І. М. Пракаповіч

# Чароўны край — Бастаўшчына

Краязнаўчыя артыкулы

Мінск

2008

УДК
ББК
П

© Пракаповіч І. М., 2009
©Афармленне. _________________, 2009

**ISBN 978-985-**

# Уводзіны

На планеце Зямля ёсць шмат прыгожых і разнастайных мясцін, але нам выпаў лёс жыць на прыгожай і шчырай беларускай зямлі, у яе невялічкім куточку, які завецца Пастаўшчына.

Пастаўскі край — тыповая беларуская глыбінка, правінцыя, у якой няма вялікіх гарадоў і буйных прадпрыемстваў, якая не стала месцам перасячэння гістарычных гандлёвых шляхоў альбо цэнтрам глабальных гістарычных падзей. Але подых гісторыі адчуваецца тут амаль у кожнай вёсцы або ў былым мястэчку: шыкоўны палац Тызенгаўзаў, высокія вежы касцёлаў і цэркваў, дагледжаныя магілы ваяроў і паўстанцаў, знакаміты камайскі каменны крыж, старасвецкія шляхецкія сядзібы, маналітныя бетонныя ўмацаванні часоў Першай сусветнай вайны…

Знаёмыя краявіды, азёры і рачулкі, вёсачкі і дарогі — усё гэта блізкае і роднае нараджае ў душы светлае пачуццё любові. Успомнім словы Ф. Скарыны: *«Звяры, якія жывуць у пустынях, ад нараджэння ведаюць норы свае; птушкі, якія лятаюць у паветры, ведаюць гнёзды свае; рыбы, якія плаваюць у морах і рэках, чуюць віры свае; пчолы і ім падобныя бароняць вуллі свае; так і людзі да таго месца, дзе нарадзіліся і выраслі, вялікую любоў маюць».*

Нават і на адлегласці ад роднай зямлі любоў да радзімы не памірае, не губляецца, а, наадварот, мацнее з году ў год. Наш зямляк, вядомы беларускі паэт У. Дубоўка, пасля доўгіх гадоў выгнання напісаў наступныя шчырыя радкі:

*А колькі б дзе ні вандраваў,*
*Хоць добра ўсюды і прыгожа, —*
*Мяне цягнула да Пастаў,*
*Хацелася пабыць ля Доўжа.*

Любоў да радзімы нараджаецца тады, калі чалавек з маленства пачынае вывучаць родныя мясціны. Спачатку гэта адбываецца несвядома праз дзіцячыя гульні, працу, вандроўкі з бацькамі і сябрамі. Пазней, у школе, вывучаючы гісторыю і геаграфію розных краін, з'яўляецца жаданне даведацца больш пра свае бліжэйшыя мясціны.

Працэс вывучэння роднага краю называецца краязнаўства. У залежнасці ад характару аб'ектаў і з'яў, якія апісваюцца, у ім выдзяляецца шэ-

раг напрамкаў: геаграфічнае краязнаўства, гістарычнае краязнаўства, літаратурнае краязнаўства і іншыя.

Пастаўшчына — даволі добра вывучаная тэрыторыя. Яе даследуюць не толькі прафесійныя навукоўцы, але і мясцовыя жыхары-аматары: настаўнікі, медыкі, рабочыя, інжынеры. Вандроўкі, экспедыцыі і цікавыя краязнаўчыя праекты здзяйсняюць вучні, якія займаюцца ў гуртках і навуковых таварыствах.

Гэтая кніга дазваляе зазірнуць у мінулае Пастаўшчыны, пазнаёміцца з асаблівасцямі прыроды і культуры тутэйшых мясцін. У ёй выкарыстоўваюцца шматлікія матэрыялы даследчыкаў нашага краю. Таму варта выказаць шчырыя словы ўдзячнасці тым людзям, якія самаахвярна і сумленна вывучалі і вывучаюць Пастаўскі край. Гэта археолагі Ф. Пакроўскі, Г. і У. Галубовічы, Я. Звяруга, М. Чарняўскі, Э. Зайкоўскі, Л. Дучыц, А. Квяткоўская; гісторыкі В. Гарбачова, К. Козак, І. Зямчонак, Г. Брэгер; краязнаўцы І. Быхавец, А. Гарбуль, Я. Драўніцкі, І. Пракаповіч, Я. Магільніцкі, Л. Чатовіч, Г. Жаброўскі, М. Арэх, С. Латыш, М. Гіль, Ф. Хоміч; фатографы І. Цапелік, П. Курыловіч, А. Чалей, Ю. Фурс, В. Казак, Г. Панкіна, С. Плыткевіч, А. Курак.

Матэрыял падручніка падзяляецца на пяць тэм. Спачатку разглядаецца геаграфічнае становішча Пастаўскага краю, яго прыродныя асаблівасці, насельніцтва і тапанімія. У другой тэме можна даведацца пра асноўныя гістарычныя падзеі ў нашай мясцовасці са старажытных часоў да пачатку III тысячагоддзя. Матэрыял трэцяй тэмы дае магчымасць пазнаёміцца з матэрыяльнай і духоўнай спадчынай Пастаўшчыны, яе славутымі людзьмі. У тэме чацвёртай разглядаюцца пытанні ўласнага «я», сям'і, роду і радаводу, а ў пятай — даецца сціслая характарыстыка буйнейшых населеных пунктаў Пастаўскага раёна: Лынтупаў, Варапаева, Дунілавічаў, Камаяў і Парыжа з Асінагарадком.

Будзь уважлівы і дапытлівы — і ты даведаешся шмат новага пра Пастаўшчыну.

Тэма I

# Мой родны край – Пастаўшчына



# § 1. Пастаўскі раён на карце Рэспублікі Беларусь

**1. Геаграфічнае становішча.** Пастаўскі раён знаходзіцца на паўночным захадзе Беларусі і займае заходні выступ Віцебскай вобласці. Адлегласць ад раённага цэнтра г. Паставы да абласнога цэнтра г. Віцебска складае 215 км, а да сталіцы Беларусі г. Мінска — 145 км. Тэрыторыя раёна размешчана на заходняй ускраіне Усходне-Еўрапейскай раўніны, займаючы часткова Полацкую нізіну па сярэднім цячэнні ракі Дзісны і Свянцянскія грады.

Пастаўскі раён суседнічае з Браслаўскім (на поўначы), Шаркоўшчынскім (на паўночным усходзе), Глыбоцкім (на ўсходзе) і Докшыцкім (на паўднёвым усходзе) раёнамі Віцебскай вобласці. На поўдні праходзіць мяжа з Мядзельскім раёнам Мінскай вобласці,




👁 Паставы на карце Віцебскай вобласці




а па паўднёвым захадзе — з Астравецкім раёнам Гродзенскай вобласці. На захадзе і паўночным захадзе раёна знаходзіцца дзяржаўная мяжа нашай краіны з Літоўскай рэспублікай.

Працягласць дзяржаўнай мяжы складае 70 км. З раёнамі Беларусі — 168 км. Адлегласць паміж крайнімі ўсходняй і заходняй кропкамі налічвае 75 км, паміж паўночнай і паўднёвай — 54 км.

Па контуру Пастаўскі раён нагадвае абрыс чаравіка або кабіны аўтамашыны. Ён мае плошчу 2,1 тыс км$^2$. Па велічыні тэрыторыі раён большы за некаторыя невялікія краіны свету, такія як, напрыклад, Мальта, Манака, Ліхтэнштэйн, Бахрэйн, Сінгапур, Сан-Марына. Зусім ненамнога большыя Люксембург, Каморскія астравы, Зах. Самоа.

Раён знаходзіцца ў другім гадзінным поясе.

У геаграфічным становішчы раёна за апошняе стагоддзе адбыліся значныя змены. Вельмі складаным яно было ў часы войнаў, асабліва Першай сусветнай, калі амаль тры гады лінія фронту падзяляла тэрыторыю раёна папалам. У 20–30-я гады XX стагоддзя Пастаўшчына знаходзілася на ўсходняй ускраіне Польшчы ў складзе так званых «крэсаў усходніх». Гаспадарка развівалася марудна, мела сельскагаспадарчую скіраванасць; перанаселенасць вёсак выклікала беспрацоўе і, як вынік, эміграцыю ў Латвію, Эстонію і іншыя краіны Еўропы і Амерыкі.

Пасля Другой сусветнай вайны эканоміка-геаграфічнае становішча раёна палепшылася пасля ўваходжання ў агульную эканамічную прастору СССР. У цяперашні час пры стабільнай эканамічнай і палітычнай сітуацыі, калі зноў назіраецца пашырэнне інтэнсіўнасці сувязяў паміж Захадам і Усходам, становішча Пастаўскага раёна выглядае выгадным. Мяжуючы з балтыйскім рэгіёнам Еўропы, а таксама валодаючы адметнымі магчымасцямі для арганізацыі турызму і адпачынку, Пастаўшчына мае добрыя перспектывы для хуткага эканамічнага развіцця.

**2. Адміністацыйна-тэрытарыяльны падзел.** У кожнай краіне для зручнага кіравання тэрыторыя падзяляецца на асобныя часткі, якія называюцца адміністрацыйнымі адзінкамі. Іх колькасць залежыць ад плошчы дзяржавы: чым большая краіна, тым складаней выглядае яе адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел. У Беларусі сістэма адміністрацыйных адзінак наступная: краіна – вобласць – раён – сельскі (гарадскі) савет. На тэрыторыі кожнай з іх утвараюцца і дзейнічаюць мясцовыя органы ўлады.

У мэтах эфектыўнага кіравання тэрыторыяй Пастаўскі раён падзелены на шэраг адміністрацыйных адзінак, цэнтрамі якіх з'яўляюцца найбольш значныя ў гаспадарчых і культурных асаблівасцях населеныя пункты. Паводле сучаснага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу на Пастаўшчыне ёсць адзін гарадскі (у Паставах), адзін пасялковы (у Варапаеве) і 11 сельскіх Саветаў: Лынтупскі, Белькаўскі, Ваўкоўскі, Дунілавіцкі, Шыркаўскі, Курапольскі, Камайскі, Казлоўшчынскі, Навасёлкаўскі, Юнькаўскі, Ярэўскі.

У мінулым наш край меў іншую сістэму адміністрацыйных адзінак. У складзе ВКЛ і Рэчы Паспалітай Пастаўшчына ў розныя часы ўваходзіла ў Ашмянскі, Завілейскі паветы Віленскага ваяводства; у складзе Расійскай імперыі — у Дзісненскі, Свянцянскі паветы Мінскай і Віленскай губерняў. З 1921 па 1939 год Паставы ў складзе Польшчы з'яўляліся цэнтрам Пастаўскага павета. 15 студзеня 1940 года ў складзе Вілейскай вобласці БССР утвораны Пастаўскі і Дунілавіцкі раёны. У час нямецка-фашысцкай акупацыі тэрыторыя сучаснага Пастаўскага раёна асобнымі часткамі ўваходзіла ў 3 акругі (гебіты): Глыбоцкую, Вілейскую і генеральную акругу Літва. Пасля вайны Пастаўскі і Дунілавіцкі раёны ўвайшлі ў склад

Маладзечанскай вобласці. З 20 студзеня 1960 года горад Паставы стаў раённым цэнтрам Віцебскай вобласці, а Дунілавіцкі раён быў скасаваны. Праз 2 гады ў Пастаўскі раён з Глыбоцкага перададзены г. п. Варапаева, Белькаўскі, Ваўкалацкі, Дунілавіцкі, Казлоўшчынскі і Ласіцкі сельсаветы.

**Пытанні і заданні:**

1. Знайдзіце населеныя пункты, якія размешчаны на адной паралелі і на адным мерыдыяне з Паставамі.
2. Знайдзіце на карце свету краіны, блізкія па памерах з Пастаўскім раёнам.
3. Знайдзіце на карце Пастаўскага раёна цэнтры адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак.
4. Падлічыце, колькі працэнтаў тэрыторыі Беларусі займае Пастаўскі раён?
5. Чаму ў мінулыя часы Пастаўшчына мела іншы адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел?

# § 2. Горад Паставы — цэнтр Пастаўскага раёна

**1. Прыродныя адметнасці горада.** У Беларусі нямнога гарадоў з такім адметным геаграфічным становішчам, як Паставы. Знаходзячыся на паўночным захадзе краіны, гарадок аддалены ад вялікіх і шумных прамысловых цэнтраў, што станоўча ўплывае на экалогію і лад жыцця мясцовых жыхароў. Маляўнічая прырода ваколіцаў Паставаў увабрала ў сябе ўсе найпрыгажэйшыя фарбы Паазер'я: тут зялёныя колеры лясоў перамяжоўваюцца з рознакаляровым адценнем палеткаў, сярод якіх звабліва блішчаць блакітныя вочы азёр і сінія меандры рэк і рачулак. Знаходжанне ў Заходняй Беларусі, суседства з замежнымі землямі (а да Літвы ўсяго каля 11 кіламетраў) прывяло да таго, што горад заўсёды адчуваў сваю далучанасць да агульнаеўрапейскай культуры.

Горад раскінуўся абапал ракі Мядзелкі, дзе на паўвостраве, утвораным вялікім выгінам рэчышча, знаходзіцца яго сэрца — гістарычны цэнтр, былое Гарадзішча. Геаграфічныя каардынаты яго — 55° 06' 36'' паўночнай шыраты і 26° 50' 30'' ўсходняй даўгаты.



Від Паставаў з вышыні птушынага палёту

Гэта пясчаная выспа ў старажытнасці была штучна аддзелена ад «мацерыка» каналам, у выніку чаго Гарадзішча ператварылася ў Востраў (гэта яшчэ адна назва гэтага месца). У Паставах перад плацінай Мядзелка даволі шырока разліваецца, утвараючы стаў плошчай 27 гектараў. У межах горада цераз раку пракладзена 5 мастоў. Некаторыя масты маюць неафіцыйныя назвы: Танкавы, Бальнічны, Млын.



Касцёл св. Антонія Падуанскага

У II тысячагоддзі, асабліва напрыканцы яго, горад разрастаўся ва ўсе бакі ад цэнтра, прыстасоўваючы для жыцця разнастайныя формы мясцовага рэльефу. Спачатку быў асвоены высокі плоскі ўзгорак на заходнім беразе ракі насупраць Гарадзішча і ўзвышэнне на Зарэччы; пазней узніклі маёнткі на ўзгорках у



Від на Паставы з боку касцёла

паўднёвай частцы на абодвух баках става. Паміж узгоркамі ляжалі забалочаныя лагчыны, якія з часам былі асушаны канавамі і забудаваны.

Заходняя частка значна вышэйшая і мае больш складаны рэльеф, чым усходняя, дзе мясцовасць ў асноўным нізінная і да таго ж моцна забалочаная. Мікрараён вуліцы Юбілейнай яшчэ ў 70-я гады ўяўляў сабой суцэльнае цяжкапрахадзімае балота.

Абсалютная вышыня горада над узроўнем мора складае ад 133,6 метра на захадзе (урэз вады ў возеры Задзеўскае) да 146,2 метра на паўднёвым захадзе (каля саду ў канцы вуліцы Паркавай).

У межах горада знаходзіцца 6 даволі вялікіх вадаёмаў: два ставы — Паўднёвы і Паўночны на рэчцы Мядзелка, возера Задзеўскае, якое злучана рачулкай Дзявіцай з возерам Думбля, невялікія азёры Чорнае і Круглае (другая назва — Паркавае).

Вакол горада захаваліся даволі значныя па памерах участкі натуральнай расліннасці. На поўначы і поўдні мерыдыянальнай паласой цягнуцца вялікія лясныя масівы, багатыя на грыбы, ягады, дзічыну. На Гарбарцы і вакол палаца яшчэ захаваліся асобныя старыя дрэвы — рэшткі даўнейшага парка.

На працягу XX стагоддзя ў Паставах сфарміравалася некалькі гарадскіх мікрараёнаў. Да існаваўшых з XVIII–XIX стагоддзяў Цэнтра (Рынкавая плошча і забудова цэнтральных вуліц) і Зарэчча далучыліся Пяты і Шосты гарадкі, МСО, Юбілейная.

У горадзе працуе шэраг прамысловых прадпрыемстваў, сярод якіх выдзяляюцца заводы «Беліт», «Паставы-мэбля», кансервавы завод, малаказавод, хлебазавод, ільнозавод, друкарня, лясгас, камбінат бытавога абслугоўвання і іншыя. Дзейнічае прафесійны ліцэй, 5 сярэдніх школ, раённая гімназія, музычная, мастацкая і спартыўная школы, дзве бібліятэкі, раённы краязнаўчы музей, Дом рамёстваў, цэнтральная раённая бальніца і шэраг іншых установаў.

**2. Гісторыя горада.** Першае вядомае паселішча старажытных людзей у межах горада адносіцца да эпохі новага каменю — неаліту. Яно выяўлена на паўночным беразе возера Задзеўскае. Крыху маладзейшае паселішча — Гарадзішча — паўстала па паўвостраве каля р. Мядзелка ў цэнтры сучасных Пастаў.

У канцы X стагоддзя каля возера Задзеўскае знаходзілася невялічкая вёсачка Пасаднік, жыхары якой займаліся лоўляй і продажам рыбы. Валодаў паселішчам у той час Дэспат-Зяновіч. Пасаднік уваходзіў у склад Полацкага княства і быў яго пагранічным рубяжом. Зручнае геаграфічнае становішча на рэчцы Мядзелка спрыяла хуткаму росту насельніцтва, развіццю рамёстваў і сельскай гаспадаркі. У 1263 годзе заходнія землі Полацкага княства, у тым ліку і Пасаднік, увайшлі ў склад Вялікага Княства Літоўскага.

У 1409 годзе паселішча належала Гераніму Зяновічу (Зяновію Братошычу), які атрымаў ад польскага караля Уладыслава-Ягайлы прывілей на перавод вёскі Пасаднік у мястэчка Паставы. Гэты год лічыцца датай заснавання горада.

Пасля заключэння ў 1588 годзе Люблінскай уніі — пагаднення аб дзяржаўна-палітычным саюзе ВКЛ з Польшчай — Паставы ўвайшлі ў склад федэратыўнай дзяржавы Рэчы Паспалітай.

У часы Лівонскай вайны (1558–1583), калі войска Рэчы Паспалітай пад кіраўніцтвам караля Стэфана Баторыя вяло баявыя дзеянні супраць арміі рускага цара Івана IV Грознага, у 1579 годзе Паставы выконвалі ролю важнага стратэгічнага пункта, адкуль плыты з гарматамі адпраўляліся на асаду Полацка. У другой па-



Дамы рамеснікаў



Старая царква



Царква і крыты рынак

лове XVII стагоддзя горад моцна пацярпеў ад рускіх войск у час вайны Рэчы Паспалітай з Масковіяй (1654–1667). Мястэчка было разрабавана і спалена. Калі перад вайной у Паставах налічвалася каля 70 двароў, то ў 1672 годзе ў мястэчку і ваколіцах іх было толькі 5.

Другая палова XVIII стагоддзя — гэта пара росквіту Паставаў. У 60-х гадах уладаром мястэчка стаў Антоній Тызенгаўз, падскарбій надворны Вялікага Княства Літоўскага, які жабрацкае драўлянае паселішча ператварыў у каменны гарадок. У 60–80-х гадах было заснавана 8 прамысловых прадпрыемстваў, узведзена шмат барочных будынкаў, якія ўтварылі ў цэнтры горада закончаны архітэктурны ансамбль; на выездзе на Мядзел пачата будаўніцтва шыкоўнага палаца. У мястэчку дзейнічалі тэатр, балетная і музычная школы, народнае вучылішча, бібліятэка. Пасля Антонія Паставамі валодалі Сафія Тызенгаўз-Хамінская, Ігнацій, Канстанцін і Райнольд Тызенгаўзы, Марыя Тызенгаўз-Пшаздзецкая, Юзаф Пшаздзецкі.

З 1791 года Паставы — цэнтр Завілейскага павета Віленскага ваяводства, а з 1793 года пасля падзелу Рэчы Паспалітай увайшлі ў склад Расійскай імперыі, сталі цэнтрам воласці Дзісенскага павета Менскай губерні.

У сярэдзіне ліпеня 1812 года Паставы захоплены французскімі войскамі Жэрома Банапарта, а сам Напалеон праехаў праз Пастаўшчыну 17–18 ліпеня, калі накіроўваўся з Гадуцішак у Глыбокае. Пасля разгрому напалеонаўскіх войск пад Масквой у кастрычніку 1812 года Паставы былі заняты рускай арміяй.

У 1814 годзе мястэчка перайшло ва ўладанне Канстанціна Тызенгаўза, пры якім Паставы дасягнулі свайго найвышэйшага росквіту, сталі навуковым і культурным цэнтрам. Новы ўладар маёнтка дабудаваў палац, стварыўшы вакол яго пейзажны парк; заснаваў карцінную галерэю, у якой былі прадстаўлены шэдэўры жывапісу эпохі Адраджэння. У адбудаваным палацы акрамя карціннай галерэі знаходзіліся экспанаты багатага арніталагічнага музея і бібліятэка.

У час паўстанняў супраць расійскай акупацыі ў 1830–1831 і 1863–1864 гадах Паставы апынуліся амаль у цэнтры тых бурлівых падзей.

На пачатак 1870-х гадоў у Паставах мелася 111 двароў, школа, 2 млыны, 13 крам, ладзілася па сем кірмашоў у год.

У канцы XIX стагоддзя паводле 1-га Усерасійскага перапісу насельніцтва ў мястэчку пражывала 2397 жыхароў (1897 год). З іх 58% — яўрэі, якія трымалі ў сваіх руках гандаль. Размаўляла насельніцтва на беларускай мове.

На развіццё Паставаў у канцы XIX стагоддзя вялікі ўплыў аказала пракладка чыгуначнай лініі Новасвянцяны – Беразвечча. У 1895 годзе пачаўся рух цягнікоў з Літвы да мястэчка, а ў наступныя два гады ён прадоўжыўся да Варапаева і Глыбокага.

Мястэчка пачатку XX стагоддзя вядома тым, што тут на працягу некалькіх гадоў размяшчалася практычная афіцэрская кавалерыйская школа. На ўзгорыстым левым беразе Мядзелкі графам Пшаздзецкім быў пабудаваны вялікі паляўнічы замак у гатычным стылі, казармы, стайні, звярынцы і псярні. Заняткі праводзіліся ў форме парфорснага палявання з вялікімі зграямі сабак, са страявымі, падрыхтаванымі коньмі. У 1901 годзе ў парфорсным паляванні браў удзел вялікі князь Мікалай Мікалаевіч,

афіцэры балгарскай і сербскай армій. Да сённяшніх дзён захаваўся невялікі відэасюжэт пра заняткі ў Пастаўскай кавалерыйскай школе. Замак і ўсе пабудовы вакол яго былі разбураны ў час Першай сусветнай вайны. Ды і самі Паставы моцна пацярпелі ад яе, бо амаль на 3 гады (1915–1917) апынуліся на лініі фронту і таму былі моцна разбураны, страцілі шмат жыхароў. Многія будынкі ператварыліся ў друз.




Будынак Пастаўскага староства. 1930 г.



Плошча ў Паставах



Помнік загінуўшым у час Другой сусветнай вайны

Пасля перамогі ў Расіі Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года ў Паставах у сакавіку 1917 года быў утвораны савет салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. Паралельна з ім дзейнічалі органы ўлады Часовага ўрада. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі да сярэдзіны лістапада 1917 года ўся ўлада ў горадзе перайшла да Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта.

З 1918 па 1920 год горад некалькі разоў займаўся войскамі Германіі, Расіі, Польшчы.

Пасля перамоў паміж Польшчай і Савецкай Расіяй 18 сакавіка 1921 года была падпісана Рыжская мірная дамова, па якой Паставы адышлі да тэрыторыі польскай дзяржавы, у так званыя «крэсы ўсходнія».

Спачатку горад уваходзіў у Пастаўскае староства, а з 1925 года стаў цэнтрам Пастаўскага павета, у якім налічвалася больш за 1,3 тысячы наседеных пунктаў з насельніцтвам каля 110 тысяч жыхароў. Адным з буйнейшых землеўладальнікаў заставаўся уладар Пастаў Юзаф Пшаздзецкі.

1 верасня 1939 года Германія напала на Польшчу, распачаўшы Другую сусветную вайну. Праз 17 дзён Чырвоная Армія з усходу рушыла на Заходнюю Беларусь. У Паставах усталявалася савецкая ўлада, а 2 лістапада 1939 года Паставы ўвайшлі ў склад БССР.

Практычна ўжо 22 чэрвеня 1941 года ўсе жыхары Пастаў ведалі аб нападзе Германіі на СССР. 25 чэрвеня нямецкія самалёты ўпершыню нанеслі некалькі бомбавых удараў па Паставах і скінулі дэсант парашутыстаў для дыверсійнай дзейнасці. Бамбілі ў асноўным мясцовы аэрадром.

Паставы былі захоплены нямецкімі войскамі 6 ліпеня 1941 года. Горад выкарыстоўваўся захопнікамі для перападрыхтоўкі і часовага прыпынку вайсковых падраздзяленняў перад адпраўкай на фронт. Гарнізон у Паставах арганізаваны ўжо ў 1941 годзе і налічваў у розныя перыяды ад 100 да 1000 чалавек. Так, у канцы 1942 года ён складаўся з 450 украінцаў, каля 500 літоўцаў і 70 немцаў.

З нацыянальных груп падчас акупацыі найбольш пацярпелі яўрэі. У лютым 1942 года гітлераўцы стварылі ў Паставах па вул. Браслаўскай (зараз Ленінская) гета, куды перасялілі з усіх вуліц горада, а таксама з ваколіцаў яўрэйскае насельніцтва. 21 лістапада 1942 года карнікі расстралялі жыхароў гета. Вырвацца ўдалося толькі аднаму чалавеку, загінула каля 4000.

5 ліпеня 1944 года горад быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў падраздзяленнямі 145-й Віцебскай стралковай дывізіі.

Вялікія страты нанесла вайна Паставам. Было спалена 86 хат, 46 разбурана часткова; у гета закатавана больш за 4000 чалавек.

Пасля вайны пачалося паступовае аднаўленне гаспадаркі. Ужо ў 1945 годзе прадпрыемствамі мясцовай прамысловасці была выпушчана першая прадукцыя. Пазней былі пабудаваны і пачалі працаваць заводы: льнозавод (з 1947), кансервавы завод (з 1953), малаказавод (з 1963), хлебазавод (1964), мясакамбінат, завод «Беліт» (з 1976), завод па вытворчасці камплектаў вучэбнага абсталявання па чарчэнні і маляванні (з 1981 года, зараз — прадпрыемства «Паставымэбля»).

З 1944 па 1955 год у Паставах знаходзілася педагагічнае вучылішча, у якім да лета 1947 года дзейнічала патрыятычная беларуская арганізацыя моладзі «Саюз беларускіх патрыётаў», якая арыентавала сваю працу на павышэнне нацыянальнай свядомасці насельніцтва. Большасць сяброў арганізацыі была арыштавана і асуджана на пазбаўленне волі ад 5 да 25 гадоў.

Сярод творчых калектываў найбольшую вядомасць мае народны фальклорны ансамбль «Паазер'е», які быў створаны ў 1991 годзе дырэктарам Пастаўскай музычнай школы А. Собалем. Калектыў — лаўрэат і дыпламант розных конкурсаў і фестываляў.

Шырокую вядомасць Паставы набылі ў сувязі з Міжнародным фестывалем народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік», які ўпершыню адбыўся ў 1991 годзе і стаў традыцыйным. На свяце бывае шмат гасцей з розных куткоў Беларусі і з замежжа.

З набыццём незалежнасці Паставы сталі пагранічным раённым цэнтрам, у выніку чаго ў горадзе з'явіліся спецыфічныя арганізацыі і ўстановы — мытня, пагранкамендатура, першая асобная авіяцыйная эскадрылля, ваенны шпіталь.

**3. Паходжанне назвы і гарадская сімволіка.** Горад мае дзве гістарычныя назвы. Першая — «Пасаднік» — згадваецца ўпершыню пры апісанні невялікай вёсачкі на 5 хат на месцы сучасных

Герб Паставаў. 1796 г.



Сучасны герб



Паставаў. Утворана назва была з прычыны таго, што землі, на якіх знаходзілася паселішча, ляжалі на заходніх межах Полацкага княства і тутэйшай мясцовасцю кіраваў пасаднік — намеснік полацкага князя.

Пры пераводзе вёскі ў разрад мястэчак паселішча атрымала і новую назву — Паставы. Тлумачэнняў сэнсавага значэння назвы існуе многа, аднак ні адна з версій пакуль што не можа быць прызнана абсалютна дакладнай. Мясцовы жыхары часцей за ўсё прыводзяць два варыянты тлумачэння. Першы зыходзіць з таго, што горад амаль усю сваю гісторыю развіваўся як вайсковы і большасць яго жыхароў жыла «па ўставу», адсюль, маўляў, і пайшла назва. Другі варыянт грунтуецца на тым, што ў цэнтры горада знаходзяцца два вялікія вадасховішчы-ставы, і таму лагічным было ўзнікненне назвы горада як паселішча, якое размяшчаецца абапал ставоў. Гэта версія прыдатна адлюстроўвае адну з галоўных геаграфічных асаблівасцяў Паставаў.

Аднак існуюць і іншыя варыянты. Слова «пастаў» азначае пару жорнаў у млыне, якія выкарыстоўваліся для памолу збожжа. Крыніцы сведчаць, што пастаўскі вадзяны млын меў два паставы.

Як адзін з верагодных варыянтаў тлумачэння можа быць прынятая версія паходжання назвы ад тэрміна, які ўжываўся пры апрацоўцы драўніны. «Пастаў» — гэта група піл на лесапільных рамах, якія ўстаноўлены ў адпаведнасці са схемай раскрою бярвення. Калі ўлічыць, што яшчэ ў старажытныя часы на беразе Мядзелкі стаяла лесапілка, то вельмі верагодна, што і назва «вырасла» адсюль.

Як бачым, версій паходжання назвы існуе некалькі, але амаль ўсе яны так ці інакш звязаны з ракой Мядзелкай, якая стала калыскай Паставаў.

Горад мае свае афіцыйныя сімвалы — герб і сцяг, якія ствараліся ў розныя часы. Герб горада Паставы быў зацверджаны 22 студзеня 1796 года пасля далучэння яго да Расійскай імперыі. Ён меў форму прадаўгаватага прамавугольніка, у якім ніжнія краі закруглены і сыходзяцца пад вуглом уніз (французскі шчыт), на якім размяшчалася рыбалоўная сетка і тры залатыя рыбкі. У верхняй частцы герба знаходзіўся герб Расійскай імперыі — двухгаловы арол з каронай, скіпетрам і булавой, у сярэдзіне якога месціўся герб Менскай губерні, у склад якой тады ўваходзілі Паставы.

У 2002 годзе рашэннем сесіі Пастаўскага раённага Савета дэпутатаў было зацверджана палажэнне аб гербе і флагу горада Паставы. Апісанне гарадскіх сімвалаў наступнае: «ГЕРБ: На блакітным фоне рыбалоўная сетка, уверсе тры залатыя рыбкі, накіраваныя галовамі ўніз. ФЛАГ: Блакітнае палотнішча з суадносінай шырыні і даўжыні як 1: 2. Пасярэдзіне правага боку рыбалоўная сетка, уверсе — тры залатыя рыбкі.»

**4. План горада.** Як вядома, гістарычным цэнтрам горада Паставы з'яўляецца паўвостраў каля р. Мядзелка, на якім зараз знаходзіцца касцёл св. Антонія Падуанскага. У старажытныя часы тут было гарадзішча, якое аддзялялася ад сушы каналам, чаму і месца гэта раней называлася Гарадзішча, або Востраў.

Паступова паселішча павялічвалася ў памерах, бо людзі сяліліся ўздоўж ракі спачатку на правым беразе, а потым і на высокім левым. У другой палове XVIII стагоддзя, за часам Антонія Тызенгаўза, цэнтральная частка горада была моцна перабудавана, у выніку чаго Паставы займелі прыгожую мураваную плошчу і чатыры галоўныя вуліцы, што разыходзіліся ў розныя бакі ад яе.



Паставы на схеме Г. Жаброўскага. 1939 г.

Даведацца пра забудову горада ў канцы XVIII стагоддзя можна, уважліва разгледзеўшы план Паставаў 1798 года, які быў складзены пасля далучэння заходнебеларускіх зямель да Расійскай імперыі. З плана вынікае, што горад у той час меў невялікія памеры: плошча яго складала ўсяго каля 1 км$^2$. Падзялялася паселішча на дзве часткі: Рынкавую (Цэнтральную) на левым




Схема г. Паставы канца XVIII ст.

беразе Мядзелкі, і Зарэчча — на правым беразе. Асобна ад горада месціўся палац і сядзібна-паркавы ансамбль Тызенгаўзаў, уладальнікамі якога на той час былі Хамінскія.

Паставы развіваліся марудна, няроўна. На гэта ўплывалі войны, паўстанні, пажары, голад. Перад Другой сусветнай вайной (1939) памеры горада складалі каля 3 км$^2$. Забудова аднапавярховымі дамамі вялася ў асноўным уздоўж галоўных вуліц, у выніку чаго аказаліся асвоенымі людзьмі прыдатныя для пражывання берагі р. Мядзелка, азёр Чорнае і Белае. Сядзібна-паркавы ансамбль злучыўся з горадам, а на Зарэччы актыўна забудоўвалася вуліца да чыгуначнага вакзала. Рынкавую плошчу пачалі зваць Рынак Стары, бо на захад ад яе ўтварыўся Рынак Задзеўскі.

Пасля Другой сусветнай вайны Паставы пачалі імкліва павялічвацца ў памерах. З'явіліся новыя вуліцы, плошчы. Побач з кварталамі аднапавярховых будынкаў выраслі мікраараёны 2–5-павярховых шматкватэрных дамоў. Звязана гэта было з тым, што ў Паставах, па-першае, размясціліся вайсковыя часці, быў пабудаваны аэрадром, а ў ваколіцах — шахты балістычных ракет; па-другое, пачалі працаваць асноўныя прамысловыя прадпрыемствы, для работы на якіх пераязджалі людзі з вёсак.

На працягу XX стагоддзя ў Паставах сфармавалася некалькі гарадскіх мікраараёнаў. Да існаваўшых з XVIII–XIX стагоддзяў Цэнтра (Рынкавая плошча і забудова цэнтральных вуліц) і Зарэчча далучыліся Пяты і Шосты гарадкі, МСО, Юбілейная, Смалярня, Будаўнікоў.

**Пытанні і заданні:**

1. Як прыродныя асаблівасці Паставаў паўплывалі на іх размяшчэнне?
2. Калі Паставы набылі статус мястэчка?
3. Якія гістарычныя падзеі пакінулі свае сляды ў горадзе?
4. У якія краіны ўваходзілі Паставы на працягу сваёй гісторыі?
5. Якія гістарычныя назвы мае горад?
6. Якія сімвалы мае горад? Як яны выглядаюць?
7. Чым адрозніваецца план Паставаў 1798 года ад сучаснага? Якія змены і чаму адбыліся?

# § 3. Геаграфія Пастаўскага краю

**1. Будова зямной кары і рэльеф.** Пастаўскі раён знаходзіцца на Усходне-Еўрапейскай платформе. Платформа — трывалы ўчастак зямной кары, і таму на Пастаўшчыне не назіраюцца праявы, характэрныя для актыўных зон — няма ў нас ні вулканаў, ні гейзераў, ні землетрасенняў. Раён размешчаны на Рускай пліце і таму мае двух'ярусную будову: знізу ляжыць падмурак — крышталічныя пароды старажытных часоў — архейскай і пратэразойскай эр; а зверху знаходзяцца асадкавыя пароды рознага ўзросту, таўшчыня якіх 540–650 м. Тэктанічная структура называецца Вілейскі пахаваны выступ Беларускай антэклізы.

Для платформ характэрны марудныя вагальныя рухі. Паводле звестак навукоўцаў, зараз паверхня раёна падымаецца з хуткасцю да 1–2 мм у год. Землетрасенні малаверагодныя, аднак усё ж такі могуць здарацца або па прычыне зрухаў горных парод падмурка, дзе выяўлены глыбінныя разломы, або як водгулле ваганняў зямной кары ў Карпатах ці ў Балтыйскім моры.



Рунічны камень

**Цікавы факт:** У 2004 годзе па Пастаўшчыне прайшла хваля землетрасення, эпіцэнтр якога знаходзіўся ў Калінінградскай вобласці. Сіла штуршкоў была 3–4 балы. У кватэрах звінеў посуд, адчыняліся дзверы шафаў, хісталіся фіранкі.



Старажытныя жывёлы пасляледавіковага перыяду

Геалагічная будова зямных нетраў на Пастаўшчыне даволі простая: на гранітна-гнейсавым падмурку амаль гарызантальна залягаюць розныя асадкавыя пароды, сярод якіх пераважаюць пяскі, супесі, суглінкі, гліны, торф, якія назапашваліся на працягу доўгага часу, асабліва калі наш край быў дном старажытных мораў і акіянаў. Найчасцей гэта адбывалася ў кембрыйскі, ардовікскі і дэвонскі перыяды палеазойскай эры. У мезазойскую і кайназойскую эры Пастаўшчына была сушай, і таму асадкавыя пароды назапашваліся слаба.

На сучаснае аблічча паверхні раёна зрабілі ўплыў няроўнасці крышталічнага падмурку, абледзяненні, сучасныя рухі зямной кары, вада, вецер, ваганні тэмператур.



Азёры — адметная асаблівасць краявідаў Пастаўшчыны

**Заляганне горных парод на Пастаўшчыне**

| Вышыня над узроўнем мора | Эра | Перыяд | Асноўныя горныя пароды |
|---|---|---|---|
| 200<br>150<br>100 | КАЙНАЗОЙ | Антрапаген | Пяскі, суглінкі, супесі, гліны, торф |
| 500<br>50<br>-100<br>-150 | ПАЛЕАЗОЙ | Дэвон | Гліны, пяскі, мергелі, гліны, гліністыя вапнякі |
| | | Ардавік | Кварцавыя пясчанікі, мергелі, гліны, гліністыя вапнякі |
| | | Кембрый | Пясчанікі, гліны, алеўраліты |
| -200<br>-250<br>-300<br>-350<br>-400<br>-450<br>-500<br>-550 | ПРАТЭРАЗОЙ | | Пясчанікі, гліны, алеўраліты, граніты, габра, перыдатыты |
| -600<br>-..... | АРХЕЙ | | Базальт, граніт, габра |

Тэрыторыя мае слабаўзгорысты характар і з'яўляецца часткай вялікай Усходне-Еўрапейскай раўніны. Найбольш прыўзнятая частка раёна — заходняя (Лынтупшчына), дзе сярэднія вышыні маюць больш за 200 м над узроўнем Балтыйскага мора. Вышэйшая кропка раёна — гара Высокая — знаходзіцца каля вёскі Каптаруны амаль на мяжы з Літвой і мае адзнаку 247 метраў. Самая нізкая частка раёна — гэта тэрыторыя, што прылягае да рэчышча Дзісны, асабліва ў сутоках рэк Дзісна, Палавіца, Галбяіца, дзе знаходзяцца вёскі Белькі, Полава. У ваколіцах вёскі Рымкі (на ўсход ад яе) вызначаецца самае нізкае месца Пастаўшчыны з адзнакай 110 м.

Паводле характару паверхні, а таксама па ўмовах фарміравання, тэрыторыю раёна можна падзяліць на тры часткі: паўночную — Дзісненскую нізіну, якая з'яўляецца часткай вялікай Полацкай нізіны, паўднёвую — Свянцянскія грады, і паўднёва-заходнюю — Нарацка-Вілейскую нізіну.

Над суседняй Дзісненскай нізінай Свянцянскія грады ўзвышаюцца на 80–90 метраў, над Нарачанскай раўнінай — на 50–

60 метраў. Па найбольшых вышынях праходзіць водападзел паміж басейнамі Заходняй Дзвіны і Нёмана.



Краявід Дзісненскай нізіны

Фарміраванне такога рэльефу звязана пераважна з дзейнасцю апошняга паазёрскага ледавіка і вод, якія ўтварыліся пасля яго раставання. Свянцянскія грады — гэта складаная сістэма канечнамарэнных узгоркаў, якія былі насунуты ледавіком, Дзісненская нізіна — дно старажытнага прыледавіковага вадаёма, які быў спушчаны рэкамі пасля таго, як пазбавілася лёду Балтыйскае мора.



Свянцянскія грады па поўдзень ад г. Паставы

Найбольш распаўсюджанымі тыпамі рэльефу Пастаўскага раёна з'яўляюцца тыя, што звязаны з дзейнасцю ледавіка (марэны), водных патокаў (патокава-ледавіковыя формы), нізкіх тэмператур (крыягенныя), раслін і жывёл, чалавека (тэхнагенныя формы).

**2. Карысныя выкапні.** Пастаўскі раён не вельмі багаты на карысныя выкапні. З групы неметалічных найбольш распаўсюджаныя радовішчы будаўнічых матэрыялаў (гліны, пяскі, жвір і некаторыя іншыя), сапрапелю, прэснаводных вапняковых адкладаў, будаўнічага каменю.

На тэрыторыі раёна выяўлена дванаццаць значных па памерах радовішчаў глін і суглінкаў, сярод якіх два — Курапольскае і Галбяіца — уваходзяць у шэраг буйнейшых у краіне.

Большасць радовішчаў пяскоў у нашым раёне адносіцца да групы будаўнічых і выкарыстоўваецца для вытворчасці блокаў,



Размяшчэнне радовішчаў карысных выкапняў

панеляў, пліт, сілікатнай цэглы. Найбольшую колькасць пяску ўтрымлівае Лынтупскае радовішча.

Пясчана-жвіровы матэрыял у прыродзе сустракаецца ў выглядзе сумесі пяску, жвіру і галькі. Выкарыстоўваецца для вытворчасці бетону і жалезабетону, будаўніцтва, пракладкі дарог. У раёне гэты від будаўнічых матэрыялаў перапрацоўвае Варапаеўскі завод жалезабетонных вырабаў. Актыўная здабыча пясчана-жвіровай сумесі вядзецца на Данеўскім радовішчы, якое знаходзіцца недалёка ад возера В. Швакшты і ў радовішчы каля вёскі Жданы.

Ледавіком прынесена на тэрыторыю раёна шмат камянёў розных памераў ад некалькіх сантыметраў да некалькіх метраў у папярэчніку. З'явіліся яны да нас здалёку — са Скандынавіі і Фінляндыі. Каменне выкарыстоўваецца ў якасці будаўнічага матэрыялу; апошнім часам у Паставах пачалі рэзаць камень на абліцовачныя дэкаратыўныя пліты. Некаторыя валуны ўзяты пад ахову, з'яўляюцца помнікамі прыроды.

Сапрапель — гэта ілістыя адклады ў вадаёмах, якія ўтрымліваюць шмат арганічных рэчываў. У залежнасці ад складу колер бывае чорны, шэры, блакітны, ружовы, нават чырвоны. На тэрыторыі раёна выяўлена 12 радовішчаў азёрнага сапрапелю. Найбольшыя іх тоўшчы вызначаны ў азёрах В. і М. Швакшты, Лучай, Лісіцкае, Задзеўскае. Сапрапелі гэтых радовішчаў могуць выкарыстоўвацца ў якасці ўгнаенняў, для вытворчасці будаўнічых матэрыялаў і для атрымання буравых раствораў.

З гаручых карысных выкапняў на Пастаўшчыне знойдзены і выкарыстоўваецца толькі торф. Таўшчыня тарфяной масы ў асноўным 1–3 м. У раёне налічваецца 62 радовішчы торфу, з якіх самыя вялікія: Пурвіны, Халосеньскае, Светлы Мох. Торф, які здабываюць у раёне, выкарыстоўваецца ў асноўным на сельскагаспадарчыя патрэбы.

Ёсць у Пастаўскім раёне і радовішчы падземных мінеральных вод. Сустракаюцца хларыдна-натрыевыя і хларыдна-сульфатна-натрыевыя воды.

**Цікавы факт:** На ўсходняй ускраіне вёскі Бялянішкі, што на Лынтупшчыне з-пад зямлі б'е штучная крыніца, якая ўтварылася з прабуранай у 90-я гады свідравіны. З трубы самацёкам ідзе слабамінералізаваная чыстая і прыемная на смак вада.

**3. Клімат.** На фарміраванне клімату Пастаўскага раёна ўплывае знаходжанне раёна ва ўмераных шыротах, набліжанасць да Атлантычнага акіяна, перавага вятроў заходняга накірунку, узвышана-раўнінны рэльеф, паветраныя масы, цыклоны і антыцыклоны.

Раён знаходзіцца ва ўмераным кліматычным поясе. Тып клімата — умерана-кантынентальны. Заходнія вятры з Атлантычнага акіяна вельмі моцна ўплываюць на надвор'е. Зімой яны прыносяць павышэнне тэмпературы




Гадавы ход тэмпературы ў раёне




Ападкі ў раёне



Феналагічныя поры года ў наваколлі Паставаў

паветра, павелічэнне адноснай вільготнасці і выпадзенне ападкаў. Летам яны паніжаюць тэмпературу. Сярэдняя хуткасць ветру 3–4 м/с, зрэдку, асабліва зімой, бываюць моцныя вятры да 10–15 м/с.

Сяраднегадавая тэмпература ў раёне +5,5°С, прычым самы цёплы месяц ліпень (+17,2°), а самы халодны — студзень (-7,3°). Колькасць дзён з тэмпературай ніжэй 0° складае 131 дзень, а з тэмпературай вышэй 0°С — 234 дні.

Па колькасці ападкаў Пастаўшчына разам з Навагрудчынай — самае вільготнае месца Беларусі. У сярэднім за год іх выпадае каля 650–700 мм. А ўсяго за год налічваецца да 190 дзён з ападкамі.

Снежнае покрыва стала з'яўляецца на палях раёна звычайна ў пачатку снежня і ляжыць каля 100–110 дзён. Таўшчыня снегу дасягае 25–30 см.

**Пытанні і заданні:**

1. На якой глыбіні залягае падмурак?
2. Ці могуць быць на Пастаўшчыне землетрасенні?
3. Якімі няруднымі карыснымі выкапнямі багатая Пастаўшчына?
4. Што такое сапрапель і дзе яго можна здабываць і выкарыстоўваць?
5. Знайдзіце на карце буйнейшыя радовішчы торфу.
6. Чым адрозніваецца рэльеф Дзісненскай нізіны ад рэльефу Свянцянскіх град?
7. Знайдзіце на карце самае высокае і самае нізкае месца Пастаўшчыны.
8. Якімі паказчыкамі характарызуецца клімат нашага краю?
9. Якія прычыны аказваюць галоўны ўплыў на клімат Пастаўскага раёна?
10. Чаму на Пастаўшчыне выпадае больш ападкаў, чым у іншых раёнах Беларусі?

# § 4. Край блакітных рэк і азёр

**1. Рэкі.** Пастаўшчына багатая рэкамі і азёрамі. У раёне 24 рэчкі і каля 300 ручаёў і рачулак. Рэкі Пастаўскага раёна нясуць ваду ў Балтыйскае мора. Самыя вялікія рэкі басейна Заходняй Дзвіны —

гэта Дзісна, Мядзелка, Палавіца, Галбяіца, Камайка, з басейна Віліі — Пелякa, Страча.

Жыўленне рэчак і ручаёў адбываецца за кошт ападкаў, таяння снягоў і лёду, падземных крыніц. Найбольшы ўзровень вады на рэках назіраецца вясной, звычайна ў красавіку ў час паводкі. Межань бывае зімой, калі рэкі закрытыя лёдам, і летам у перыяды засух.

Трывалы лёд усталёўваецца на рэках звычайна ў пачатку студзеня. Ён ляжыць 90–130 дзён, дасягаючы найбольшай таўшчыні 25–60 см у другой палове лютага — пачатку сакавіка.



Возера Пастаўскае (стаў) на р. Мядзелка



Поплаў каля р. Ласіца




Насельнікі вадаёма: 1 — камар; 2 — андатра; 3 — страказа; 4 — чапля; 5 — вадамерка; 6 — жук-плывунец; 7 — жаба; 8 — павук; 9 — зімародак; 10 — акунь; 11 — чарапаха; 12 — шчупак; 13 — вуж; 14 — п’яўка; 15 — рак; 16 — карась; 17 — шыцік

Самая паўнаводная рака раёна — Дзісна, левы прыток Заходняй Дзвіны, пачынаецца ў Літве і працякае па паўночнай мяжы з суседнімі Браслаўскім і Шаркоўшчынскім раёнамі. На наш раён прыпадае толькі сярэдняе

цячэнне ракі ад в.Каз'яны да в. Рымкі. Даўжыня яе на гэтым адрэзку 29 км (агульная — 178 км).

Найбольшую даўжыню ў межах раёна мае рака Галбяіца, якая ў верхнім цячэнні называецца Заражанка. Яна працягнулася на 51 км з поўдня на поўнач ад в. Гараноўшчына да в. Рымкі. У вярхоўях рэчка мае звілістае рэчышча, прымае шмат прытокаў.

Другое месца па даўжыні мае Мядзелка, правы прыток Бірветы. Працягнулася яна з поўдня на поўнач ад Ідаліны да Ракітаў. Вельмі моцна меандрыруе, чым адрозніваецца ад іншых рэчак. У Паставах і Манькавічах ёсць запруды з млынамі, вышэй якіх знаходзяцца значныя па памерах вадасховішчы.

**2. Азёры.** На Пастаўшчыне шмат азёр. Вадаёмаў натуральнага паходжання з папярэчнікам люстэрка больш за 100 м налічваецца 141.

Размяшчэнне азёр звязана з ледавіковым паходжаннем іх катлавін. Яны раскіданы па тэрыторыі раёна пераважна групамі па 3–12 вадаёмаў. Выдзяляецца 13 такіх груп: Швакштаўская, Камайская, Спорская, Даўжанская, Мажэйкаўская, Азёркі, Валожынская, Лучайская, Дунілавіцкая, Казлоўшчынская, Варапаеўская, Галбейская, Ваўкоўская.

Самае глыбокае возера Пастаўскага раёна Каптарунскае, якое знаходзіцца на паўночным захадзе ад Лынтупаў каля мяжы з Літвой. Яно мае глыбіню 33 м і займае адзінаццатае месца сярод самых глыбокіх азёр Беларусі. Другое па глыбіні — возера Чорнае, што на Варапаеўшчыне — 31,5 м.

Самае вялікае па плошчы возера — Вялікія Швакшты. Яго люстра мае памер 9,56 км$^2$, што намнога перавышае плошчу іншых вялікіх азёр. Напрыклад, у Лучая — 2,51 км$^2$, у М. Швакштаў — 1,91 км$^2$, у Доўжа — 1,04 км$^2$, у азёр Лодасі і В. Сурвілішкі — 1,03 км$^2$.

З прычыны таго, што ледавік у свой час утварыў шмат выцягнутых катлавін, мы сёння маем значную



Возера Svіта з гарой Гарадзішча



Азярцо каля Варапаева



Возера Ласіца



Раніца на возеры

колькасць доўгіх і вузкіх азёр. Чэмпіёнам у гэтых адносінах з'яўляецца воз. Доўжа, якое пры найбольшай шырыні у 420 м мае даўжыню 4,89 км (суадносіны 1:11,6). Моцна выцягнутае і воз. В. Сурвілішкі з памерамі 2,36×0,53 км (суадносіны 1:4,5).

На некаторых азёрах Пастаўшчыны асаблівую пекнату іх знешняму віду надаюць астравы. Па іх колькасці не мае сабе роўных воз. Лучай, на якім іх аж шэсць. Тры астравы ёсць на воз. Світа, па адным — на Задзеўскім, Ласіцы, Лодасях, Саранчанах, Спорах, М. Швакштах, Чартах.

Амаль усе азёры каля берагоў маюць некалькі палос расліннасці. Найбольш яўна прасочваюцца палосы надводных (тросць, сіта, чарот), з плаваючымі лістамі (кубышкі, лілеі) і падводных (рдэсты, эладэі, рагаліснікі, цэларэзы) раслін.

У азёрах раёна распаўсюджана больш як 20 відаў рыб. Найбольш часта сустракаюцца плотка, акунь, лешч, лін, карась, гусцёрка, шчупак і інш.

Ёсць і рэдкія. Так у р. Страча сустракаецца стронга, у некаторых азёрах (Белае, Доўжа, Глодава) — вугор.

**3. Вадасховішчы.** У Пастаўскім раёне налічваецца больш за дзесяць значных па памерах сажалак і вадасховішчаў. Частка з іх утворана шляхам запруджвання ракі плацінай, як, напрыклад, каля Томішак на Лынтупцы, пастаўскія азёры на Мядзелцы, каля Манькавіч на Мядзелцы, каля Алешына на Заражанцы і іншыя. Частка з'яўляецца штучна капанымі, як сажалкі ў Навінках, Норыцы, Цешылаве, Палессі.

Прызначэнне сажалак і вадасховішчаў рознае. Некаторыя з іх выкарыстоўваюцца для развядзення рыбы (Навінкі, Стары Двор, Навасёлкі, Норыца, Лынтупы), для водазабеспячэння (Паставы, Лынтупы), для размяшчэння млыноў (Варапаева, Паставы, Манькавічы), для адпачынку. Некаторыя сажалкавыя сістэмы выконвалі ролю элементаў сядзібна-паркавых ансамбляў (Варапаева, Норыца, Лынтупы, Паставы, Нохаўшчына).

Да буйнейшых вадасховішчаў адносяцца Навінкі, Старадворскае, Пастаўскае.



Вадасховішча на р. Заражанка каля Варапаева перад плацінай



Стаў у Лынтупах

**4. Балоты і крыніцы.** Балоты — гэта залішне ўвільготненыя ўчасткі сушы, зарослыя балотнай раслiннасцю. На Пастаўшчыне іх плошча складае каля 11 тысяч гектараў. Абсалютна пераважаюць сярод іх нізінныя, якія займаюць вялікія тэрыторыі ў паўночнай частцы раёна на моцна забалочанай Дзісненскай нізіне, а таксама



Балоты



Святая крыніца ў Вярхоўі

на паўднёвым захадзе — частцы Нарачанска-Вілейскай нізіны. Для гэтых балот уласцівы багаты раслінны і жывёльны свет. Асноўнымі прадстаўнікамі вільгацелюбівай флоры з'яўляюцца: хвошч, папараць, тросць, сіта, асака, вольха, крушына, бяроза, елка, лаза і іншыя.

Вярховыя балоты звычайна маюць невялікія памеры і знаходзяцца на ўзвышшах і раўнінах Свянцянскіхград. Расліннасць на іх намнога бяднейшая — пераважаюць сфагнавыя імхі, пушыцы, расянкі, верасы, багуны, журавіны, карлікавыя формы соснаў.

Найбольшую плошчу займаюць балоты «Пурвіны» каля Швакштаў, «Халосеньскае» каля Сяргеевічаў, «Сакалінскае» каля Груздава, «Светлы Мох» каля Валожына, «Лугі» каля Дунілавічаў.

На Пастаўшчыне шмат крыніц — месцаў выхаду на паверхню падземных вод. Сустракаюцца яны пераважна ў паўднёвай частцы раёна на Свянцянскіх градах, дзе рэкі і ручаі перапілоўваюць горныя пароды, ускрываючы ваданосныя пласты і жылы. Таму найчасцей крыніцы прабіваюцца на паверхню па далінах рэк, у лагчынах, у забалочаных нізінах. Навукоўцамі зафіксавана і апісана ў нашай мясцовасці больш за 30 крыніц.

**Пытанні і заданні:**

1. Чаму на Пастаўшчыне існуе густая рачная сетка?

2. Чым можна растлумачыць тое, што большасць рэк нашага краю цячэ ў напрамку на поўнач і паўночны ўсход?
3. Якая рака на Пастаўшчыне самая мнагаводная, а якая самая доўгая?
4. Якое жыўленне і рэжым маюць рэкі нашага краю?
5. Якія азёры па якіх паказчыках выдзяляюцца сярод іншых?
6. Знайдзі на карце буйнейшыя рэкі, азёры, вадасховішчы, балоты.

## § 5. Раслінны і жывёльны свет. Ахова прыроды

**1. Расліннасць.** Асноўнымі тыпамі натуральнай расліннасці раёна з'яўляюцца лясная, лугавая і балотная.

*Расліннасць лясоў*. У раёне налічваецца больш як 1000 відаў вышэйшых раслін. Большая іх частка знаходзіцца ў лясах. На канец 2004 года лясістасць тэрыторыі наблізілася да 40%, што па еўрапейскіх мерках вельмі добры паказчык. Рост лесапакрытасці адбываецца за кошт пераводу былых ворыўных зямель з нізкай якасцю глебаў пад лесапасадкі. Сярэдні ўзрост дрэў — каля 50 гадоў. Сярод парод пераважаюць сосны, елкі, дубы, ясені, бярозы, асіны, вольхі. Рэдка сустракаюцца ліпы, ясені, клёны. На захадзе, на мяжы з Літвой, ёсць невялікія ўчасткі вяза голага і шурпатага, якія ахоўваюцца ў батанічным заказніку «Лынтупскі».

Большая частка лясоў — гэта вялікія масівы дрэў: Гадуцінская Дача, Варапаеўская Дача, Груздаўская Дача, Пастаўская Дача, Манькаўская Дача, лес Дунілавічы, лес Лынтупы, лес Камаі, лес Мядзель (каля в.Вярэнькі), лес Мар'янполле (каля Полава), лес Навінкі (каля рыбгаса).


Бярозавы гай

*Расліннасць лугоў*. У раёне сустракаюцца розныя тыпы лугоў.



❶ ❷ ❸

👁 Дрэвы лясоў Беларусі: 1 — бяроза; 2 — елка; 3 — дуб

Сухадольныя размешчаны на павышаных элементах рэльефу і часцей сустракаюцца на поўдні Пастаўшчыны на Свянцянскіх градах. На ўзгорках, градах, стромкіх схілах травастоі нізкарослыя і зрэджаныя, пераважаюць булаваносец сіваваты, аўсяніца авечая, мятліца тонкая, галадок шматгадовы, ястрабок валасісты, гладун гладкі, шчаўе малое, расходнік едкі і іншыя.

Нізінныя лугі шырока распаўсюджаны ў паўночнай частцы на Дзісненскай нізіне. Травастоі злакавыя (вострыца дзірваністая, мятліца сабачая і белая, метлюжкі балотны і звычайны, пажарніца шараватая), асаковыя са значнай прымессю вільгацелюбівага разнатраўя.



👁 Лясныя масівы



❶ ❷ ❸

👁 Лясныя ягады: 1 — чарніцы; 2 — суніцы; 3 — брусніцы

Поймавыя (заліўныя) лугі сустракаюцца на Пастаўшчыне па далінах большых рэк: Дзісны, Мядзелкі, Галбяіцы, Лынтупкі, Лучайкі, Камайкі і іншых. У месцах сярэдняга ўвільгатнення пераважаюць злакі, у найбольш вільготных — злакі і асокі.

*Расліннасць балот.* У Пастаўскім раёне ёсць розныя тыпы балот. Вярховыя балоты сустракаюцца пераважна ў паўднёвай узвышанай частцы. Яны звычайна аблесены маларослай хвояй, укрыты суцэльным дыванам



Лісічкі ў брусьнічніку

сфагнавых імхоў, у ярусе кустоўя сустракаюцца багун, касандра, верас, буякі, андрамеда, журавіны; у травяністым — багноўка, падвей похвенны, расянка круглалістая, чаротнік, імхі і лішайнікі.

Нізінныя балоты пераважаюць у паўночнай частцы Пастаўшчыны, хоць сустракаюцца і ў паніжэннях Свянцянскіх град. З дрэў растуць хвоя, бяроза, вольха; з кустоў — розныя віды вербаў, нізкая бяроза; з травяністых раслін — вятроўнік, бабок, шабельнік, хвошч, папараць, скрыпень, пажарніца, трыснёг, мятліца (белая), мурожніца чырвоная, метлюжок лугавы, асака, імхі.

**2. Жывёльны свет.** У сучаснай фауне раёна налічваецца каля 400 відаў пазваночных і некалькі дзесяткаў тысяч беспазваночных жывёл. Сустракаюцца прадстаўнікі ўсіх класаў, што зафіксаваны і ў Беларусі — млекакормячыя, птушкі, земнаводныя, паўзуны, рыбы, насякомыя, прасцейшыя, чэрві, малюскі, рака- і павукападобныя.

Сучасная фауна млекакормячых прадстаўлена 6 атрадамі: насякомаедныя (10 відаў), лятучыя мышы (15 відаў), драпежнікі (16 відаў), парнакапытныя (6 відаў), зайцападобныя (2 віды), грызуны (24 віды). Сярод іх і 4 акліматызаваныя: янотападобны сабака, янот-паласкун, амерыканская норка, андатра.

Паўзуноў налічваецца 7 відаў, сярод якіх па 3 віды яшчарак і




Жывёльны свет лясоў Беларусі: 1 — вавёрка; 2 — барсук; 3 — дзік; 4 — лось; 5 — гадзюка; 6 — лісіца

змеяў. Земнаводныя прадстаўлены 2 відамі трытонаў і 10 відамі бясхвостых (жабы, рапухі і да таго падобнае).

З птушак на нашай тэрыторыі сустракаюцца прадстаўнікі 302 відаў, з якіх каля 200 тут і гняздзяцца.



Птушкі лясоў Беларусі: 1 — івалга; 2 — цецярук; 3 — салавей; 4 — бусел; 5 — сава; 6 — каршун

Некаторыя віды жывёл і птушак адносяцца да паляўніча-прамысловых. Па ліцэнзіях вядзецца паляванне на лася, дзіка, казулю, аленя, бабра і выдру. Паляўнічым дазваляецца таксама здабываць у вызначаныя тэрміны вавёрак, зайцаў, ліс, норак, тхароў, куніц, гарнастаяў.

**3. Забруджванне навакольнага асяроддзя.** Пастаўшчына вызначаецца як раён з даволі напружанай экалагічнай сітуацыяй. Тлумачыцца гэта параўнальна высокім сярод сельскіх раёнаў асваеннем тэрыторыі, наяўнасцю экалагічна шкодных вытворчасцяў (спіртзаводы, малаказавод, мэблевыя прадпрыемствы), густой транспартнай сеткай (аўтадарогі, чыгунка), высокай ступенню сельскагаспадарчага ўздзеяння, а да нядаўняга часу і значнай колькасцю вайсковых злучэнняў (авіяцыя, сухапутныя войскі, ракетныя (у тым ліку з ядзернай зброяй), пагранічныя.

З прадпрыемстваў найбольш шкоднымі для наваколля з'яўляюцца Пастаўскі малаказавод і Лынтупскі спіртзавод. Абодва маюць ачыстныя збудаванні,



Птушкі вадаёмаў. Дыярама Пастаўскага краязнаўчага музея



Лебедзь

але забруджанасць сцёкаў застаецца высокая. Тым больш што сажалкі-адстойнікі малаказавода размешчаны няправільна: яны знаходзяцца вышэй г. Паставы, і слабаачышчаныя сцёкі заносяцца з рачной вадой у межы горада ў воз. Пастаўскае, дзе і назапашваюцца. Паступленне ў возера біялагічных рэчываў прывяло да моцнага разрастання воднай расліннасці і водарасцяў, парушэння кіслароднага рэжыму, з'яўлення вясной і восенню моцнага паху гніення.

Слабаачышчаныя воды Лынтупскага спіртзавода моцна шкодзяць р. Лынтупка, утвараючы на дне рэчкі налёт блакітна-шэрага колеру.

Значна забруджвае навакольнае асяроддзе сельская гаспадарка, у асноўным з прычыны няправільнага ўнясення мінеральных і арганічных угнаенняў, пестыцыдаў (ядахімікатаў).

Асноўнымі забруджвальнікамі паветра з'яўляюцца заводы ў Паставах, Варапаеве, Лынтупах, у вёсках — фермы, кацельні, а таксама — аўтамабілі і іншая тэхніка.

На тэрыторыі раёна можна вызначыць некалькі мясцін, дзе шкоднае ўздзеянне на прыроду найбольшае. Гэта Паставы, Лынтупы, Варапаева, Камаі, Нарыца.

**4. Ахова прыроды.** За апошняе дзесяцігоддзе экалагічны стан раёна значна палепшыўся. Зменшылася колькасць крыніц забруджвання, паменшыліся аб'ёмы шкодных выкідаў. Яскравы доказ гэтага — павышэнне лясістасці тэрыторыі. Калі ў пачатку 90-х гадоў XX стагоддзя яна была трохі больш за 30%, то ў 2006 годзе дасягнула амаль 40%.

На тэрыторыі раёна знаходзяцца месцы, дзе сустракаюцца віды жывёл, якія занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі. З млекакормячых гэта барсук, вячэрніца гіганцкая, лясны кот, вавёрка-палятуха, хахуля, начніцы вялікая і Натэрэра. Да групы ахоўваемых жывёл

адносяцца некаторыя каштоўныя прамысловыя віды, здабыча якіх абмежавана (высакародны алень, бабёр, глушэц, янот-паласкун і іншыя). Таксама ахоўваецца каля 45 відаў птушак (арлан-белахвост, аўдотка, беркут, бусел чорны, гогаль, журавель шэры, зімародак, кулік-сарока, белая курапатка, скапа і іншыя), 1 від паўзуноў (мядзянка), 1 від амфібій (жаба чаротавая), 5 відаў рыб (вусач, сцерлядзь, сырок, стронга, харыус), 9 відаў насякомых, 1 від ракападобных (шыракапалы рак).



Расліны, занесеныя ў Чырвоную кнігу Беларусі: 1 — купальнік горны; 2 — неатыянта клабучковая; 3 — ятрышнік мужчынскі; 4 — касач сібірскі; 5 — пярэсна еўрапейская; 6 — сон лугавы (сон-трава); 7 — гарлачык белы

На Пастаўшчыне знаходзіцца частка нацыянальнага парку «Нарачанскі», гідралагічны заказнік рэспубліканскага значэння «Швакшты». Помнікамі прыроды рэспубліканскага значэння з'яўляюцца горы Маяк, Баяраўшчына, Лысая; вялікія камяні Заўлечанскі, Лодаскі, Мягунскі, Дзіравы камень Каптарунскі,Чортаўкамень Саболкаўскі. Цікавыя прыродныя аб'екты — заказнікі мясцовага значэння:



Заказнікі на Пастаўшчыне

ландшафтныя — Карагач, Палескія Узгоркі, Сяргеевіцкія Узгоркі, Саранчанскія грады, Спорыцкая ледавіковая лагчына; батанічны — Лынтупскі; ахоўныя тарфянікі — Равы, Гіненкі і Каліты. Помнікамі прыроды мясцовага значэння абвешчаны: горы — Балдоўшчына, Гара Вялікая, Гараватка; Жуперская града; узгоркі — Барадзінскі і Чарнецкі; вялікія камяні — Зыбалішскі, Камайскі, Трапшавіцкі, Чашкаўшчынскі; камень Казнадзеюшскі.

**Пытанні і заданні:**

1. У выніку якіх глебаўтваральных працэсаў сфармаваліся на Пастаўшчыне галоўныя тыпы глебаў?
2. Як размяркоўваюцца глебы паводле механічнага складу?
3. Якую лясістаць мае Пастаўскі раён?
4. Які тып балот пераважае на Пастаўшчыне?
5. На якіх жывёл дазволена паляванне?
6. Назавіце жывёл і птушак, якія сустракаюцца каля вадаёмаў, у лясах, на лугах, у населеных пунктах.

# § 6. Насельніцтва Пастаўшчыны

**1. Дынаміка насельніцтва.** На тэрыторыі Пастаўскага раёна людзі змаглі пасяліцца толькі пасля таго, як з паўночнай Беларусі сышоў ледавік і ўтварыліся спрыяльныя ўмовы для развіцця раслін і жывёл. Першажыхары прыйшлі з поўдня. Яны вялі качавы лад жыцця, займаліся паляваннем, рыбнай лоўляй, збіральніцтвам, таму іх колькасць была невялікая. З пераходам людзей да заняткаў земляробствам і жывёлагадоўляй утварыліся паселішчы са сталым жыхарствам. Паступова колькасць насельніц-




Дынаміка колькасці жыхароў у Пастаўскім раёне ў XX – пач. XXI ст.


МЕТРИЧЕСКАЯ КНИГА

Данная изъ

для записки родившихся, бракомъ сочетавшихся и умершихъ на 1861 годъ.

ЧАСТЬ ПЕРВАЯ, О РОДИВШИХСЯ.

Вокладка метрычнай кнігі Груздаўскай царквы. 1861 г.

тва павялічвалася. У пачатку нашай эры на тэрыторыі раёна пражывала каля 1000 чалавек.

На працягу амаль усёй гісторыі колькасць насельніцтва расла вельмі марудна. На гэта ўплывалі шматлікія войны, голад, эпідэміі хвароб. Паводле разлікаў колькасць жыхароў нашага краю ў першай палове XVII стагоддзя наблізілася да 23 тысяч чалавек. Аднак войны Рэчы Паспалітай з Расіяй прывялі да таго, што на тэрыторыі раёна засталося не больш як 10 тысяч насельнікаў.

Толькі ў пачатку XX стагоддзя перад Першай сусветнай вайной і ў сярэдзіне XX стагоддзя перад Другой сусветнай вайной колькасць жыхароў наблізілася да 100 000 чалавек. Войны прынеслі вельмі вялікія страты. У час Другой сусветнай загінуў кожны трэці жыхар Віцебшчыны.

У пасляваенны час колькасць насельніцтва трохі павялічылася, але ў апошнія дзесяцігоддзі назіраецца яе скарачэнне. У 2002 годзе пражывала 46 тыс. чалавек, а на пачатак 2007 года налічвалася 44 100 жыхароў.

**2. Размяшчэнне насельніцтва.** Насельніцтва на тэрыторыі Пастаўскага раёна размяшчаецца нераўнамерна. На гэта паўплывалі як прыродныя ўмовы, так і гісторыя засялення. На сённяшні дзень можна вызначыць некалькі характэрных асаблівасцяў размяшчэння насельніцтва на Пастаўшчыне. Па-першае, выдзяляецца паласа павышанай шчыльнасці, якая працягнулася з захаду на ўсход праз сярэднюю частку. Працягласць паласы каля 80 км, шырыня яе вагаецца ад 8 да 15 км. Тут размешчаны ўсе гарадскія паселішчы (Паставы, Лынтупы, Варапаева) і амаль усе буйныя вёскі. Шчыльнасць насельніцтва перавышае сярэднераённы паказчык, у асобных мясцовасцях дасягаючы сярэднебеларускіх значэнняў (каля 50 чал/км$^2$). Паласа павышанай шчыльнасці геаграфічна супадае

са Свянцянскімі градамі, дзе ў паніжэннях паміж узгоркамі даволі ўрадлівыя землі і, што асабліва важна для нашай мясцовасці, яны пазбаўлены празмернага ўвільгатнення.

Па-другое, у паўночнай частцы раёна, на Падзісеншчыне, можна выдзеліць тыпова далінны тып рассялення. Сапраўды, абсалютная большасць вёсак месціцца ўздоўж рэк Дзісна, Мядзелка, Лучайка, Палавіца, Галбяіца. На абсягах паміж рачнымі далінамі вёсак вельмі мала, насельніцтва рэдкае. На характар рассялення ў паўночнай частцы раёна ўплывае вялікая забалочанасць і лясістасць тэрыторыі.

Па-трэцяе, у паўднёвай частцы Пастаўшчыны, дзе знаходзяцца вярхоўі Страчы, Лучайкі, Смычыцы, Заражанкі, азёры Швакшты Вялікія і Малыя, Лучайскае, Лісіцкае, мясцовасць таксама моцна забалочана, пакрыта лесам і таму слаба заселена. Аднак асобныя, значныя па памерах, узвышшы заселены даволі шчыльна. Гэта ваколіцы вёсак Вярэнькі, Груздава, Сяргеевічы.

**Цікавы факт:** Усе большыя паселішчы нашага краю выраслі каля рэк і азёр, а самыя вялікія — у месцах, дзе азёрныя групы размяшчаюцца каля рэк (Паставы, Дунілавічы, Варапаева, Гута).

**3. Этнічны склад.** На Пастаўшчыне да сярэдзіны I тысячагоддзя нашай эры пражывала змешанае фіна-угорскае і балцкае насельніцтва. У VI–VIII стагоддзях н. э. на тэрыторыю пачалося пранікненне славян-крывічоў. Яны рассяляліся на водападзелах і па далінах рэк, паступова асімілюючы мясцовае насельніцтва. У выніку складаных этнічных працэсаў утварыўся карэнны народ нашага краю — беларусы.

У XIV–XV стагоддзях на Пастаўшчыне пачалі рассяляцца яўрэі, якія на беларускіх землях знаходзілі паратунак ад уціску і гвалту, што чыніліся супраць прадстаўнікоў гэтага народа ў Заходняй Еўропе. У гэты ж час з'явіліся тут і татары, якія былі запрошаны Вялікім князем Вітаўтам




Этнічны склад насельніцтва Пастаўскага раёна

для службы ў войску. З цягам часу татары амаль асіміляваліся, а колькасць яўрэяў моцна зменшылася ў выніку карнай палітыкі фашыстаў у час Другой сусветнай вайны.

У пачатку XXI стагоддзя абсалютную большасць насельніцтва складаюць карэнныя жыхары — беларусы (82%). Другую значную этнічную групу утвараюць рускія (13%). Доля прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей (палякі, украінцы, літоўцы, цыганы) нязначная.

**4. Рэлігійны склад.** Да пачатку II тысячагоддзя нашай эры мясцовае насельніцтва верыла ў звышнатуральныя сілы духаў зямлі, пакланялася дрэвам ды камяням, прыносіла ахвяры на агні і на вадзе. Паганскія вераванні існавалі доўгі час побач з хрысціянствам і іншымі канфесіямі. Але ўсё ж галоўныя пазіцыі ў рэлігійным жыцці раёна належаць хрысціянству, якое прадстаўлена каталіцызмам, праваслаўем і пратэстантызмам.



Царква ў в. Ласіца

У пачатку нашага стагоддзя паміж праваслаўем і каталіцызмам на Пастаўшчыне існаваў парытэт: абедзве галіны хрысціянства мелі па 7 таварыстваў. Праваслаўныя рэлігійныя суполкі дзейнічалі ў Паставах, Варапаеве, Ваўках, Манькавічах, Груздаве, Асінагарадку, Ласіцы; каталіцкія — у Паставах, Варапаеве, Лынтупах, Дунілавічах, Лучаі, Груздаве, Камаях.



Касцёл у Груздаве (зараз не існуе)

Пры захаванні трывалых пазіцый дзвюх традыцыйных галін хрысціянства, разам з тым паступова пашыраецца ўплыў пратэстантызму, які ў нашай мясцовасці праяўляецца ў павелічэнні колькасці прыхільнікаў царквы хрысціян веры евангельскай. Маючы падтрымку аднаверцаў, пераважна з краін Скандынавіі, прадстаўнікам гэтай галіны хрысціянства ўжо ўдалося стварыць свае таварыствы ў Паставах, Камаях, Варапаеве.



Апідамская стараверская царква



Казурава капліца ў Пухаўцы

Хрысціянства прадстаўлена на Пастаўшчыне і яшчэ адной плынню — стараабрадчай, або стараверскай царквой. Гэта адгалінаванне праваслаўя ўзнікла пасля расколу ў рускай праваслаўнай царкве ў другой палове XVII стагоддзя. Ратуючыся ад праследу, старавеpы ўцякалі з цэнтральнай часткі Расіі цэлымі вёскамі. Асноўны арэал іх кампактнага пражывання — гэта паўночная Лынтупшчына. Менавіта там і знаходзяцца два стараверскія храмы ў Апідамах і Куклянах.

Напачатку XXI стагоддзя нехрысціянскіх рэлігійных таварыстваў не зарэгістравана, аднак ёсць асобныя невялікія групы насельніцтва, якія з'яўляюцца прадстаўнікамі іншых рэлігій. Найбольшымі адметнасцямі сярод іх выдзяляюцца татарымусульмане і яўрэі-іудаісты.

**Цікавыя факты:** 1. Візантыйскі пісьменнік Пракопій Кесарыйскі (VI ст. н. э.) пісаў пра вераванні славян: *«...лічаць, што адзін толькі бог, тварэц*

*маланкі, з'яўляецца ўладыкай над усімі, і яму прыносяць у ахвяру быкоў і спраўляюць другія свяшчэнныя абрады...Яны шануюць рэкі і німф і ўсялякія іншыя божаствы, прыносячы ахвяры ўсім ім і пры дапамозе гэтых ахвяр робяць і гаданне...»*

2. Прыкладам захавання паганскіх вераванняў з'яўляецца Святы (Дзіравы) камень каля вёскі Каптаруны на Лынтупшчыне, да якога да нядаўняга часу насілі ахвяраванні некаторыя мясцовыя жыхары.

**5. Рассяленне жыхароў.** Асноўнае жыхарства Пастаўшчыны пражывае ў населеных пунктах: горадзе Паставы, аграгарадках Лынтупы, Варапаева, Камаі, Дунілавічы, вёсках (516 у 2001 годзе), хутарах.

Першыя селішчы і гарадзішчы ўзніклі на нашай зямлі яшчэ ў мезаліце — неаліце. З цягам часу колькасць іх павялічвалася, і ў пачатку II тысячагоддзя нашай эры ўжо існавала даволі густая сетка паселішчаў. Археалагічныя даныя сведчаць пра тое, што ў розныя часы гарадзішчы або селішчы месціліся ў Паставах (на беразе возера Задзеўскае і каля Мядзелкі на Гарадзішчы), у Задзеўі, каля Данеўцаў, Саранчанаў, Навадруцка, Сіманаў, Яцэвічаў, Асінагарадка, Сарокаў, Палесся, Кураполля, Лапінцаў, Каралінова, Ёдаўцаў і шэрагу іншых сучасных вёсак і пасёлкаў.

Да старэйшых паселішчаў Пастаўшчыны належаць Лынтупы (згадваюцца ў крыніцах пад 1385 годам), Дунілавічы (1473), Камаі (1513), Лучай (1542), Асінагарадок (1567), Манькавічы (XVI ст.).

Паселішчы ў залежнасці ад сацыяльнага статуса, колькасці жыхароў, функцыянальнага значэння падзяляліся на розныя групы. У часы Расійскай імперыі на Пастаўшчыне існавалі мястэчкі, фальваркі, засценкі, хутары, маёнткі, выселкі. Асваенне новых земляў вяло да заснавання хутароў і вёсак.

У 1939 годзе ў Пастаўскім павеце было 387 населеных пунктаў: 3 мястэчкі, 170 вёсак, 14 маёнткаў, 28 фальваркаў, 72 хутары, 100 засценкаў.

У пасляваенны час колькасць населеных пунктаў пачала змяншацца. Прычыны былі розныя. Некаторыя невялічкія вёсачкі і хутары былі паглынуты большымі паселішчамі (напрыклад, Бжэстовіца — Паставамі, Гароднікі — Мольдзевічамі, Свішчаполле — Лынтупамі, Дабраволле і Мечыслававa — Цешылавым. Частка вёсак злілася ў буйнейшыя. Асабліва гэта датычыцца

выселкаў, якія мелі лічбавыя азначэнні (Першыя, Другія) або характарыстыкі велічыні (Вялікія, Малыя). Так, з Крывога-1 і Крывога-2 утварылася вёска Крывое. Гэткім жа чынам утварыліся Лапінцы, Васіліны, Пушча, Няверышкі. Шляхам аб'яднання Вялікіх і Малых з'явіліся на картах Паташня, Цырклішкі, Волься. Старое Заўлічча злілося з Новым, а Дзядзенкі Дольныя з Дзядзенкамі Горнымі. Два населеныя пункты зніклі ў выніку пажараў: вёска Скакуны і хутар Новы Дзял. Яшчэ два перасталі існаваць з прычыны пераезду жыхароў у іншыя краіны: Венюкішкі — у Польшчу, Чэпішкі — у Літву. Найбольшая ж колькасць вёсак знікла ў выніку ссялення і перасялення ў больш перспектыўныя. Такіх налічваецца 121. Дзве вёскі на Пастаўшчыне былі перайменаваны ў 1966 годзе: Паздзюткі — у Радугу, Цуцкі — у Васточную.

Усяго ж на нашай зямлі за пасляваенны час знікла 214 населеных пунктаў; частка вёсак і хутароў не аднавілася пасля Другой сусветнай вайны. Працэс змяншэння колькасці населеных пунктаў назіраецца і ў апошнія дзесяцігоддзі. Так, у 1970 годзе іх было 665, у 1979 — 591, а ў 1999 — 521. У 2001 годзе на Пастаўшчыне налічвалася 517 населеных пунктаў, сярод якіх у трох пражывала гарадское насельніцтва: горад Паставы, гарадскія пасёлкі Лынтупы і Варапаева.

Доля гараджан у агульнай колькасці насельніцтва пастаянна павышаецца. Калі ў 1970 годзе яна складала толькі 33,6%, то ў 1989 ужо амаль палову насельніцтва раёна. На пачатку 2002 года ў нашым краі пражывала 46 372 жыхары, з якіх 26 110 — гарадскія жыхары, 20 262 — сельскія. Узровень урбанізацыі склаў 56,3%.

**6. Мовы на Пастаўшчыне.** Моўная сітуацыя ў нашым краі на працягу стагоддзяў вызначалася складанасцю, бо доўгія часы існавала неадпаведнасць паміж мовай побытавай і мовай афіцыйнай, мовай карэнных жыхароў і мовай меншасцяў.

Мова карэнных жыхароў раёна — беларусаў — сфармавалася ў часы Вялікага Княства Літоўскага. У XIV стагоддзі яна стала дзяржаўнай і літаратурнай. Гаворкі насельнікаў Пастаўскага краю паслужылі адной з крыніц фармавання старабеларускай мовы. У той час гутарковая мова супадала з афіцыйнай дзяржаўнай. Як вядома, старажытнабеларуская мова ўжывалася тады не толькі ў афіцыйных дакументах унутры краіны, але і выконвала



👁 Узор старабеларускага пісьма (Са Статута ВКЛ 1588 г.)

функцыю міжнародных зносін. Пераважная большасць дароўных лістоў, прывілеяў, грамат, купчых, абавязацельстваў XVI стагоддзя, якія тычацца Пастаўшчыны, пісалася на старабеларускай мове.

Аднак, пачынаючы з другой паловы XVI стагоддзя, назіраецца працэс раздзялення народнай побытавай мовы і афіцыйнай дзяржаўнай. Пасля Люблінскай уніі (1569), калі адбылося аб'яднанне Вялікага Княства з Каралеўствам Польскім, вышэйшыя саслоўі пачалі паступова пераходзіць на польскую мову, якая стала, па сутнасці, дзяржаўнай. У XVII стагоддзі дакументы, якія датычацца гісторыі нашага краю, ужо спрэс польскамоўныя.

Пасля ўключэння Пастаўшчыны ў склад Расійскай імперыі, асабліва пасля паўстанняў 1830–31 і 1863 гадоў царскі ўрад пачаў праводзіць жорсткую русіфікатарскую палітыку. Афіцыйнай мовай паступова станавілася руская, а беларуская заставалася мовай простага люду.

У часе кайзераўскай акупацыі (1915–1917) на заходняй частцы Пастаўшчыны (Лынтупшчына, Камайшчына) у якасці афіцыйнай ужываліся нямецкая і польская мовы.

Пасля ўваходжання Пастаўшчыны ў 1921 годзе ў склад Польшчы на нашых землях праводзілася актыўная палітыка паланізацыі мясцовага насельніцтва. Польская мова стала мовай справаводства, асветы, рэлігіі і, часткова, побыту. Беларускія школы забараняліся, прыём з беларускамоўных школ у вышэйшыя навучальныя ўстановы абмяжоўваўся, не дазвалялася карыстацца роднай мовай у дзяржаўных установах. Частку вучняў на канікулах за дзяржаўны кошт вывозілі на экскурсію ў этнічную Польшчу, каб школьнікі напоўніліся польскім духам. Такая палітыка дала чаканы вынік: да 1939 года на ўсёй Заходняй Беларусі фактычна не засталося беларускіх школ.



Старыя стараверскія кнігі ў Куклянскай царкве

Верасень 1939 года рэзка змяніў моўную сітуацыю ў нашым краі. Пасля далучэння раёна да БССР афіцыйнымі мовамі сталі беларуская і руская, адчыняліся пераважна беларускамоўныя школы. Мясцова газета «Новы шлях» выдавалася на беларускай мове.

Напад Германіі на СССР і акупацыя нямецкімі войскамі нашай зямлі прывялі да ўсталявання новай моўнай палітыкі. Дзяржаўнымі мовамі сталі нямецкая і беларуская: афіцыйныя дакументы выдаваліся на дзвюх мовах. Уся сістэма адукацыі стала беларускамоўнай, зразумела, з абавязковым вывучэннем нямецкай. Выкладанне вялося ў духу нацызму; савецкія і польскія падручнікі спальваліся.

Пасля вызвалення Пастаўскага раёна ад нямецкіх захопнікаў сітуацыя з мовамі зноў карэнным чынам змянілася, на жаль, не на карысць беларусаў. Беларуская мова пачала выціскацца са справаводства і з некаторых сфер жыцця, у першую чаргу з адукацыі: пастаўскае педагагічнае вучылішча , гарадскія школы і некаторыя школы сельскія паступова перайшлі на рускую мову навучання. Карэнныя жыхары — беларусы — пачалі вывучаць у школах родную мову як замежную.

А паводле даных перапісу 1999 года ў нашым раёне на беларускай мове дома звычайна размаўляюць 81,9% жыхароў (76,2% беларусаў і 5,7% прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў).

**Пытанні і заданні:**

1. Як змянялася колькасць насельніцтва Пастаўскага раёна на працягу апошняга тысячагоддзя?
2. Якія народы пражываюць зараз на Пастаўшчыне? Якія жылі раней?
3. Назаві галоўныя рэлігійныя канфесіі нашага краю.

4. У якіх населеных пунктах раёна знаходзяцца храмы?
5. Якія віды населеных пунктаў ёсць на Пастаўшчыне?
6. Якія паселішчы нашага краю самыя старажытныя?
7. Якія змены адбыліся ў рассяленні жыхароў Пастаўшчыны за апошняе стагоддзе?
8. Прывядзі доказы таго, што моўная сітуацыя ў нашым краі амаль ва ўсе часы вызначалася складанасцю.

# § 7. Адкуль пайшлі назвы

**1. Утварэнне назваў.** Назвы вёсак, рэк, азёр і іншых геаграфічных аб'ектаў утварыліся ў розныя часы. Не трэба здзіўляцца, што значная іх колькасць паходзіць не толькі са славянскіх моў, але мае карані ў гаворках народаў, якія знаходзяцца сёння далёка ад Беларусі: у фінскай, карэльскай, эстонскай, комі, мансі, удмурцкай, хантыйскай. Усе гэтыя мовы роднасныя і адносяцца да фіна-угорскай моўнай сям'і (угры — венгры). У старажытныя часы прадстаўнікі менавіта гэтых груп засялялі і асвойвалі першымі тэрыторыю раёна. Ад іх да нас дайшлі пераважна назвы рэк і азёр.

Пасля фіна-угорскіх плямёнаў на Пастаўскую зямлю прыходзілі балты, якія пакінулі свой адметны след у назвах. Асабліва вялікая колькасць найменняў, сэнс якіх тлумачыцца з літоўскай і латышскай моў, захавалася на захадзе Пастаўскага раёна — на Лынтупшчыне і Камайшчыне.

Але абсалютную большасць складаюць славянскія назвы. Яны добра тлумачацца з беларускай, рускай, украінскай, польскай моў індаеўрапейскай моўнай сям'і, бо прадстаўнікі гэтых народаў больш тысячы гадоў насяляюць наш край.

**2. Назвы водных аб'ектаў.** Своеасаблівую групу складаюць назвы розных водных аб'ектаў: азёр, рэк, балот. Іх спецыялісты абазначаюць тэрмінам «гідронімы», ад грэчаскіх асноў «гідра» — «вада» і «анома» — «імя, назва». Большасць з іх уяўляе словы–помнікі, якія прыйшлі да нас з глыбокай даўніны. У часы, калі ўся паверхня была занятая лясамі, рэкі адыгрывалі ролю шляхоў зносін, па іх ішоў пошук новых паляўнічых і рыбалоўных угоддзяў.



Возера Надазерскае




Назва Лынтупы на нямецкай паштоўцы часоў Першай сусветнай вайны

Найбольш простай па разуменні сэнсу з'яўляецца славянская група гідронімаў. Некаторыя не патрабуюць нават і тлумачэнняў: Баравое, Амшанае, Дубок, Загацце, Бледнае і г. д. Частка славянскіх назваў утварылася ад ужо састарэлых слоў, якія выйшлі з ужытку: Заражанка (ад слова «зараза» — «зараснік, перасечаная мясцовасць»), Язвінка (ад слова «язва» — «яр», «лагчына»), Волься — (ад слова «вольс» — «альховы зараснік на балоце»).

Нашмат больш складанымі для тлумачэння з'яўляюцца балцкія і, асабліва, фіна-угорскія назвы. Гэта тлумачыцца тым, што, па-першае, яны вельмі старажытныя; па-другое, моцна скажоныя славянамі і прыстасаваныя пад славянскі моўны лад ; па-трэцяе, мовы плямёнаў, якія пакінулі назвы, не захаваліся ў чыстым выглядзе, і таму тлумачэнні найменняў трэба шукаць сярод сучасных роднасных моў. Варта адзначыць і яшчэ адну акалічнасць, якая ўскладняе пошукі: старажытныя людзі ўсё сваё жыццё праводзілі ў прыродзе і таму яны адзначалі і адлюстроўвалі ў назвах самыя нязначныя асаблівасці геаграфічных аб'ектаў. Тое, што для сучаснага чалавека ўсяго толькі «балота», для старажытнага чалавека мела дзесяткі, а мо і сотні адметнасцяў.

**Цікавы факт:** Вядомы беларускі даследчык В. А. Жучкевіч толькі ў беларускай мове знайшоў шэраг слоў, якія з рознымі адметнасцямі адпавядаюць паняццю «балота»: валога, дрыгва, гала, нетра, віць, павіцце, мраіва, багна, твань, слата, іржа.




Пастаўскія школьнікі ў час вандроўкі ў Парыж




Указальнік Манькавічы




Шклозавод «Гута»

Сярод гідронімаў славянскага паходжання найбольшую групу па сэнсу ўтвараюць назвы, якія паказваюць адметнасць расліннасці вакол аб'екта: Баравое, Амшанае, Белькі, Бярозаўскае, Волься, Дубок, Заражанка. Значнае распаўсюджанне маюць назвы, якія вызначаюць месцазнаходжанне азёр і рэк (Загацце, Задняе, Зароўшчына, Надазерскае), колер вады (Белае, Чорнае, Бледнае, Рудзіца, Аржоўка), прыналежнасць даўласніка або жыхара (Арцёмаўскае, Бульбінаўскае). Адзінакавыя назвы адлюстроўваюць іншыя адметнасці: Язвіка (рэльеф), Думбля, Каменскае (грунты), Доўжа (форма), Валожынскае, Пліса, Сляпіца, Страча (іншыя характарыстыкі аб'ектаў).

Каб растлумачыць сэнс балцкіх і фіна-угорскіх назваў рэк і азёр, трэба выкарыстоўваць разнастайныя слоўнікі адпаведных моў. І тады раскрываецца значэнне на першы погляд зусім незразумелых слоў. Напрыклад, «Баб'е» — возера, якое мае тарфяністыя сплавінныя

берагі, «Астуньева» — забалочанае возера, якое падобна на раку, «Біоста» — рака, якая з'яўляецца прытокам другой ракі, «Лодасі» — возера, якое мае камяністы астравок. *(З тлумачэннем назваў некаторых буйнейшых водных аб'ектаў Пастаўшчыны можна пазнаёміцца ў дадатку).*

**3. Назвы паселішчаў.** Каля 80% паселішчаў Пастаўскага раёна маюць назвы славянскія, астатнія паходзяць з балцкіх і фіна-угорскіх моў. Паводле сэнсавага значэння іх можна падзяліць на некалькі груп.

*1. Назвы, якія адлюстроўваюць прыродныя ўмовы мясцовасці.* Да іх адносяцца найменні, якія паказваюць адметнасць геаграфічнага становішча (Загацце, Куцішкі, Пад'ясенка, Падкамаі, Падсосна, Забалацце, Заброддзе); адлюстроўваюць характар рэльефу (Казіная Гара, Логавінцы, Гурніца, Гараноўшчына, Гумбяны, Верацеі, Высокія); сведчаць пра грунтова–глебавыя ўмовы мясцовасці (Гліншчына, Пяскарышкі, Жвірынка, Жарсцвянка); звязаны з раслінным светам (Сасноўшчына, Ракіты, Волься, Асіннікі, Дубрава, Ольшнева, Алешына, Лазовікі, Баравое, Калінаўка); адлюстроўваюць жывёльны свет (Шпакі, Казлы, Салаўі, Барсучына, Жукі, Ваўкі, Барсучы Мох).

*2. Назвы, якія звязаны з працоўнай дзейнасцю і сацыяльна–эканамічнымі ўмовамі жыцця людзей.* Да іх адносяцца найменні, якія адлюстроўваюць умовы жыцця і быт людзей (Старчуны, Стонішкі, Бядункі); звязаны з працоўнай дзейнасцю людзей і з іх старажытнымі промысламі (Агароднікі, Перавознікі, Муляры, Лаўцы, Паташня, Скураты, Пушкары, Ралаўцы); адлюстроўваюць прававыя адносіны (Баяры, Валькі, Даравое); сведчаць пра асаблівасці транспартных шляхоў (Крывы Мост, Масцішча, Разлуцішкі).

*3. Назвы рэлігійна-культавага значэння* (Няверышкі, Папоўцы).

*4. Назвы, што паказваюць тып паселішчаў, тып пабудоў* (Асінагарадок, Паставы, Паставішкі, Дамуці, Станчыкі, Гродзі, Свіраны, Навасёлкі, Стары Двор, Дашкі, Хацілы, Дзеравянкі, Будзева).

*5. Назвы, якія звязаны з прозвішчамі і імёнамі людзей.* Магчыма, першапасяленцаў ці заснавальнікаў. Гэта група самая вялікая па колькасці, да яе адносіцца амаль трэцяя частка ўсіх назваў

паселішчаў раёна (Адамова, Мікулкі, Багданава, Васевічы, Аліхверы, Сергі, Сяргеевічы, Лявонавічы, Пятровічы, Абрамаўшчына, Андрушышкі і іншыя).

*6. Назвы, якія адлюстроўваюць знешнія асаблівасці паселішча (колер, велічыню)* (Чорнае, Вялічкі, Белыя, Сіўцы, Рудзі).

*7. Назвы, якія адлюстроўваюць найменне плямёнаў, народаў ды іншых этнічных груп* (Ляхаўшчына, Маскалішкі, Русіны, Русакі, Ліцвінкі, Прусы, Мазурка, Гудэлішкі, Сакуны).

*8. Назвы, якія звязаны сваім паходжаннем з воднымі аб'ектамі, у тым ліку з назвамі рэк і азёр* (Шыльва, Юнькі, Янкішкі, Камаі, Лучай, Лодасі, Галбея, Ласіца, Лынтупы).

Складанымі для разумення з'яўляюцца назвы, якія паходзяць з іншых моў. Толькі шляхам грунтоўнага аналізу і вывучэння можна дазнацца пра іх сэнс. Напрыклад, вёска Ажуройсці на Лынтупшчыне. Назва мае балцкія карані і складаецца з дзвюх частак: у літоўскай мове «*ažu*» азначае «за», а «*raistas*» — «забалочаны лясок». Такім чынам, назва вёскі ўказвае яе месцазнаходжанне «за забалочаным ляском». Або назва вёскі Васіліны. Мясцовая легенда тлумачыць яе паходжанне ад імён першапасяленцаў Васіля і Лены, але, верагодна, назва з'яўляецца старажытнай фіна-угорскай. Яна складаецца з дзвюх асноў: «vesi» — «вада» і «linna» — «умацаванае месца», «замак». Такім чынам, атрымліваецца зразумелае тлумачэнне: «замак каля ракі». Параўнаем з назвай эстонскай сталіцы Талін, дзе «лін» — «замак».

Вывучэнне назваў пашырае нашы веды пра родны край. Тапаністы ў сваёй працы выкарыстоўваюць не толькі слоўнікі розных моў, але і старажытныя і сучасныя карты, дакументы, каб даведацца, як гучала слова даўней, распытваюць мясцовых жыхароў, вывучаюць прыродныя і гістарычныя асаблівасці мясцовасці.

**Пытанні і заданні:**

1. Як утвараюцца назвы?
2. З якіх моўных сем'яў і груп паходзяць назвы Пастаўшчыны?
3. Чаму назвы водных аб'ектаў найбольш складаныя для разумення?
4. На якія групы падзяляюцца назвы паселішчаў па сэнсавым значэнні?
5. Якія крыніцы трэба выкарыстоўваць, каб вызначыць сэнс геаграфічнай назвы?

Тэма II

# Мінулае і сучаснасць



## § 8. Гісторыя Пастаўшчыны на стужцы часу

Каб арыентавацца ў гістарычных падзеях, трэба ведаць хаця б асноўныя даты з жыцця Еўропы, краіны, сваёй мясцовасці. Для гэтага існуе такое паняцце, як стужка часу — паласа, або лінія, на якой паказваюцца галоўныя падзеі мінуўшчыны. У кожнага чалавека ў свядомасці на працягу жыцця ствараецца своеасаблівая стужка часу, дзякуючы якой ён можа ўспомніць нейкія акалічнасці свайго лёсу, лёсу іншых людзей, краёў, краін.



Пасля адступлення ледавіка



Сучасны краявід




Стужка часу для Пастаўскага раёна

Зразумела, што запомніць усе даты немагчыма, але для тых, хто вывучае гісторыю, ведаць важнейшыя з іх вельмі важна. І тут на дапамогу прыходзіць стужка часу. Яе можа скласці кожны для сябе як памятку, як шпаргалку. Як гэта зрабіць?

Уся гісторыя хрысціянскага свету, як вядома, падзяляецца на два вялікія прамежкі часу — да нашай эры і нашу эру. Мяжу паміж імі вызначаюць па даце нараджэння Ісуса Хрыста. А нарадзіўся ён 2008 год таму назад. Значыць, мы жывём у пачатку трэцяга тысячагоддзя, або XXI стагоддзя нашай эры (н. э.).

Стужку часу ў прамежку да нашай эры можна раскручваць да пачатку ўтварэння Зямлі (~ 4,6 млрд. г. да н. э.), або ўтварэння Сонца (~5 млрд. г. да н. э.), або ўтварэння Сусвету (~14 млрд. г. да н. э.). Але навуку гісторыю цікавіць жыццё людзей, і таму стужка часу будзе намнога карацейшая, бо ў Беларусі першыя вядомыя стаянкі старажытных жыхароў з'явіліся каля 24 тыс. г. да н. э. Для Пастаўшчыны стужку часу трэба яшчэ скараціць, бо наша тэрыторыя доўгі час была занятая ледавіком, які пакінуў наш край прыблізна 10 тыс г. да н. э.

Якія падзеі ў нашай мясцовасці могуць быць нанесеныя на стужку часу ў адрэзку да нашай эры? Ды нямногія. У канцы III – пачатку II тыс. да н. э. каля воз. Задзеўскае знаходзілася паселішча неалітычнай эпохі, а ў VII ст. да н. э. – IV ст. н. э. існавалі гарадзішчы культуры штрыхаванай керамікі ў Дзяўгунах, Сароках, Сіманьках, Колаўцах.

З прычыны адсутнасці пісьмовых крыніц не шмат мы ведаем дат і ў I тысячагоддзі нашай эры. У IV–VI стагоддзях на Пастаўшчыне рассяляліся славяне-крывічы, у канцы X стагоддзя на беразе воз. Задзеўскае ўжо існавала вёсачка Пасаднік, каля Лынтупаў і Вайшкунаў фарміраваліся вялікія курганныя могільнікі балтаў, каля Голбіі жыло сваім жыццём гарадзішча…

А вось з X стагоддзя стужка часу насычаецца падзеямі, бо да сённяшняга часу дайшло шмат пісьмовых крыніц пра даўнейшыя часы. І тут ужо варта зрабіць адбор самых важных дат. Для Пастаўшчыны, як і для любой іншай тэрыторыі, трэба ў першую чаргу вызначыцца з дзяржавамі, у склад якіх яна ўваходзіла: з X ст. — Полацкае і Нальшчанскае княства, з XIII ст. — Вялікае Княства Літоўскае, з 1569 г. — Рэч Паспалітая, з 1793–1795 гг. — Расійская імперыя, з 1915 г. — Германія (заходняя частка раёна),

з лістапада 1917 г. — Савецкая Расія, з лютага 1918 г. — Германія, з лістапада 1918 г. — Савецкая Расія, з красавіка 1919 г. — Польшча, з ліпеня 1920 г. — Савецкая Расія, з 21 сакавіка 1921 г. — Польшча, з 17 верасня 1939 г. — БССР, з 6 ліпеня 1941 г. — Германія, з 5 ліпеня 1944 г. — БССР (СССР), з 1991 г. — Рэспубліка Беларусь (СНД), з 2 красавіка 1997 г. — саюз Беларусі і Расіі.

Вызначыўшы такім чынам прыналежнасць да дзяржаў, потым на стужку часу варта нанесці войны і паўстанні, якія пакінулі сляды ў гісторыі краю. Гэта: 1252 г. — нашэсце мангола-татарскай конніцы Бурундая, 1324, 1378 гг. — паходы крыжакоў Лівонскага ордэна, 1579 г. — Лівонская вайна паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй, 1654 г. — вайна паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй, 1655 г. — вайна паміж Швецыяй і Расіяй, 1706 і 1709 гг. — вайна паміж Швецыяй і Расіяй, 1794 г. — паўстанне Т. Касцюшкі супраць расійскай акупацыі, 1812 г. — вайна паміж Францыяй і Расіяй, 1830–1831 гг. — паўстанне супраць расійскай акупацыі, 1863 г. — паўстанне К. Каліноўскага супраць расійскай акупацыі, 1915–1918 гг. — Першая сусветная вайна, 1917–1920 гг. — Кастрычніцкая рэвалюцыя, вайна Расіі з Германіяй, Польшчай, 1939–1944 гг. — Другая сусветная вайна.

Акрамя гэтага на стужку часу могуць быць нанесеныя іншыя катэгорыі гістарычных падзей, напрыклад, даты заснавання населеных пунктаў раёна, даты будаўніцтва цэркваў і касцёлаў, даты жыцця вядомых людзей і іншае. Стужкі часу можна стварыць для кожнага населенага пункта раёна.

**Пытанні і заданні:**

1. Якое значэнне мае стужка часу пры вывучэнні гісторыі?
2. Што можна адлюстраваць на стужцы часу?
3. Скарыстаўшы матэрыял параграфа і дадаткаў, намалюй у сшытку стужку часу Пастаўскага раёна.

# § 9. Маўклівыя сведкі мінуўшчыны

**1. Старажытная гісторыя раёна.** Старажытная гісторыя ўмоўна падзяляецца на вялікія прамежкі часу, якія называюць эпохамі або вякамі. Выдзяляюцца *ранні каменны век* або *палеаліт* (на Пастаўшчыне не зафіксаваны), *сярэдні каменны век* або *мезаліт* (IX–III тысячагоддзі да нашый эры), *новы каменны век* або *неаліт* (III – сярэдзіна II тысячагоддзя да н. э.), *бронзавы век* (сярэдзіна II тысячагоддзя — VII–IV стагоддзі да н. э.), *жалезны век* (з VII–IV стагоддзяў да н. э.) Па сваім унутраным развіцці эпохі былі неаднароднымі: яны падзяляюцца на меншыя прамежкі часу, якія называюць культурамі і выдзяляюць звычайна паводле характару штрыховак на кераміцы.

*Неаліт і мезаліт*. Больш як 15 тысяч гадоў таму тэрыторыю Пастаўшчыны займаў вялікі ледавік, і таму прыродныя ўмовы былі вельмі суровыя. Пасля таго, як у выніку пацяплення лядовыя глыбы пачалі раставаць, на паверхні ўтварыліся вялікія азёры і рэкі, значныя па вышыні горы і ўзгоркі з пяску і гліны. Мінуў значны час, пакуль на месцы халоднай прасторы выраслі густыя лясы, якія пачалі абжываць розныя жывёлы.

Першыя людзі прыйшлі на тэрыторыю Пастаўшчыны, верагодна, з поўдня ці з паўднёвага захаду (паўднёвая Беларусь і Польшча) прыблізна ў IX тысячагоддзі да н. э. Яны займаліся паляваннем, рыбалоўствам, збіральніцтвам. У гэты час зроблена адно з найвялікшых вынаходстваў чалавека — лук. Гэта дазволіла паляваць невялікімі групамі і нават паасобна. Пошукі лепшых месцаў вымушалі чалавека весці рухомы лад жыцця, і таму ён доўга не затрымліваўся на адной стаянцы. Гэтым, а таксама малалікасцю першажыхароў можна тлумачыць невялікую колькасць вядомых на сённяшні дзень стаянак людзей мезаліту. Некалькі паселішчаў таго часу знойдзена каля возера Нарач, але на Пастаўшчыне яны пакуль што не выяўлены.

З V тысячагоддзя да н. э. пачалася неалітычная, якая доўжылася каля 2 тысяч гадоў. Тады клімат быў цяплейшы за сучасны, што спрыяла росту багатых лясоў, асабліва шыракалістых. Неабсяжныя лясы і лугі, вялізныя балоты былі прытулкам для розных



Людзі каменнага веку



Паганскае капішча

відаў птушак і жывёл. У гушчарах вадзіліся лісы, ваўкі, дзікі, высакародныя алені, ласі, зубры, мядзведзі, рысі, барсукі, бабры, тарпаны і іншыя жывёлы, якія ў большасці жывуць на нашай тэрыторыі і цяпер. Рэкі і азёры былі царствам вадаплаўнай птушкі і мелі шмат рыбы.

Людзі сяліліся найчасцей на невялікіх узвышшах і пясчаных пагорках каля рэк і азёр. На Пастаўшчыне паселішча неаліту выяўлена каля возера Задзеўскае. Яно размяшчаецца на паўночным беразе вадаёма на краі надпоплаўнай тэрасы. У час раскопак навукоўцы выявілі тут крамянёвыя скрабкі, нажы, наканечнікі стрэл, праколкі, кераміку *нарвенскай і паўночнабеларускай* археалагічных культур, а таксама культуры *грабеньчата-ямкавай* керамікі. Датуецца паселішча канцом III – пачаткам II тысячагоддзя да н. э. Яно мае памеры 70 на 20 метраў.

Лічыцца, што ўсе неалітычныя стаянкі былі невялікімі: некалькі прымітыўных пабудоў, размешчаных на адлегласці дзесяткаў метраў адна ад адной. Аднак характар пабудовы жылля і матэрыяльныя рэшткі сведчаць пра пераход насельніцтва ад качавога да аселага ладу жыцця. Дзякуючы выкарыстанню больш дасканалых прылад з крэменю, косці і рогу, а таксама лука і стрэлаў, праца першабытнага паляўнічага і рыбалова стала больш эфектыўнай. На звяроў і птушак яны ладзілі самастрэлы і пасткі, рабілі капканы, капалі лоўчыя ямы. Рыбаловы мелі вуды з касцянымі кручкамі, зубчастыя коп'і і восці. Выкарыстанне выдзеўбанага чоўна і рыбалоўнай сеткі зрабілі рыбалоўства больш прадукцыйным, чым паляванне. Яно стала надзейным спосабам атрымання ежы і

садзейнічала пераходу да аселасці. Людзі займаліся таксама зборам пладоў, каранёў, вадзяных арэхаў, малюскаў і іншых дароў прыроды.

У эпоху неаліту было зроблена найважнейшае адкрыццё — вынайдзены спосаб вырабу глінянага посуду. Авалоданне прыёмамі лепкі і абпальвання посуду палепшыла спосабы прыгатавання ежы і аблягчыла яе захаванне, што таксама спрыяла пераходу да аселага ладу жыцця. На кераміку часта наносіліся складаныя арнаментальныя малюнкі.

На Пастаўшчыне ў пачатку неаліту жылі плямёны так званай культуры *порыстай керамікі*, якая вылучаецца як галіна *нарвенскай культуры*, асноўныя арэалы каторай знаходзяцца ва ўсходняй Прыбалтыцы.

Даследаванні археолагаў сведчаць, што ў 2-й палове III тысячагоддзя да н. э. з Прыбалтыкі на тэрыторыю Пастаўшчыны прыйшлі плямёны культуры тыповай *грабеньчата-ямкавай керамікі*, званай так па рысах аздаблення посуду. Гэтыя плямёны па сваёй мове лічацца блізкімі да угра-фінаў, яны былі нешматлікімі і хутка змяшаліся з карэннымі жыхарамі.

Нягледзячы на ўдасканаленне прылад і авалоданне новымі формамі вядзення гаспадаркі, прадукцыйнасць працы па-ранейшаму заставалася недастатковай для



Жрэц



Арнаменты керамікі паўночнабеларускай культуры



Заняткі старажытных людзей



Сям'я балтаў

таго, каб людзі змаглі жыць асобнымі сем'ямі. Калектыўныя формы палявання і рыбалоўства давалі большую частку прадуктаў.

У эпоху неаліту мацярынскі род дасягнуў сталых формаў. Рэгуляванне шлюбных адносін прычынілася для ўстанаўлення дакладна акрэсленага кола родзічаў толькі па жаночай лініі. Такі род складаўся з усіх дачок, унучак, праўнучак і асоб мужчынскага полу, якія мелі адну прамаці. Таму жыхары аднаго роду не маглі браць шлюб паміж сабой. Муж павінен быў належаць да іншага роду на строга вызначаным у племені шлюбным парадку, але ў той жа час абавязкова павінен быў быць супляменнікам, гэта значыць, што роды мужа і жонкі мусілі ўваходзіць у адно племя. Такая арганізацыя садзейнічала захаванню адметных рыс племя: мовы, абрадаў, упрыгожанняў, арнаментацыі керамікі, вытворчых навыкаў, характару пабудовы жылля і іншых.

У жыцці старажытных людзей вялікую ролю адыгрывала першабытная рэлігія, або татэмізм. Ва ўмовах узаемаадносін родаў і плямёнаў татэм выступаў як родавае імя або назва племя. Былі пашыраны культы жывёл і анімістычных уяўленняў. Не выключана, што сучасныя прозвішчы некаторых людзей маюць свае карані у татэмізме. Прыкладам таму прозвішчы Лось, Мядзведзь, Казёл, Баран, Заяц і іншыя.

На мяжы III–II тысячагоддзяў да н. э. на тэрыторыю Пастаўшчыны прасунуліся племянныя групы культуры *шнуравой керамікі*, ці, як іх яшчэ называюць, *культуры баявых сякер*. Пад уплывам «шнуравікоў» склалася *паўночнабеларуская* культура.

Асноўную частку знаходак у часе раскопак позняга неаліту складаюць фрагменты ляпнога посуду з дамешкамі тоўчаных ракавінак, расліннасці, пяску і жарствы ў гліняным цесце. Галоўнымі прыёмамі арнаментацыі былі насечкі, ямкі, тычкі, рыскі, грабеньчатыя адбіткі, шнур.

*Бронзавы век.* На Пастаўшчыне бронзавы век пачаўся значна пазней, чым на паўднёвых тэрыторыях. Гэта звязана з тым, што наш край не меў сваёй сыравіны для выплаўкі бронзы і быў значна аддалены ад цэнтраў старажытнай металургіі. Таму мяжа паміж эпохамі неаліту і бронзы прыпадае прыблізна на сярэдзіну II тысячагоддзя да н. э. Нават і пазней прылады з бронзы не змаглі выціснуць вырабаў з крэменю і косці, і шырокага распаўсюджання тут не атрымалі. Бронзавыя і медныя вырабы траплялі ў наш край у асноўным шляхам абмену.

Пад канец II тысячагоддзя да н. э. арнамент на кераміцы становіцца значна бяднейшы, а пазней амаль цалкам знікае. Плямёны культуры баявых сякер займаліся жывёлагадоўляй і земляробствам. Іх паселішчы звычайна месціліся на пясчаных узвышшах па берагах рэк. Гэта былі невялікія пасёлкі плошчай 0,2–0,5 га з наземнымі жытламі слупавой канструкцыі. Пасярэдзіне іх размяшчаліся ачагі — месцы для вогнішча.

Насельніцтву былі вядомыя асноўныя віды свойскай жывёлы: быкі, козы, авечкі, свінні. Жыхары займаліся земляробствам, паляваннем, рыбалоўствам, апрацоўкай скур, ткацтвам і шыццём адзення. Зямлю апрацоўвалі каменнымі і рагавымі матыкамі. Жалі крамянёвымі сярпамі, а жыта расціралі з дапамогай ручных каменных зерняцёрак.

Змяніліся і формы гліняных гаршкоў. Калі ў неаліце іх дно было акруглым ці вострым, то ў эпоху бронзы яно стала плоскім, што было выклікана з'яўленнем ачага з роўным подам і стала ў выглядзе гарызантальнай дошкі на падпорках.

У гэтую эпоху адбыўся пераход ад мацярынскага да патрыярхальнага родавага ладу. Сваяцтва пачало лічыцца ўжо не па матчынай лініі, а па бацькавай, а дзеці — нашчадкі па бацьку.

Памерлых хавалі ў грунтовых могільніках на баку ў скурчанай позе. Калі гэта быў мужчына, то побач клалі каменныя прасвідраваныя баявыя сякеры, кліны, долаты, касцяныя гарпуны, крамянёвыя наканечнікі стрэл і нажы, калі жанчына — каралі



Здабыча жалезнай руды і выплаўка жалеза

з прасвідраваных зубоў жывёл, шыферныя ці бурштынавыя ўпрыгожанні.

*Жалезны век.* Жалезны век пачаўся на Пастаўшчыне ў сярэдзіне I тысячагоддзя да н. э. (VII–IV стст. да н. э.). Назву гэтая эпоха атрымала з-за таго, што чалавек навучыўся здабываць і апрацоўваць жалеза, вырабляць з яго патрэбныя яму рэчы. Доказам таму служаць знаходкі на раскопках некаторых гарадзішчаў і стаянак. Звычайна трапляюцца жалезныя шлакі (дзынра), рэшткі жалезных вырабаў, крыца, балванкі і іншыя сляды жалезаробчай вытворчасці. Жалеза выраблялася на месцы, бо мясцовая балоты былі багатыя на жалезную руду (буры жалязняк, або ліманіт). З жалеза выраблялі сякеры, нажы, сярпы, іголкі, шылы, наканечнікі дзідаў, дроцікаў, стрэл, а таксама ўпрыгожанні: бранзалеты, шпількі, падвескі.

Па-ранейшаму, асабліва ў пачатку эпохі, значнае распаўсюджванне мелі каменныя прылады, пераважна прасвідраваныя сякеры. Як і раней, шырока ўжываліся прылады з косці і рогу. З бронзы на той час выплаўлялі толькі ўпрыгожанні, сярод якіх галоўную ролю адыгрывалі пярсцёнкі, бранзалеты і падвескі.

Найбольш характэрным элементам тагачаснай матэрыяльнай культуры мясцовых плямёнаў была *штрыхаваная кераміка*, па якой і названа сама культура. Рэшткі ляпнога посуду, які належыць да культуры штрыхаванай керамікі, знойдзены на гарадзішчах каля вёсак Дзяўгуны, Сарокі, Сіманькі, Навадруцк, Саранчаны, Данеўцы.

Для керамікі ўласцівыя пласкадонныя гаршкі з вострым рабром у верхняй частцы і пасудзіны ў выглядзе звычайнага слоіка.

Сярод гаспадарчых заняткаў асноўную ролю да канца I тысячагоддзя да н. э. адыгрывалі жывёлагадоўля і паляванне. У гэты час на нашай тэрыторыі былі вядомыя ўсе асноўныя віды свойскай жывёлы: каровы, козы, коні, свінні. Пераважала буйная рагатая

жывёла. Коні ўжо тады выкарыстоўваліся для верхавой язды. Асноўнымі аб'ектамі палявання былі дзік, лось, зубр, лісіца, бабёр.

З цягам часу ў гаспадарцы ўзрастала доля падсечнага земляробства. Па спосабу падрыхтоўкі ўчастка лесу для пасеву такая сістэма атрымала назву ляднай. Частку прадуктаў харчавання давалі рыбалоўства і збіральніцтва. На гарадзішчах знойдзены кручкі і восці, а таксама ракавіны малюскаў і шкарлупіны ад арэхаў.

Паселішчы ранняга жалезнага веку (культура *штрыхаванай керамікі*) месціліся звычайна каля прыродных вадаёмаў. Прыблізна да V–IV стст. да н. э. на іх не было ніякіх абарончых збудаванняў. Пазней па краях гарадзішчаў сталі насыпаць адзін, а то і некалькі валоў, рабіць перад імі равы. Па грэбені вала ўзводзіліся драўляныя сцены. Плошча паселішчаў звычайна не перавышала 0,25–0,3 га. Жытламі служылі наземныя слупавыя збудаванні чатырохвугольнай формы. Яны былі доўгія, шматкамерныя, у кожным памяшканні меўся ачаг. Прыблізна ў пачатку н. э. адбылося павелічэнне плошчы асобных жылых памяшканняў, з'явіліся даволі вялікія аднакамерныя дамы, якія будаваліся асобна. Падлога ў жытлах абмазвалася глінай.

Далейшае сацыяльна-эканамічнае і этнічнае развіццё ў IV–V стст. н. э. прывяло да значных змен у жыцці мясцовага насельніцтва. Старыя патрыярхальныя гарадзішчы, якія сталі эканамічна нявыгаднымі, былі пакінуты, а замест іх узніклі неўмацаваныя селішчы. Відаць, гэта адбылося ў выніку ўзнікнення вялікіх племянных аб'яднанняў, у межах якіх для кожнай асобнай абшчыны страцілася неабходнасць ва ўмацаваных гарадзішчах.

Узнікненне маёмаснай няроўнасці, з'яўленне багатых і бедных сем'яў паскорыла распад родавых адносін. Сваяцкія сувязі пачалі страчваць сваю сілу. На адкрытых паселішчах сяліліся не толькі кроўныя родзічы, але і сем'і з чужых родаў. Першабытная абшчына, заснаваная на кроўным сваяцтве, саступіла месца абшчыне суседскай.

Адбыліся змены і ў культуры. У выніку зліцця культур, якія існавалі на поўначы Беларусі, утварылася новая археалагічная культура, якая мае назву банцараўская. Цікава, што амаль усе даследаваныя селішчы таго часу знаходзіліся на месцы стаянак каменнага ці бронзавага вякоў, на нізкай першай надпоплаўнай тэрасе рэк і азёр, каля самай вады.

У канцы VI стагоддзя палітычнае становішча, напэўна, змянілася і стала больш трывожным, бо селішчы пачалі размяшчаць побач са старымі гарадзішчамі. Самі гарадзішчы былі ператвораны ў крэпасці-сховішчы, значна ўмацаваныя дадатковымі валамі шляхам падсыпкі краю пляцовак, абарончымі драўлянымі сценамі.

Трывожная абстаноўка таго часу, напэўна, тлумачыцца тым, што пачалося паступовае перамяшчэнне славян на тэрыторыю, што раней займалі балты і угра-фіны. Хутчэй за ўсё рух гэтых плямён адбываўся гвалтоўна, праз узброеныя сутычкі з мясцовымі жыхарамі. Устаноўлена, што на мяжы VII–VIII стст. большасць умацаванняў балцкага насельніцтва загінула ў выніку пажараў.

**2. Помнікі старажытнай гісторыі.** Найбольш распаўсюджаным тыпам паселішчаў у жалезным веку былі ***гарадзішчы*** — старажытныя ўмацаваныя пасёлкі. Яны звычайна размяшчаліся на мысах стромкіх берагоў рэк (*мысавыя гарадзішчы*), а таксама на асобных узвышшах (*узгорыстыя гарадзішчы*). Дзякуючы такому месцазнаходжанню, а таксама штучным земляным валам і равам, якія ўзводзіліся ў мэтах самаабароны, гарадзішчы ўяўлялі сабою добра ўмацаваныя пункты.

Форма пляцоўкі гарадзішча, агароджанай умацаваннямі, у значнай меры залежала ад прыродных абрысаў саміх мысаў і ўзгоркаў. Памеры іх, як правіла, невялікія — ад 1000 да 5000 м$^2$. Вось на такіх пляцоўках пражываў род, які складаўся з некалькіх дзесяткаў чалавек. Тут будаваліся жыллё і розныя гаспадарчыя пабудовы.

Гарадзішчы дзякуючы наяўнасці на іх астаткаў валаў і равоў добра прасочваюцца на мясцовасці. Часта старажытныя гарадзішчы завуць *«гарадок», «замчышча», «замак»* або *«царкавішча», «чорная гара».* На працягу доўгай гісторыі жалезнага веку жыццё на гарадзішчах магло неаднаразова знікаць, а затым адраджацца зноў. Ад кожнага перыяду жыцця людзей тут заставаліся сляды. Такія гарадзішчы завуць шматпластавымі.

На Пастаўшчыне выяўлена 36 гарадзішчаў. Найбольш цікавыя з іх знаходзяцца каля вёсак Данеўцы, Гута, Сарокі, Асінагарадок, Яцавічы, Сіманы, Паставы, Задзеўе, Дзяўгуны.

***Селішчамі*** лічаць адкрытыя, неўмацаваныя пасяленні людзей жалезнага веку. Часта селішчы знаходзяцца побач з гарадзішчамі.



Старажытнае гарадзішча



Гарадзішча каля в. Голбія



Знаходкі з гарадзішча культуры штрыхаванай керамікі ў в. Саранчаны

Бывае і так, што пазнейшае паселішча размяшчаецца поруч ранняга гарадзішча, якое ў такіх выпадках выкарыстоўвалася насельніцтвам у якасці сховішча на выпадак ваеннай небяспекі. Размешчаныя, як правіла, па берагах рэк і азёр, паселішчы не мелі ніякіх земляных умацаванняў, таму выявіць іх можна толькі па наяўнасці культурнага пласта. З гэтай прычыны на Пастаўшчыне выяўлена толькі 6 селішчаў. Яны знаходзяцца каля г. Паставы на беразе Задзеўскага возера, каля вёсак Саранчаны, Шыркі, Дварчаны, Лапінцы. Каля Сіманоў селішча знаходзіцца каля гарадзішча-сховішча «Грыкава гара».

Адным з самых распаўсюджаных відаў археалагічных помнікаў з'яўляюцца ***пахавальныя курганы***, якія ўяўляюць сабою земляныя ўзгоркі, насыпаныя над магілай. Вышыня курганоў ад 15–30 см да 3–4 м. Па форме ў плане яны часцей круглыя, але ёсць насыпы доўгія, падоўжаныя, авальныя, чатырохкутныя. Курганы



Частка каменнага ахвярніка з гарадзішча каля в. Данеўцы



Курган каля в. Сяргеевічы

бываюць адзінкавымі або размяшчаюцца цэлымі групамі. У групе іх налічваецца ад некалькіх адзінак да некалькіх сот.

У кургане можа быць адно або некалькі пахаванняў. Яны знаходзяцца пад насыпам на ўзроўні глебы (гарызонту) або ў яме, а таксама ў самім насыпе. Абрад пахавання ў курганах з'яўляецца паганскім. Ён звязаны з дахрысціянскімі паданнямі аб замагільным жыцці. У X ст. яшчэ было шырока распаўсюджанае *трупаспаленне*. Агню аддаваліся не толькі цела нябожчыка, але і рэчы, якімі ён карыстаўся пры жыцці.

На мяжы X–XI стст. пад уплывам хрысціянства распаўсюджваецца пахаванне ў кургане па абраду *трупапакладання*. Памерлага клалі на зямлю, як правіла, галавой на захад, тварам да ўзыходнага сонца. Нябожчыка на «той свет» забяспечвалі рэчамі, якія ў шматлікіх выпадках добра захаваліся.

Курганы служаць неацэннай крыніцай для вывучэння гісторыі славянскіх плямёнаў. Рэчы, якія знаходзяць у іх, дазваляюць рабіць высновы аб рамястве, гандлі і іншых занятках нашых продкаў.

Пра курганы ў народзе існуе шмат паданняў. На Пастаўшчыне часта можна пачуць мясцовы назоў курганоў — *«валатоўкі».* Яно звязана з паданнем аб тым, што ў курганах пахаваны людзі вялікага росту і сілы — «*волаты*». У іншых месцах гэтыя пахаванні завуць *«капцы».* Але самы распаўсюджаны назоў іх у Беларусі — *французскія*

або *шведскія магілы*. Звязана гэта з тым, што сярод насельніцтва паўсюдна сустракаюцца людзі, асабліва пажылога ўзросту, якія сцвярджаюць, быццам у курганах пахаваныя шведы або французы. Аднак гэта не так. Шматлікімі археалагічнымі раскопкамі даказана, што курганы не маюць ніякага дачынення ні да французаў, ні да шведаў і з'яўляюцца пахаваннямі нашых далёкіх продкаў — славян.



Знаходкі з курганнага могільніка каля в. Вайшкуны: 1 — сякера; 2 — прасніца; 3 — ботала; 4 — шпілька; 5 — шыла; 6 — наканечнік дзіды

Насыпалі курганы над магіламі да самога канца XIII ст. Толькі ў XIV ст. канчаткова зацвердзіўся звычай хрысціянскага пахавання. У XIV–XVII стст. памерлых хавалі ў глыбокіх грунтавых ямах. Зверху насыпаўся невялікі ўзгорак, на які ставіўся выраблены з каменю крыж.

На Пастаўшчыне выяўлена 23 месцы, дзе знаходзяцца курганныя групы або асобныя курганы. Вялікія комплексы старажытных


Каменны крыж каля в. Маштаркі


Каменны крыж на могільніку ў Лынтупах



👁 Клінавая і свідраваная сякеры, знойдзеныя ў Пастаўскім раёне

пахаванняў ёсць каля населеных пунктаў Лынтупы (больш 70 насыпаў), Голбія (49 насыпаў), Вайшкуны (21 насып), Янова (10 насыпаў), Сяргеевічы (23 насыпы). Асобныя вялікія курганы знаходзяцца каля вёсак Саранчаны і Трабуцішкі.

Старажытнымі помнікамі з'яўляюцца *камяні з высечанымі на іх пісьмёнамі або іншымі малюнкамі*. Ёсць шмат камянёў, на якіх маюцца малюнкі ў выглядзе крыжоў, падкоў, слядоў чалавека і інш. Пра іх існуе шмат цікавых паданняў, з імі звязаныя розныя вераванні. На Пастаўшчыне шмат валуноў, якія з'яўляюцца помнікамі. Гэта так званыя «Чортавы камяні» каля пасёлка Лынтупы, вёсак Палессе, Мікулкі, Гараватка; «Святы (Дзіравы) камень» каля в. Каптаруны, «Шчапаны камень» каля в. Вялічкі і іншыя. З каменных крыжоў выдзяляецца вялікі крыж у Камаях і крыж з нерасшыфраванай сістэмай насечак каля в. Маштаркі.

Навуковая каштоўнасць археалагічных помнікаў сапраўды вялізная. Яны служаць найважнымі і асноўнымі крыніцамі для спазнання старажытных гістарычных эпох, бо ў тыя часы пісьменнасці яшчэ не было. Іх навуковае вывучэнне дазваляе крок за крокам прасачыць далёкае мінулае людзей.

### Пытанні і заданні:

1. На якія эпохі падзяляецца старажытная гісторыя?
4. Прадстаўнікі якіх археалагічных культур насялялі Пастаўшчыну ў старажытнасці?
5. Чым адрозніваецца побыт людзей неаліту ад людзей жалезнага веку?
6. Якія віды археалагічных помнікаў ёсць на Пастаўшчыне? Якія сярод іх самыя шматлікія?
7. Дзе на тэрыторыі Пастаўскага раёна знаходзяцца найбольш адметныя гарадзішчы, селішчы, курганныя могільнікі?

# § 10. З глыбіні вякоў

**1. У складзе старажытных дзяржаў.** Самым магутным і значным княствам на тэрыторыі Беларусі ў X-XIII стагоддзях з'яўлялася Полацкае. Пастаўшчына знаходзілася на заходніх абшарах гэтай старажытнай дзяржавы на памежжы з Нальшчанскай зямлёй. Славяне-крывічы, рухаючыся з усходу на захад, паступова адцяснялі і асімілявалі балтаў. У нашым раёне іх пранікненне прыпынілася на некаторы час па даліне Мядзелкі, дзе і была мяжа паміж гэтымі старажытнымі княствамі. Пашырэнне Полацкай дзяржавы на захад адбывалася ў час княжання Ізяслава, сына Рагнеды, і Брачыслава. Менавіта пры апошнім узніклі ў Беларусі паселішчы: горад Браслаў, вёска Браслаў каля возера Свір, Браслаў у Латвіі. Верагодна тады ўзнік і Пастаўскі замак — умацаванае месца на беразе ракі Мядзелка ў акружэнні вясковых хат мясцовых жыхароў, асноўным заняткам якіх было рыбалоўства.

Заходняя частка Пастаўшчыны ўваходзіла ў склад Нальшчанскага княства. У старажытным Мінхенскім рукапісе пры апісанні зямель згадвалася племя свіранаў (zuireani), якое мела 325 гарадоў. Мясцовасць, на якой трывала сядзела гэта племя, у рускіх і гоцкіх летапісах значыцца пад імем Нальшчанскай зямлі. На яго ўсходняй мяжы знаходзілася ўмацаванае паселішча Камаі, дзе, верагодна, была крэпасць, якая кантралявала граніцу з Полацкім княствам. Паўночнымі суседзямі нальшчанцаў былі аўкштайцкія плямёны і Дзяволтаўскае княства, якое мела сваю княскую дынастыю. Найбольш вядомым нальшчанскім князем быў Даўмонт. Вядома, што ён і Міндоўг былі сваякамі, бо ажаніліся з роднымі сёстрамі. Аднак палітычныя і асабістыя



Крывіч і крывічанка

стасункі прывялі князёў да варажнечы і міжусобных закалотаў. У выніку ў 1265 годзе Даўмонт пакінуў княства і з дружынай уцёк у Пскоў. Там ён атрымаў княжы пасад, прыняў хрысціянства і верна служыў новай радзіме, стаўшы шанаваным святым пад імем Цімафей.

Даўмонт са Пскова тройчы з дружынай рабіў наезды на вотчынныя землі, рабаваў жыхароў. З 1264 года, калі вялікі князь Войшалак заваяваў Нальшчаны і Дзяволтву, пастаўскія землі ўвайшлі ў склад Вялікага Княства Літоўскага.

У XIII–XV стагоддзях на Пастаўшчыне было неспакойна. Акрамя міжусобных сутычак паміж суседзямі сюды пачалі наведвацца і больш далёкія няпрошаныя госці. У 1242 годзе праз Пастаўшчыну праходзіла татарская конніца, якая дабіралася з Полацка да Вільні, а летам 1258 года край тапталі татара-мангольскія войскі Бурундая. Пасля аб'яднання ў 1237 годзе Ордэна мечаносцаў з Тэўтонскім ордэнам і ўтварэннем Лівонскага ордэна нямецкія рыцары раз за разам пачалі прыходзіць сюды з рабункамі. Князь Гедымін у сваім пасланні біскупу Дэрптскаму ў 1324 годзе, згадваючы аблогу Мядзела, скардзіцца: *«...мноства людзей яны забілі і многіх павялі з сабой... Таксама роўна сорак дзён пасля яны зноў, як драпежныя ваўкі, люта спустошылі тую ж зямлю, бязлітасна забілі 80 чалавек...»* Крыжацкі храніст пад 1378 годам паведамляе, што лівонскія рыцары хадзілі *«супраць рускіх у вобласць замка Мядзель, якія былі за паганцаў і падтрымлівалі іх»*. Шлях праходзіў праз Пастаўшчыну. Да таго ж часу адносіцца і адзінае ўпамінанне пра



Старажытнаславянскае жытла



Полацкі князь Брачыслаў з мініяцюры Радзівілаўскага летапісу



Вялікі князь ВКЛ Войшалк. Выява з Лаўрышоўскага дабравесця

Пастаўскі замак. *«Каб пакараць Кейстута за дзёрзкія словы, магістр паслаў на Жамойць рыцараў. Яны абклалі Пастаўскі замак. Не наважыўшыся на штурм, яны пусцілі па рацэ запаленыя караблі. Вецер перанёс агонь на замак. Ратуючыся ад агню, абаронцы здаліся на міласць пераможцаў. Але літасці не было... Па загаду маршала крыжакі забілі ўсіх палонных».* Разбураны замак не аднавіўся.

Пасля перамогі аб'яднаных войскаў ВКЛ і Польшчы над крыжакамі ў Грунвальдскай бітве (1410 год), у якой бралі ўдзел і ваяры з нашых мясцін, на Пастаўшчыне ўсталявалася адносная зацішша: амаль 200 гадоў ваенныя калясніцы абміналі наш край. Спакойнае жыццё паўплывала на эканамічнае ажыўленне і аказала станоўчае ўздзеянне на развіццё гаспадаркі.



Воіны Полацкага княства XII–XIII стст.



Крыжакі са старадаўняй мініяцюры



Рыцары тэўтонскага ордэна



Вялікі князь Гедымін

**2. Утварэнне Пасадніка.** У зручным месцы на ўзвышаным паўвостраве каля ракі Мядзелка на мяжы I–II тысячагоддзяў н. э. было заснавана парубежнае паселішча Полацкай зямлі — Пасаднік. Валодаў ім магнат Дэспат-Зяновіч. У XII–XVI стагоддзях род Зяновічаў быў адным з самых заможных і ўплывовых ў Вялікім Княстве Літоўскім. Князь Вітаўт за асаблівыя заслугі надзяліў Зяновіча вялізарнымі маёнткамі, якія раскінуліся на абсягах ад Дзісны да Прыпяці. З XV стагоддзя прадстаўнікі гэтага знакамітага роду ўдзельнічалі ва ўсіх значных гістарычных падзеях. У 1442 годзе атрады Дэспата-Зяновіча і Радзівілаў складалі асноўную частку войска ВКЛ у вайне з Масковіяй.

У 1409 годзе Паставы належалі Гераніму Зяновічу (Зяновію Братошычу), які атрымаў ад польскага караля Уладыслава Ягайлы прывілей на перавод вёскі Пасаднік у мястэчка Паставы. Пазней, у 1414 годзе, гэта ж было пацверджана прывілеем Вялікага князя ВКЛ Вітаўта. У дакуменце запісана, што Вялікі князь *«пацвярджае Зяновію Братошычу спадчынную маёмасць Мыш, Чардлёны, Вішнеў на возеры Спяхла, Чачэлічы з людзьмі на возеры Нарач у павеце Мядзельскім, а таксама вёскі і азёры: Паставы, Мапаў, Баравічы ў межах да рэк Бычыца, Недзяліца, Кіравіца, Лусіца, Альбеця, Дзісна,*



👁 Ягайла



👁 Вялікі князь ВКЛ Вітаўт

*Беразвіца да меж полацкіх і маёнтка, дадзеных яму Уладыславам Ягайлам паміж Глыбокім і Паповічамі».*

У 1514 годзе пастаўскім маёнткам валодаў унук Зяновія Братошыча, гаспадарскі маршалак Юрый Іванавіч Зяновіч, а пасля ягонай смерці ў 1522 годзе Паставы былі падзелены паміж чатырма сынамі: Мікалаем, Міхаілам, Ежы (Юрыем) і Янам. Тады ж у мястэчку быў узведзены каталіцкі касцёл.

**Цікавы факт:** Рускі гісторык С. Д. Фёдараў у кнізе «Поселения Северо-Западного Края Великого Княжества Литовского», выдадзенай на пачатку дваццатага стагоддзя ў С.-Пецярбургу, пісаў:

*«...В 25 верстах от озера Мездолье находится поселение 5 домов наземное его сельцы занимались рыбой в озере Задревское. Селение возникло в 996 году. Деспот Зенович, приезжий магнат, облюбовал это место и основался в 1005 году.*

*После его смерти владел им его сын Данут Зенович, а после него племянник С. Зенович. Поселение первоначально — Посадник было 13 домов. После него в 1349 году был племянник сын Гвидон и он так же являлся владельцем деревни, занимался рыбой. А последним владельцем деревни был Зенович Героним в 1409 году, который получил местечко, 26 домов и 13 корчмы...»*

**3. Гістарычны водны шлях.** У раннім сярэднявеччы асноўныя гандлёвыя стасункі паміж княствамі і паселішчамі ажыццяўляліся па рэках. У тыя часы водны шлях паміж Полацкам (басейн р. Дзвіна) і Наваградкам (басейн р. Нёман) праходзіў праз тэрыторыю Пастаўшчыны. З Дзвіны ён вёў у Дзісну, далей — у Бірвіту, а з яе — у Мядзелку. Далей шлях ішоў праз азёры Мядзел, Мястра, Нарач, раку Нарачанку. Можна заўважыць, што берагі Мядзелкі і зараз заселены даволі шчыльна. Практычна ўсе прыдатныя для жыцця землі абапал ракі занятыя паселішчамі, якія цягнуцца чарадой: Ракіты, Маскалішкі, Мамулі, Койры, Целякі, Турлы, Валодзькі, Русакі, Рыбчаны, Курты, Хацілы, Заброддзе, Волахі. Мястэчка Паставы на гэтым водным шляху мела адметнае значэнне. У летапісную пару яно мела назву Пасаднік і выконвала ролю фарпоста заходніх межаў Полацкай зямлі. Маючы выгаднае геаграфічнае становішча, Паставы паступова распаўсюдзілі свой уплыў на яшчэ дзве рачныя сістэмы: Лучайку (вёска Перавознікі) і Спарыцу (вёска Задзеўе).



Вікінгі пераносяць човен цераз волак



Месца старадаўняй прыстані ў Паставах



Перацягванне ладдзі цераз волак

Вышэй Паставаў Мядзелка значна звужаецца і цячэ ў асноўным сярод лясоў і хмызнякоў. Населеных пунктаў параўнальна мала (Ліпнікі, Манькавічы, Пятроўшчына, Мікіткі, Маўчаны, Лапосі), што сведчыць аб тым, што гэты ўчастак шляху перастаў выконваць свае функцыі даволі даўно. Верагодна, «залатым часам» для яго былі XI–XIV стагоддзі, калі ажыццяўляліся інтэнсіўныя стасункі паміж Полацкам, Наваградкам і Вільняй.

Яскравыя доказы існавання гандлёвага шляху па Мядзелцы мы знаходзім на берагах яе вытока — возера Мядзел. Пра тое, што узбярэжжа возера ў даўнейшыя часы было шчыльна заселена, сведчаць вядомыя археолагам гарадзішчы і селішчы: ля вытокаў Мядзелкі, на паўвостраве Дубавым, каля вёсак Рыбкі, Стругалапы, Пасашкі і на востраве Замак. Гэты востраў кантраляваў усе ваколіцы і, напэўна, гандлёвы шлях. З усіх названых вышэй гарадзішчаў Замак найбольш захаваў рысы сваёй былой велічы: яго ўмацаваная частка і зараз узвышаецца на добры дзесятак метраў над наваколлем. Добра вызначаюцца валы і акружны роў. З вяршыні Замка выдатна праглядаецца амаль уся акваторыя возера. Пра старажытнасць паселішча на востраве сведчыць вялікі культурны пласт.

На паўднёвым беразе возера знаходзіцца вёска Волачак. Назва «Волачак» вельмі важны доказ існавання воднага шляху, бо паказвае на тое, што караблі з Мядзела ў Мястра трэба было цягнуць волакам.

Далей водны шлях працягваўся па возеры Мястра да пратокі Скема і праз яе выводзіў у Нарач. Абапал пратокі знаходзяцца два гарадзішчы. Вузкасць паласы сушы і, адпаведна, абмежаванасць у мінулым лясных і жывёльных рэсурсаў падштурхоўваюць да думкі, што прычына ўтварэння тут гарадзішчаў — гэта кантроль за водным шляхам, гандаль, рыба. Такія ж функцыі на возеры Нарач выконваў востраў Выспа, дзе ў сярэднявеччы знаходзіўся замак. З яго добра бачна пратока, часткі Нарачы і Мястра.

Магчыма, адгалінаванне гэтага воднага шляху праходзіла і праз Лынтупы, выкарыстоўваючы сістэмы рэк Бірвіта, Канчэгіна, Лынтупка, Страча, Вілія. Найбольш інтэнсіўна гэты гандлёвы шлях выкарыстоўваўся ў XIII стагоддзі пасля таго, як нізоўі Зах. Дзвіны апынуліся ў руках Лівонскага ордэна, які вёў няспынныя войны з суседзямі. Па гэтай прычыне Полацк, Віцебск і Смаленск траплялі ў Балтыйскае мора праз Дзісненска-Вілейскую рачную сістэму.

**Пытанні і заданні:**

1. У склад якіх старажытных дзяржаў уваходзіла Пастаўшчына?
2. Якім чынам род Зяновічаў звязаны з Пастаўскім краем?
3. Як утварыўся Пасаднік?
4. Што вядома пра пастаўскі замак?
5. Дзе праходзілі праз Пастаўшчыну водныя гандлёвыя шляхі? Знайдзі іх на карце.

# § 11. У Рэчы Паспалітай

**1. Пастаўшчына ў Лівонскай вайне (1558–1583).** Пасля заключэння ў 1569 годзе Люблінскай уніі — пагаднення аб дзяржаўна-палітычным саюзе ВКЛ (Княства) і Польшчы (Кароны) — Паставы ўвайшлі ў склад федэратыўнай дзяржавы Рэчы Паспалітай. Да аб'яднання дзве краіны падштурхнула агрэсіўная палітыка Маскоўскай дзяржавы, якая праводзіла актыўныя вайсковыя аперацыі па пашырэнні сваёй тэрыторыі на захадзе. Вайна 1558–1583 гг. паміж Рэччу Паспалітай (кароль Стэфан Баторый) і



Кароль Рэчы Паспалітай Стафан Баторый




Рускі цар Іван IV Грозны (Жахлівы)




Тракт Баторыя праз Пастаўшчыну

Маскоўскім княствам (цар Іван Грозны (Жахлівы)) увайшла ў гісторыю пад назвай Лівонская. У 1579 годзе Паставы выконвалі ролю важнага стратэгічнага пункта ў гэтым узброеным канфлікце. Войска Баторыя, якое складалася з польскіх, літоўскіх, беларускіх, венгерскіх і нямецкіх жаўнераў, збіралася да паходу ў ваколіцах Свіры (цяпер — Мядзельскі раён). 30 чэрвеня ў Свір прыехаў сам кароль, які правёў агляд конных аддзелаў князёў Радзівілаў і Яна Кішкі. Са Свіры армія рушыла праз Пастаўшчыну на Полацк. Армія ішла па так званым «тракце Баторыя» — дарозе, што злучала Вільню з Полацкам і вяла праз Пятроўшчыну, Сарочына, Манькавічы, Мястэчка, Савічы, Міхнічы, Лучай. У Паставах гарматы былі пагружаны на плыты і па рэчках Мядзелка і Дзісна адпраўлены пад Полацк. Гэткім жа чынам туды быў дастаўлены і перанасны мост, зроблены ў Коўне.



Воін ВКЛ. Пачатак XV ст.



Маскоўскія коннікі першай паловы XVI ст.



Беларуская шляхта XVI–XVII стст.

Праз Паставы праходзілі каралеўскія войскі, раздзеленыя на роты, харугвы; вершнікі, пакрытыя стальнымі шаломамі і панцырамі, мелі пікі, шаблі і па два ручныя пісталеты, прывязаныя да сёдлаў. Пяхота мела толькі стрэльбы.

**Сведчаць дакументы**: У літаратуры гэтыя падзеі апісаны так: *«...венгерская пъхота, по распоряженію короля, шла сухимъ путёмъ до Поставъ: отсюда на лодках, вмъсте съ орудіями и прочими тяжёлыми военными снарядами, она по ръке прибыла в Дисну». «Замойскій приказалъ перевезть всё приготовленное (орудія, порохъ, провіантъ и фуражъ) въ Ковно, оттуда вверхъ по Виліи въ Михалишки, изъ Михалишекъ сухимъ путёмъ въ Поставы. Потом въ Дисну, а оттуда Двиною въ Витебскъ...»*

**2. Пастаўскі маёнтак.** У XVII стагоддзі маёнтак Паставы быў падзелены на чатыры часткі, кожная з якіх мела сваю гісторыю. Яны часта пераходзілі ад адных уладароў да другіх рознымі шляхамі: перадачай у спадчыну сынам; у якасці пасагу пры замужжы; продажам з адных рук у другія. Пераважны час маёнтак знаходзіўся ва ўладанні роду Зяновічаў, хоць у некаторыя перыяды рознымі яго часткамі валодалі Радзівілы, Шорцы, Грудзінскія, Гуйскія, Бяганскія, Пацы.




Пастаўскія землі на карце Ашмянскага павета ў канцы XVI ст.

Палітычная і эканамічная стабільнасць у пачатку стагоддзя прывяла да росту насельніцтва і пашырэння будаўніцтва. У 1616 годзе каралеўскі сакратар Станіслаў Бяганскі пабудаваў касцёл на Гарадзішчы. У 1628 годзе дачка Мікалая Зяновіча Ганна Сафія выйшла замуж за кашталяна віленскага Альбрэхта Радзівіла, які і стаў уладаром цэнтральнай часткі Паставаў. З гэтай нагоды быў складзены інвентар маёнтка, у якім апісваецца тое багацце, якое атрымаў новы гаспадар. Так, акрамя будынкаў двара і фальварка, кароў і быкоў было 13 галоў, авечак — 17, свіней — 16, гусей — 12, курэй — 10. У тым жа інвентары даецца і апісанне мястэчка.



Пастаўшчына на карце Радзівіла. 1613 г.

На гандлёвай плошчы знаходзілася шэсць двароў гандляроў і рамеснікаў, на вуліцах-дарогах, што вялі на Мядзел, Друю і Глыбокае было, 26 двароў, на Зарэччы месцілася 17 двароў. Былі таксама два пасады на 8 і 9 двароў. У дакуменце называюцца прозвішчы мяшчан, якія жылі на рынку, на розных вуліцах і на Зарэччы. Сярод іх часцей называюцца: Бржазінскі, Адамовіч, Шчакатовіч, Сапрановіч, Лукашэвіч, Рамановіч, Залескі, Лагвіновіч, Цыган, Паўловіч, Хватовіч, Шымковіч, Тамашэвіч, Валянцэвіч, Фатовіч, Кабылянін, Казелка, Ваўковіч, Нікіпаровіч, Жыдковіч, Кравец. У мястэчку на той час былі млын і карчма.

У сярэдзіне стагоддзя ўсе часткі Паставаў былі аб'яднаныя пад уладай Зяновічаў. У 1692 годзе ў мястэчку налічвалася 142 двары, пражывала 994 жыхары.

У 1613 годзе на карце Т. Макоўскага «Вялікае Княства Літоўскае», выданне якой фундаваў князь Мікалай Радзівіл, нанесены паселішчы нашага краю: Паставы, Лучай, Ожунічы (Ажуны), Олбій (Голбія), Полава, Дунілавічы, Лынтупы, Камаі, Гадуцішкі, Асінагарадок.

**Сведчаць дакументы**: У інвентары А. Радзівіла 1628 г. пра Паставы паведамляецца наступнае: «Спачатку драўляны касцёл з усім прыналежным начыннем і плябанія каля яго, карчма з белай ізбой і пякарняй, драніцамі ашаляваная, на вуліцы, што ідзе да Зарэчча, царква пад тытулам святога Мікалая з усім начыннем».

**3. Пастаўшчына ў вайне Расіі з Рэччу Паспалітай (1654–1667) і Швецыяй (1655).** У другой палове XVII стагоддзя Рэч Паспалітая перажывала часы заняпаду. Вясной 1602 года пачалася эпідэмія, шмат людзей вымерла. У гэты ж час з-за кепскіх кліматычных умоў загінуў ураджай, пачаўся страшны голад. Таму «много множество людей убогих с голоду» сталі ўцякаць з галадаючых раёнаў.



Гусар XVII ст.



Маскоўскія стральцы XVII ст

Вялікі ўплыў на пагаршэнне эканамічных умоў жыцця аказала так званая «невядомая вайна» 1654–1667 гадоў, якую распачала Расія супраць суседняй дзяржавы. Руская армія, імкліва рухаючыся на захад, пакідала за сабой спапялёную зямлю. Спачатку мясцовае насельніцтва аказвала актыўную падтрымку захопнікам у спадзяванні пазбавіцца шляхецкага прыгнёту, аднак хутка расчаравалася ў палітыцы новых улад. Накіроўваючы войскі на тэрыторыю Беларусі, рускі цар Аляксей Міхайлавіч даў загад разбураць і паліць усё на сваім шляху, а каб



Польскі кароль Ян Казімір. 1654 г.



Цар Аляксей Міхайлавіч Цішайшы (Крывавы)

разбурэнні былі шырэйшыя «назад идти целыми, жилыми месты».

Вайна пачалася вясной 1654 года, а ўжо ўвосень войскі графа Мацвея Шарамеццева захапілі Паставы. Мястэчка было разрабавана і спалена. Калі перад вайной у Паставах налічвалася каля 70 двароў, то ў 1672 годзе ў мястэчку і ваколіцах іх было толькі 5. Разбураны і разрабаваны былі і іншыя паселішчы на Пастаўшчыне. Тады ж быў спалены Камайскі касцёл, ад якога засталіся вежы і сцены. Захаваўся тапонім ля вёскі Гвоздавічы (за 2 км ад Камай) — «Шыбеніца», дзе вешалі католікаў, шляхту, і «Казацкая гара», дзе стаялі казакі Хаванскага, бо вёска была спалена. Каля вёскі Міхнічы ёсць тапонім «Маскоўскія могілкі». У час гэтай вайны загінуў кожны другі жыхар краіны.

Рускіх захопнікаў змянілі шведскія. Пасля Койданаўскай дамовы 1655 года аб уніі ВКЛ са Швецыяй на тэрыторыю Рэчы Паспалітай увайшлі войскі Карла X, якія занялі за некалькі месяцаў усю Польшчу і большую частку Літвы. Пакінулі яны свой след і на Пастаўшчыне. У 1655 годзе шведы абстралялі вежы камайскага касцёла, дзе знаходзіўся рускі гарнізон. Як напамін пра тыя падзеі ядры ад шведскіх гармат па загаду сына фундатара касцёла Пятра Рудаміны былі ўмураваны ў 1661 годзе ў расаднай сцяне храма. Не шкадавалі шведы і сялян: забіралі коней, фураж, марадзёрнічалі. Гэта выклікала адпор з боку мясцовых жыхароў, прывяло да партызанскіх выступленняў. Вайна Рэчы Паспалітай з Расіяй скончылася ў 1667 годзе Андрусаўскім перамір'ем. Пачалося аднаўленне разбуранай гаспадаркі і адбудова спаленых дамоў.

**Сведчаць дакументы**: Ваявода А. Трубяцкой паведамляў цару: *«идучи дорогою, сёла и деревни и сено и всякие конские кормы мы... по обе стороны жгли и людей побивали и в полон имали, и разоряли совсем без остатку, и по сторонам потомуж жечь и разорять посылали».*

**4. Пастаўшчына ў вайне Расіі са Швецыяй (1700–1721).** Канец XVII стагоддзя быў адносна спакойны, што паспрыяла эканамічнаму аднаўленню гаспадаркі і паступоваму росту насельніцтва. Аднак пачатак новага, XVIII стагоддзя супаў з перыядам чарговага зацяжнога ліхалецця. У 1700 годзе распачаліся вайна паміж рускімі войскамі Пятра I і шведскай арміяй Карла XII, якая восем гадоў вялася на тэрыторыі Беларусі. Яна прынесла незлічоныя страты, у яе полымі загінуў кожны трэці жыхар краіны. Паставы апынуліся троху ў баку ад асноўнага тэатра баявых дзеянняў, якія амаль спляжылі Гродзенскую губерню, але поўнасцю пазбегнуць навалы мясцоваму люду не ўдалося. Рабаўніцтвам займаліся размешчаныя тут вайсковыя аддзелы, а ў 1709 годзе праз Пастаўшчыну прайшоў корпус шведскага войска над камандаваннем генерала Левенгаўпта, які імкнуўся на дапамогу арміі свайго караля Карла XII. У складзе корпуса было 16 тысяч вайскоўцаў і 7 тысяч вазоў са зброяй і харчам. Маюцца звесткі, што ягоныя атрады праходзілі праз Паставы, Споры, Камаі. У гэты час зноў моцна пацярпеў камайскі касцёл, а ў Яцэвічах распавядаюць легенду пра тое, як касцёл, што стаяў тады на мясцовым гарадзішчы, праваліўся скрозь зямлю разам са шведамі, якія ўварваліся ў яго і пасеклі мячамі святыя абразы. Хутчэй за ўсё касцёл быў спалены, што сведчыць пра гвалт, які чыніўся захопнікамі ў дачыненні да мясцовых святыняў і мясцовага насельніцтва. Разам з вайной на жыхароў абрынулася і іншая пошасць: у пачатку XVIII стагоддзя край спасцігла вялікая засуха, а з 1708 па 1711 — эпідэміі розных хваробаў. Як адзначалася ва універсале 1711 года, у выніку эпідэмій некаторыя гарады і мястэчкі «сталі амаль пустымі», колькасць жыхароў у населеных пунктах зменшылася на 30–35%. Такія складаныя варункі жыцця прывялі да таго, што на Пастаўшчыне засталося ўсяго каля 9300 жыхароў.



Шведскі генерал Адам Левенгаўпт

**5. Народы і рэлігіі.** У выніку складаных этнічных працэсаў з фіна-угорскіх, балцкіх і славянскіх плямёнаў, якія пражывалі раней на Пастаўшчыне, сфарміравалася карэннае насельніцтва нашай мясцовасці — беларусы. Яны былі хрысціянамі, але належалі да розных яе плыняў. На ўсходняй частцы нашага краю, якая ўваходзіла ў Полацкае княства, большасць насельніцтва прытрымлівалася праваслаўя, жыхары ж Нальшчанскага княства былі паганцамі (язычнікамі). Іх далучэнне да хрысціянства адбылося пасля Крэўскай уніі, калі Вялікі князь Літоўскі Ягайла, стаўшы каралём Польшчы, у сваёй грамаце 1387 года аб'явіў аб прымусовым абарачэнні ў каталіцтва паганскага насельніцтва краю. У хуткім часе пасля гэтага на Пастаўшчыне і ў ваколіцах пачалі будавацца касцёлы: у Свянцянах ў 1414 годзе, Свіры — 1452, Лынтупах — 1459, Груздаве — 1443 і ў іншых паселішчах.

XVI стагоддзе, асабліва маскоўскае нашэсце 1567 года прынесла вялікае гора і страты мясцоваму жыхарству, паўплывала на рэлігійныя дачыненні. Абсалютная большасць драўляных касцёлаў была разрабавана і папалена. Таму эканамічны рост у канцы XVI – першай палове XVII стагоддзя прывёў да пашырэння каталіцтва, што адлюстравалася ў будаўніцтве новых касцёлаў: 1606 — у Камаях, 1610 — у Паставах, 1624 — у Дунілавічах. У 1640 годзе на выспе Гарадзішча ў Паставах быў пабудаваны кляштар францысканцаў з касцёлам.

Тым часам у нашай мясцовасці пачынае пашырацца уніяцтва. У 1595 годзе была заключана Брэсцкая царкоўная унія паміж праваслаўем і каталіцызмам. Згодна з ёй Вялікі князь ВКЛ Жыгімонт IV Ваза выдаў дэкрэт аб зліцці цэркваў. Такім чынам утварылася уніяцкая, «народная» царква. У інвентары маёнтка Паставы ад 1628 года згадваецца «царква пад тытулам святога Мікалая з усім начыннем».

Трэцяя хваля будаўніцтва касцёлаў прыпадае на другую палову XVIII стагоддзя. Тады ўзніклі каталіцкія храмы ў Лучаі ў 1776 годзе, Дунілавічах — 1769–73 гг.; зроблена прыбудова капліцы са склепам да касцёла ў Камаях (1778). У XVIII–XIX стагоддзях будаваліся і цэрквы, пераважна уніяцкія: 1756 г. — Груздава, 1713 г. — Паставы, 1782 г. — Асінагарадок, 1817 г. — Рымкі, 1830 г. — Ласіца.

У канцы XVII – пачатку XVIII стагоддзя на Пастаўшчыне пасяліліся на сталае жыхарства значныя групы ўцекачоў з Масковіі.

Гэта маскалі-стараверы, гнаныя рэлігійнай нецярпімасцю з Расіі, знайшлі прытулак на нашай зямлі. Яны пасяляліся ў найменш асвоеных частках раёна ў мясцовасці, дзе зараз знаходзяцца вёскі Апідамы, Палессе, Кукляны, Белькі. Арыгінальныя асаблівасці мовы, побыту і традыцый захаваліся ў гэтых мясцовасцях да нашых дзён.

Даволі многа было палякаў, пераважна шляхецкага паходжання, але вызначыцца дакладна з іх колькасцю немагчыма, бо ў часы Рэчы Паспалітай панавала польская мова і культура.

Мясцовае насельніцтва заўсёды вызначалася верацярпімасцю, аднак дзяржаўныя ўлады ў розныя часы праводзілі сваю палітыку ў дачыненні да рэлігій, спрыяючы якой-небудзь адной і абмяжоўваючы другія. Да падзелу Рэчы Паспалітай у канцы XVIII стагоддзя прыярытэтнай рэлігіяй быў каталіцызм. У 1658 годзе сойм краіны нават прыняў закон аб выгнанні з краю кожнага, хто адмаўляўся ад каталіцкай веры.

Татары патрапілі на Пастаўшчыну ў канцы XIV стагоддзя, калі князь Вітаўт здзейсніў свой паход у Кіпчацкія стэпы і ўзяў у палон тысячы татараў з сем'ямі, якіх потым рассяліў па Літве. Маёнтак Вітаўта быў у Цырклішках каля Свянцянаў, і ён пасяліў татараў у вёсках на ўсход ад рэзідэнцыі: у Жардэлях, Субачах, Яўнелішках і некаторых іншых. Службовая татарская знаць атрымала шляхецкія правы і ператварылася паступова ў феадалаў (татар-зямян), уладальнікаў маёнткаў, фальваркаў, вёсак. Рэшта ж перасяленцаў стала звычайнымі хлебаробамі, асела ў гарадах і мястэчках, займалася вырабам скур, меднага посуду, рамізніцтвам. У Паставах да сённяшняга часу захавалася гістарычная назва месца, дзе татары займаліся апрацоўкай скур — Гарбарка.



Касцёл у Лучаі

Паколькі татарам было дазволена браць у жонкі мясцовых дзяўчат, то паступова адбывалася асіміляцыя татарскага насельніцтва, славянізаваліся

рысы твару, мяняўся побыт, роднай мовай станавілася беларуская. Да татарскіх прозвішчаў можна аднесці наступныя: Мухля, Палтаржыцкі, Гімбіцкі, Якубоўскі, Кірэй, Мурза, Александровіч, Асановіч, Ільясевіч, Лебедзь, Тамашэвіч. Мясцовыя татары былі мусульмане, прытрымліваліся ісламу суніцкага толку. Суніты лічаць законнымі спадчыннікамі Мухамеда трох легендарных халіфаў — Абу-Бекера, Амара і Асмана — і таму прызнаюць толькі тыя паданні пра прарока (суны), якія ўзніклі пры іх.

Рэлігійным цэнтрам мясцовых татараў доўгі час быў Мядзел, дзе знаходзілася мячэць. Каля Мядзела на паўвыспе возера Мястра месцяцца вялікія татарскія могілкі (мізар).

З часамі княжання Вітаўта звязана і з'яўленне ў нашай мясцовасці яўрэяў. У XIV–XV стагоддзях адбываецца масавая эміграцыя прадстаўнікоў гэтага народа на тэрыторыю ВКЛ з заходніх краін, пераважна з Нямеччыны, дзе супраць яўрэяў чыніўся



Царква ў Рымках



Мячэць у Старым Мядзеле



Яўрэйскія пахаванні ў Паставах

цяжкі ўціск і гвалт (асабліва пасля крыжовых паходаў). Ужо ў пачатку XVI стагоддзя яўрэі занялі значныя пазіцыі ў эканоміцы ВКЛ. На Пастаўшчыне яўрэі мелі права сяліцца ў пяці мястэчках: Паставы, Дунілавічы, Камаі, Лынтупы, Лучай, Манькавічы. Іх доля ў асобных мястэчках нашага краю складала ад 30 да 60%. Яўрэі прытрымліваліся сваёй веры — іудаізму. У Паставах дзейнічала сінагога і яўрэйскі малітоўны дом. Яўрэйскія культавыя будынкі знаходзіліся і ў іншых мястэчках.

Даволі доўга на Пастаўшчыне побач з рэлігіямі суіснавалі паганскія звычаі. Пра гэта сведчыць выпадак спальвання ведзьмы ў в. Мягуны. У 1615 годзе ў вёсцы быў масавы падзеж жывёлы. Адказнасць за гэта мясцовыя жыхары ўсклалі на аднавяскоўку Зофію Шупене, якую абвінавацілі ў зносінах з д'ябламі і ў чараўніцтве. А таму маці і сына-падлетка жыўцом спалілі на вогнішчы.

**Пытанні і заданні:**

1. Што такое Рэч Паспалітая?
2. Якую ролю выконвалі Паставы ў Лівонскай вайне?
3. Праз якія населеныя пункты праходзіў полацкі тракт Баторыя? Пакажы на карце.
4. Як выглядаў Пастаўскі маёнтак у пачатку XVII стагоддзя?
5. Чаму можна сцвярджаць, што так званая «невядомая вайна» была самай страшнай падзеяй для жыхароў Пастаўшчыны ў сярэднявеччы?
6. Чаму ў мясцовых легендах і паданнях часта згадваюцца шведы, а некаторыя курганы называюцца шведскімі магіламі?
7. Якія народы насялялі Пастаўшчыну ў сярэднявеччы?
8. Якія рэлігіі распаўсюджваліся ў нашым краі? Дзе знаходзіліся іх культавыя пабудовы?
9. Чаму на Пастаўшчыне мірна пражывалі прадстаўнікі розных этнасаў і розных веравызнанняў? Якую ролю ў гэтым адыгрываў Статут ВКЛ 1588 года?

# § 12. У складзе Расійскай імперыі

**1. Далучэнне да Расійскай імперыі. Паўстанне Т. Касцюшкі.** У другой палове XVIII стагоддзя Рэч Паспалітая губляла сваю былую веліч і прыходзіла ў заняпад. Гэтым скарысталіся яе суседзі Расія, Аўстрыя і Прусія. Яны правялі тры падзелы Рэчы Паспалітай, у выніку чаго краіна перастала існаваць. Па 2-м падзеле (1793) усходняя і цэнтральная часткі Пастаўскага раёна адышлі да Расійскай імперыі, а ў час 3-га падзелу (1795) у склад Расіі ўвайшла і Лынтупшчына. Многія слаі насельніцтва, асабліва шляхта, вельмі балюча ўспрынялі страту роднай краіны і расійскую акупацыю. Гэта незадаволенасць выявілася ў форме нацыянальна-вызвольнага паўстання за аднаўленне незалежнасці і суверэнітэту Рэчы Паспалітай. Кіраўніком паўстання быў генерал-лейтэнант Тадэвуш Касцюшка. Асноўныя сутычкі з рускімі войскамі адбываліся на тэрыторыі Польшчы і Літвы, аднак і Пастаўшчыну закранулі тыя бурлівыя падзеі.

У Беларусі і Літве паўстанне пачалося з выступлення часцей ВКЛ 16 красавіка ў Шаўлях. У ноч з 22 на 23 красавіка 1794 года паўстанцы захапілі Вільню. 28 красавіка мінскі генерал-губернатар Ц. Туталмін паведамляў князю М. Рапніну, што мяцежнікі павінны былі напасці на Мінск, сарвалі каля Нарачы пост і забілі 2 егераў, а 31 мая ён скардзіцца на тое, што ў ваколіцах Мядзела польскія жаўнеры абвяшчаюць універсалы віленскіх падбухторшчыкаў, з-за чаго сяляне не падпарадкоўваюцца рускім уладам, а выконваюць загады паўстанцаў. У пачатку чэрвеня каля 2000 мяцежнікаў пад кіраўніцтвам ваўкалацкага шляхціца генерал-маёра Зянькевіча накіравалася з Пастаў у Кабыльнікі. Ноччу насустрач ім выступілі з 4 гарматамі батальёны князя Валконскага, якія атакавалі



Кіраўнік паўстання 1794 г.



👁 Расійская імператрыца Кацярына II

паўстанцаў і разбілі ўшчэнт. Рэгіянальны цэнтр паўстання перамясціўся ў Ашмяны.

Актыўны ўдзел ў паўстанні прыняў гаспадар Болькава, ашмянскі чэснік Даніла Бучынскі, якога Т. Касцюшка 10 мая 1794 года прызначыў наменікам радцы Найвышэйшай Рады і загадчыкам аддзела Законнасці. Ён браў удзел ва ўсіх пасяджэннях Рады. У разгар паўстання выдаў адозву да землякоў, у якой заклікаў да паўстання. Пасля паразы паўстання эмігрыраваў. Праз 4 гады вярнуўся на Радзіму і стаў працаваць суддзёй, а з 1804 года падкаморым Завілейскага павета ў Паставах. У 1817 годзе арганізаваў збор ахвяраванняў на ўстаноўку помніка Касцюшку ў Вільні.

У верасні-лістападзе 1794 года рускія войскі пад камандаваннем генерала-аншэфа А. Суворава разбілі паўстанцкія атрады, захапілі Варшаву. Такім чынам, паўстанне было задушана.

**2. Пастаўшчына ў вайне 1812 года.** Пачатак XIX стагоддзя для жыхароў Пастаўшчыны выдаўся вельмі неспрыяльны. Шмат праблем прынесла краю вайна 1812 года паміж Расіяй і Францыяй. Ад французаў шляхта чакала незалежнасці краіны, а сяляне — адмены прыгону. Жыхары Віленшчыны аказвалі супраціўленне расійскай арміі: ад царскіх салдат хавалі па лясах коней, хавалі ад рэквізіцый харч і фураж, не давалі рэкрутаў у царскую армію, перашкаджалі адступаючым расійскім салдатам праводзіць тактыку «выпаленай зямлі» — разбураць масты, паліць вёскі і мястэчкі. Напачатку беларускія сяляне напалеонаўскіх жаўнераў сустракалі прыхільна, паказвалі дарогу, частавалі малаком і садавінай, разам з імі нападалі на маёнткі верных цару памешчыкаў. Але дачыненні сялян і «французаў» хутка змяніліся. Па вёсках, пакідаючы за сабой пустыя хлявы, свірны і адрыны, гойсалі напалеонаўскія рэквізітары.




Пастаўшчына на карце Дзісненскага павета 1801 г.



Французскі імператар Напалеон I

Пад выглядам ахвяраванняў забіралі фураж, харч. Сялянам прыйшлося хаваць быдла і пажыткі. Хаваліся ў лес ад французскіх салдат маладзіцы і дзяўчаты.

Уздоўж Полацкага тракту для французскай арміі былі створаны пастаянныя магазіны (базы), дзе канцэнтраваўся правіянт і фураж. Калі хто не выконваў паставак, то туды на тры дні ставілі чатырох салдат для экзекуцыі неплацельшчыка і прымушалі кожнаму французскаму салдату за гэта плаціць па 12 злотых у дзень. Расказвалі старажылы, што дзяцей ціскалі лавамі, каб тыя сказалі, дзе схаваны пажыткі.

Праз Пастаўшчыну ў пастаянных сутычках з рускімі атрадамі арміі Барклая дэ Толі прайшлі французскія войскі Жэрома Банапарта (брата Напалеона). Сам Напалеон праехаў праз Пастаўшчыну 17–18 ліпеня, калі накіроўваўся з Гадуцішак у Глыбокае. Існуе версія, што ён спыняўся на начлег у маёнтку князя Друцкага-

Любецкага ў Манькавічах, а каля палудня быў у Навадруцку, які перайменаваў у Парыж.

Напалеон распарадзіўся аб стварэнні стотысячнага войска Княства. Ад 75 двароў павінен быць пастаўлены 1 салдат з канём, з 50 двароў — 486 злотых. Было загадана сабраць тры мільёны пудоў жыта, 1,5 мільёна чвэрцяў аўса, па 2,5 мільёна пудоў сена і саломы, 60 тысяч галоў рагатай жывёлы і яшчэ шмат чаго.

У загадзе Напалеона ад 13 ліпеня 1812 года « Аб прызначэнні афіцэраў у Літоўскія палкі» значыцца палкоўнік Канстанцін Тызенгаўз (1781–1853) з Паставаў, які быў накіраваны камандзірам батальёна ў 19-ы полк. Ён браў удзел у бітве пад Лейпцыгам у складзе корпуса Ю. Панятоўскага. Пасля амністыі 1814 года пасяліўся ў Паставах.

Гэта вайна пакінула вялікі адбітак у памяці мясцовага люду, бо напалеонаўскія войскі паўсюдна займаліся гвалтам і рабаўніцтвам. Доўгі час з пакалення ў пакаленне перадаваліся апавяданні пра здзек, які чынілі французы з мясцовых жыхароў. На тэрыторыі раёна захавалася каля дзесяці курганных груп, якія маюць назву «французскія магілы».

Вайна 1812 года для беларусаў была братазабойчай: і на баку расійцаў і на баку французаў былі беларусы. Салдатам-беларусам лозунг «За веру, царя и отечество» нічога не гаварыў, бо вера ў асноўным была уніяцкай, цара беларусам навязалі, радзіма таксама была іншай: не Расія, а Княства. У баявых сутычках мог ваяваць брат з братам, сусед з суседам…

У гісторыі застаўся эпізод з гэтай вайны: каля вёскі Ажарава быў разбіты раз'езд французскіх войск маршала Даву. Французскіх салдат, якія загінулі ў гэтым баі, пахавалі на могілках каля Груздаўскай царквы.

Войскі Напалеона пацярпелі крах. Пасля Барадзінскай бітвы «вялікая армія» з вялікімі цяжкасцямі пад пастаяннымі нападамі рускіх адступала праз Беларусь. Французскія жаўнеры гінулі ад знясілення і маразоў, кідалі абозы з нарабаваным багаццем. На Пастаўшчыне з пакалення ў пакаленне перадаюцца паданні пра закапаныя напалеонаўскія карэты з золатам і каштоўнасцямі.

**Сведчаць дакументы:** 1. У лісце павятовай шляхты паведамлялася: *«Пастаянныя пераходы мнагалікіх войскаў аднялі ў нас усё: коней, жывёлу, адабралі ў нас падначаленых, неараная зямля стала пустыром».*

2. Вынікі вялікіх маразоў і знясільваючых уцёкаў былі такія, што, як успамінае відавочца: *«они падали друг на друга и, упадши не могли уже подняться. Лежавшие рассеянно, при сильном морозе, спалзывались в кучи, для согретия один другого, и после пришед в бессилие, дабы утолить голод… рвали зубами тело живых своих товарищей вместе с ними лежавших и ели отмороженные пальцы рук своих. Когда один солдат упал, другие раздевали его донага еще прежде последнего его издыхания, чтобы надеть на себя его лохмотья. Дома были сожигаемы для нагретия себя, и на каждом пожарище лежали целые кучи солдат, которые приближались к огню и не имели сил отойти при его распространении. Многие также, сидя на пожарищах, на мёртвых товарищах своих, жарили их и ели».*

**3. Паўстанне 1830–1831 гадоў. Узмацненне прыгнёту.** Землі Пастаўшчыны апынуліся амаль у цэнтры паўстання 1830–1831 гадоў, якое мела мэтай барацьбу з панаваннем «маскалёў» і аднаўленне незалежнасці ВКЛ. У Пастаўскім краі выступленне пачалося 11 красавіка 1831 года. Ініцыятарамі руху сталі браты Адольф і Станіслаў Кубліцкія з вёскі Палессе. Яны арганізавалі атрад з 20 чалавек і рушылі на Свянцяны. Да іх далучыўся Станіслаў Барткевіч з сынам і братам, шляхціц Адамовіч. Гарадскі гарнізон налічваў 140 салдат. Паўстанцы акружылі яго і прытаіліся. Наперад выйшаў капелан Ануфры Лабуць у белай комжы з крыжам і пісталетам і прапанаваў гарнізону здацца. Яго ранілі, а потым дабілі штыхом, але ён паспеў крыкнуць: «У атаку!» Свянцяны ўдалося захапіць. Паўстанцы выпусцілі з турмы зняволеных. Некаторыя з іх пажадалі стаць у шэрагі паўстанцаў. Здабылі трафеі: 80 вінтовак і 8 пудоў куль.



Сутычка паўстанцаў 1830–1831 гг. з царскімі войскамі

Паўстанцы стварылі Павятовы ўрад. Прэзідэнтам стаў Э. Мастоўскі, віцэпрэзідэнтам С. Барткевіч — завілейскі падкаморы, членамі ўрада: ксёндз-канонік В. Завадскі, земскі прэзідэнт Я. Шымкавіч, граф А. Гюнтэр —

член галоўнага вайсковага камітэта, М. Вайніцкі, Б. Чаховіч — завілейскі падкаморы, адвакат Ф. Свянтэцкі, суддзя М. Мікоша, асэсар С. Квінта.

Была распрацавана і разаслана па павеце адозва да жыхароў. Супраць дома, дзе быў урад, усталявана шыбеніца. Павет падзялілі на 26 парафій, у якія прызначылі інспектараў (камісараў). Так у Струнойці, Лынтупы, Клюшчаны быў накіраваны Прушынскі; у Свір, Войстам, Камаі, Гадуцішкі. Засвір, Кабыльнік — Невяровіч і Б. Чаховіч.

На зборны пункт у Свянцяны сабралася некалькі тысяч чалавек. На 5 мая было запланавана прыняцце прысягі, але гэта акцыя не адбылася. Да Свянцян падышоў двухтысячны атрад князя Хілкова, на ўзбраенні якога было 200 адзінак агнястрэльнай зброі, не быў распрацаваны план ваенных дзеянняў. Барткевіч спешна правёў ваенную нараду, дзе было вырашана пакінуць Свянцяны без бою і прыняць форму партызанскай барацьбы, а добраахвотнікаў адпусціць дадому да асобнага распараджэння, бо з вялікім неўпарадкаваным атрадам нельга дзейнічаць эфектыўна. З некалькіх тысяч паўстанцаў Барткевіч выбраў толькі пяцьсот: 300 добра ўзброеных інсургентаў і 200 коннікаў.

Хілкоў увайшоў у Свянцяны. Атрад Барткевіча падаўся ў Лынтупы, а праз суткі 6 мая рушыў на Камаі. Галоўныя сілы накіраваліся на Лужкі, выбраўшы карацейшую дарогу праз Саранчаны, Паставы, Мосар. Камандзіры царскіх войскаў Хілкоў, Атрошчанка і Балцэнталь вырашылі 8 мая акружыць і знішчыць меншую групу паўстанцаў. Але гэты план ім не ўдаўся па дзвюх прычынах: паўстанцы аказалі належнае супраціўленне, а ў лагеры расійскіх войск успыхнула эпідэмія халеры. Салдаты, гледзячы на паміраючых у канвульсіях сяброў, цэлымі групамі кідалі зброю і ўцякалі ад страху. У Лужкі рухаўся з Вілейкі праз Мядзел атрад Радзішэўскага, які злучыўся з атрадам Барткевіча. Аб'яднаная паўстанцкая групоўка налічвала каля 3000 добра ўзброеных паўстанцаў. 19 мая паўстанцы фарсіравалі Дзісну і рушылі на Казьяны, потым, абыходзячы гарнізон, на Тверач. Пасля няўдалай спробы захапіць Вільню, 26-тысячнае царскае войска нанесла паразу аб'яднаным сілам паўстанцаў, якія адступілі, перайшлі прускую мяжу і склалі зброю.

У час паўстання супраць расійскай акупацыі ў 1830–1831 гадах арганізацыйны і ваенны цэнтр паўстанцаў знаходзіўся ў Дзісненскім павеце і такім чынам Паставы апынуліся амаль у эпіцэнтры тых бурлівых падзей. Галоўная база паўстанцаў размяшчалася ў мястэчку Лужкі, а паўстанцкія атрады кантралявалі Пастаўшчыну. Васіль Дубоўскі, селянін памешчыка Тызенгаўза, знаходзіўся ў час ваенных дзеянняў у атрадзе С. Радзішэўскага, удзельнічаў у паўстанні са зброяй у руках. Пасля задушэння паўстання выракам суда гэты селянін быў аддадзены ў салдаты.

У маі 1831 пасля няўдалай спробы паўстанцаў захапіць Вілейку вызвольнае войска вымушана было адступіць і некаторы час размяшчалася ў Паставах.

Актыўны ўдзел у паўстанні прымаў уладальнік Паставаў Канстанцін Тызенгаўз, які знаходзіўся ў тайных зносінах з Дзісненскім «урадавым камітэтам», уладальнік маёнтка Ляхаўшчына Міхал Сямашка, уладальнікі маёнтка Кубаркі Адольф і Густаў Хомскія, уладальнік маёнтка Норыца Юзаф Лапацінскі і іншыя.

Паступова да восені 1831 года рускім войскам удалося ўсталяваць кантроль над Пастаўшчынай і актыўныя выступленні тут прыпыніліся.

Аб бітвах з царызмам ўдзельнікі паўстання расказвалі дзецям, у душах якіх загараўся патрыятычны агеньчык, жаданне прадоўжыць справу бацькоў.

Пасля паўстання, для таго, каб кампенсаваць страты, памешчыкі ўзмацнілі прыгнёт да такой ступені, што з сялян літаральна выціскалі сокі, абкладаючы непамернымі падаткамі і работамі. Да таго ж неўраджайныя гады ішлі адзін за другім. На працягу 30 гадоў неўраджаі былі 10 разоў.

З 1842 г. Паставы сталі цэнтрам Дзісненскага павета Віленскай губерні.

**Сведчаць дакументы:** 1. З рапарта Храпавіцкага:

*«У ваколіцах Лынтуп жыхары або ўжо злучыліся з Барткевічам, або засталіся ў сваіх маёнтках і з'яўляюцца больш схільнымі да паўстання, чым прыхільнікамі рускага ўрада».*

2. З тэксту адозвы Павятовага ўрада:

*1. Кожны жыхар з двух дымоў павінен паставіць аднаго воіна са зброяй. А з 50 дымоў — аднаго конніка з шабляй, пісталетам і дзідай.*

*2. Калі жыхар сам стары ці па іншых прычынах не можа ўзяць зброю — павінен апроч назначаных з дымоў наняць двух воінаў.*
*3. Людзі не абавязкова павінны быць выбранцамі, абы ўмелі страляць.*
*4. Адзіночная шляхта 20–40 гадоў выступае самастойна.*
*5. Калі за 4 дні загад не будзе выкананы, то вінаватыя караюцца смерцю і секвестрацыяй маёмасці.*

3. Афіцыйная справаздача пра становішча жыхароў сведчыць, што *«сяляне амаль не ведаюць хлеба, харчуюцца грыбамі і рознымі сырымі рэчывамі, якія нараджаюць хваробы; галеча страшная, а побач раскоша памешчыкаў; жыццёвыя сілы краю зусім вычарпаліся ў маральных і фізічных адносінах; расслабленне дасягнула апошняй мяжы».*

**4. Пастаўшчына ў паўстанні 1863–1864 гадоў.** Пасля задушэння паўстання 1831 года над нашым краем запанавала злавесная цішыня. На важнейшыя пасады ва ўстановах прызначаліся толькі рускія, стала праводзіцца татальная русіфікацыя, уводзілася жорсткая цэнзура, адукацыю перадалі ў рукі рускім чыноўнікам, якія зачынялі школы. У Свянцянскім павеце налічвалася 104 358 жыхароў, а школ засталося ўсяго 5 з 254 вучнямі, што складала 0,25% ад колькасці насельніцтва. Падрастала маладое пакаленне. Запаведзі і гераізм паўстанцаў 1831 года выхоўвалі ў яго патрыятызм, нянавісць да царызму і імкненне да незалежнасці. У канцы 50-х гадоў XIX стагоддзя на беларускіх землях ішла актыўная падрыхтоўка да паўстання за вызваленне ад прыгону і расійскага прыгнёту, за аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 года. Адным з кіраўнікоў паўстання быў Кастусь Каліноўскі, які выдаваў і распаўсюджваў газету «Мужыцкая праўда». Вядома, што два яе першыя нумары трапілі і на Пастаўшчыну. Прывёз іх аканом з маёнтка Каралінова Мацвей Пятроўскі. Газету чыталі і перадавалі з рук у рукі. М. Пятроўскі быў арыштаваны і высланы на катаржныя работы на 6 гадоў. Ста-



Паўстанцы 1863 г.



Зыгмунт Чаховіч, ураджэнец маёнтка Сурвілішкі, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863 г.




Медаль, якім царскі ўрад узнагароджваў удзельнікаў падаўлення паўстання 1863 г.

ражылы Камай і Мулараў сцвярджалі, што К. Каліноўскі быў у Камаях, выступаў у касцёле з заклікам да паўстання.

Паўстанне выбухнула 23 студзеня 1863 года, калі Цэнтральны нацыянальны камітэт выдаў маніфест з заклікам да выступлення. Яно пачалося стыхійна раней намечанага тэрміну, ішла падрыхтоўка да збройнага чыну. За кароткі час у паўстанцкую касу сабралі 2000 рублёў. Эдвард Ромер з вёскі Каралінова акрамя звычайнага падатку на карысць паўстання быў першым чалавекам з Літвы, які перадаў жончын залаты ланцужок.

Паўстанцы сталі дабываць і назапашваць зброю, у кузнях каваць косы для касінераў. У Свянцянскім павеце, у які тады ўваходзіла частка Пастаўшчыны, былі сфарміраваны 4 паўстанцкія атрады, якімі кіравалі Л. Нарбут, Ф. Віславух, С. Бухавецкі, Г. Чаховіч. Ужо ў першыя дні адбыліся сутычкі паўстанцаў з расійскімі салдатамі каля Свянцян. За 3 км на ўсход ад Лынтупаў, у вёсцы Свірдуны, стаіць помнік загінуўшым у змаганні за волю.

У павеце быў створаны Паўстанцкі камітэт, у які ўвайшлі К. Маслоўскі — прэзідэнт, А. Таньскі (Камаі) — скарбнік і Я. Жарпоўскі (Стахоўцы) — камісар. У абавязкі камітэта ўваходзіла вярбоўка добраахвотнікаў, збор сродкаў для паўстанцаў, інфармацыя аб руху царскіх войскаў і пасрэдніцтва паміж Народным Урадам і палявымі камандзірамі.

У лесе паміж Лынтупамі і Свянцянамі быў вызначаны зборны пункт для паўстанцаў. Ваенным Начальнікам прызначылі былога афіцэра царскай арміі Густава Чаховіча (Астоя). Перад атрадам была пастаўлена задача перайсці ў Вілейскі павет, каб злучыцца з атрадам Козела-Паклеўскага і паўстанцамі Нарачы (Вілейшчына), якімі камандаваў брат Густава — Лявон Чаховіч.



Помнік у в. Свідуны паўстанцам 1863 г.



Магіла паўстанца Ф. Даноўскага на могілках у Каралінове



Крыж Рымтаўтаў каля вёскі Радута

У сярэдзіне красавіка атрад Густава Чаховіча прайшоў каля Лынтуп, Камай, Кабыльніка і размясціўся ля возера Нарач. Тут чакалі амуніцыі, па якую да ўзбярэжжа Балтыкі былі адпраўлены злучаныя атрады ў колькасці 2700 паўстанцаў пад кіраўніцтвам Зыгманта Серакоўскага. Але зброі не дачакаліся, бо баржу Лапіньскага са зброяй праследаваў расейскі карабель, а перакладзеную на лодкі зброю ўтапіла бурай.

Мураўёў аддаў Свянцянскі павет цалкам у рукі ваенных, абклаўшы шляхту і духавенства вялікімі падаткамі. Так Шышка (Кабыльнік) павінен быў заплаціць 280 рублёў 75 капеек, Скірмунт (Шэметава) — 1710 рублёў, Бішэўскі (Лынтупы) — 312 рублёў 35 капеек. З сялян былі створана «сельскія каравулы», якім за кожнага злоўленага паўстанца плацілі па 2–3 рублі серабром, было загадана здаць усялякую зброю і забаронены выезд.

На Пастаўшчыне размяшчалася база паўстанцаў. Узначальваў яе Апалінар Танскі, які забяспечваў інсургентаў грашыма, а ў яго маёнтках Камаі і Бежаны нарыхтоўвалася харчаванне. Паплечнікам К. Каліноўскага і адным з кіраўнікоў паўстання быў ураджэнец Пастаўшчыны Зыгмант Чаховіч.

Нягледзячы на шырокі размах вызвольнага руху, паўстанне было падаўлена. Паводле загаду галоўнага начальніка Паўночна-Заходняга краю М. Мураўёва, якога за жорсткасць у народзе празвалі Шыбенікам, са Свянцянскага павета 138 чалавек разам з сем'ямі былі высланы ў Самарскую губерню, а іх маёмасць была распрададзена.

**Сведчаць дакументы**: 1. Звяртаючыся да беларускай шляхты, М. Мураўёў казаў: *«...помните, что если вы не станете здесь по своим мыслям и чувствам русскими, то вы будете здесь иностранцами и должны тогда покинуть этот край».*

2. Зыгмант Чаховіч зрабіў вялікі ўплыў на фарміраванне светапогляду і таленту вядомага беларускага паэта Янкі Купалы: пасля дванаццацігадовай катаргі былы паўстанец жыў у маёнтку М. Бясяды каля Радашковічаў, куды па кнігі часта наведваўся сын-падлетак суседа-арандатара.

**5. Пастаўская воласць.** Пастаўская воласць, як адміністрацыйная адзінка Расійскай імперыі, мела меншыя памеры, чым сучасны Пастаўскі раён. У воласці было 99 вёсак, сяло і мястэчка Паставы. Зямля знаходзілася ў карыстанні сялян, цэркваў і касцёла, а таксама арандатараў у фальварках і засценках уладанняў графа Тызенгаўза. Увесь лес таксама належаў графу. Высечкай, вывазкай і сплавам лесу займаліся сяляне. Асноўнымі сплаўнымі рэчкамі былі Лучайка, Бірвета і Дзісна.

Усе заводы, якія былі на тэрыторыі Пастаўскай воласці, знаходзіліся ва ўладанні Тызенгаўза. У м. Паставы на беразе р. Мядзелка знаходзіўся лесапільны завод, які прыводзіўся ў рух ад вады і пары, у суседнім з лесапілкай будынку месціўся маслабойны завод. Пры пастаўскім фальварку знаходзіўся гарэлачны завод, а пры фальварку Соўчына — вапнавы. У Полаве і Варапаеве існавалі дзве цагельні, але цэглу на мясцовыя патрэбы воласці прывозілі з заводаў Свянцянскага і Вілейскага паветаў. Да заводаў можна аднесці і сукнамяльню, якая была ўстроена пры Варапаеўскім млыне.

Для памолу збожжа сяляне карысталіся вадзянымі, ветранымі і валовымі млынамі, найбяднейшыя сяляне малолі зерне ручнымі жорнамі. У воласці было два мураваныя вадзяныя млыны, 4 ветракі і два валовыя млыны.

Сяляне, якія мелі невялікія надзелы зямлі або не мелі яе зусім, вымушаны былі займацца промысламі і рамёствамі: рабілі на продаж драўляны посуд — вёдры, кадушкі, карыты, кублы, сані, дроўні; займаліся бандарствам. Гарбарствам (вырабам скур) займаліся толькі дзве сям'і татар з м. Паставы. Амаль у кожнай вёсцы быў каваль. Шубы, кажухі, шапкі, боты, спадніцы і іншыя рэчы шыліся ў асноўным беззямельнымі сялянамі і адстаўнымі салдатамі. Гэтыя майстры хадзілі па хатах і абшывалі сем'і. Сяляне бліжэйшых да Паставаў вёсак займаліся рамізніцтвам. Яны вазілі ад яўрэяў хлеб у розных відах, ільнасемя, ільновалакно, транты і іншае ў г. Дынабург і на Свянцянскую станцыю чыгункі.



Вадзяны млын у в. Казлоўшчына. 1859 г.

Амаль ва ўсіх сем'ях адзенне было самаробнае, і таму кожны гаспадар клапаціўся пасеяць ільну столькі, каб яго хапіла на сямейныя патрэбы. У кожнай хаце можна было сустрэць кросны, з дапамогай якіх выраблялася палатно і сукно.

Сукно ішло на вопратку-сярмягу і на зімнія штаны; з палатна шылі кашулі, штаны, спадніцы і іншае. У крамах сяляне куплялі сітцы, баваўняны матэрыял, хусткі і іншае адзенне. Усе гэтыя прадметы ўжываліся імі толькі па святах і таму не патрабавалі вялікіх расходаў.



Палац Канткоўскіх у Саранчанах



Баляслаў Ялавецкі, ураджэнец Пастаўшчыны, арганізатар будаўніцтва чыгункі Новасвянцыны – Беразвечча

На развіццё Паставаў у канцы XIX стагоддзя вялікі ўплыў аказала пракладка чыгуначнай лініі Новасвянцыны – Беразвечча. У 1895 годзе пачаўся рух цягнікоў з Літвы да мястэчка, а ў наступныя два гады ён прадоўжыўся да Варапаева і Глыбокага.

Развіццё капіталістычных адносінаў прывяло да ажыўлення прамысловасці і ганлёвых стасункаў. Найбольшую групу прадпрыемстваў прадстаўлялі вінакурныя заводы. У Паставах іх было тры. Першы заснаваны ў 1880 годзе Канстанцінам і Густавам Пшаздзецкімі. На ім працавала 5 рабочых, выраблялася 5150 вёдзер спірту ў год. Другі завод заснаваў Юзаф Пшаздзецкі ў 1885 годзе. Гэты завод знаходзіўся ў арэндзе ў купца А. Пергамента; выраблялася на ім баварскае светлае піва, якое ў мястэчку называлі «пергаменцкім». Магутнасць завода — 59 тысяч вёдзер піва ў год. Працавала 6 рабочых. У 1900 годзе Пршаздзецкія заснавалі яшчэ адзін завод (упраўляючы А. З. Мазель), дзе выраблялася 100 тысяч вёдзер спірту ў год.

Генерал А. А. Брусілаў — кіраўнік школы парфорснага палявання



Дом афіцэрскай кавалерыйскай школы парфорснага палявання




СВИДѢТЕЛЬСТВО.

О ЯВКѢ КЪ ИСПОЛНЕНІЮ ВОИНСКОЙ ПОВИННОСТИ.

являлс: къ исполненію воинской повинности при призывѣ 1910 года и зачисленъ въ ратники ополченія второго разряда.

уѣзднымъ по воинской повинности Присутствіемъ дня 1910 года за №

Предсѣдатель Присутствія

Дѣлопроизводитель

👁 Пасведчанне аб вайсковай павіннасці Івану Ляўданскаму. 1910 г.



👁 Грошы Расійскай імперыі

У мястэчку дзейнічаў шкіпінарны завод, якім валодалі яўрэі. На ім выраблялася да 800 пудоў шкіпінару, 1500 пудоў смалы і дзёгцю, 3500 пудоў вугалю.

Каля сучаснай аўтастанцыі размяшчаўся вялікі цагляны завод. Ён працаваў 120–150 дзён у год і выпускаў цэглу сярэдняй якасці. Была спроба наладзіць выраб неглазураванай кафлі, аднак справа не пайшла з прычыны высокага сабекошту прадукцыі. У мястэчку дзейнічала народнае вучылішча, у якім навучалася 115 хлопчыкаў і 7 дзяўчынак, працавалі два настаўнікі. У 1880 годзе пачала дзейнічаць жаночая царкоўнапрыходская школа, у якой вучылася 23 дзяўчынкі. З 1895 па 1901 год у Паставах знаходзілася гаспадарча-агародніцкая школа, у якой вывучалі аграномію, садоўніцтва, таксатарства, пчалярства. Вялікая ўвага аддавалася спосабам перапрацоўкі і захавання сельгаспадарчай прадукцыі. Вырабы навучэнцаў экспанаваліся на выставах ў Вільні, Лібаве, Пабраддзі, Ноўгарадзе, дзе былі адзначаны 23 медалямі.

У мястэчку працавалі два доктары і тры фельчары, мелася адна вольнапрактыкуючая акушэрка. Нетрадыцыйнымі сродкамі лячылі людзей два знахары. Дзейнічала прыватная бальніца на некалькі ложкаў. Найбольш распаўсюджанымі хваробамі былі адзёр, воспа, шкарлятына, дыфтэрыя. Вялікіх эпідэмій не назіралася нават у

халерныя гады, але шмат людзей пакутавала ад тыфу, які існаваў амаль увесь час.

Для непрацаздольных людзей у Паставах быў адчынены прытулак. Утрымліваўся ён на сродкі маёнтка з гадавым асігнаваннем 3200 рублёў. Той, хто не трапіў у прытулак, жабраваў.

Вельмі часта здараліся пажары. Мястэчка гарэла амаль кожны год. За 5 апошніх гадоў XIX стагоддзя страты ад пажараў склалі каля 60 тысяч рублёў. Мястэчка пачатку стагоддзя вядома тым, што тут у час размяшчалася практычная афіцэрская кавалерыйская школа. Кіраваў школай генерал А. Брусілаў. Заняткі праводзіліся ў форме парфорснага палявання з вялікімі зграямі сабак, са страявымі, падрыхтаванымі конямі. У 1901 годзе ў парфорсным паляванні браў удзел вялікі князь Мікалай Мікалаевіч, афіцэры балгарскай і сербскай армій.

**Сведчаць дакументы**: У даведніку «Воласці і важнейшыя пасяленні еўрапейскай Расіі» (1886 год) пра Паставы напісана наступнае: *«г. Паставы, Пастаўскай воласці, Дзісненскага павета, Віленскай губерні, былое ўладальніцкае, размяшчаецца пры рацэ Мядзелка, двароў 66, жыхароў 726. Маюцца: царква праваслаўная, касцёл, сінагога, яўрэйскі малітоўны дом, школа, паравы млын, вадзяны млын, сукнавальня, 17 крамаў, 4 піцейныя дамы, 7 кірмашоў на год, базар па нядзелях».*

**Пытанні і заданні:**

1. Якім чынам вайна 1812 года закранула Пастаўшчыну?
2. Чаму шляхта Пастаўшчыны актыўна ўдзельнічала ў паўстанні 1830–1831 гадоў?
3. Якія паселішчы нашага краю звязаны з падзеямі паўстання 1863–1864 гадоў?
4. Прывядзі доказы таго, што расійскі ўрад на беларускіх землях праводзіў палітыку русіфікацыі.
5. Якія факты табе запомніліся пры чытанні пра Пастаўскую воласць?
6. Якія гістарычныя асобы XIX стагоддзя цябе прываблiваюць і чаму?Пра якіх з іх ты хацеў бы даведацца больш?

# § 13. Роля Тызенгаўзаў-Пшаздзецкіх у гісторыі краю

**1. Пераход Паставаў ва ўладанне Тызенгаўзаў.** У пачатку XVIII стагоддзя Паставамі валодаў сын К. У. Бяганскага старадубскі староста Ян Казімір Бяганскі з жонкай Аляксандрай з Крышпінаў. Рысы біяграфіі гавораць пра тое, што чалавек гэта быў даволі авантурны і рызыкоўны. У канцы XVII стагоддзя ўваходзіў у хаўрус разам з Агінскімі і Вышнявіцкімі, у 1710 годзе займаў пасаду маршалка Суда ВКЛ, а ў 1718 годзе на сойме ў Гародні быў абвінавачаны ў фальсіфікацыях каралеўскіх дакументаў, прыгавораны да пакарання смерцю. Пазбег трагічнага канца, схаваўшыся ў Гарадзенскім кляштары кармелітаў. Пазней зноў вярнуўся да палітычнай дзейнасці. У сужонстве меў сына і дачку Ганну. Сватаючы сваю дачку за пісара ВКЛ Бенядыкта Тызенгаўза, абяцаў даць 100 000 злотых пасагу, аднак напярэдадні вяселля паехаў да бацькі маладога і прапанаваў замест грошай маёнтак Паставы. Замена, відаць, была няроўная, бо Тызенгаўзы палічылі сябе пакрыўджанымі і справа дайшла да суда. Як бы там ні было, але ў 1722 годзе мястэчка пераходзіць да Бенядыкта Тызенгаўза, які атрымаў яго, ажаніўшыся з Ганнай — дачкой Бяганскіх. З гэтага часу і амаль да сярэдзіны XX стагоддзя Паставы знаходзіліся ва ўладанні роду Тызенгаўзаў.



Энгельбрэхт — першы з Тызенгаўзаў. Скульптура ў касцёле

Род Тызенгаўзенаў пачынаецца з мястэчка Tisenhusen, якое

знаходзілася на рацэ Везэр у Германіі. Па паданнях сям'і, Тызенгаўзэны былі рыцарамі ў дружыне пры замку графаў фон Вёльпе.

Прыкладна ў 1198 г. браты Энгельбрэхт і Тэадорык разам з прыкладна 1500 іншымі рыцарамі на 23 караблях прыплылі ў вусце Дзвіны, каб пашыраць хрысціянства сярод тутэйшых балцкіх плямёнаў, заснаваўшы Лівонскі ордэн. Браты-рыцары насілі белыя плашчы з выявай чырвонага мяча і крыжа над ім, адкуль і пайшла больш вядомая назва рыцараў Ордэна «браты па мячы», або «мечаносцы». Тызенгаўзы мелі ўласны герб «Буйвал». Адно з адгалінаванняў роду апынулася ў ВКЛ, і яго прадстаўнікі сталі ўплывовымі магнатамі.

У сям'і Бенядыкта і Ганны было восем дачок і тры сыны. Пасля смерці бацькі дзеці падзялілі спадчыну, але пазней, у 60-х гадах XVIII стагоддзя, Паставы перайшлі ва ўладанне надворнага падскарбія Вялікага Княства Антонія Тызенгаўза, які выкупіў у братоў і сясцёр іх часткі маёнтка.

**2. Антоній Тызенгаўз (1733–1785).** Антоній Тызенгаўз — адметная асоба ў гісторыі ВКЛ і Рэчы Паспалітай, займае выключнае месца ў гісторыі Пастаў. Ён быў не толькі буйным кіраўнікомрэфарматарам і фінансістам, але і высокакультурным і адукаваным чалавекам свайго часу. Кар'ера А. Тызенгаўза пачыналася бліскуча. Сын шмельцінскага старосты, новаспечаны граф адну за адной атрымоўвае высокія дзяржаўныя пасады: канюшы літоўскі, праз год — падскарбі надворны літоўскі і гродзенскі староста. На каранацыйным сейме сам кароль уручае яму ордэн Святога Станіслава. Новы манарх прызначае Тызенгаўза арандатарам каралеўскіх эканомій (сталовых маёнткаў), а таксама ўпраўляючым усіх каралеўскіх мануфактур. Вядома, гэтаму паспрыяла старое сяброўства: будучы кароль Станіслаў Панятоўскі і юны Тызенгаўз пасля нядоўгага знаходжання ў школе віленскіх езуітаў разам выхоўваліся ў Волчыне пры двары князёў Чартарыйскіх. Малады Антоній, як адзначаў біёграф Тызенгаўза І. Гібянскі, у паводзінах быў нязграбны, ведаў толькі польскую і латынь, але вылучаўся розумам, энергіяй і большай сур'ёзнасцю, чым Панятоўскі.

Атрымаўшы пасады, гродзенскі староста з уласцівым яму стараннем акунуўся ў справы. Ён паабяцаў каралю павялічыць у тры разы даходы ад эканомій, зрабіўшы іх узорнымі гаспадаркамі,



Антоній Тызенгаўз

адрадзіць старыя мануфактуры, узвесці новыя. Арыстакрат старой крыві, граф так напружана працаваў, што спаў усяго трычатыры гадзіны ў суткі. Ім былі распачаты вялікія рэформы, закладзена шмат мануфактур, разгорнута шырокае будаўніцтва ў Гродне і ў Паставах, закладзены асновы развіцця архітэктуры, балета, медыцыны, батанікі, іншых сфер культуры.

Прапрацаваўшы па трычатыры гады, многія з новых каралеўскіх мануфактур, якія не прыносілі прыбытку, пачалі закрывацца. Катастрафічна падаў даход з эканомій, затрымліваліся плацяжы працэнтаў па галандскай пазыцы. Распаўсюджваліся чуткі аб крадзяжах з казны, пра несумленныя здзелкі з замежнымі купцамі, пра неверагодную жорсткасць у абыходжанні з падначаленымі. Спецыяльная скарбавая камісія, правёўшы расследаванне, адхіліла Тызенгаўза ад кіравання фабрыкамі і эканоміямі. На яго Пастаўскае графства — вотчынныя ўладанні — быў накладзены штраф чатыры мільёны злотых. Тызенгаўз не змог унесці назначаную суму ў тэрмін, і маёнтак канфіскавалі.

Апошнія гады Антоній Тызенгаўз хварэў меланхоліяй, жыў у поўнай адзіноце. Памёр у Варшаве ў 1785 годзе, на пяцьдзесят другім годзе. Пахаваны ў Жалудку, вотчынным маёнтку.

У Гродне, у правым нефе старога езуіцкага касцёла



Палац у XIX ст.

пры калоне ў 1910 годзе графіня Марыя Тызенгаўз-Пшаздзецкая паставіла сімвалічны помнік свайму продку. Гэта вялікі, з шэразялёнага мармуру пастамент, на якім устаноўлена скульптура жанчыны ў смуткуючай позе, з пальмавай галінкай у руцэ. Зверху — вялікі медальён з барэльефам Антонія Тызенгаўза, пад ім надпіс: Антоній граф Тызенгаўз, староста Гродзенскі, казначэй Вялікага Княства Літоўскага. 1733–1785 гг.

Другая палова XVIII стагоддзя — гэта пара росквіту Паставаў. Антоній Тызенгаўз жабрацкае драўлянае паселішча ператварыў у каменны гарадок. У 60–80-х гадах было заснавана 8 прамысловых прадпрыемстваў, узведзена шмат барочных будынкаў, якія утварылі ў цэнтры горада закончаны архітэктурны ансамбль; на выездзе на Мядзел пачата будаўніцтва шыкоўнага палаца. У горадзе пачалі дзейнічаць тэатр, балетная і музычная школы, народнае вучылішча, бібліятэка. *«Литовский подскарбий Антоний Тизенгауз возвёл Поставы на высокую ступень в культурном отношении, построил много великолепных зданий, завёл бумажную и полотняную фабрики...»* («Живописная Россия»).

Для правядзення рэформ у Паставах А. Тызенгаўз напачатку заснаваў (у 1754 годзе) цагельны завод, які павінен быў забяспечыць патрэбы ў будаўнічых матэрыялах. У 1766–1967 гадах правёў індустрыялізацыю папяровай фабрыкі, якая існавала ў мястэчку з 1728 года. Паперня знаходзілася на р. Мядзелка, працавала пры дапамозе двух вадзяных колаў. На фабрыцы выраблялася шэсць сартоў паперы і картон, у тым ліку выпускалася гербавая папера з вадзянымі знакамі.

А. Тызенгаўзам была пабудавана фабрыка паясоў або персіярня, на якой на 24 станках выраблялiся паясы. За год вопытны майстар вырабляў звычайна не больш 8 паясоў з залатых і сярэбраных нітак на шаўковай аснове. Паводле некаторых звестак, паясы пастаўскай фабрыкі былі з аднаго боку чырвоныя, а з другога зялёныя, і каштаваў кожны з іх па 30 дукатаў (для параўнання: за два дукаты можна было купіць вала). Майстроў А. Тызенгаўз прывозіў з Германіі і Галандыі, рабочых наймаў на месцы з платай па 3 злотыя ў дзень.

У тыя ж гады ў мястэчку былі заснаваны ткацкія майстэрні, дзе на 26 станках выраблялiся ніткі, палатно, шалікі, капелюшы, дываны, карабельныя ветразі, карункі, ігральныя карты.

На левым беразе Мядзелкі быў адноўлены вятрак, а недалёка ад яго, на ўзвышшы, уладкавана гарбарня (зараз гарадскі парк Гарбарка), дзе татары, якіх спецыяльна прывезлі ў Паставы для арганізацыі гарабарнай справы і ўладкавання агародаў, займаліся апрацоўкай скур. Пазней на гэтым месцы быў знойдзены гаршчок з багдадскімі манетамі.

А. Тызенгаўз перабудаваў вадзяны млын на рацэ Мядзелка, які ў XVII стагоддзі ўзвёў Ян Ежы Зяновіч, а таксама адкрыў латунную майстэрню.

У цэнтры горада вядомым італьянскім архітэктарам Джузепе дэ Сака быў пабудаваны рынак у форме квадрата, будынак суда, школа, фабрыкі, піларама, маслабойня, дом заездаў, дом урача, дамы рамеснікаў. У сярэдзіне базарнай плошчы была ўзведзена арыгінальная пабудова, якое мела назву «ратуша».

Такім чынам, у канцы XVIII стагоддзя Паставы ператварыліся ў адзін з прыгажэйшых гарадкоў на ўсходніх абсягах Рэчы Паспалітай. Аднак ненадоўга, бо пасля смерці А. Тызенгаўза ў 1785 годзе мануфактуры паступова прыйшлі ў заняпад.

Пасля яго смерці маёнтак перайшоў да пляменніцы Сафіі з Тызенгаўзаў, дачкі роднага брата Антонія — Казіміра, якая была замужам за ваяводам Францішкам Ксаверыем Хамінскім (1750–1809), «чалавекам вялікай вучонасці», які фактычна і кіраваў Паставамі на працягу амаль 20 гадоў. Пасля смерці Сафіі Хамінскай (пасля 1809 года), якая была бяздзетная, маёнтак перайшоў ва ўласнасць яе стрыечнага брата Ігнацыя Тызенгаўза (сына старэйшага брата Антонія Тызенгаўза Міхаіла), які ў 1814 годзе запісаў яго свайму сыну Канстанціну.

**3. Канстанцін Тызенгаўз (1786–1853).** Канстанцін Тызенгаўз нарадзіўся ў 1786 годзе ў мястэчку Жалудок на Гродзеншчыне. У 1804 г. у 18-гадовым узросце ён паступіў у Віленскі універсітэт. Адным з любімых выкладчыкаў Канстанціна быў знакаміты батанік праф. Станіслаў Юндзіл, які акрамя стварэння гербарыя мясцовай флоры пачаў збіраць калекцыю птушак і насякомых, чым моцна паўплываў на захапленні студэнта. Другім вядомым настаўнікам Канстанціна быў выдатны мастак Ян Рустэм, які напісаў адзін з двух вядомых на сёння партрэтаў К. Тызенгаўза.

У 26-гадовым узросце удзельнічаў у вайне 1812 года на баку Напалеона напачатку камандзірам батальёна 19-га літоўскага палка, а потым у корпусе Юзафа Панятоўскага. Канстанцін Тызенгаўз разам са сваім палком мужна змагаўся пад Вільняй, Кёнігсбергам, прымаў удзел у знакамітай абароне крэпасці Модлін, а потым і ў бітвах за Германію. У 1813 г. ён быў узнагароджаны Крыжам Ганаровай Легіі. Браў удзел у бітве пад Лейпцыгам.

За ўдзел у вайне супраць Расійскай імперыі уладарам Паставаў, як і ўсёй паспалітай шляхце, пагражала канфіскацыя маёмасці і выгнанне, аднак у маніфесце ад 12 снежня 1812 года імператар Аляксандр I аб'явіў ім «уселітасцівейшае агульнае і прыватнае дараванне, аддаючы ўсё мінулае вечнаму забыццю і глыбокаму маўчанню». Гэта амністыя дазволіла К. Тызенгаўзу пасяліцца на сталае жыхарства ў Паставах і вярнуць мястэчку былую славу і веліч. У першай палове XIX стагоддзя Паставы сталі вядомыя як навуковы і культурны цэнтр.

Менавіта пры Канстанціне быў дабудаваны Пастаўскі палац Тызенгаўзаў. Бо падчас жыцця Антонія былі ўзведзены толькі два бакавыя флігелі (кухонны і канюшанны), закладзены фундамент асноўнага будынка і заснаваны парк пейзажнага тыпу з сажалкамі. Па ініцыятыве Канстанціна ў палацы была ўзведзена каланада — парадны пад'езд. Паўночная частка палаца была цалкам прызначана для заняткаў навукамі і мастацтвам. Направа ад вестыбюля размяшчалася вялізная зала, прыстасаваная пад арніталагічны музей, налева — капліца. Былі таксама кабінеты заалогіі, мінералогіі і этнаграфіі краю. Злева знаходзіліся анфілады пакояў з ляпнінай і мармуровымі камінамі, сцены якіх упрыгожвалі палотны знакамітых мастакоў: Леанарда да Вінчы, Веранезе, Тынтарэта, Рубенса, Дзюрэра. У другую, больш сціплую палову палаца, дзе жыла сям'я Канстанціна, заязджалі з заходняга боку праз браму, куды выходзілі тры ганкі. Цэнтральны меў выгляд галерэі і вёў у жылое памяшканьне — вітальню і тры пакоі.

Жанаты з Валерыяй Ванькові́ч, Канстанцін меў дзвюх дачок: Алену (Helena) і Марыю, а таксама сына Райнольда.

Пры Канстанціне ў Паставах была створана карцінная галерэя і багаты арніталагічны музей з бібліятэкай. Асноўным заняткам К. Тызенгаўза і справай усяго яго жыцця сталася заалогія, а найперш — арніталогія. Разам са сваім таксідэрмістам



Партрэт Канстанціна Тызенгаўза



Стары замак у Рокішках. Малюнак К. Тызенгаўза

Міхалам Скіндэрам ён не толькі прэпарыраваў шматлікія экзэмпляры птушак і звяроў з навакольных мясцін Віленшчыны, але і ездзіў у экспедыцыі па краі і за яго межы (на Гарадзеншчыну, Піншчыну, у Карпаты, Падолію, Бесарабію, на ўзбярэжжа Чорнага мора). У 1829 і 1844 гадах ён быў у Парыжы і Вене, у 1841 годзе наведаў Дрэздэн, Мілан і Венецыю, у 1851 — Берлін. Некалькі разоў бываў у Варшаве. За няпоўныя 40 гадоў ён сабраў вялізарную нават па сённяшніх мерках калекцыю: каля 3000 відаў птушак з усяго свету, а таксама значную колькасць птушыных яек.

З 1831 года даследчык апублікаваў больш за 20 навуковых прац, напісаных польскай, лацінскай і французскай мовамі. У артыкулах пісаў, між іншым, пра вясновы пралёт птушак у наваколлі Пастаў, пра афарбоўку качак, пра еўрапейскія віды арлоў, пра звяроў і рыб Беларусі, пра цікавыя назіранні за насякомымі. Але найбольш вядомыя кнігі Тызенгаўза, якія ён выдатна ілюстраваў уласнымі малюнкамі — яны і прынеслі яму заслужаную славу заснавальніка беларускай арніталогіі: «Асновы арніталогіі, або Навукі пра птушак» (1841) і «Усеагульная арніталогія, або Апісанне птушак усіх частак свету» (1843–1846). Гэтыя выданні да сённяшніх дзён не страцілі сваёй навуковай вартасці.

К. Тызенгаўз захапляўся жывапісам, меў мастацкую падрыхтоўку, добра маляваў, што дазваляла яму якасна ілюстраваць свае кнігі. Рабіў ён ілюстрацыі і для кнігі У. Тачаноўскага «Заалогія



Барэльеф К. Тызенгаўза

польскіх птушак» (1862). У арніталагічным музеі было некалькі тысяч узораў птушак і яек з Беларусі, Літвы, Украіны і іншых краін. Пры музеі мелася значная бібліятэка, якая складалася з кніг па арніталогіі, а таксама рэдкіх помнікаў польскага пісьменства, каштоўнага збору гравюр і сямейнага архіва, дакументы якога пачыналіся ад XIII стагоддзя.

Яшчэ пры жыцці Канстанцін Тызенгаўз быў прыняты ў сябры Навуковага Кракаўскага таварыства, Львоўскага сельскагаспадарчага таварыства і іншых навуковых таварыстваў па ўсёй Еўропе: у Парыжы, Варшаве, Рызе, Берліне і Дрэздэне.



Птушка. Малюнак К. Тызенгаўза

Ужо на сёмым дзесятку свайго жыцця ён пачаў падрыхтоўку да экспедыцыі ў Азію, аднак мара не здзейснілася: зімой 1853 года, прыехаўшы ў Парыж па справах выдання сваёй чарговай кнігі, К. Тызенгаўз раптоўна захварэў. Цяжка хворага, яго прывозяць на радзіму. 28 сакавіка, дачакаўшыся апошні раз веснавога спеву жаўрукоў, вучоны памёр. Пахаваны ў літоўскім горадзе Рокішкіс у крыпце касцёла св. Мацвея.



Грабніца Канстанціна Тызенгаўза ў Рокішках

**Дакументы сведчаць:** пляменніца Канстанціна Габрыэля Пузына пісала пра дзядзьку: *«Ён быў бацькам, панам і лекарам дамовым, а ягоныя спосабы супраць рожы і каўтуна былі слынныя на ўсе ваколіцы, адно, што захоўваў іх у таямніцы, як нейкі знахар. Падобна ж чыніў і са спосабам вырабу адмысловых сыроў, фабрыку якіх меў у адным са сваіх фальваркаў».*

**4. Райнольд Тызенгаўз (1830–1881).** Пасля смерці К. Тызенгаўза Паставы разам з больш чым дзвюма дзесяткамі маёнткаў перайшлі ў спадчыну ягонаму сыну Райнольду, які шмат у чым, асабліва ў культурніцкай дзейнасці, прадоўжыў справу бацькі. Райнольд атрымаў выдатную адукацыю і меў схільнасці да літаратурнай працы. Ён з'яўляўся аўтарам дзесяці кніг пераважна філасофска-асветніцкага зместу: «Што спрыяе сапраўднаму духоўнаму стану», «Адказ дзецям на ўласнае пытанне, чым заняцца пасля вывучэння навук», «Адказ дзецям на пытанне, для чаго і як трэба вучыцца музыцы», «Адказы бацькам на ўласныя пытанні, як выхоўваць дзяцей» і іншых.

У 70-я гады XIX стагоддзя Р. Тызенгаўз стварыў ў Паставах аркестрава-харавую школу, у якой вучыліся дзеці з мястэчка. Краваў ёй Пётр Шчука — таленавіты музыкант і педагог. У школе дзейнічаў аркестр, які набліжаўся па складу да малога сімфанічнага аркестра. У рэпертуары пастаўскага аркестра і хору было каля 30 опусаў: уверцюры, месы, маршы. Аркестр і хор бралі ўдзел у рэлігійных і свецкіх святах.

У 1856 годзе, выконваючы волю бацькі, Райнольд Тызенгаўз перадаў арніталагічную калекцыю ў музей Віленскай археалагічнай камісіі, у якім быў створаны арніталагічны кабінет. Аднак пасля здушэння паўстання К. Каліноўскага расійскія ўлады разглядалі музей старажытнасцяў як адзін з цэнтраў «польскай



Райнольд — апошні з Тызенгаўзаў. Скульптура ў касцёле



Палац у час свята «Звіняць цымбалы і гармонік» з выявай герба Тызенгаўзаў Буйвал



Пісьменніца Габрыела Пузыніна, пляменніца К. Тызенгаўза, пакінула ўспаміны пра пастаўскі палац

інтрыгі». Па загаду генерал-губернатара Мураўёва ў 1864 годзе ён фактычна быў зачынены. А замест Віленскай археалагічнай камісіі пачала працаваць іншая — «Комиссия для разбора и приведения в известность и надлежащий порядок предметов, находящихся в Виленском музеуме древностей». Найбольш каштоўныя экспанаты «рэвізавалі» і адпраўлялі ў Маскву...

У Паставах Р. Тызенгаўз бываў даволі рэдка — яго рэзідэнцыяй быў маёнтак ў Рокішках на Літве.

Райнольд Тызенгаўз не меў нашчадкаў і сваё багацце пасля смерці (1881) пакінуў сястры Марыі, якая была замужам за вядомым гісторыкам і пісьменнікам Аляксандрам Пшаздзецкім.



Упраўляючы графа Тызенгаўза з Савічаў

**5. Род Пшаздзецкіх.** Марыя Тызенгаўз-Пшаздзецкая нарадзілася ў 1823 годзе, атрымала добрае прыватнае выхаванне. Ад

бацькі навучылася музыцы, маляванню і арніталогіі. Брала ўрокі жывапісу ў самаго Дэлакруа, заснавальніка французскага рамантызму. Альбом з уласнымі выявамі кляштароў і касцёлаў яна падаравала Папу Рымскаму Леону XIII на яго залаты юбілей. Магчыма, гэта была свайго роду ўдзячнасць Папу за дазвол выйсці замуж за Аляксандра Пшаздзецкага. Жаніх даводзўся Марыі стрыечным братам і з прычыны роднаснасці крыві дазвол на шлюб трэба было браць у Рыме. Вяселле адбылося ў апартаментах бабулі нявесты Марыяны Тызенгаўз з Пшаздзецкіх у Варшаве 24 лістапада 1842 года. Разам з мужам Марыя жыла у Італіі, Францыі, Польшчы; Паставы наведвала вельмі рэдка. У 1871 годзе аўдавела. Пасля смерці брата Райнольда была вельмі багатая. Займалася дабрачыннасцю, шмат грошай ахвяравала на мастацтва і на будаўніцтва і падтрымку касцёлаў. З яе фундацыі быў узведзены касцёл св. Антонія Падуанскага ў Паставах, яна ж дала 5000 злотых праваслаўным вернікам на будаўніцтва царквы ў мястэчку пасля таго, як стары храм згарэў у агні пажару.



Канстанцін Пшаздзецкі. 1900 г.

Памерла Марыя Тызенгаўз-Пшаздзецкая у 1890 годзе ў Варшаве. У шлюбе з А. Пшаздзецкім мела сыноў Канстанціна і Густава.




Браты Пшаздзецкія

Пасля смерці М. Тызенгаўз маёмасць перайшла ў спадчыну спачатку да яе старэйшага сына



Сям’я графа Пшаздзецкага музіцыруе



Палац Тызенгаўзаў. Сучасны выгляд

Канстанціна, які ў сужонстве з Эльжбетай Плятэр-Зыберк меў пяць сыноў і дзвюх дачок. Канстанцін памёр у 1896 годзе, і маёмасць была падзелена паміж ягонымі нашчадкамі. Паставы дасталіся Юзафу (старэйшаму сыну), маёнтак Варапаева — Канстанціну, маёнткі ў Польшчы — Стэфану, малодшаму, Райнольду, — маёнткі ў Латвіі і Літве. Варта адзначыць, што апошні з Тызенгаўзаў — уладальнікаў Паставаў — Райнольд, яшчэ перад сваёй смерцю ў 1880 годзе запісаў маёнтак унуку сваёй сястры Марыі Юзафу Пшаздзецкаму, які нарадзіўся ў 1872 годзе.

Браты Юзаф і Канстанцін клапаціліся пра эканамічнае развіццё Пастаўшчыны. Пры іх удзеле была пабудавана вузкакалейка паміж Паняважам (Навасвянцяны) і Глыбокім (Круляўшчына), якая стымулявала развіццё гаспадаркі. Пшаздзецкія былі і самымі буйнымі землеўласнікамі: ім належала каля 16,5 тысячы дзесяцін зямлі.

Юзаф дамогся падцвярджэння расійскім Сенатам графскага тытулу роду Пшаздзецкіх.

Значную ролю ў пастаўскай спадчыне Тызенгаўзаў-Пшаздзецкіх адыграў малодшы з братоў, Райнольд. Вялікі ўплыў на яго выхаванне аказала бабуля Марыя Пшаздзецкая і, магчыма таму ён больш за іншых клапаціўся за тыя мастацкія каштоўнасці, якімі валодаў іх род. У 1914 годзе, перад Першай сусветнай вайной Райнольд перавёз у Варшаву на вуліцу Фоксаль фамільны архіў Тызенгаўзаў. У 1917 годзе ў час рэвалюцыйных падзей спрабаваў уратаваць

вялікую бібліятэку, перавёзшы яе з Паставаў у Смаленск. Далейшы лёс бібліятэкі пакуль што невядомы.

Наступленне Чырвонай Арміі 17 верасня 1939 года застала Райнольда Тызенгаўза ў Паставах. Перш чым назаўжды пакінуць родныя мясціны, ён выкупіў у Вільні ў антыкварных крамах кнігі свайго славутага дзеда і заехаў у родавы маёнтак Рокішкі, каб забраць некалькі палотнаў сямейнай калекцыі. Жыў спачатку ў Швецыі, пазней — у Швейцарыі. Напісаў цікавую манаграфію пра дзеда «Аляксандр, граф Пшаздзецкі (1814–1871) Сямейныя ўспаміны аб яго жыцці і справах».

Райнольд Пшаздзецкі пастаянна памятаў, што яго род вымірае, таму імкнуўся пакінуць як мага болей звестак аб сваёй фаміліі. У ягоных архівах засталіся запісы, якія сведчаць, што ён меў намер напісаць манаграфію пра Паставы.

Райнольд Пшаздзецкі, адзінокі і невылечна хворы, памёр у бальніцы Лазаны ў 1955 годзе.

**Пытанні і заданні:**

1. Як Паставы апынуліся ва ўладанні роду Тызенгаўзаў?
2. Што вядома з гісторыі роду Тызенгаўзаў? Якім гербам карыстаўся гэты род?
3. Якую ролю ў развіцці Паставаў адыграў Антоній Тызенгаўз?
4. Чаму можна сцвярджаць, што пра Канстанціне Тызенгаўзе Паставы сталі навуковым і культурным цэнтрам?
5. Якімі справамі ўвайшоў у гісторыю Паставаў Райнольд Тызенгаўз?
6. Што зрабілі для Пастаўшчыны прадстаўнікі роду Пшаздзецкіх?

# § 14. Грознай вайны навала: Першая сусветная

**1. Пачатак вайны.** Самотны лёс Беларусі… Няма такога стагоддзя ў яе гісторыі, якое прайшло б без войнаў, пажараў, крыві і слёз. Пачатак XX стагоддзя не стаў выключэннем. Першая сусветная вайна лютай віхурай пранеслася па зямлі беларускай, пакідаючы за сабой чорны след абгарэлых вёсак, маршчыны траншэяў ды рады крыжоў над невялікімі насыпамі зямлі. Яе рэха ўжо губляецца ў новых лясах і сярод хат адбудаваных нанова вёсак і гарадоў. І ўсё ж сям-там можна сустрэць яе сляды. Асабліва добра захаваліся яны ў межах Пастаўскага і Мядзельскага раёнаў, што звязана з размяшчэннем тут на працягу амаль трох гадоў умацаванай лініі фронту.



Нямецкі аэраплан

Першая сусветная вайна пачалася 1 жніўня 1914 года, калі Германія аб'явіла вайну Расійскай імперыі. У выніку імклівага наступлення ў пачатку верасня 1915 года германскія войскі, прарваўшы фронт каля Свянцянаў, увайшлі на тэрыторыю Пастаўскага раёна. На лініі фронту атрымаўся выступ нямецкай абароны, які праходзіў праз Паставы, воз. Мядзел, воз. Нарач. Прычынай утварэння гэтага выступу стала вядомая аперацыя германскай арміі пад назвай «Свянцянскі прарыў», якая была праведзена напрыканцы лета-восені 1915 года. Тады пяць дывізій кайзера ўклініліся ў рускі фронт у раёне Свянцян (суч. Швянчоніс) і прымусіілі да адыходу каля дваццаці рускіх пяхотных дывізій больш чым на 80



Нямецкая артылерыя. 1916 г.

кіламетраў, а конны корпус генерала Гарнье зайшоў у глыбокі тыл дзесятай рускай арміі амаль на 120 кіламетраў, перарэзаў 19 верасня чыгунку Мінск – Масква ў раёне Смалявіч і заставаўся гаспадаром становішча на працягу тыдня. Толькі велізарным напружаннем сіл рускай арміі ўдалося ліквідаваць гэты прарыў і адцясніць немцаў да азёр Нарач і Свір.



Вярхоўны галоўнакамандуючы рускі імператар палкоўнік Мікалай II

На ўчастку фронту паміж Дзісной і возерам Свір падзеі падчас прарыву разгортваліся наступным чынам. Наступ нямецкай арміі пачаўся 9 верасня на мяжы двух рускіх франтоў — Паўночнага (глаўком генерал Рузскі) і Заходняга (глаўком генерал Аляксееў). Праз тры дні яны захапілі станцыю Нова-Свянцяны (суч. Швянчаняляй), а 14 верасня галоўныя сілы конніцы немцаў, рухаючыся на поўдзень, уварваліся трыма калонамі паміж азёрамі Нарач і Свір. Пазней былі захоплены Глыбокае і Докшыцы. Вялікімі намаганнямі ў канцы верасня рускім войскам удалося адцясніць нямецкую кавалерыю да лініі Паставы – воз. Нарач. У пачатку кастрычніка ў выніку жорсткіх кавалерыйскіх баёў рускія войскі занялі Паставы, але каля возера Задзеўскае сутыкнуліся з умацаванымі пазіцыямі германцаў. Дажджлівая восень і зімняя сцюжа прымусілі ворагаў прыпыніць актыўныя баявыя дзеянні. Размежаванне дзвюх армій праходзіла па населеных пунктах Галатыльцы – Вілейты – Мікулішкіч – Мажэйкі – Хацілы – Паставы – Рамелькі – Шыркі – Гутары – Гарані. У раёне горада Паставы лінія фрон-



Падрыхтоўка пазіцый рускай арміі

ту праходзіла ад паўночнага канца вуліцы Ленінскай, каля сучаснага ільнозавода і далей на вёскі Задзеўе, Споры, Параскі, Ідаліна. Фронт стабілізаваўся з выгадай для немцаў: пад іх кантролем знаходзіліся асноўныя камандныя вышыні Свянцянскіх градаў, што дазваляла сачыць за дзеяннямі рускай арміі на Полацкай і Нарачанскай нізінах.

Супрацьстаянне войскаў расцягнулася на тры гады. За гэты час немцы здолелі стварыць вельмі моцную сістэму абароны. Да сённяшняга дня добра захаваліся лініі траншэй, якія цягнуцца дзвюма-трыма стужкамі з поўначы на поўдзень уздоўж лініі фронту. На камандных вышынях будаваліся масіўныя жалезабетонныя бліндажы — доўгатэрміновыя ўмацаваныя кропкі.

Вайна прымусіла тысячы людзей пакінуць свае родныя мясціны, падацца ў бежанства. Тыя, хто застаўся, у прымусовым парадку накіроўваліся на будаўніцтва абарончых аб'ектаў. У такіх умовах рускімі ўладамі вузкакалейка Новасвянцяны – Глыбокае была заменена шырокай каляінай.

**2. Нарацкая аперацыя.** Пасля зімовага зацішша 18–28 сакавіка 1916 года рускія войскі зрабілі спробу прарваць фронт у раёне возера Нарач – Паставы. Гэтыя баявыя дзеянні ўвайшлі ў гісторыю пад назвай Нарацкая аперацыя і вядомы як адна з самых крывавых бітваў Вялікай вайны. Адбыліся жорсткія баі паміж войскамі 21-га корпуса нямецкай арміі і арміяй расійскага генерала Эверта. Непасрэдна ў Паставах супрацьстаялі 42-я пяхотная дывізія немцаў і рускія 27-ы і 34-ы армейскія корпусы пад камандаваннем генералаў Пляшкова і Сірэліуса. Каля Задзеўя і Дукоў рускім войскам 1-га армейскага і 1-га сібірскага карпусоў супрацьстаялі вайсковыя аддзелы 42-й нямецкай пяхотнай дывізіі. Германскія пазіцыі, якія ўмацоўваліся з восені, уяўлялі



Карта баявых дзеянняў у ваколіцах г. Паставы ў час Нарацкай аперацыі



Нарацкая аперацыя. Схема

сабой дзве, а месцамі і тры, абарончыя паласы, моцна прыкрытыя дротавымі загародамі.

З 18 па 26 сакавіка 1916 года пры падтрымцы артылерыі рускія войскі праводзілі масіраваныя наступленні на пазіцыі германскіх войск, аднак прарваць лінію абароны так і не ўдалося. На вынікі наступлення паўплывала і дрэннае надвор'е: некалькі дзён вісеў туман, наст быў крохкі і салдаты глыбока правальваліся ў снег. А да 20 сакавіка дарогі раскіслі, і забеспячэнне артылерыі снарадамі замарудзілася. Шматлікія ахвяры і складанасці пры правядзенні аперацыі вымусілі генерала Рагозу аддаць загад аб спыненні наступлення. Хоць рускія войскі мелі значную колькасную перавагу над немцамі, ліквідаваць Свянцянскі выступ расійскай арміі не ўдалося. З 26 сакавіка да 2 красавіка войскі



Камандуючы рускімі войскамі генерал Аляксей Эверт



Камандуючы германскімі войскамі Эрых Людэндорф



👁 Рускі ваенны чатырохматорны самалёт «Ільля Мурамец»

былі адведзены за раку Мядзелка на лінію Коскі – Аўласы, і адлегласць паміж передавымі пазіцыямі армій дасягала 2–7 кіламетраў.

З красавіка 1916 года актыўныя баявыя дзеянні каля Паставаў не вяліся. З лета германцы ўмацоўвалі лінію абароны, усталёўвалі бетонныя бліндажы, пракладвалі вузкакалейкі да перадавых пазіцый.



👁 У перадавым акопе

Супрацьстаянне армій прывяло да таго, што вёскі Дукі і Задзеўе былі зусім знішчаны, горад Паставы аказаўся моцна разбураным. Частку хат разабралі на ўмацаванні, частка згарэла ад страляніны. Тады ж разбураны і мураваны касцёл у Задзеўі. Значная частка жыхароў падалася ў бежанства, тыя ж, хто застаўся, былі вывезены немцамі ў лагер у Вільню, дзе многія паўміралі ад голаду і хваробаў. У час Нарацкай аперацыі людскія страты аказаліся вельмі вялікія: рускіх загінула каля 78 тысяч чалавек, германцаў — каля 34–40 тысяч.



👁 Дэманстрацыя супраць вайны ў Паставах. 1918 г.

**Дакументы сведчаць**: З успамінаў германскага генерала Э. фон Людэндорфа: *«З 18 па 21 сакавіка становішча 10-й арміі было крытычным. Рускія валодалі вялікай колькаснай перавагай... Заходней Паставаў іх атака з цяжкасцю адбіта. Напружанне войскаў, якія прымалі ўдзел у гэтай аперацыі, на глыбока размытай зямлі, у халоднае і золкае надвор'е, было вельмі вялікім. Падмацаванні, якія спешна падводзіліся намі, правальваліся ў балоце, з цяжкасцю прасоўваючыся наперад ад чыгункі Вільня – Дзвінск. Але рускія, якім прыходзілася па яшчэ менш спрыяльнай мясцовасці, чым тая, якая знаходзілася ў тыле нашых пазіцый, самі выдыхнуліся».*

**3. Помнікі гісторыі Першай сусветнай вайны.** Першая сусветная вайна пакінула на Пастаўшчыне свае адметныя сляды. Усе іх можна лічыць помнікамі гісторыі. Яны ўтвараюць 4 групы аб'ектаў: доўгатэрміновыя ўмацаваныя кропкі (бетонныя бліндажы), траншэі, чыгуначныя насыпы, могілкі і брацкія магілы. На лініі фронту германцамі былі створаны дзве, а месцамі і тры паласы абароны. Кожная паласа мела 2–3 траншэі, прыстасаваныя для стральбы са дна рова. Праз кожныя 15–30 метраў размяшчаліся траверсы. Траншэі былі накрыты стралковымі шчытамі — казыркамі з бярвенняў, якія ахоўвалі салдат ад асколкаў. Уся сістэма абароны была выдатна прыстасавана да мясцовасці.

Зараз у ваколіцах вёскі Задзеўе, асабліва паміж азёрамі Задзеўскае і Загацце, сустракаецца вялікая колькасць жалезабетонных бліндажоў. Гэта вялікі абарончы комплекс, бадай, буйнейшы на Пастаўшчыне. Умацаваная паласа працягнулася па высокай градзе ўздоўж ракі Спарыца. Значныя комплексы бліндажоў захаваліся каля вёсак Свілелі, Шыркі, Споры, Параскі.



Германскія грошы часоў Першай сусветнай вайны

Каб стварыць такую сістэму абарончых збудаванняў, патрэбен быў час і неабходны матэрыял. Для задавальнення патрэб




Германскія салдаты ў Лынтупах. 1916 г.




Пашпарт, які выдаваўся жыхарам акупаваных германцамі тэрыторый

фронту немцы пабудавалі сістэму чыгунак. Рэшткі чыгуначных насыпаў яшчэ выдзяляюцца ў рэльефе ў некаторых мясцінах. Галоўную ролю выконвала чыгунка Вільня – Полацк і станцыя Гадуцішкі. Каля вёсак Мольдзевічы і Ярэва чыгункі веерам разыходзіліся да лініі фронту. Паўночны сектар выступу забяспечвалі два адгалінаванні: на Свілелі і на Мажэйкі.



Каменны крыж на нямецкіх могілках Першай сусветнай вайны

Для забеспячэння патрэб паўднёвай часткі фронту была пабудавана паўднёвая чыгунка, якая праходзіла амаль паралельна лініі фронту з Мольдзевіч на Малую Вольсю, Рудзі, Мацуты, Шкіралі, Рубеж, Барадзіно. Ад гэтай Паўднёвай чыгункі ў бок лініі фронту адыходзілі адгалінаванні на Дукі, Загачча, Споры, Крэўна.

Сказаць дакладна, ці ўдалося немцам поўнасцю ўвесці ў дзеянне ўсю гэту сістэму чыгунак, сёння, бадай, не магчыма, але на нямецкіх ваенных картах яны ўсе зафіксаваны.

На лініі фронту і ў бліжэйшым тыле існавала шмат пахаванняў загінуўшых салдат. Частка з іх захавалася, многа знішчана людзьмі. На сённяшні дзень вядома месцазнаходжанне 24 могільнікаў нямецкіх салдат і адна брацкая магіла рускіх.

Уяўленне аб знешнім выглядзе могільнікаў можна скласці на падставе апісання нямецкага пахавання каля вёскі Пятроўшчына. Яно знаходзіцца каля рэчкі на першай надпоплаўнай тэрасе. Мае памер 20×40 метраў, налічвае каля 56 магіл, з якіх 18 разбурана. Пахаванні размяшчаюцца ў тры рады. Каля рэчкі ёсць абеліск, які складзены вялікімі камянямі. Надмагільныя пліты сустракаюцца двух тыпаў: бетонныя квадратныя з рэльефам у выглядзе крыжа і бетонныя літыя ў форме крыжа прымацаваныя на камянях. Пліты раскіданыя хаатычна. Усяго іх налічваецца 23.

У ваколіцах Паставаў нямецкія могільнікі знаходзяцца каля вёсак Дварчаны, Споры, Мажэйкі, Ярэва, Свілелі, Параскі. Даволі вялікія могілкі існавалі на захад ад Дукоў, але іх знішчылі ў час будаўніцтва аэрадрома, калі ў гэтым месцы распрацоўвалі пясчаны кар'ер.

Сляды Першай сусветнай вайны з'яўляюцца напамінам аб тых трагічных падзеях у гісторыі чалавецтва і таму патрабуюць ашчадных адносін і аховы.

**Пытанні і заданні:**

1. Якія падзеі ўвайшлі ў гісторыю пад назвамі «Свянцянскі прарыў»?
2. З якой мэтай праводзілася Нарацкая аперацыя? Чаму яе называюць самай крывавай падзеяй Вялікай вайны?
3. Чаму на заходнім беразе возера Задзеўскае многа мураваных бліндажоў?
4. Якія аб'екты з'яўляюцца помнікамі Першай сусветнай вайны?
5. Для чаго трэба зберагаць помнікі ваеннай гісторыі?
6. Пакажы на карце вёскі, праз якія праходзіла лінія фронту Першай сусветнай вайны.

# § 15. На крутым павароце гісторыі (1917–1921)

**1. Рэвалюцыйныя падзеі на Пастаўшчыне.** Пасля перамогі Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года склаліся абставіны, якія палітычныя партыі ацэньвалі па-рознаму. Бальшавікі лічылі, што рэвалюцыя павінна развівацца далей, бо на буржуазна-дэмакратычным этапе яна доўга не затрымаецца, а перарасце ў сацыялістычную. Меншавікі лічылі, што буржуазна-грамадскі лад праіснуе доўгі час, пакуль не будуць вычарпаны ўсе магчымасці капіталістычнага спосабу вытворчасці. Ліберальна-дэмакратычныя партыі адстойвалі ідэю прававой пераемнасці старой і новай улад, патрабавалі ўстанаўлення ў Расіі канстытуцыйнай манархіі ці, у крайнім выпадку, рэспубліканскага ладу. Часовы ж урад, каб спыніць развіццё рэвалюцыі і абмежаваць дзеянні радыкальнай грамадскасці, правёў серыю адпаведных заканадаўчых актаў па ўмацаванні ўлады буржуазіі.

У 1-й палове сакавіка 1917 года ў Паставах быў утвораны Савет салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. У вёсках пачалі арганізоўвацца сялянскія камітэты, якія пазней сталі асновай Саветаў сялянскіх дэпутатаў. Узброенае Кастрычніцкае паўстанне ў Петраградзе было прыязна сустрэта насельніцтвам Пастаў і салдатамі Пастаўскага гарнізона. Частка палкоў ужо 26 кастрычніка 1917 года правяла арышты штабоў, арганізавала перавыбары салдацкіх камітэтаў. Батарэі пачалі перамяшчацца да чыгуначнай станцыі, каб пры неабходнасці выступіць на падтрымку рэвалюцыі. У гэты час стыхійна і больш-менш арганізавана праходзілі мітынгі з удзелам меншавікоў і эсэраў. У вёсках Андроны, Цёплыя, Васіліны, Чарэмушнікі Падзісенныя, Кураполле, Бароўкі агітацыю распачалі прыхільнікі шляхціца Дамброўскага, а ў іншых населеных пунктах — графа Пшаздзецкага.

Прадстаўнікам бальшавікоў удалося арганізавана правесці шматлюдны мітынг у цэнтры Пастаў з мэтай падтрымкі ўлады Саветаў. Значны ўплыў на сітуацыю аказаў 2-і армейскі з'езд салдацкіх дэпутатаў 3-й арміі.

На рэвалюцыйны настрой насельніцтва Пастаўшчыны ўплывала і тое, што вярталіся ў родны край многія сяляне, якія

раней вымушана пакідалі яго і ехалі працаваць у Пецярбург, на шахты Данбаса і заводы Украіны. Там яны станавіліся рабочымі, пранікаліся пралетарскай ідэалогіяй. Вяртаючыся дамоў, яны распаўсюджвалі пралетарскія ідэі сярод землякоў.

Да сярэдзіны лістапада 1917 года ўся ўлада ў вайсковых часцях Пастаўскага гарнізона і ў горадзе, а таксама па ўсёй лініі фронту 3-й арміі перайшла да Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта, які назначаў камісараў ва ўсе аддзелы штаба арміі, у тым ліку і ў Пастаўскую воласць. У канцы лістапада 1917 года адбыліся перавыбары Пастаўскага валаснога савета, дзе да гэтага часу эсэры і меншавікі мелі перавагу. У выніку бальшавікі атрымалі ў ім большасць месцаў. На Пастаўшчыне пачаліся сацыялістычныя пераўтварэнні: уведзены 8-гадзінны рабочы дзень, усталяваны рабочы кантроль за вытворчасцю і размеркаваннем прадуктаў, пачалася нацыяналізацыя панскай маёмасці.

Валасны савет, у які ўваходзіла 16 мясцовых жыхароў, размяшчаўся ў фальварку Варапаева. У ліку першых ён распачаў дзейнасць па нацыяналізацыі панскай маёмасці. Для падтрымання парадку была ўтворана мясцовая міліцыя ў складзе 5 чалавек.

Аднак перабудова ажыццяўлялася нядоўга. 18 лютага 1918 года пачалі наступаць германскія войскі. Яны наступалі дзвюма групамі. Адна з іх, 10-я армія, што рухалася ў напрамку Мінск – Смаленск, ліквідавала савецкую ўладу ў Паставах. Пачаўся новы этап жыцця

У Паставах і воласці была адноўлена валасная ўправа. Кіраўнічыя пасады ў ёй занялі па-антысавецку настроеныя прадстаўнікі, якіх задавальнялі германскія парадкі і органы кіравання. Акупанты адмянілі ўсе дэкрэты савецкай улады. Загадам міністра земляробства Германіі ад 8 чэрвеня 1918 года аднаўлялася памешчыцкая ўласнасць. Памешчыкам вярталіся землі, інвентар. маёнткі, лясныя ўгоддзі, што належалі ім раней. У маёнтак Пшаздзецкага вярнуліся аканомы. Германскія ваенныя фарміраванні правялі шэраг мер па рэквізіцыі маёмасці і прадуктаў харчавання для патрэб арміі. Жывёлу вывозілі, склады рабавалі. За любое непадпарадкаванне сялян жорстка каралі. Каб пазбегнуць эканамічных цяжкасцей, пачаўся масавы адыход жыхароў з горада і воласці. Частка найбольш радыкальных жыхароў бралася за зброю. Восенню 1918 года ўзброеная барацьба ў тыле нямецкіх войскаў набыла масавы характар.

У такім стане Пастаўшчына сустрэла навіну аб лістападаўскай рэвалюцыі ў Германіі. Брэсцкае пагадненне было анулявана, і Чырвоная Армія уступіла на акупаваныя Германіяй землі. У 2-й палове лістапада 1918 года часці Чырвонай Арміі ўвайшлі ў Паставы, Маладзечна, Ліду, Баранавічы. Насельніцтва вітала яе як вызваліцельніцу.

**2. Мітынг у Андронах.** 15 снежня 1918 года у в. Андроны на мітынг сабралася каля 4 тыс. грамадзян. Ініцыятыву спрабаваў захапіць прыхільнік Дамброўскага Давыдовіч, але натоўп не даў яму слова крыкамі: «Не патрэбны нам ні памешчыкі, ні прыставы, ні земскія начальнікі!»

Іх вітаў прадстаўнік рэвалюцыйнага Петраграда Іван Новікаў. Ён расказаў пра задачы савецкай улады, яе першыя дэкрэты. Паведамленне, што зямля перадаецца без усялякага выкупу, было сустрэта гучнымі воклічамі. Ад мясцовых сялян на мітынгу выступілі Пётр Дзіковіч з в. Чарэмушнікі Падзісенныя, Цімафей Собаль з в. Цёплыя, Даніла Райчонак з в. Алашкі, Ганна Дзейніс з в. Янчыха. Яны заклікалі падтрымаць савецкую ўладу, разам з чырвонаармейцамі весці барацьбу супраць знешніх і ўнутраных ворагаў. На мітынгу быў выбраны рэвалюцыйны камітэт Пастаўскай воласці ў складзе Цімафея Собаля, Пятра Дзіковіча, Іосіфа Райчонка і іншых. У прынятай рэзалюцыі была адзначана аднадушная падтрымка намаганняў савецкай улады. Селянін Ягор Касцень прапанаваў паслаць тэлеграму на адрас У. І. Леніна. Вось яе змест:

*«Масква, Старшыні Савета Народных Камісараў таварышу Леніну.*

*Мы, сяляне Пастаўскай воласці Дзісенскага павета, вызваленыя ад нямецкіх бандытаў, рабаваўшых нас дзевяць месяцаў, пратэстуем супраць усіх гвалтаў і вітаем Вас, дарагі правадыр пралетарыяту ўсяго свету, і просім не дапусціць яшчэ рабаваць нас драпежнікам розных масцей.*

*З гэтага 15 снежня Пастаўская воласць будзе называцца Вашым імем, аб чым і просім Вас, дарагі Ільіч, даць згоду праз Свянцянскі ваенна-рэвалюцыйны Савет».*

Гэтая просьба была задаволена, пэўны час воласць значылася Ленінскай ва ўсіх дакументах.

У ходзе нацыяналізацыі камітэты беднаты прыступілі да падзелу памешчыцкай зямлі. У асноўным гэта былі ўладанні Пшаздзецкага (каля 16,5 тыс. дзесяцін). Першымі атрымалі іх беднякі вёсак Вінаграды, Полава, Янчыха і інш. Вясной 1919 года прыступілі да раздачы памешчыцкай маёмасці, жывёлы.

Адной з галоўных задач было навучанне пісьменнасці. Так, у складзе рэўкама быў утвораны аддзел народнай адукацыі на чале з Іосіфам Райчонкам, адкрыты першыя савецкія школы ў Варапаеве, Алашках, Полаве, Чарэмушніках Падзісенных, некалькі школ граматы для рабочых і сялян.

**3. Польская акупацыя 1919–1920 гг.** Пасля трох падзелаў паміж Расіяй, Прусіяй і Аўстрыяй у XVIII стагоддзі з карты Еўропы знікла буйнейшая дзяржава — Рэч Паспалітая. Патрыёты не маглі пагадзіцца са стратай незалежнасці і шмат разоў браліся за зброю пад сцягамі паўстанцаў. І толькі праз 123 гады 11 лістапада 1918 года была абвешчана незалежная польская дзяржава пад кіраўніцтвам Юзафа Пілсудскага. Створаная польская армія пачала ваенныя дзеянні супраць савецкіх войск. У канцы лютага 1919 года арміі Польшчы пачалі наступленне на адным са стратэгічных напрамкаў Вільня – Ліда – Маладзечна. Вясной польскія войскі прарвалі фронт і пад націскам перавышаючых сіл савецкія войскі вымушаны былі адступіць.

Пад польскай акупацыяй Паставы знаходзіліся з красавіка 1919 года да ліпеня 1920 года. Насталі часы вяртання да старой сістэмы. З'явіліся аканомы Пшаздзецкага, і зноў сяляне прымушаны былі вярнуць памешчыкам землі і маёмасць. Былі закрыты, як непатрэбныя, беларускія і рускія школы, таму што польская мова была аб'яўлена дзяржаўнай.



Пахаванні польскіх жаўнераў у Дунілавічах

Летам 1920 года Чырвоная Армія пачала насту-

пленне. З дапамогай партызан яна хутка прасоўвалася на захад. Асабліва цяжкія баі разгарэліся на тэрыторыі Глыбоцкага і ўсходняй часткі Пастаўскага раёнаў. Тут супраць польскага Паўночна-ўсходняга фронту на чале з генералам С. Шаптыцкім разгортвалася наступленне савецкага Заходняга фронту пад камандаваннем М. Тухачэўскага. Раніцай 4 ліпеня войскі 4-й арміі (камандарм Е. Сяргееў) прарвалі абарону польскіх войск і рушылі на захад. Вялікую ролю ў развіцці наступлення адыграў 3-ці кавалерыйскі корпус пад камандаваннем Г. Гая. Ужо 6 ліпеня яго вайскоўцам пасля ўпартых баёў удалося выйсці да ракі Дзісна і працягваць развіваць наступленне ў напрамку на Асінагарадок. Такое становішча вымусіла 1-ю польскую армію адступаць па дарозе Глыбокае – Дунілавічы праз Паставы і Свянцяны. У час гэтых баявых дзеянняў абодва бакі панеслі вялікія страты. Палякаў загінула больш за 2 тысячы, чырвонаармейцаў — больш 1,5 тысячы. Польскія ўлады ў пасляваенны час арганізавалі перапахаванне сваіх жаўнераў на могілках, якія як памяць тых часоў засталіся ў Дунілавічах, Паставах, Лынтупах. У Паставах на Рынкавай плошчы



👁 Юзаф Пілсудскі — начальнік Польскай дзяржавы



👁 Генерал Люцыян Жалігоўскі — кіраўнік Сярэдняй Літвы




👁 Землі Пастаўшчыны ў складзе Сярэдняй Літвы




Паштовыя маркі Сярэдняй Літвы

быў створаны мемарыял з асобных пахаванняў і брацкай магілы з абеліскам у выглядзе высокай чатырохграннай калоны з выявай арла ў навершшы.

У канцы ліпеня Пастаўшчына зноў стала савецкай. У валасцях адраджаліся рэвалюцыйныя камітэты. Так, старшынёй Антаноўскага савета была абрана Г. Дзейніс. Разам з іншымі рэўкамы аднаўлялі тое, што разбурылі і ліквідавалі польскія ўлады. Пасля прыняцця Дэкларацыі аб абвяшчэнні незалежнасці БССР 31 ліпеня 1920 года Пастаўшчына стала часткай незалежнай Беларусі. Але разлік савецкага боку на слабасць Польшчы быў памылковым. На хвалях патрыятызму Юзафу Пілсудскаму, начальніку Польскай дзяржавы, удалося ўтрымаць рабочых ад рэвалюцыйных выступленняў. Між іншым, Ю. Пілсудскі у часы сваёй маладосці часта бываў на Пастаўшчыне і Глыбоччыне, дзе ў Мосары быў маёнтак яго сваякоў.

Атрымаўшы новыя падмацаванні, войскі Польшчы прымусілі Чырвоную Армію адступаць. За кароткі тэрмін фронт з-пад Варшавы перамясціўся да Мінска. Аднак ні Польшча, ні Савецкая Расія не мелі магчымасці працягваць вайну. У ходзе перагавораў у Рызе 18 сакавіка 1921 года быў падпісаны мірны дагавор. Пастаўшчына, як і ўся заходняя частка Беларусі, увайшла ў склад польскай дзяржавы, у так званыя «крэсы ўсходнія».

Заходняя частка Пастаўшчыны (Камайшчына і Лынтупшчына) у 1920–1922 гадах уваходзіла ў склад Сярэдняй Літвы — польскай марыянетачнай дзяржавы на тэрыторыі Віленшчыны і Гродзеншчыны. Яна была ўтворана з мэтай далучэння да Польшчы Віленшчыны, якая паводле ўмоў польска-літоўскага пагаднення лічылася тэрыторыяй Літвы. Восенню 1920 года быў арганізаваны бунт польскага войска пад камандаваннем генерала Люцыяна Жалігоўскага быццам бы супраць «літоўскай акупацыі краю». На тэрыторыі, занятай часцямі Жалігоўскага, была арганізавана фар-

мальна незалежная ад Польшчы адміністрацыйная адзінка, якая атрымала назву Сярэдняя Літва. 20 лютага 1922 года сейм Сярэдняй Літвы прыняў рашэнне аб далучэнні яе да Польшчы.

**Пытанні і заданні:**

1. Колькі разоў на працягу 1917–1921 гадоў мянялася ўлада на Пастаўшчыне?
2. Як рэвалюцыйныя падзеі 1917 года ў Расіі паўплывалі на грамадскае жыццё ў нашым краі?
3. З якой нагоды некаторы час Пастаўская воласць называлася Ленінскай?
4. Якія ваенныя дзеянні адбываліся на Пастаўшчыне летам 1920 года?
5. Дзе на Пастаўшчыне знаходзяцца пахаванні польскіх жаўнераў?
6. Чаму наш край у 1921 годзе ўвайшоў у склад Польшчы?

## § 16. За польскім часам (1921–1939)

**1. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел.** Паводле ўмоў Рыжскай мірнай дамовы 1921 года да Польшчы адышлі этнічныя беларускія землі Гродзенскай, усходнія паветы Віленскай і заходнія паветы Мінскай губерняў. Гэтыя тэрыторыі разам з Вільняй і бліжэйшымі ўсходнімі паветамі Літвы, захопленыя Польшчай яшчэ ў 1920 годзе, атрымалі назву «крэсы ўсходнія». Яны складалі 113 тыс. км$^2$, насельніцтва — 4,6 млн. чалавек (1931). Галоўным горадам краю, яго культурным і навуковым цэнтрам, была Вільня.

Напачатку, у адпаведнасці з адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам у Польшчы, тэрыторыя Пастаўскага раёна ўваходзіла ў Дунілавіцкі павет. Пэўны час існавала і Пастаўскае староства ў складзе 3 раёнаў з цэнтрамі ў мястэчках Варапаева, Мядзел і Докшыцы. Раёны падзяляліся на меншыя адзінкі — гміны. Памеры гмін былі розныя. Адны з іх складаліся з сотняў, іншыя з некалькіх населеных пунктаў. Імі кіравалі войты. Так, у Пастаўскую гміну ўваходзілі 101 вёска, 9 леснічовак, 9 фальваркаў і 5 засценкаў, а ў Лучайскую гміну — 6 вёсак і 1 засценак. У вёсках прадстаўнікамі ўлад з'яўляліся солтысы. У кожнай гміне былі паліцэйскія пастарункі, дзейнічалі пакаёвыя, ці міравыя суды. Акрамя таго, існавала

вялікая армія акцызных і падатковых чыноўнікаў, секвестратараў, каморнікаў, леснікоў і іншых, якія былі выхадцамі з этнічнай Польшчы і ў адносінах да мясцовага насельніцтва праводзілі жорсткую ўрадавую палітыку.



Паставы Віленскія. Агульны выгляд. З польскай паштоўкі

У выніку рэфармавання ў 1925 годзе быў створаны Пастаўскі павет. У яго ўваходзіла больш за 1,3 тыс. населеных пунктаў, дзе пражывала каля 110 тыс. жыхароў. У адпаведнасці з польскім перапісам 1931 года палякамі лічылі сябе 49%, а беларусамі — 48%, астатнія з'яўляліся прадстаўнікамі нацыянальных меншасцей (рускія і яўрэі).

Практычна ў межах сучаснага Пастаўскага раёна на пачатак 1939 года мелася 3 мястэчкі, 170 вёсак, 14 маёнткаў, 28 фальваркаў, 72 хутары, 100 засценкаў. Найбольшай была Пастаўская воласць (больш за 16 тыс. чалавек), далей Груздаўская (больш за 11 тыс.) і Лучайская (каля 8 тыс.) воласць.

**2. Палітычныя і эканамічныя перамены.** У 1920-я – пачатку 1930-х гадоў польскі ўрад правёў зямельныя рэформы: парцэляцыю (продаж праз зямельны банк часткі памешчыцкай і дзяржаўнай зямлі), камасацыю (звядзенне дробных сялянскіх палосак у адзін участак з адначасовым высяленнем на хутар) і ліквідацыю сервітутаў (сумеснае карыстанне сялянамі і памешчыкамі выганаў, сенакосаў і пашаў). Адначасова праводзілася насаджэнне асаднікаў, большасць з якіх складалі былыя польскія вайскоўцы.



Базар у Паставах у 30-я гады XX ст.

Яны атрымлівалі па невысокім кошце, а часам і дарма, зямельныя ўчасткі ад 15 да 45 га. Такім чынам да канца 1939 года ў Заходняй Беларусі было расселена каля 10 тыс. асаднікаў. У выніку рэформ уладанні памешчыкаў значна паменшыліся, аднак памешчыцкае землеўладанне захавалася і сялянскае малазямелле не было ліквідавана. На Пастаўшчыне значным зямельным уладальнікам заставаўся Юзаф Пшаздзецкі. Частку сваіх уладанняў ён аддаваў у арэнду. У Дунілавічах і наваколлі буйнейшым землеўладальнікам заставаўся Юзаф Тышкевіч. Яго сядзіба размяшчалася ў Крыкалах. Драбнейшымі ўладальнікамі былі Павел Карэцкі (в. Міхаліна), Аскерка Яніна (в. Крыкалы), Варанкевіч Антон (в. Сарокі), Варанкевіч Ян (в. Лісуны).



Жэтоны са шклозавода «Гута»

Самым буйным уласнікам нерухомасці быў граф Канстанцін Пшаздзецкі. У фальварку Варапаева ён трымаў дзесятка паўтара коней, меў 2 аўтамабілі (летні і снегаход), 2 маторныя лодкі. У 1933 годзе ўладанні К. Пшаздзецкага наведаў прэзідэнт Польшчы Ігнацій Масціцкі. Ён начаваў у графскім палацы, а на наступны дзень прысутнічаў на адкрыцці 90-кіламетровай вузкакалейкі Варапаева — Друя, якую праклалі за 3 гады.

Перанаселеная вёска не мела адтоку ў прамысловасць, таму ў пошуках работы сяляне часта эмігрыравалі ў краіны Заходняй Еўропы і Амерыкі. Так, да сярэдзіны 1935 года па вярбоўцы ў Латвію з Пастаўскага павета выехала больш за 1,1 тыс. чалавек.

Адной з асаблівасцей Пастаўшчыны з'яўлялася тое, што найбольш значныя прамысловыя прадпрыемствы былі размешчаны ў г. Паставы. На працягу 1920-х гадоў тут дзейнічалі лесапільны завод ад газагенератарнай устаноўкі, цагельня, лесаэксплуатацыя, фарбавальня, смалярня, бровар і пякарня. Надзённыя патрэбы забяспечвалі 3 млыны, дзе працавалі па 3 чалавекі (уладальнікі Гендэль, Пергамент, Шкляроўскі, Гадль), а таксама 8 кавалёў, 7 муляраў, 5 шаўцоў, 4 сталяры, 4 краўцы.




Польскія грошы

Эканамічныя магчымасці Пастаўскага рэгіёна некалькі пашырыла будаўніцтва ў 1922 годзе лесапільнага цэха. У тым жа годзе пачалося ўзвядзенне шакаладнай фабрыкі. Аднак з-за дарагавізны сыравіны яе перапрафілявалі ў мэблевую фабрыку.

Даволі дынамічна як прамысловы цэнтр развівалася мястэчка Варапаева, дзе існавалі лесапільны завод (да 50 рабочых), мелася 3 млыны (вадзяны, паравы і электрычны), лесаэксплуатацыя. Пэўны час іх уладальнікам, у тым ліку адноўленым графам Пшаздзецкім у 1927 годзе шклозаводам «Гута» (да 300 рабочых), быў Зінгер. На машынах «Фірко» з 1930 года выраблялася аконнае шкло шырынёй ленты 1–1,6 м, пры таўшчыні ліста 1,2–1,4 мм. Недалёка ад Варапаева ў фальварку Ляўкова выраблялася для мясцовых патрэб кафля даволі высокіх гатункаў.

Значным прамысловым месцам з'яўляліся Дунілавічы, дзе працавалі цагельны і лесапільны заводы, лесаэксплуатацыя, млын, кузня, піларама. Тавары надзённага попыту вырабляў ткацкі цэх. Пэўныя прамысловыя прадпрыемствы дзейнічалі і ў іншых населеных пунктах. Так, у в. Алешына (Гольдман), Свідна (Шкоднік) працавалі цагельныя заводы; у Полаве — фанерны завод (каля 200 рабочых). Гарбарні і прадпрыемствы па апрацоўцы сукна дзейнічалі ў в. Алешына, у Крутках і Навасёлках былі воўначасальні. Пэўныя гаспадарчыя патрэбы задавальнялі 16 млыноў. Кавалі працавалі ў вёсках Рудзевічы і Ажуны. Пэўныя магчымасці ў будаўніцтве на тэрыторыі



У такіх бутэльках выпускалася ў Паставах пергаментскае піва

раёна забяспечвала Варапаеўская фабрыка будаўнічых матэрыялаў (да 130 рабочых).

Сельская гаспадарка развівалася марудна. На Пастаўшчыне было 21,4 тыс. аднаасобных гаспадарак, іх сярэдні памер складаў каля 10 га. Прычым 73% гаспадарак мела надзелы да 10 га, і толькі 1,25% — звыш 50 га.

Рэформы садзейнічалі ўмацаванню сялянскіх гаспадарак, рассяленню сялян на хутары (да 1939 года расселена каля 70% сялянскіх гаспадарак). Буйныя ўладальнікі Пастаўшчыны арганізоўвалі сельскагаспадарчыя прадпрыемствы. У фальварку К. Пшаздзецкага Варапаеве была пабудавана цяпліца, меўся пладогадавальнік, дзе з 1931 па 1937 год працаваў выдатны беларускі селекцыянер Іван Паўлавіч Сікора. Для перапрацоўкі малака мелася 6 пунктаў і 13 аддзяленняў.

Патрэбы насельніцтва ў бытавых таварах забяспечвалі больш як 600 гандлёвых пунктаў, якія былі ў большасці прыватнымі. У Паставах, напрыклад, дзейнічалі кааператывы «Выгада», «Зерне», рыбалавецкае таварыства, фотаатэлье, цырульня, рэстаран, чайная, кавярня, гадзіннікавая майстэрня, галантарэйная лаўка, пашыў шапак, выраб скур. Меліся прадстаўнікі, якія займаліся продажам скур (9 чалавек), спажывецкіх тавараў (7 чалавек), збожжа і металічных вырабаў (па 2 чалавекі), сельгасмашын, коней, солі, піва (па 1 чалавеку).

У Варапаеве было нямала прыватных гандляроў, якія трымалі свае крамы (Бэкары, Марцык, Мацулевіч, Пятроўскія, Ражноўскія, Цывінскія і інш.). Прадстаўнік кааператыва «Галіцыя» прадаваў газу. У Дунілавічах для мясцовых патрэб былі наладжаны вытворчасць дываноў, пашыў жаночага адзення, выраб скур, фарбавальня, гадзіннікавая майстэрня.



Будынак Лучайскай аграмамічнай школы (былы палац)

**3. Адукацыя і культура.** У адносінах да беларусаў польскія ўлады праводзілі палітыку прымусовай паланізацыі і асіміляцыі. Яны забаранялі беларускія


PAŃSTWOWA SZKOŁA ROLNICZA
W ŁUCZAJU
przyjmuje zapisy na kurs, który rozpoczyna się dnia **15 stycznia 1934 r.**
W Szkole szczególną uwagę zwraca się na naukę przedmiotów zawodowych (rolnictwo, łąkarstwo, hodowla, mleczarstwo, ogrodnictwo, pszczelnictwo i t. p.).
Praktykę uczniowie odbywają w odnośnych działach fermy rolnej, bogato wyposażonej we wszelkie urządzenia i inwentarze gospodarskie, oraz w obszernych sadach, warsztatach i t. p. szkolnych.
Bliższych informacyj udziela się bezpłatnie na każde żądanie

Аб’ява з часопіса Przysposobienie Rolnicze за 1934 год аб прыёме навучэнцаў у Лучайскую школу

школы, абмяжоўвалі прыём з беларускіх школ у вышэйшыя навучальныя ўстановы, не дазвалялі карыстацца роднай мовай у дзяржаўных установах, не прызнавалі тэрміна «Заходняя Беларусь» і ў афіцыйных дакументах называлі яе «крэсы всходне» («усходнія ўскраіны»). Мэтам паскоранай паланізацыі беларускага насельніцтва служылі дзяржаўны апарат, шавіністычны друк, польскія школы і каталіцкая царква. Такім чынам, асветніцтва сярод мясцовага насельніцтва было зарыентавана на польскі лад. У 1923 годзе была адкрыта Варапаеўская пачатковая школа імя Ю. Пілсудскага. Раз у тыдзень урокі Закона Божага праводзілі і каталіцкі ксёндз, і праваслаўны святар. Калі не стала хапаць месца, асобныя класы збіраліся ў іншых пабудовах. Пазней для падлеткаў была пабудавана двухпавярховая школа. Арганізацыі моладзі аб'ядноўвалі ў групы скаўтаў, стшэльшчыкаў. З дапамогай Саюза маладой Польшчы у 1937/38 навучальным годзе больш за 50 школьнікаў наведалі Варшаву і іншыя гарады Польшчы.




Пасведчанне аб навучанні ў польскай сямікласнай школе паўшэхнай

У пачатку 1920-х гадоў у в. Лучай, на месцы былой панскай сядзібы, пачала дзейнічаць агранамічная школа (дырэктар Жэмральскі). Працэс навучання для хлопчыкаў, што закончылі сямігадовую школу, вялі 4 польскія выкладчыкі. Усяго каля 120 чалавек займаліся на працягу паўтара года, з іх паўгода адводзілася для практыкі. Выкладалася і ваенная справа. Кошт навучання штомесячна складаў 25 злотых.

У Дунілавічах меліся агульнаадукацыйная і вышэйшая яўрэйская

| SKALA STOPNI: | | | | |
|---|---|---|---|---|
| ze sprawowania się | bardzo dobry | dobry | odpowiedni | nieodpowiedni |
| z nauki przedmiotów | bardzo dobry | dobry | dostateczny | niedostateczny |

Шкала адзнак у польскай школе

школы. Школы былі ў вёсках Цівунцы, Ясева, Навасёлкі, Целякі і інш. Усяго ў павеце дзейнічала 146 школ 1-й, 12 — 2-й, 10 — 3-й ступеней, гімназія ў Паставах і прагімназія ў Лынтупах.

Жыццё на Пастаўшчыне развівалася ў рэчышчы польскай культуры. Беларускія газеты часта забараняліся і канфіскоўваліся, штрафаваліся друкарні, у якіх яны выдаваліся. Як вынік, у Заходняй Беларусі не было беларускіх тэатраў і музычных устаноў. Улады вышуквалі розныя прычыны, каб закрываць беларускія выдавецтвы, бібліятэкі, клубы, хаты-чытальні.

Грамадска-культурнае жыццё канцэнтравалася ў гмінных цэнтрах. Тут былі будынкі школ, упраў. У Паставах, Дунілавічах і Кураполлі дзейнічалі народныя дамы. У Савічах і Лучаі — так званыя хаты-святліцы, куды збіралася моладзь на вячоркі. Невялікія бібліятэкі дзейнічалі пры Ясеўскай, Навасёлкаўскай і Целякоўскай школах. У Паставах функцыянавала друкарня, а ў Дунілавічах пераплётная майстэрня. Пэўныя патрэбы тых, хто цікавіўся польскай кнігай, забяспечвала кнігарня ў Дунілавічах.

Значнае пашырэнне набылі культавыя ўстановы. Практычна ўсе найбольш значныя населеныя пункты мелі капліцы ці касцёлы.



Памятны знак да 1900-годдзя смерці і ўзнясення Ісуса Хрыста

**4. Нацыянальна-вызваленчы рух.** Разгортванне культурна-дзяржаўнага будаўніцтва ў БССР у 1920-я гады садзейнічала ажыўленню рэвалюцыйнага руху



Кірыл Брадовіч

ў Заходняй Беларусі. У 1921–1922 гадах яго ўзначальвала Беларуская рэвалюцыйная арганізацыя (БРА), у 1923–1938 гадах — адна з найбольш радыкальных партый — Камуністычная партыя Заходняй Беларусі (КПЗБ), якая аб'ядноўвала на 1933 год каля 4 тыс. членаў. Пад кіраўніцтвам КПЗБ дзейнічалі Камуністычны саюз моладзі Заходняй Беларусі (КСМЗБ), створаны ў 1924 годзе. На 1932 год ён аб'ядноўваў 3,4 тыс. чалавек. Дзейнічалі таксама Чырвоная дапамога, левыя (чырвоныя) прафсаюзы, студэнцкая лявіца «Фронт». КПЗБ у сваіх падпольных друкарнях (2 у Вільні і 1 у Беластоку, друкарскія станкі ў Гродне, Брэсце і інш.) выдавала газеты «Чырвоны сцяг», часопіс «Бальшавік» і іншыя перыядычныя выданні на беларускай, польскай, рускай, літоўскай і яўрэйскай мовах. Свае газеты і часопісы выдавалі БРА, Беларуская сялянска-работніцкая грамада (БСРГ), «Змаганне», Таварыства беларускай школы, «Фронт», КСМЗБ, Чырвоная дапамога.

Разам з тым у плыў на насельніцтва рабіла і барацьба партызанскіх атрадаў, дзеянні якіх да 1924 года набылі арганізаваны характар. Так, у маі 1925 года непадалёку ад пастаўскіх мясцін, у Крывічах Вілейскага павета, быў разгромлены паліцэйскі ўчастак.

У першыя гады польскага панавання ў в. Ліпнікі існавала партыйная арганізацыя з 15 чалавек на чале з Ільёй Асяненкам. Ён жа стаў і сакратаром Пастаўскага падпольнага райкама партыі, утворанага ў пачатку 1924 года. На пачатак 1926 года падпольныя раённыя арганізацыі налічвалі больш за 100 чалавек, аб'яднаных у 29 партыйных ячэек на чале з Пятром Собалем, Сямёнам Бароўкам, Аляксандрам Ліпніцкім, Міхаілам Бароўкам, Пятром Кундрам, Аляксандрам Целяком, Уладзімірам Дубоўкам, Уладзімірам Дунцом і інш. Старэйшым дапамагала моладзь з ліку членаў КСМЗБ: Міхаіл Пронька, Якаў Крывулька з в. Ліпнікі, Сяргей Пратас з в. Мястэчка і іншыя.

Адным з цэнтраў дзейнасці КПЗБ было і Варапаева, дзе знаходзіўся акруговы камітэт на чале з А. Красоўскім.

За рэвалюцыйную дзейнасць супраць польскага ўрада 9 жыхароў з Ліпнікаў былі арыштаваны і асуджаны да зняволення ад 4 да 6 гадоў у Лукішскую турму. У верасні 1926 года былі арыштаваны сакратар павятовага камітэта С. З. Асяненка разам з Ф. Вайнерам, Аляксандрам Каркозам, братамі Аўласавымі. Усе яны пасля жорсткіх допытаў былі перавезены ў Лукішкі. Пасля гэтага паліцэйскія ўлады нават пасадзілі ў турму бацькоў Соф'і Асяненка — Захара Іванавіча і Дар'ю Іванаўну Антух. Практычна арышты працягваліся ўвесь час. У 1930 годзе былі зняволены Міхаіл Бароўка, Кірыла Брадовіч, Канстанцін Пратас (трагічна загінуў), Аляксандр Каркоз, Казімір Літвінёнак, Міхаіл Пронька.

У Паставах дзейнічаў павятовы камітэт БСРГ. Старшынёй яго быў выбраны Антон Таяновіч, а сакратаром С.Асяненка. Праз прапагандысцкую дзейнасць, у тым ліку і масавыя сходы, яны заклікалі насельніцтва не выбіраць польскіх стаўленікаў. На бюлетэнях у час выбараў пісалі: «Паны, вон!», «Няхай жыве Савецкая ўлада!» Напярэдадні рэвалюцыйных свят вывешвалі чырвоныя сцягі, клеілі лістоўкі, арганізоўвалі дэманстрацыі за правы абяздоленых працоўных. Падчас сходак спявалі «Інтэрнацыянал» ці гімн Грамады «Ад веку цярпелі». Так, у час 10-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі Іван Жук побач з будынкам пастарунка вывесіў чырвоны сцяг з надпісам: «Далоў паліцыю, няхай жыве міліцыя!» Аляксандр Ліпніцкі нават вывесіў сцяг на Задзеўскім касцёле, і здымаць яго прыйшлося пажарнай камандзе. Манькавіцкі гмінны камітэт (знаходзіўся ў в. Груздава) узначальваў Данат Мацкевіч, сакратаром быў Іван Талайка. Гурткі Грамады ўзначальвалі Рыгор Андрон (в. Русіны), Вікенцій Садоўскі (в. Мястэчка), Пётр Кундра (в. Васіліны), Барыс Комар (в. Кашыцы) і іншыя.

У данясенні каменданта Пастаўскай павятовай паліцыі ў акруговы аддзел палітычнай паліцыі ў Вільні 2 верасня 1926 года гаварылася, што гурткі БСРГ на тэрыторыі Пастаўскага павета актывізуюць сваю дзейнасць. Паколькі большасць насельніцтва складаюць беларусы, то Грамада карыстаецца тут вялікім аўтарытэтам і яе лозунгі блізкія насельніцтву. Дзейнасць БСРГ уключае арганізацыю новых гурткоў, прыцягненне ў іх новых членаў, агітацыю за вызваленне палітвязняў, адмену смяротнай кары, адкрыццё беларускіх школ. Грамада налічвае на тэрыторыі павета больш за 200 гурткоў, выдае свой лісток «Народная справа».

На хвалі барацьбы часам праводзіліся мітынгі. Так, у 1926 і 1927 гадах яны адбыліся ў Асінагарадку. У 1930 годзе ў м. Варапаева выйшлі на дэманстрацыю рабочыя чыгункі, фанернага завода, батракі Пшаздзецкага. За ўдзел у антыдзяржаўных мерапрыемствах у 1931 годзе было арыштавана больш за 20 чалавек. Вялікую прапагандысцкую работу вялі былыя сакратары Пастаўскага падпольнага райкама КПЗБ Кірыл Брадовіч — жыхар в. Шпакі, Міхаіл Бароўка з в. Логавінцы і Міхаіл Пронька з в. Казічы. Кожны з іх за сваю дзейнасць праследаваўся польскімі ўладамі і быў засуджаны на розныя тэрміны зняволення. Напрыклад, К. Брадовіч з 1930 па 1939 год знаходзіўся ў турме, і толькі Чырвоная Армія вызваліла яго з Лукішскай турмы. М. Пронька зведаў Куртуз-Бярозу і Лукішкі.

Каб пазбегнуць палітычнага праследавання, удзельнікі нацыянальнага руху пераходзілі мяжу з СССР. Так, пасля шасцігадовага заключэння І. М. Асяненка і шмат іншых перайшлі на тэрыторыю СССР. Усяго толькі з 1926 па 1930 год з в. Ліпнікі такім чынам перайшло 12 чалавек. У некаторых выпадках пераходзілі нават цэлымі сем'ямі. Нягледзячы на катэгарычную забарону, жыхары Заходняй Беларусі часам слухалі па радыёпрыёмніках навіны з Савецкай Беларусі і СССР. Менавіта такім чынам была ўпершыню пачута навіна аб пераходзе 17 верасня 1939 года Чырвонай Арміяй мяжы.

**Пытанні і заданні:**

1. Якія адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі існавалі на тэрыторыі раёна ў часы «крэсаў усходніх»?
2. Хто такія солтысы і войты?
3. Якія віды паселішчаў уваходзілі ў Пастаўскую гміну?
4. Як развівалася прамысловасць і сельская гаспадарка на Пастаўшчыне ў часы Польшчы?
5. Якія праблемы і чаму мелі свядомыя беларусы ў часы «крэсаў усходніх»?
6. У якіх формах разгортваўся нацыянальна-вызваленчы рух?

# § 17. Пад уладай першых Саветаў (1939–1941)

**1. У пачатку Другой сусветнай вайны.** 1 верасня 1939 года гітлераўская Германія напала на Польшчу, распачаўшы Другую сусветную вайну. На тэрыторыі Пастаўшчыны, якая была тады ў складзе польскай дзяржавы, праведзена мабілізацыя мужчынскай часткі насельніцтва ў польскую армію. Прызваныя ў войска з'язджаліся на зборны пункт у Паставах, адкуль іх на цягніках адпраўлялі ў Вільню. Нямала загінула вайскоўцаў — жыхароў Пастаўшчыны. Некаторыя трапілі ў палон, іншым пашанцавала адступіць да родных мясцін. Вайна набліжалася да беларускіх зямель.

У гэтых абставінах раніцай 17 верасня 1939 года ў адпаведнасці з раней дасягнутай дамоўленасцю з Германіяй (пакт Рыбентропа-Молатава) аб сумеснай дэмаркацыйнай лініі Савецкі ўрад аддаў загад Чырвонай Арміі перайсці мяжу і вызваліць тэрыторыю Заходняй Беларусі. Польскае войска, сціснутае з двух бакоў нямецкімі і савецкімі арміямі не мела магчымасці весці вайну на два фронты. Некаторым аддзелам удалося прарвацца на Прыбалтыку, рэшта вайскоўцаў разышлася па хатах або трапіла ў палон.


OBWIESZCZENIE MOBILIZACJI

MOBILIZACJĘ POWSZECHNĄ

zarządzam co następuje:

I. Dnie mobilizacji.

II. Powołanie do czynnej służby wojskowej.

III. Cofnięcie urlopów.

IV. Nie podlegają powołaniu do czynnej służby wojskowej w myśl niniejszego obwieszczenia:

V. Odpowiedzialność za niestawienie się do czynnej służby wojskowej

Minister Spraw Wojskowych

Абвестка пра мабілізацыю ў польскае войска ў пачатку Другой сусветнай вайны



Германскія вайскоўцы пераходзяць мяжу з Польшчай



Польскія ўланы



Польская кавалерыя

У сярэдзіне верасня на Пастаўшчыне усталёўваліся новыя парадкі, ствараліся часовыя ўпраўленні і сялянскія камітэты, міліцыя. Да моманту прыняцця Заходняй Беларусі ў склад БССР у раёне ўлада належала органам часовага кіравання на чале з упаўнаважаным ЦК КП(б)Б Брыкавым.



Афіцэр і салдаты польскай арміі 1939 г. Малюнак з часопіса «Салдат»

**2. Далучэнне Пастаўшчыны да БССР.** 22 кастрычніка 1939 года у раёне адбыліся выбары ў Народны сход Заходняй Беларусі, які павінен быў у заканадаўчым парадку вырашыць пытанне аб уладзе. Ад Пастаўшчыны для ўдзелу ў ім быў накіраваны жыхар в. Казічы, былы член КПЗБ, вязень польскіх турмаў М. Пронька. Народны сход адбыўся 28–30 кастрычніка 1939 года ў Беластоку. Яго дэпутаты звярнуліся ў Вярхоўны Савет СССР з просьбай аб прыняцці Заходняй Беларусі ў склад Савецкага Саюза і ўз'яднанні



Чырвоная Армія перасякае мяжу з Польшчай. 17 верасня 1939 г.




Наступленне Чырвонай Арміі на Польшчу. 17–20 верасня 1939 г. Схема

яе з БССР. Просьба была задаволена 2 лістапада 1939 года на 5-й (нечарговай) сесіі Вярхоўнага Савета 1-га склікання, а таксама 14 лістапада 1939 года 3-й нечарговай сесіяй Вярхоўнага Савета БССР, дзе разам з іншымі прымаў удзел наш зямляк Фёдар Маркаў. Прадстаўніком збяднелага сялянства ад Пастаўшчыны быў А. Арцямёнак.

У хуткім часе на Пастаўшчыне пачаліся пераўтварэнні ў палітычным, сацыяльным і эканамічным жыцці. Беззямельныя і малазямельныя сяляне атрымалі 13,5 тыс. га зямлі, сотні адзінак сельгасінвентару, 360 коней, 700 кароў, шмат іншай жывёлы. Адначасова былі адкрыты дзяржаўныя крамы.

У студзені–сакавіку 1940 года былі створаны мясцовыя органы савецкай улады. Фарміраванне іх закончылася толькі ў канцы года, калі ў выніку выбараў, якія адбыліся ў снежні, утварыліся



Польская пяхота на маршы. 1939 г.



Высадка пехацінцаў Чырвонай Арміі з танка

сельскія, раённыя, гарадскія, абласныя Саветы дэпутатаў працоўных. Так, першым старшынёй Пастаўскага гарсавета быў абраны А. І. Арцямёнак, Пастаўскі сельсавет узначаліла Матрона Замастоцкая. Прадстаўляць інтарэсы насельніцтва Пастаўшчыны ў Вярхоўным Савеце БССР быў аказаны давер загадчыку аддзела сацыяльнага забеспячэння райвыканкама Антону Пабядзінскаму.

З прычыны недаверу да мясцовых кіраўнікоў і з мэтай правядзення эфектыўнай палітыкі партыйныя, савецкія, праваахоўныя органы ўзначальвалі кадры, прысланыя з Расіі або ўсходніх абласцей БССР. Такіх людзей на адказных пасадах было каля 250 чалавек.

У канцы 1939 года і пачатку 1940 года створана 11 партыйных арганізацый і 1 партыйна-кандыдацкая група, на ўліку ў якіх было 115 камуністаў і кандыдатаў у партыю. Райкам партыі ўзначаліў Брыкаў, пазней Аляксандр Манахаў. На тэрыторыі раёна існавалі 32 пярвічныя камсамольскія арганізацыі. Яны аб'ядноўвалі больш як 300 чалавек (сакратар райкама камсамола А. Л. Статкевіч). Пераважна ў рады ЛКСМБ ішла бядняцкая моладзь і сярод іх з ліку першых: Васіль Асяненка, Ганна Маслоўская, Марыя Полех, Тамара Сікора, Яўстафій Касарэўскі, Адольф Буцько.

На 1 студзеня 1940 года ў выніку адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу ў раёне існавала 20 сельскіх Саветаў і Пастаўскі гарадскі савет. 15 студзеня 1940 года ў складзе Вілейскай вобласці былі ўтвораны Пастаўскі і Дунілавіцкі раёны. У 600 населеных пунктах Пастаўскага раёна пражывала каля 53 тыс. чалавек, у тым ліку 20 тыс. дзяцей школьнага ўзросту. Паставы мелі статус горада, Лынтупы, Камаі і Груздава — мястэчак. Усяго ў раёне налічвалася 4907 гаспадарак. На базе Пастаўскага, Полаўскага, Лынтупскага і Смыцкага лясніцтваў быў арганізаваны Пастаўскі лясгас.



Палонныя польскія жаўнеры

**3. Усталяванне савецкай улады.** Пачатак сацыялістычным пераўтварэнням у эканоміцы паклала нацыяналізацыя прамысловасці і банкаў, якая адбывалася ў асноўным у лістападзе–снежні 1939 года. Рэканструяваліся старыя прамысловыя прадпрыемствы. Пачалося будаўніцтва новых. Рамесныя і саматужныя майстэрні сталі аб'ядноўвацца ў прадпрыемствы прамысловай кааперацыі.

Асноўная прамысловасць была размешчана галоўным чынам у Паставах і мястэчку Лынтупы. Горад асвятляўся пры дапамозе газагенератараў, якія працавалі на драўнінным паліве. Электрыфікаваны былі таксама элеватар, радыёвузел, друкарня, гарбарны завод. За кароткі тэрмін пабудавана і здадзена ў эксплуатацыю аўтарамонтная майстэрня. Пачаў дзейнічаць мэблевы цэх, які вырабляў за месяц 50 сталоў і 500 крэслаў. Быў створаны цэх па рамонце веласіпедаў, прымусаў, швейных машынак, патэфонаў і іншых прадметаў хатняга ўжытку. Дзейнічалі 4 цагельныя заводы, 3 паравыя і 1 вадзяны млын, 2 электрастанцыі і лесапільны завод.

Спіртзавод у Лынтупах, на якім працавала каля 60 мясцовых жыхароў, перайшоў на трохзменную работу. Пастаўскі піваварны завод ужо ў 1941 годзе выпускаў не менш як 2 млн. літраў піва за год, а мясакамбінат каля 10 тон каўбасных вырабаў за суткі. Працавалі 4 маслазаводы, 18 сепаратарных пунктаў.

У Паставах існавала 7 арцеляў: сталярная, харчовая, швейная, смалакурная (50 чалавек), шавецкая (49 чалавек), цагельная, фотаарцель. У Лынтупах меліся смалакурная і цагельная арцелі, працавала ў раёне яшчэ 9 саматужна-вытворчых промыслаў. Пачалі



А. І. Арцямёнак

стварацца таварыствы спажывецкай кааперацыі. Адкрываліся сталовыя, чайныя, хлебапякарні. Наладжвалася забеспячэнне гандлёвых устаноў таварамі.

У сельскай гаспадарцы пасля канфіскацыі памешчыцкіх зямель і падзелу іх паміж малазямельнымі сялянамі партыйныя і савецкія органы накіравалі намаганні на арганізацыю кааперацыі ў вёсцы. Сярод бяднейшых і часткі сярэдніх сялян знаходзіла падтрымку ідэя стварэння калектыўных гаспадарак. Было ўзята на ўлік каля 21 тыс. галоў буйной рагатай жывёлы, больш за 15 тыс. свіней, 11 тыс. коней.

На працягу 1940–1941 гадоў дзейнічала 8 калгасаў: у вёсках Васіліны, Бараўкі, Палессе, Манькавічы, Лынтупы, Перавознікі.

342 сялянскія гаспадаркі аб'ядналіся ў калгасы, у якія ўступіла больш як 1300 чалавек. У кожным сельскагаспадарчым падраздзяленні было створана па 3 жывёлагадоўчыя фермы.

Дзейнічалі 2 машынна-трактарныя станцыі: у Паставах і мястэчку Камаі, у былым Дунілавіцкім раёне ў в. Ясневічы. У МТС мелася 19 трактароў розных марак, 3 аўтамашыны, 18 плугоў, 4 сеялкі, 8 культыватараў.

У сярэднім у 1940 годзе ў калгасах з кожнага гектара было атрымана па 9 цэнтнераў збожжа. На працадзень выдадзена па 3,5 кг жыта, пшаніцы, 7,2 кг бульбы.

У Паставах налічвалася 14 крам, дзейнічала 8 спажывецкіх таварыстваў, 74 магазіны, з іх палова размяшчалася ў прыватных хатах. Былі адкрыты 3 прыватныя крамы.

У Паставах і Лынтупах былі адноўлены кірмашы. У Паставах, напрыклад, яны праводзіліся ў панядзелак і ў пятніцу. Пуд жыта каштаваў 20–25 руб., кілаграм свініны даходзіў да 20 руб., дзесятак яек да 6, кілаграм алею да 20 руб. На кірмашы за рабочага каня плацілі 200–400 руб.

У Паставах працавалі сярэдняя, 3 няпоўныя сярэднія школы, у сельскай мясцовасці — 9 няпоўных сярэдніх і 71 пачатковая

школа. У іх займалася каля 7,5 тыс. вучняў. На базе былой польскай гімназіі было арганізавана педвучылішча, а Лынтупская прагімназіяператворана ў няпоўную сярэднюю школу. Прадметы выкладалі 200 настаўнікаў. Для настаўнікаў, якія не мелі адпаведнай падрыхтоўкі, працавалі падрыхтоўчыя курсы. У 1940 годзе іх наведвала больш як 100 чалавек. Пачалі адкрывацца вячэрнія школы і курсы па ліквідацыі непісьменнасці для дарослых.

Рэгулярна выходзіла раённая газета «Новы шлях» тыражом 2 тыс. экзэмпляраў з перыядычнасцю 9 нумароў у месяц. У Паставах вёў трансляцыі радыёвузел, які быў разлічаны на 1,5 тыс. радыёкропак, дзейнічаў кінатэатр.

У раёне працавалі 3 царквы, 6 касцёлаў, 1 сінагога, а таксама малельны дом.

Значныя змены адбыліся ў галіне аховы здароўя. У Паставах у 1940 годзе працавала бальніца на 45 ложкаў, амбулаторыя, дзіцячая кансультацыя, тубдыспансер, санстанцыя. Іх абслугоўвалі 10 урачоў, 5 акушэрак, 3 фельчары, 17 медсясцёр і іншы медыцынскі персанал.

На тэрыторыі раёна знаходзіўся ваенны гарадок. Там, дзе раней размяшчаўся польскі кавалерыйскі полк, стала працаваць авіяшкола, меліся 3 авіяпляцоўкі.

Змянялася аблічча краю. Але часта насельніцтва, якое доўгі час знаходзілася пад Польшчай, не ўспрымала новую ўладу. Былі выпадкі, калі распаўсюджваліся антысавецкія лістоўкі, з адміністрацыйных памяшканняў здымаліся чырвоныя сцягі. У урнах на выбарчых участках вёсак Баранішкі і Навасёлкі былі знойдзены запіскі антысавецкай накіраванасці. На тэрыторыі раёна дзейнічала 31 антысавецкая арганізацыя агульнай колькасцю 691 чалавек. У дачыненні да тых груп насельніцтва, якія не прымалі савецкай улады, ужываліся жорсткія карныя метады. Некаторыя арыштоўваліся і атрымлівалі значныя тэрміны зняволення, іншыя высяляліся ў Сібір. Дэпартацыя на Пастаўшчыне адбывалася ў тры этапы: 10 лютага, 13 красавіка і 29 чэрвеня 1940 года. Вывозілі ў асноўным памешчыкаў, кулакоў, асаднікаў, леснікоў. Такім чынам было адселена больш за 200 чалавек. За два дні да вайны ў ноч з 19 на 20 чэрвеня 1941 года было рэпрэсіравана 270 чалавек.

Абапіраючыся на эканамічны і навукова-тэхнічны патэнцыял усёй краіны, Пастаўскі раён, як і іншыя раёны Заходняй Беларусі,

пасля ўз'яднання зрабіў значны крок у сацыяльна-эканамічным развіцці свайго краю. Але напад гітлераўскай Германіі на Савецкі Саюз і акупацыя Беларусі нямецка-фашысцкімі войскамі перарвалі гэты працэс.

**Пытанні і заданні:**

1. Чаму ў пачатку Другой сусветнай вайны многія мужчыны нашага краю апынуліся ў польскім войску?
2. Як і калі Пастаўшчына ўвайшла ў склад БССР?
3. Якія эканамічныя і сацыяльныя пераўтварэнні адбыліся ў раёне з усталяваннем савецкай улады?
4. Чаму не ўсе жыхары нашага краю прыхільна аднесліся да новых парадкаў?
5. Якія захады прымалі органы савецкай улады для барацьбы з «варожымі элементамі»?

## § 18. Ішла вайна народная (1941–1944)

**1. Акупацыя Пастаўшчыны нямецка-фашысцкімі захопнікамі.** 22 чэрвеня 1941 года фашысцкая Германія пачала вайну з Савецкім Саюзам. Вечарам у Пастаўскім райкаме партыі адбылася тэрміновая нарада. Райваенкамат пачаў мабілізацыю, працаваў цэлыя суткі, адпраўляючы прызыўнікоў у дзеючую армію. У гэты час іх у горадзе сабралася некалькі тысяч. 25 чэрвеня нямецкія самалёты ўпершыню нанеслі некалькі бомбавых udараў па Паставах і скінулі дэсант парашутыстаў для дыверсійнай дзейнасці. Бамбілі ў асноўным мясцовы аэрадром. Некалькі бомб трапіла ў лес каля возера Сляпіца, у рэчку Мядзелка. Аднак гэта вялікай шкоды не нанесла.

Першымі на Пастаўшчыне былі захоплены населеныя пункты Лынтупы, Палессе, Масленікі, Падзюткі, Камаі, Ярэва, Вярэнькі, Васіліны, Кураполле, Савічы. 6 ліпеня 1941 года фашысты ўвайшлі ў Паставы. Праз дзень астатняя тэрыторыя раёна была акупавана германскімі войскамі, а да канца жніўня 1941 года і ўся тэрыторыя БССР.

Восенню 1941 года падзел часова акупаванай Беларусі быў у асноўным завершаны. Пастаўскі раён увайшоў у Глыбоцкую акругу (гебіт) рэйхскамісарыята «Остланд» з рэзідэнцыяй у Рызе. Гебітскамісарыят узначальваў Яўген Карл (забіты партызанамі 26.10.1943), пазней — Пауль Гахман. Частка раёна ўвайшла таксама ў Вілейскую акругу (гебітскамісар Шміт, затым К.Магас). Да генеральнай акругі Літва адышлі тэрыторыі Лынтупскага і Камайскага сельсаветаў Пастаўскага раёна. Такое размежаванне значна ўскладніла і без таго складанае становішча жыхароў. Па новаўтвораных межах былі створаны шматлікія пагранічныя заставы, якія забаранялі насельніцтву перамяшчэнне без дазволу акупацыйных улад.

Мясцовую ўладу прадстаўлялі прызначаныя германскімі органамі ортскамісары, у раёнах ствараліся павятовыя (раённыя) ўправы на чале з бургамістрам. На тэрыторыі былых сельсаветаў былі створаны воласці на чале з валаснымі старшынямі, у вёсках прызначаліся старасты (солтысы). Адной з асаблівасцей акупацыйнага рэжыму на Пастаўшчыне была набліжанасць раёна да Вілейкі — абласнога горада, які стаў ваенным і палітычным фарпостам германскіх войск у гэтым рэгіёне.

Тэрыторыя раёна выкарыстоўвалася і для перападрыхтоўкі, часовага прыпынку перад адпраўкай на фронт шматлікіх вайсковых падраздзяленняў. Гэтыя франтавыя часці неаднаразова прыцягваліся камандаваннем на гаспадарчыя работы, правядзенні карных аперацый супраць партызан і насельніцтва. Так, у пачатку красавіка 1944 года ў в. Варапаева прыбыў эшалон з 1 тыс. ваеннаслужачых. На пэўны час яны былі расквартараваны ў в. Бараўкі, а потым у в. Ваўкі. Пры гэтым частка сіл адразу ж была выкарыстана для правядзення аблаў і захопу насельніцтва для вывазу на прымусовыя работы ў Германію.



Пачатак нямецкай акупацыі

У Паставах быў адноўлены аэрадром, на якім



Нямецкія самалёты

штодня рабілі пасадку 10–15 самалётаў. Для тэхнічнага забеспячэння палётаў каля Канстанцінава была ўстаноўлена радыёпеленгатарная станцыя.

У буйнейшых населеных пунктах былі створаны ваенна-паліцэйскія гарнізоны, дзе размяшчаліся не толькі немцы, але і прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей. У Паставах гарнізон існаваў ужо ў 1941 годзе і налічваў у розныя перыяды ад 100 да 1000 чалавек. Так, у канцы 1942 годзе ён складаўся з 450 украінцаў, каля 500 літоўцаў і 70 нямецкіх салдат. У пачатку 1944 года налічваў 700–770 чалавек, з якіх 134 — вайскоўцы так званай Рускай вызваленчай арміі Уласава, каля 46 паліцаяў і немцы. На ўзбраенні гарнізон меў 2 бронемашыны, 2 танкеткі, 4 аўтамашыны, 3 ручныя кулямёты, 4 ротныя і 1 батальённы мінамёты.

Значнасць гарнізона ў Варапаеве вынікала з тае прычыны, што тут яшчэ была і чыгуначная станцыя. Таму іншым часам ён налічваў да 1100 чалавек. Асноўную яго колькасць складалі германскія вайскоўцы. Паліцэйскіх было толькі 40. Улічваючы стратэгічнае становішча пасёлка, на подступах да яго былі ўзведзены абарончыя ўмацаванні. На ўзбраенні меліся 2 бронемашыны, 2 танкеткі, 3 ротныя, 1 батальённы мінамёты, 4 станковыя, 7 ручных кулямётаў.

У шэрагу гарнізонаў раёна частку вайскоўцаў складалі літоўцы. Так, у Камаях іх налічвалася да 117 чалавек, у Каралінове — 66 асоб літоўскай нацыянальнасці. Гарнізон у Лынтупах налічваў да 100 немцаў, з іх 40 ахоўвалі радыёстанцыю, 31 — чыгунку, 17 — лесапільны завод. Пры гарнізоне існавала рабочая каманда. На ўзбраенні было 6 станковых, 9 ручных кулямётаў, каля 15 аўтаматаў, вінтоўкі.

Гарнізоны ў Груздаве, Дунілавічах, Залессі і іншых месцах былі не такімі шматлікімі, але таксама выконвалі важныя функцыі для германскай арміі. Яны вялі ахову камунікацый — в. Ваўкі (да 120 чалавек, у тым ліку і чэхі), у в. Кролікі (150 чалавек, з іх да 30 немцаў), Перавознікі (37 чэхаў і немцаў у вёсцы і 38 немцаў на ахове моста), у в. Стары Двор (ад 70 да 150 чалавек). Невялікі гарнізон у в. Кейзікі складалі 80 мабілізаваных самаахоўцаў, а ў Шарабаях было ўсяго 15–20 чалавек.

Для арганізацыі паліцэйскіх мер бяспекі па ахове ваенных і іншых аб'ектаў, вядзення барацьбы з партызанамі і выканання карных мерапрыемстваў супраць насельніцтва стваралася мясцовая дапаможная паліцыя парадку, якая павінна была дзейнічаць пад камандаваннем ваенных у цесным кантакце з мясцовым начальнікам паліцыі і СД. Фарміравалі па прынцыпе — у сельскай мясцовасці 1 паліцэйскі на 100 чалавек, у гарадах — на 300 чалавек.

Утварэнне мясцовай паліцыі ў раёне першапачаткова вялося на добраахвотных пачатках. Калі ж стала зразумела, што вайна набывае зацяжны характар, а партызанскія дзеянні становяцца больш арганізаванымі і адчувальнымі, то пачаліся масавыя прымусовыя наборы ў паліцэйскія фарміраванні, асабліва за кошт ваеннапалонных. Страх за сваё жыццё, спроба выратаваць яго і варожая прапаганда сталі асноўнай прычынай таго, што на тэрыторыі раёна палова паліцэйскага саставу была з ліку былых вайскоўцаў, а трэць — з ліку мясцовага насельніцтва ці ўраджэнцаў усходняй Беларусі.

**2. Жыццё пад акупацыяй.** Першапачаткова для ажыццяўлення ваенна-эканамічных дырэктыў германскімі ўладамі быў арганізаваны ўлік маёмаснага становішча насельніцтва і гаспадарак. Арганізаваныя невялікія сепаратарныя і зліўныя пункты павінны былі наладзіць прыём малака з калгасаў і саўгасаў (іх немцы спачатку не распускалі), ад насельніцтва. Жорсткасць пакаранняў за невыкананне планаў пастаўкі была з'явай пашыранай. Так, за кастрычнік — лістапад 1942 года ў Вілейскай вобласці за няздачу сельскагаспадарчай прадукцыі і нявыплату падаткаў былі расстраляны 280 чалавек.

Акупацыйнымі ўладамі быў арганізаваны падлік свойскай жывёлы і памераў гаспадарак, а потым праз падаткі і рэквізіцыі







Германскія прапагандысцкія плакаты

большасць з наяўнага была забрана. Так на 1 красавіка 1944 года толькі з Дунілавіцкага раёна былі вывезены 24 443 галавы жывёлы, з іх кароў — 2770, коней — 2014, авечак — 13 941, свіней — 2917, іншай жывёлы — 2801.

Арганізацыйныя мерапрыемствы мясцовых акупацыйных органаў былі скіраваны на забеспячэнне вайсковых патрэб: збор цёплага адзення для вайскоўцаў, выкананне разнастайных рамонтных, будаўнічых і гаспадарчых работ. Асабліва масавымі яны назіраліся на працягу лета 1942 года, калі насельніцтва раёна было прыцягнута да будаўніцтва другой каляі чыгункі Свянцяны – Паставы.

Ужо з другой паловы 1941 года наладзілі работу лесапільныя заводы ў Лынтупах і Варапаеве. Апрацаваная драўніна арганізавана вывозілася па чыгунцы на захад.

Для вярбоўкі рабочай сілы на прадпрыемствы Германіі былі арганізаваны біржы працы. На першым часе адна з біржаў дзейнічала ў Дунілавічах, а пасля яе знішчэння партызанамі была пераведзена ў Варапаева.

Акупацыйныя ўлады рабілі ўсе захады, каб прыцягнуць на свой бок насельніцтва. Таму за супрацоўніцтва з імі выдавалі грашовыя ўзнагароды, розныя пайкі, а таксама гарэлку, папяросы, махорку. Сялянам, якія асабліва вызначацца ў змаганні з партызанамі, была абяцана як вялікая ўзнагарода — сялянская гаспадарка. Але ўсе гэтыя меры не давалі значных вынікаў, і ў першую чаргу


Zentral-Handelsgesellschaft Ost

Warenkarte 1943-44

Таварная картка

Таварная картка селяніна на здачу тавараў і прадуктаў нямецкім акупацыйным уладам



Кіраўніцтва СБМ у Паставах

з-за шырокай і актыўнай дзейнасці партызанскіх фарміраванняў.

У тых месцах, дзе фашысты наладзілі работу сельскагаспадарчых маёнткаў і эканомій, дробных прадпрыемстваў і стварылі запасы харчавання ў складскіх памяшканнях, партызанскія фарміраванні праводзілі баявыя аперацыі, выводзілі са строю абсталяванне, знішчалі атрыманую прадукцыю.

З 15 лістапада 1941 года былі адноўлены заняткі ў школах, але ўжо па праграмах нацыянал-сацыялістычнага ўзору. Польскія і савецкія падручнікі канфіскоўваліся, актыўна выкарыстоўваліся нямецкія часопісы, вывучалася біяграфія Гітлера. Усе школы былі пераведзены на беларускую мову навучання з абавязковым вывучэннем нямецкай. Не хапала настаўнікаў, і таму ў Паставах адчынілі настаўніцкую семінарыю. На першым этапе была зафіксавана дзейнасць 126 школ, з якіх 4 лічыліся сямігадовымі,


REICHSKOMMISSARIAT OSTLAND

PERSONENAUSWEIS

ЛЕГІТЫМАЦЫЯ

Легітымацыя (пашпарт), які выдаваўся жыхарам акупаваных тэрыторый




👁 Знакі, якія насілі савецкія грамадзяне, вывезеныя ў Германію: 1 — агульны для ўсіх грамадзян; 2 — для рускіх; 3 — для беларусаў; 4 — для ўкраінцаў

а 122 — народнымі няпоўнымі школамі. Усяго было прыцягнута і ўзята на ўлік каля 10 тыс. падлеткаў і 223 настаўнікі, адзін з якіх меў вышэйшую адукацыю.

Яшчэ адной спробай узмацнення нацысцкага ўплыву на моладзь было ўтварэнне ў чэрвені 1943 года Саюза беларускай моладзі (СБМ). Стварэннем суполкі СБМ у Паставах, а таксама ў прылеглых да горада пунктах займаліся непасрэдна кіраўнікі СБМ Глыбоцкай акругі Яўген Мацюшонак, а пасля яго — Мечыслаў Рачыцкі і Ульяна Кушталян. У Пастаўскім павеце кіраўніком быў прызначаны Яўген Занкавіч. Шляхам залічэння ўсіх навучэнцаў Пастаўскай семінарыі (кіраўнік Віктар Сікора) і вучняў Пастаўскай пачатковай сельскай школы ва ўзросце 13–16 гадоў восенню 1943 года была значна пашырана мясцовая арганізацыя СБМ. Спроба падрыхтаваць эсбээмаўцаў да барацьбы супраць партызан і Чырвонай Арміі правалілася. Да канца




👁 Нямецкія грошы часоў Другой сусветнай вайны

акупацыі толькі 33 чалавекі з іх працягвалі дзейнасць у складзе самааховы, астатнія ж разышліся па сваіх хатах.

Некалькі членаў СБМ сталі членамі Беларускай незалежніцкай партыі (БНП), якой кіраваў У. Родзька. З красавіка 1944 года яе членам, а потым і партыйным кіраўніком раёна стаў Віктар Сікора (намеснік — Яўген Занкавіч). Усяго каля 40 чалавек былі ўцягнуты ў дзейнасць гэтай арганізацыі. З іх частка стала на шлях узброенай барацьбы, у тым ліку і ў складзе батальёна «Дальвіц», ужо на вызваленай Чырвонай Арміяй тэрыторыі.

У лютым–сакавіку 1944 года была зроблена спроба арганізацыі Беларускай краёвай абароны (БКА). Усяго для фарміраванняў БКА на Пастаўшчыне былі мабілізаваны 540 чалавек, у Дунілавіцкім раёне больш за 1 тысячу. Такім чынам, былі створаны 2 батальёны БКА — батальён № 35 (знаходзіўся ў Паставах, камандзір Леў Глінскі) і батальён № 32 (у Варапаеве, камандзір — лейтэнант Восіп Крыкун).

Значна павялічылася колькасць ваенных фарміраванняў на тэрыторыі раёна на завяршальным этапе акупацыі. 17 сакавіка 1944 года ў Паставы прыбылі 800 чалавек з нацыянальных паліцэйскіх фарміраванняў (казакі, узбекі і іншыя).

**3. Рэпрэсіі і карныя аперацыі акупантаў.** Акупацыйны рэжым, што быў устаноўлены гітлераўцамі на часова захопленай імі тэрыторыі, распрацоўваўся загадзя, яшчэ да нападу на Савецкі Саюз. Асноўныя яго палажэнні былі выкладзены ў плане «Барбароса» і генеральным плане «Ост» — праграме каланізацыі тэрыторыі, германізацыі, высялення і знішчэння народаў Усходняй Еўропы. Планавалася на працягу 30 гадоў 75% беларускага насельніцтва па расавых і палітычных матывах фактычна знішчыць ці выселіць на ўсход, а астатнія 25% анямечыць. З нямецкіх салдат і афіцэраў здымалася ўсялякая адказнасць за злачынствы на акупаванай зямлі.

Ажыццяўленнем акупацыйнай палітыкі на Пастаўшчыне займаліся айнзатцкаманды, зондэркаманды, тайная палявая паліцыя (ГФП), паліцыя бяспекі і СД, фельдкамендатуры, ортскамендатуры, жандармерыя і іншыя карныя органы. Іх ахвярамі станавіліся палітработнікі і былыя актывісты савецкай улады, яўрэі і іншыя катэгорыі насельніцтва. Айнзатцгрупай «Б» ужо з



Расстрэл мірных жыхароў гітлераўцамі



Усталяванне акупацыйнага рэжыму

ліпеня 1941 года былі распачаты карныя аперацыі. У першыя дні акупацыі былі схоплены дэпутаты Аляксандр Жытковіч (в. Ліпнікі), Аляксандр Гіль (в. Сіманькі), Якаў Соўка (в. Кадукі), актывіст Андрэй Соўка (в. Зосіна), старшыня і сакратар Курапольскага сельсавета Анатоль Кундра і К.Шакола, рахункавод Анатоль Дзіковіч (в. Лодасі), старшыня калгаса «Чырвоная зорка» Мікалай Дзіковіч, старшыня калгаса з в. Кураполле Рыгор Кундра, сакратар Лынтупскага сельсавета Антаніна Астроўская і іншыя, усяго 16 чалавек, якія былі расстраляны. Па даносе быў арыштаваны і Рыгор Крукаў. 29 ліпеня яго як «чырвонага бандыта» павінны былі расстраляць. Але Крукаву ўдалося выратавацца, і ў далейшым ён стаў адным з арганізатараў партызанскага руху на Пастаўшчыне.

Была ўведзена камендацкая гадзіна і ўсялякія перамяшчэнні абмежаваны. Патрабавалася здаць зброю, ваенную маёмасць, данесці ўладам на вайскоўцаў, савецкіх актывістаў. За невыкананне загадаў акупантаў прадугледжвалася адзіная мера — расстрэл ці канцэнтрацыйны лагер для ўсіх членаў сям'і.

Стаў шырока выкарыстоўвацца загад аб закладніках, калі за аднаго забітага германскага салдата знішчалі 50–100 чалавек, каб запужаць насельніцтва. Сістэма закладніцтва дзейнічала на працягу ўсёй акупацыі. За знішчаных партызанамі шэфа жандармерыі Вілейскай акругі Крыля і гебітскамісара Бека 19–20 мая 1943 года

былі расстраляны мясцовай паліцыяй 200 схопленых жыхароў Лынтупаў і навакольных вёсак. 29 студзеня 1944 года аднаго з жыхароў в. Юнькі нямецкія салдаты павесілі за тое, што паблізу партызаны спалілі мост, а насельніцтва не перашкодзіла гэтаму. Дастаткова часта германскім камандаваннем выдаваліся загады аб расстрэлах западозраных у антыгерманскай дзейнасці. Так, вясной 1942 года ў в. Васіліны за сувязь з партызанамі былі схоплены 23 юнакі і дзяўчыны. Іх пасля здзекаў расстралялі. У канцы снежня 1942 года за сувязь з партызанамі быў арыштаваны жыхар в. Крывое Пётр Воля. Пры спробе ўцёкаў быў застрэлены.




Дзеці за калючым дротам




Пастаўская настаўніцкая семінарыя, першы курс, 1943 г. У цэнтры — Б. Кіт

Неад'емнай часткай акупацыйнага рэжыму былі карныя экспедыцыі. Іх асноўнай задачай было: ліквідацыя партызанскіх фарміраванняў, іх месцаў дыслакацыі, захоп сельскагаспадарчых прадуктаў, прыпасаў харчавання, а таксама насельніцтва для прымусовага вывазу ў Германію.

У 1942 годзе маштаб карных аперацый быў адносна невялікі, з удзелам 30–40 ваенных на працягу 2–3 дзён. Але з 1943 года з узмацненнем партызанскага руху яны сталі доўжыцца да 30–40 сутак, праводзіцца на вялікай плошчы з удзелам часцей вермахта, авіяцыі, артылерыі. Напачатку праводзіліся метадычныя абстрэлы ляснога масіву па квадратах, затым ішлі ў ход прапагандысцкія мерапрыемствы (лістоўкі, сходы, давядзенне да ведама загадаў нямецкага



Пахаванне Адама Дасюкевіча ў Паставах



Шыбеніцы — яшчэ адна праява фашысцкай акупацыі

камандавання і г. д.), якія змяняліся баявымі дзеяннямі і карнымі мерапрыемствамі супраць насельніцтва. Так, на працягу 22–28 лістапада 1942 года была арганізавана карная аперацыя «Нюрнберг». Карнікі так і не змаглі акружыць і знішчыць партызан, але спалілі шмат вёсак, у т. л. Дунілавічы.

У верасні–кастрычніку 1943 года на вялікай тэрыторыі, якая ахоплівала Браслаўскі, Відзаўскі, Глыбоцкі, Міёрскі, Пастаўскі, Шаркоўшчынскі і Дунілавіцкі раёны, значнымі сіламі акупанты правялі карную аперацыю «Фрыц». Пад націскам пераўзыходзячых сіл партызаны з баямі пакінулі блакіраваныя лясныя масівы і прарваліся ў суседнія раёны Віцебшчыны. У канцы кастрычніка — пачатку лістапада яны зноў вярнуліся на месцы ранейшай дыслакацыі. За час карнай аперацыі было загублена звыш 500 мясцовых жыхароў і каля 12 тыс. чалавек вывезены на катаргу ў Германію, спалена 87 вёсак, у т. л. Кеўлічы (загублена 28 чалавек) і Стахоўскія (40 чалавек) Пастаўскага раёна.

Звычайнай з'явай былі аблавы, якія праводзіліся нямецкімі вайскоўцамі з удзелам паліцэйскіх. Акружыўшы вёску, хапалі людзей для вывазу ў Германію ці для выканання тэрміновых гаспадарчых работ, забіралі маёмасць. Так, летам 1942 года ў час рэлігійных святаў у Варапаеве былі схоплены і прымусова вывезены на работы ў Германію 120 чалавек.

Няўдачы фашысцкіх войскаў на ўсходнім фронце сур'ёзна пагоршылі становішча Германіі. Усё значней станавілася праблема

людскіх рэзерваў. Па загаду фюрэра ад 1 жніўня 1943 года ўсе грамадзяне 1925 г. нараджэння былі абавязаны адбываць працоўную павіннасць у Германіі. Выключэнне рабілася для асоб, што паступілі добраахвотна ў Рускую вызваленчую армію і дапаможныя паліцэйскія фарміраванні. Каб паспяхова выканаць гэтыя дырэктывы, на тэрыторыі раёна дзейнічалі мабілізацыйныя каманды. У Варапаеве быў размешчаны зборны пункт па адпраўцы насельніцтва ў Германію. Толькі вясной 1943 года з раёна ў Германію было вывезена да 450 юнакоў і дзяўчат, а ўсяго за час акупацыі — 1800 жыхароў.

З пачатку 1942 года пасаду старшыні Пастаўскага павета займаў беларус-патрыёт, настаўнік Адам Дасюкевіч. Яму даводзілася праводзіць беларусізацыю адміністрацыі, бараніць насельніцтва перад нямецкімі акупантамі. У 1943 годзе А. Дасюкевіча застрэліў зондэрфюрэр за тое, што ў вызначаны дзень не прыбылі ўсе сялянскія падводы з пастаўкай збожжа ў Германію. На яго пахаванне сотні людзей выйшлі на вуліцы горада і далучыліся да жалобнай працэсіі.

За гады вайны акупантамі было знішчана па Пастаўскім раёне 3688 чалавек, Дунілавіцкім — 992, з іх 828 — непасрэдна ў Дунілавічах. У час карных аперацый было спалена 77 вёсак, у т.л. разам з жыхарамі вёска Альцы, 1820 хат. Такі вынік трохгадовай акупацыі Пастаўшчыны.

**4. Трагедыя яўрэйскіх гета.** Асабліва пацярпелі ў час Другой сусветнай вайны яўрэі, супраць якіх фашысты праводзілі палітыку генацыду. У мястэчках Пастаўшчыны доля прадстаўнікоў гэтага народа складала 20–40%. Большасць іх займалася гандлем, рамяством. У 1941–42 гадах у Паставах, Дунілавічах, Лынтупах акупанты стварылі канцэнтрацыйныя лагеры (гета) для яўрэяў. У іх было сселена амаль усё яўрэйскае насельніцтва Пастаўшчыны, большая частка якога пазней была расстраляна.

У лютым 1942 года ў паўночнай частцы горада Паставы немцы стварылі для яўрэйскага насельніцтва гета, якое займала тры вялікія вуліцы (цяпер — раён вуліцы Ленінская). Там утрымлівалася каля 4000 чалавек. Гета было абнесена плотам з дошак, зверху — калючы дрот. Вакол гета хадзілі нямецкія вартавыя. Бывалі выпадкі, калі людзі хацелі перакінуць яўрэям што-



Помнік ахвярам генацыду

небудзь з ежы, але вартавыя тады стралялі.

З яўрэяў немцы стварылі паліцыю, праз яе перадавалі загады вязням. Жыхароў гета прымушалі працаваць, вадзілі калонамі на работу. Спераду і ззаду на адзенні яны павінны былі насіць сіянісцкую зорку жоўтага колеру. Ім не дазвалялася ісці па тратуары, а толькі па праезнай частцы вуліцы.

Дзень трагедыі Пастаўскага гета — 21 лістапада 1942 года. Яўрэяў выводзілі групамі за чыгунку да загадзя падрыхтаваных ям і расстрэльвалі. Калі знішчалі яўрэяў, то спалілі некаторыя хаты ў гета, дзе, на думку немцаў, яўрэі маглі хавацца. Частка вязняў была расстраляна на агародзе Якава Якубоўскага па вуліцы Горкага. Зараз на месцы расстрэлаў устаноўлены помнікі.

У Дунілавічах з першых дзён акупацыі нямецкія ўлады правялі перапіс яўрэйскага насельніцтва, разрабавалі іх маёмасць і запасы прадуктаў. У снежні 1941 года яўрэяў сабралі каля будынка жандармерыі, пагналі на бераг ракі Заражанка, дзе прымусілі ў адзенні купацца, каб вада даходзіла да шыі, а назад на бераг паўзці на жываце. У пачатку 1942 года на вуліцы Альцоўскай было створана гета, у якім знаходзілася 903 чалавекі. Ноччу 21 лістапада 1942 года на 4 машынах да гета пад'ехала 35 немцаў і, паставіўшы кулямёты, пачалі абстрэльваць жылыя дамы гета. На досвітку ўсіх тых, хто застаўся жывы, сагналі ў хлеў, там раздзелі і ў адным споднім выганялі на вуліцу па 3–4 чалавекі, дзе яны і расстрэльваліся з аўтаматаў п'янымі немцамі.

У Лынтупах яўрэяў пагналі ў дом Завадскага, што знаходзіўся ў раёне плошчы. Пасля іх рассялілі ў пяці хатах на Красоўскай вуліцы. Дамы тыя былі з забітымі вокнамі. Расстралялі іх 22 снежня 1942 года, а смерць прынялі ў той страшны дзень 93 чалавекі. Аб гэтым напісана на камені, які стаіць на брацкай магіле.

**Сведчаць дакументы**: З успамінаў Юліі Грыгаровіч (Паставы): *«Расстралялі іх, бедных, восенню 1942 года. Гналі па вуліцы да месца расстрэлу. Гналі іх і паліцаі, і немцы, усе ў нейкай чорнай форме. Мы баяліся глядзець у акно, таму што азвярэлыя немцы стралялі ва ўсіх, каго заўважаць. А калі пачалі расстрэльваць яўрэяў, то былі чуваць нечалавечыя крыкі з таго боку. Пра гэта нават страшна ўспамінаць. Ня верыцца, што так могуць крычаць людзі».*

**Гістарычная асоба: Барыс Уладзіміравіч Кіт,** Акадэмік Міжнароднай акадэміі астранаўтыкі, вынаходнік вадароднага паліва для касмічных караблёў, дарадчык урада ЗША па астранаўтыцы, сістэмным аналізе, адзін з першых распрацоўшчыкаў амерыканскіх касмічных сістэм, дырэктар Віленскай і Навагрудскай беларускіх гімназій, прафесар Мэрылендскага універсітэта, заснавальнік беларускай калоніі ў г. Саўт-Рывер (ЗША). У 1942 годзе працаваў дырэктарам настаўніцкай семінарыі ў Паставах.

**Пытанні і заданні:**

1. Калі Пастаўшчына была акупавана фашысцкай Германіей?
2. Якім чынам акупанты усталёўвалі сваю ўладу ў нашым краі?
3. Якія захады рабіліся для таго, каб выхаваць моладзь у духу нацызму?
4. Якія цяжкасці перажывалі жыхары Пастаўшчыны ў час акупацыі?
5. Для чаго акупанты праводзілі карныя аперацыі?
6. У чым трагедыя яўрэйскага народа?

# § 19. Пастаўшчына партызанская

**1. Арганізацыя антыфашысцкага супраціву.** З самага пачатку вайны на тэрыторыі раёна пачало разгарацца полымя барацьбы супраць фашысцкіх акупантаў. У розных мясцовасцях ствараліся партызанскія атрады і падпольныя групы. Для арганізацыі ўзброенага супраціву з-за лініі фронту ў нямецкі тыл перапраўляліся групы савецкіх і партыйных работнікаў. У пачатку ліпеня 1941 года ў Ветрыне і Ушачах было створана 10 такіх груп, аднак праз лінію прайшла толькі група С. А. Проньکі. Астатнія былі рассеяны падчас сутычак з ворагам ці вярнуліся назад. У гэты ж час быў сфарміраваны, у асноўным з мясцовых актывістаў, невялікі



Сяргей Пронька — арганізатар першай партызанскай групы ў Пастаўскім раёне



Яўгенія Машара — камсамолка-падпольшчыца з вёскі Васіліны

партызанскі атрад «Смерць фашызму» на чале са старшынёй Пастаўскага райвыканкама Ф. Нагорным і сакратаром райкама партыі А. Манахавым.

26 жніўня 1941 года з савецкага тылу была накіравана на Вілейшчыну арганізатарская група ў складзе 3 чалавек на чале з намеснікам старшыні Вілейскага аблвыканкама Фёдарам Маркавым. Трапіўшы ў Пастаўскі раён, ён падабраў надзейных людзей, устанавіў сувязі з дробнымі партызанскімі групамі і на іх базе стварыў партызанскі атрад імя А. В. Суворава. Атрад хутка рос, набіраўся сіл, пры актыўнай падтрымцы насельніцтва стаў праводзіць баявыя аперацыі. Толькі за кастрычнік 1942 года народныя мсціўцы знішчылі паліцэйскую і валасную ўправы ў Клюшчанах, узарвалі чыгуначны мост на рацэ Рудня, маёнтак Альшэва, здзейснілі налёт на гарнізон у вёсцы Слабада. У гэтым жа месяцы партызаны разграмілі моцны варожы гарнізон у мястэчку Кабыльнік. Падчас бою было знішчана 18 салдат і афіцэраў, у тым ліку шэф жандармерыі Мядзельскага раёна. У баявых аперацыях праявілі гераізм і адвагу камандзіры і радавыя партызаны Ф. Р. Маркаў, Г. П. Буцько, М. І. Беспалёнаў, А. А. Гаршкоў, Я. К. Брадовіч, А. А. Кананенка, Г. З. Магілёўчык і іншыя народныя мсціўцы.

У лістападзе 1942 года атрад імя А. В. Суворава аб'яднаўся з атрадам «Знішчальнік» (камандзір В. Т. Цаба) у партызанскую брыгаду імя К. Я. Варашылава на чале з Ф. Р. Маркавым. Яна кантралявала ўвесь Нарачанскі край. Летам 1944 года брыгада складалася з 12 атрадаў і налічвала ў сваіх радах амаль 2 тыс.



👁 Марыя Лапаць і Клаўдзія Рамановіч — камсамолкі, удзельніцы партызанскага руху

чалавек. Аснову патрыятычных груп складалі мясцовыя актывісты, воіны і афіцэры Чырвонай Арміі, якія аказаліся ў акружэнні ці збеглі з фашысцкага палону.

Летам 1941 года былы міліцыянер з в. Крывое Рыгор Крукаў стварыў невялікую партызанскую групу, якая пачала рабіць налёты на паліцэйскія ўчасткі. Летам 1942 года яны ліквідавалі Ласіцкую, а затым Казлоўшчынскую і Залескую ўправы, захапілі ў ворага пішучую машынку.

Значны ўклад у разгром фашысцкіх захопнікаў унёс партызанскі атрад «Слава», якім кіравалі нашы землякі Васіль Асяненка (камандзір) і Я. А. Пронька (камісар).

Пастаўскім падпольным райкамам партыі была праведзена вялікая работа па зборы грашовых сродкаў ад насельніцтва ў фонд Чырвонай Арміі. Брыгады імя К. Я. Варашылава і імя М. В. Фрунзе сабралі ў фонд абароны грошай, золата і іншых каштоўнасцей на суму 1300 тыс. рублёў.

З восені 1943 года ў зоне дзеяння брыгады Ф. Р. Маркава набіраліся і друкаваліся пастаўская раённая газета «За победу», шматлікія лістоўкі.

Сярод тых, хто адным з першых стаў на шлях барацьбы з ворагам, было шмат моладзі. Камсамольска-маладзёжныя падпольныя групы былі створаны ў пасёлку Варапаева, вёсках Васіліны, Вялікія Коскі, Козічы, Крывое, Логавінцы, Ліпнікі, Рымкі, Чарэмушнікі і інш. Вялікую ролю ў арганізацыі камсамольскага падполля адыграў С. А. Пронька. З яго ўдзелам былі створаны ў 1943 годзе Пастаўскі і Дунілавіцкі раённыя камсамольскія цэнтры. Камсамольцы і моладзь стваралі ядро ў дыверсійных і разведвальных групах, паказвалі ўзоры мужнасці і адвагі, самаадданасці і непахіснасці. Прыкладам таму подзвігі і гераічныя ўчынкі камсамолак Ганны Маслоўскай, якая была ўдастоена ганаровага звання

Героя Савецкага Саюза, Ганны Дунец (Пашкевіч), Надзеі Асяненкі, Рэгіны Міхнёнак і іншых. Многія з юнакоў і дзяўчат Пастаўшчыны ахвяравалі сваім жыццём у гэтай барацьбе, каб наблізіць жаданы час вызвалення.

**2. Разгортванне партызанскага руху.** У верасні 1942 года партызанамі былі разгромлены гарнізоны ў вёсках Дунілавічы, Груздава, у 1943 годзе — у Лынтупах, у 1944 годзе — у вёсках Ажуны, Залессе і інш.

У выніку актыўнасці партызан і пад уздзеяннем антыфашысцкай прапаганды, якую вялі ў гарнізонах патрыёты, паліцэйскія ў большасці сваёй пры магчымасці пераходзілі да партызан, што значна аслабляла германскі бок. Так, ужо зімой 1942 года перайшлі 14 чалавек са зброяй, а летам — яшчэ 100. У маі 1943 года прыпыніў дзейнасць супраць партызан і мясцовага насельніцтва ўкраінскі батальён (86 чалавек), і па рашэнні партызанскага камандавання на яго аснове быў створаны атрад імя Пархоменкі. Усяго летам 1943 года з пастаўскага гарнізона да партызан перайшлі са зброяй 200 паліцэйскіх, з Варапаева ў красавіку 1944 года — каля 50 чалавек.




Акупанты ўсталёўваюць шыльду «Партызаны – небяспечна!»

На вызваленай партызанамі тэрыторыі дзяржаўная ўлада ажыццяўлялася партызанскім камандаваннем і Пастаўскім падпольным райкамам партыі. Гітлераўцы ўсімі сіламі імкнуліся ліквідаваць ці хаця б аслабіць партызанскі рух. Для гэтага нямецкае камандаванне здымала з фронту воінскія часці і накіроўвала іх для разгрому партызан. Так, зімой 1943 года фашысты распачалі блакаду нарацкай зоны. Вораг сканцэнтраваў супраць партызан да 10 тыс. салдат і афіцэраў, шмат тэхнікі, у тым ліку самалёты, танкі, артылерыю. 14 лютага фашысты пачалі баявыя дзеянні. 12 самалётаў бамбілі

партызанскія лагеры, вёскі. На наступны дзень вораг працягваў наносіць бомбавыя ўдары па партызанах, а затым перайшоў у наступленне. Партызаны адбілі ўсе атакі.



👁 Партызанская карыкатура на Гітлера

Калі набліжаліся дні вырашальнага наступлення Чырвонай Арміі, фашысты зрабілі яшчэ адну спробу ачысціць свае тылы ад партызан і знішчыць ці вывезці на катаргу мірнае насельніцтва. У красавіку 1944 года гітлераўцы арганізавалі самую буйную аперацыю супраць партызан Нарачанскіх і Казьянскіх лясоў. Штаб камандавання фашысцкай экспедыцыі на чале з генералам Мільнерам знаходзіўся ў Паставах.

Гітлераўцы наваднілі гарнізоны карнікамі, франтавымі часцямі і пачалі акружаць партызанскія зоны. Завязаліся працяглыя і цяжкія баі. Нямецкія самалёты бамбілі партызанскія базы, вёскі, хутары. Усё было ахоплена пажарам. Сілы былі няроўныя, але партызаны супрацьпаставілі гэтай навале хітрасць і кемлівасць. Усе атрады ў Казьянскіх і Нарачанскіх лясах былі разбіты на невялікія групы, каб прарвацца ці праслізнуць праз лінію акружэння, а потым сабрацца зноў у атрады і разгарнуць баявыя дзеянні ўжо ў тыле карнікаў. Партызаны паспяхова ажыццявілі гэты манеўр, а нямецкія войскі яшчэ доўга працягвалі бамбіць і прачэсваць пусты лес.

Пасля блакады фашысцкія часці, якія ўдзельнічалі ў гэтай карнай экспедыцыі, пайшлі на фронт, а народныя мсціўцы вярнуліся на свае базы і працягваліграміць апорныя пункты ворага, яго глыбокія тылы. У час рэйкавай вайны 19–20 чэрвеня 1944 года партызаны вывелі са строю чыгуначны ўчастак Варапаева—Паставы і ў далейшым наносілі дастаткова адчувальныя ўдары па камунікацыях ворага і гарнізонах.

Актыўныя дзеянні супраць акупантаў на тэрыторыі Пастаўскага раёна праводзілі, апрача брыгады імя К. Я. Варашылава, партызанскія брыгады імя К. К. Ракасоўскага, М. Ф. Гастэлы,



👁 Яўген Брадовіч — камсамолец, член пастаўскай партызанскай групы



👁 Якаў Пронька — камісар атрада брыгады імя Варашылава

У. І. Леніна, 1-я брыгада імя А. В. Суворава, 1-я антыфашысцкая, асобныя атрады імя І. В. Сталіна, П. К. Панамарэнкі, а таксама спецгрупы НКДБ «Альфа» і «Паўночныя».

На тэрыторыі раёна апрача савецкіх партызан дзейнічалі і польскія ўзброеныя фарміраванні Арміі Краёвай (АК-акаўцы), якія падпарадкоўваліся польскаму эміграцкаму ўраду ў Лондане. Адносіны паміж імі складваліся далёка не проста. Былі спробы ўстанавіць сувязь, каб дзейнічаць сумесна супраць фашыстаў, але шчыльнага супрацоўніцтва не атрымлівалася. Акаўцы разглядалі Пастаўшчыну як частку Польшчы і не падпарадкоўваліся савецкаму кіраўніцтву. Камандаванне савецкіх партызан рабіла ўсё, каб сітуацыя была пад яго поўным кантролем. Менавіта таму ў канцы 1943 года брыгада імя Варашылава і яшчэ 5 брыгад Вілейскага партызанскага злучэння правялі буйную аперацыю па раззбраенні польскай партызанскай брыгады Кміціца ў колькасці 640 чалавек, частка якіх была расстраляна. Пасля гэтага польскія партызанскія атрады пачалі праводзіць узброеныя выступленні не толькі супраць акупантаў, але і савецкіх партызанаў.

4 ліпеня 1944 года войскі 1-га Прыбалтыйскага фронту пад камандаваннем І. Баграмяна пасля вызвалення Полацка, Лепеля, Глыбокага пачалі наступленне ў напрамку на Паставы. Немцамі былі створаны ўмацаванні перад горадам, у вёсцы Юнькі, дзе і адбыліся найбольш жорсткія баі. Толькі з дапамогай танкаў Чырвонай Арміі ўдалося зламаць супраціўленне праціўніка і рушыць на Паставы. 5 ліпеня горад быў заняты падраздзяленнямі 145-й Віцебскай стралковай дывізіі.

Вялікія страты нанесла вайна Паставам. Было спалена 86 хат, 46 разбурана часткова; у гета закатавана больш як 4000 чалавек.

Партызанскія фарміраванні прымалі ўдзел у вызваленні раёна разам з часцямі Чырвонай Арміі, пасля чаго многія народныя мсціўцы ўліліся ў франтавыя часці.

**3. Арганізатары і кіраўнікі антыфашысцкай барацьбы.** У гады Другой сусветнай вайны мужнасцю і гераізмам праславіліся многія жыхары Пастаўскага раёна. Сярод іх найбольш вядомыя ўраджэнцы нашага краю Н. Асяненка, Ф. Маркаў, Г. Маслоўская, В. Асяненка, В. Юшкевіч.



Надзея Асяненка — партызанка-разведчыца, сакратар падпольнай камсамольскай арганізацыі

*Надзея Асяненка* нарадзілася ў 1917 годзе у вёсцы Ліпнікі. У час вайны была партызанкай-разведчыцай. Удзельнічала ў многіх баявых аперацыях. Загінула ў баі з фашыстамі ў сакавіку 1944 года каля в. Гулі Мядзельскага раёна. У в. Ліпнікі мужнай партызанцы пастаўлены помнік.

*Фёдар Рыгоравіч Маркаў* нарадзіўся 24.12.1913 г. у в. Качанішкі. За рэвалюцыйную дзейнасць адбываў зняволенне ў Бяроза-Картузскім канцлагеры, віленскай турме. У час вайны — камандзір партызанскай брыгады імя К. Я. Варашылава. Герой Савецкага Саюза. Памёр 14.1.1958 г. Яго імем названы вуліцы ў Вілейцы, Паставах, Лынтупах.

*Ганна Іванаўна Маслоўская* нарадзілася 6.1.1920 г. у в. Курсевічы. У час вайны была падпольшчыцай, партызанкай атрада імя Пархоменкі. Удзельнічала ў разгроме фашысцкіх гарнізонаў у Залессі, Лынтупах, Камаях. Герой Савецкага Саюза. Пасля вайны стала прыёмнай маці 15 сірот, бацькі якіх загінулі на вайне. Памерла 11.11.1980.

*Васіль Мікалаевіч Асяненка* нарадзіўся 31.1.1916 г. у в. Ліпнікі. У час вайны быў камандзірам партызанскага атрада «Слава», сакратаром Пастаўскага падпольнага райкама камсамола. Ганаровае званне Героя Сацыялістычнай працы прысвоена яму ў 1966 годзе



Ганна Маслоўская — партызанка-разведчыца, Герой Савецкага Саюза



Мікалай Асяненка — член пастаўскай партызанскай групы

за поспехі ў развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці, калі працаваў першым сакратаром Глыбоцкага РК КПБ. Памёр 13.6.1977 г.

Паставы — радзіма генерал-палкоўніка *Васіля Аляксандравіча Юшкевіча.* Ён нарадзіўся 28 лютага 1897 года, закончыў курсы пры Ваеннай акадэміі, удзельнічаў у Першай сусветнай і грамадзянскай войнах, вайне ў Іспаніі ў 1936–1939 гадах. У час Другой сусветнай вайны камандаваў 44-м корпусам, які ў чэрвені 1941 года абараняў Мінск. У бітве пад Масквой камандаваў 31-й арміяй, пазней — 3-й ударнай арміяй 2-га Прыбалтыйскага фронту. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Суворава, Кутузава. Памёр 15.3.1951 г. у г. Ленінград. Яго імем названа вуліца ў Паставах.

У цэнтральнай частцы гарадской плошчы знаходзіцца чатырохгранны абеліск з чырвонай зоркай у навершшы, дзе пахаваны генерал-маёр Кляра Ігнат Вікенцьевіч і палкоўнік Харальскі Дзмітрый Васільевіч.

*І. В. Кляра* нарадзіўся ў Віцебску 30 снежня 1896 года. Скончыў Ваенную акадэмію імя Фрунзе. Удзельнік грамадзянскай вайны. У Другую сусветную вайну ваяваў на Заходнім, Калінінскім, Бранскім, Цэнтральным і 1-м Прыбалтыйскім франтах. Генерал-маёр. Вызваляў Паставы. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга і ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені. Загінуў у баі 13.7.1944 г. У гонар Кляра названа адна з галоўных вуліц горада.

*Д. В. Харальскі* нарадзіўся ў 1907 годзе. Скончыў Сумскае артылерыйскае вучылішча. У Другую сусветную вайну гвардыі

палкоўнік, наместнік камандзіра, начальнік артылерыі 145-й стралковай дывізіі. Удзельнік вызвалення Паставаў. Загінуў у баі 22.7.1944 г.

*Васіль Аляксеевіч Сідарэнка* атрымаў высокае званне Героя Савецкага Саюза за мужнасць і гераізм, якія ён праявіў у час баёў за Паставы, камандуючы артылерыйскім узводам гармат. Пасля вайны жыў у г. Курск, неаднаразова наведваў Паставы, быў ганаровым грамадзянінам горада. Яго імем названа адна з вуліц горада.

У баі каля Паставаў быў цяжка паранены Герой Савецкага Саюза *Васіль Паўлавіч Кірычук.* Ён памёр ад ран 13.7.1944 г., пахаваны ў брацкай магіле на вуліцы Чырвонаармейскай. Яго імем названа вуліца горада.

У вызваленні Пастаўскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў бралі ўдзел Героі Савецкага Саюза М. А. Васільеў, В. А. Сідарэнка, Б. А. Хлуд, А. В. Шагалаў, А. К. Галубкоў, В. П. Кірычук, М. П. Красільнікаў, У. М. Піўнюк.

Ураджэнцы Пастаўшчыны ўдзельнічалі і ў вядомых падзеях апошняга года вайны: П. П. Бароўка з в. Бараўкі штурмаваў рэйхстаг, С. Я. Зубкоў з в. Жвойрышкі ўдзельнічаў у парадзе Перамогі ў Маскве, а А. І. Чувалаў з в. Паташня — у парадзе саюзных войск у Берліне.

**Цікавы факт:** Пры вызваленні Паставаў ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў першым, хто ўварваўся ў горад, быў камандзір аддзялення аўтаматчыкаў Іван Шэпелеў. За мужнасць і адвагу, праяўленыя ў гэтым баі, яго ўзнагародзілі ордэнам Чырвонай Зоркі.

**Пытанні і заданні:**

1. Як арганізоўваўся антыфашысцкі рух на Пастаўшчыне?
2. Якія партызанскія атрады і брыгады дзейнічалі на тэрыторыі раёна?
3. У якіх вёсках нашага краю былі створаны камсамольска-моладзевыя падпольныя групы?
4. Чаму паміж савецкімі і польскімі партызанамі былі ўзброеныя канфлікты?
5. Лёсы якіх герояў вайны звязаны з Пастаўшчынай?

# § 20. У мірнай працы (1944–1991)

**1. Пасляваеннае аднаўленне гаспадаркі.** З першых дзён вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў пачалося ўсталяванне савецкай улады, якая скіравала ўсю сваю дзейнасць на аднаўленне разбуранай гаспадаркі. Ужо ў 1945 годзе пайшла першая прадукцыя прадпрыемстваў мясцовай прамысловасці — трох цагельных заводаў агульнай магутнасцю 1 млн. штук цэглы ў год, вапнавага завода магутнасцю 150 т вапны ў год, ганчарнай майстэрні і інш. У тым жа годзе распачалі працу спіртзавод, лесапільна-мэблевы камбінат, 4 млыны. Фактычна ўся выпускаемая прадукцыя ішла на патрэбы раёна.

Разам з аднoўленай прамысловасцю пачала працаваць сацыяльная сфера. Ужо ў 1944 годзе дзейнічалі раённая бальніца на 65 месцаў, раённая амбулаторыя, станцыі хуткай дапамогі, санстанцыя, 2 фельчарска-акушэрскія пункты; адкрыліся 65 пачатковых, 4 няпоўныя сярэднія і адна сярэдняя школы, у якіх займаліся 4652 вучні.

У першыя пасляваенныя гады пачалася калектывізацыя сялянскіх гаспадарак. У 1944–1945 гадах удалося аднавіць дзейнасць усяго трох калгасаў з 9 існаваўшых у раёне да пачатку вайны. У 1949 годзе распачалося хуткае калгаснае будаўніцтва: калі ў сакавіку 1949 года было створана 5 калгасаў, то ўжо ў красавіку гэтага ж года — яшчэ 18.

Кваліфікаваных спецыялістаў для новых гаспадарак рыхтавалі на кароткатэрміновых курсах па падрыхтоўцы рахункаводаў, старшыняў калгасаў, касіраў, загадчыкаў жывёлагадоўчых ферм, трактарыстаў і іншых. Да снежня 1950 года ў раёне з 9648 аднаасобных гаспадарак было аб'яднана ў калгасы



Пастаўская цагельня. 1950-я гг.



Школа ў Манькавічах

8764, ці 94,5%, а на іх базе створана 210 калгасаў.

У 1944–1946 гады кіраўніцтву раёна давялося вырашаць няпростыя задачы, звязаныя з перасяленнем польскага насельніцтва з Пастаўскага раёна ў Польшчу. У верасні 1944 года паміж урадам БССР і Польскім камітэтам нацыянальнага вызвалення была падпісана дамова аб узаемнай эвакуацыі беларусаў з Польшчы і палякаў з БССР у Польшчу. На выезд у суседнюю краіну з Пастаўшчыны запісалася больш за тысячу аднаасобных сялянскіх гаспадарак агульнай колькасцю 2487 чалавек.

Пераважную большасць ад'язджаючых склалі аднаасобныя заможныя сяляне, і галоўнымі матывамі іх пераезду з'яўлялася непрыняцце савецкай улады і ўсяго таго, што ад яе імя рабілася — прымусовай калектывізацыі, беспадстаўных арыштаў, масавых дэпартацый насельніцтва, а таксама рэлігійны ўціск, страх згубіць роднасныя сувязі зродзічамі на польскай зямлі.

У раёне ў 1944–1947 гадах склалася даволі напружаная палітычная сітуацыя, і звязана гэта было ў першую чаргу з існаваннем разгалінаванай сеткі ўзброенага антысавецкага супраціву. Для барацьбы з ёй на Пастаўшчыну былі прысланы спецыяльныя групы з вопытных работнікаў. За 5 месяцаў 1946 года праваахоўнымі органамі было ліквідавана 25 бандаў агульнай колькасцю 111 чалавек, а таксама затрымана 36 бандытаў-адзіночак. Аднак да канца



Алеся і Антон Фурсы — удзельнікі арганізацыі «Саюз беларускіх патрыётаў»

50-х гадоў антысавецкія выступленні працягваліся, і толькі ў 1952 годзе са з'яўленнем у краі аператыўнай групы ўнутраных войск асноўныя антысавецкія фарміраванні былі ліквідаваныя.

Патрыятычны рух на Пастаўшчыне праявіўся ў дзейнасці «Саюза беларускіх патрыётаў» (СБП) — падпольнай моладзевай арганізацыі, якая ўзнікла ў Глыбоцкім педвучылішчы, а потым да яе далучылася група навучэнцаў Пастаўскага педвучылішча. Дзейнасць арганізацыі скіроўвалася на павышэнне нацыянальнай свядомасці навучэнцаў, якія на месцах павінны былі распачаць аналагічную работу сярод насельніцтва. На пачатку лета 1947 года большасць сяброў арганізацыі была арыштавана. 33 члены СБП былі пазбаўлены волі на тэрміны ад 5 да 25 гадоў.

**Сведчаць дакументы:** У справаздачы начальніка раённага аддзела Міністэрства дзяржбяспекі на бюро Пастаўскага РК КП(б)Б 20 снежня 1947 года адзначалася: *«За апошнія 4 месяцы гэтага года ў раёне рэзка актывізавалася дзейнасць бандыцкіх нацыяналістычных груп. За гэты час бандытамі здзейснена 5 тэрарыстычных актаў супраць партыйнасавецкага актыву, у выніку гэтых тэрарыстычных актаў былі забіты старшыня Радуцкага сельсавета, дэпутат Груздаўскага сельсавета, настаўніца Пастаўскай школы, маці загадчыцы Савіцкай хатычытальні, сакратар камсамольскай арганізацыі Мягунскага сельскага Савета, інспектар раённага фінансавага аддзела, загадчык магазіна Мягунскага сельпо».*

**2. Эканамічнае развіццё ў 50–90-я гады.** З першых пасляваенных гадоў кіраўніцтва раёна прымала ўсе захады, каб павялічыць выпуск прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі, пашырыць сферу сацыяльных паслуг. Паступова ў строй дзеючых уводзіліся новыя важныя аб'екты, ажывалі даваенныя.

Ужо ў 1947 годзе першую прадукцыю выдаў Пастаўскі льнозавод, які спецыялізаваўся на першаснай перапрацоўцы ільну. Разам з гэтым на прадпрыемстве былі запушчаны швейны цэх, цэхі па вырабу вяровак і кастрапліт.

У 1953 годзе ў строй дзеючых уступіў кансервавы завод, праз дзесяць гадоў — малаказавод. У 1964 годзе на базе дзвюх хлебапякарань быў створаны хлебазавод, а ў 1970 годзе пабудаваны новы. Пашырылі выпуск прадукцыі старэйшыя прадпрыемствы Пастаўшчыны — шклозавод «Гута», Варапаеўскі дрэваапрацоўчы камбінат.



Грошы часоў СССР

Спрыяльнае геаграфічнае становішча і наяўнасць працоўных рэсурсаў садзейнічалі далейшаму развіццю на Пастаўшчыне прамысловай вытворчасці. На працягу 1977–1980 гадоў вялося будаўніцтва завода па вытворчасці камплектаў вучэбнага абсталявання па чарчэнні і маляванні, разлічанага больш як на 500 працуючых. У 1981 годзе прадпрыемства выдала першую прадукцыю. Адметна тое, што гэта была амаль што адзіная спецыялізаваная вытворчасць, якая забяспечвала многія рэгіёны былога СССР школьным абсталяваннем. З 1985 года завод выйшаў на праектную магутнасць.

У 1976 годзе ў Паставах быў створаны філіял Вільнюскага завода радыёкампанентаў вытворчага аб'яднання «Вінгіс», які спецыялізаваўся на выпуску прадукцыі для абароннай прамысловасці. У 1986 годзе ён быў пераўтвораны ў завод па вытворчасці трансфарматараў і атрымаў назву «Беліт» (Беларусь – Літва). У пачатку 1993 года завод быў прыняты ў склад Мінскага вытворчага аб'яднання «Гарызонт».



Пастаўская цагельня. 1965 г.

З будаўніцтвам і станаўленнем «Беліта» многае звязана ў развіцці сацыяльнай сферы горада: гэта жыллё, дзіцячыя сады, узвядзенне сучаснага водазабору, вялікай кацельні, шмат іншага, без чаго цяпер не ўяўляецца жыццё пастаўчан і жыццядзейнасць многіх аб'ектаў вытворчай і сацыяльнай сферы.

У 60-х гадах была створана Пастаўская міжкалгасная будаўнічая арганізацыя, якая ў 1978 годзе атрымала статус міжкалгаснай перасовачнай механізаванай калоны (МПМК) № 33, а з 1996 года пераўтворана ў аграбудфірму «Рассвет». За час існавання арганізацыяй уведзены ў эксплуатацыю амаль 1000 аб'ектаў: жылыя дамы, кароўнікі, свінарнікі, рамонтныя майстэрні, школы, клубы, дзіцячыя сады, жывёлагадоўчыя комплексы.

Для будаўніцтва дарог, іх падрыхтоўкі і ўтрымання і была створана ў лістападзе 1957 года дарожнае эксплуатацыйнае ўпраўленне (ДРБУ-132). У 1960–1970-я гады ім пабудаваны дарогі Паставы – Казьяны, Дварчаны – Лынтупы, Полава – Варапаева – Ваўкалаты, Паставы – Полава, участак магістралі Полацк – Вільнюс, дзесяткі ўнутрыгаспадарчых дарог, пад'язных шляхоў, мастоў.

За гады існавання раёна вялікія змены адбыліся ў гандлёвым абслугоўванні насельніцтва. Спажывецкая кааперацыя пступова ператварылася ў шматгаліновую гаспадарчую арганізацыю: выпускае тавары, ажыццяўляе рознічны гандаль, арганізуе грамадскае харчаванне, вядзе нарыхтоўкі сельгаспрадукцыі і сыравіны, мае сваю аўтабазу і будаўнічы ўчастак, аказвае шматлікія паслугі насельніцтву.

Пастаўскі раён, нягледзячы на даволі развітую прамысловасць і іншыя галіны, усё ж сельскагаспадарчы. У сувязі з перадачай трактарнага парка з машынна-трактарнай станцыі ў калгасы і саўгасы было створана раённае аб'яднанне «Сельгастэхніка» з колькасцю працуючых каля 300 чалавек.

Аб'яднанне пашырала такія віды паслуг, як абслугоўванне і рамонт тэхнікі, механізмаў на жывёлагадоўчых фермах, зерне- і льнотакоў, выконвала шэраг іншых работ.

Аднак не ўсе працэсы ў сельгасвытворчасці адбываліся так, як жадалі вяскоўцы. Захапленне рознымі кампаніямі, у тым ліку пашырэнне пасеваў кукурузы, падрывала стан традыцыйных культур, такіх, як бульба, жыта, авёс, лён. Таму гаспадаркі пасля чарговага «эксперыменту» вярталіся да сваіх звыклых, спрадвечных заняткаў. Толькі за дзесяцігоддзе, з 1960 па 1970 год, аб'ёмы продажу збожжа дзяржаве выраслі ў 3 разы, мяса — у 2,7, агародніны і малака — у 2,2, яек — у 3 разы. Найбольш высокіх паказчыкаў у развіцці жывёлагадоўлі раён дасягнуў у 1990 годзе, у раслінаводстве — у 1972 годзе. Самая высокая ўраджайнасць




Ракетныя базы ў Беларусі

збожжавых і зернебабовых была атрымана ў 1976 годзе — 34,4 цэнтнера з гектара.

На гэты час прыпадае будаўніцтва буйных жывёлагадоўчых комплексаў па вырошчванні і адкорме буйной рагатай жывёлы ў калгасах «Перамога» і «Сцяг Перамогі», свінакомплексаў у калгасах «Дружба» і «XXV партз'езд».

Раён неаднаразова выходзіў пераможцам абласнога, рэспубліканскага і ўсесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва, сотні передавікоў сельгасвытворчасці ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі СССР, а старшыня калгаса імя Суворава А. Валодзька ўдастоены звання Героя Сацыялістычнай Працы.

Добрых вынікаў гаспадарання дабіваліся таксама ў калгасах «Дружба», імя Калініна, імя Мічурына.

**3. Культурныя здабыткі.** Пастаўшчына здаўна славіцца сваімі музычнымі традыцыямі, самадзейнай мастацкай творчасцю, рамёствамі. У няпросты пасляваенны перыяд уцалелыя памяшканні, якія былі прыгодныя для выкарыстання, сталі першымі культурнымі цэнтрамі. Пашырэнню асветніцтва спрыяла арганізацыя невялікіх мясцовых бібліятэк. З 1960-х гадоў яны набылі статус самастойных. У дзейнасці культурна-асветных устаноў шырока выкарыстоўваліся розныя формы работы — тэматычныя вечары, народныя універсітэты, вечары працоўнай славы, сустрэчы з ветэранамі вайны і працы. Пастаўшчына як песенны і самабытны край не страціла сваёй захопленасці фальклорам, народнай музыкай. Своеасаблівым музычным цэнтрам у раёне стала в. Груздава, дзе з цікавымі праграмамі выступалі сямейныя ансамблі музыкаў Мацкевічаў, Крывенькаў, Новікаў, Падгайскіх, Мельцаў. А ў 1958 годзе тут быў створаны цымбальны аркестр у складзе 50 чалавек, якому у 1973 годзе было прысвоена




Груздаўскі народны цымбальны аркестр на плошчы ў Паставах

званне народнага. Нават святочныя канцэрты ў Крамлёўскім палацы з'ездаў часам не абыходзіліся без груздаўскіх музыкаў. Яны часта выступалі на рэспубліканскім і абласным тэлебачанні, у рэспубліках былога СССР.

Добрым захавальнікам нашай гісторыі і спадчыны стаў раённы краязнаўчы музей, заснаваны на грамадскіх пачатках настаўнікам А. Лукічовым. У 1974 годзе установа набыла статус дзяржаўнай і ў 1976 годзе была адкрыта для наведвальнікаў.

Мясцовыя навіны асвятляліся ў газеце «Звязда», якая ў 50-я гады называлася «Новы шлях».

У 1944 годзе ў Паставах было адкрыта педагагічнае вучылішча, якое ўжо ў 1947 годзе падрыхтавала першы выпуск. У вельмі цяжкіх умовах даводзілася працаваць не толькі выкладчыкам, але і навучэнцам, якіх было каля 60. З прычыны недахопу сродкаў педвучылішча ў 1955 годзе спыніла сваю дзейнасць. У пасляваенны перыяд і ў больш позні час былі здадзены ў эксплуатацыю новыя памяшканні 5 сярэдніх школ у г. Паставы, Лынтупскай, Камайскай, Навасёлкаўскай, Ваўкоўскай сярэдніх, Навадруцкай, Юнькаўскай,




Дэманстрацыя працоўных на плошчы ў Паставах. 1971 г.

Балаеўскай, Андронаўскай і многіх іншых базавых і пачатковых школ. За перыяд з 1966 па 1990 год 853 настаўнікі атрымалі дзяржаўныя ўзнагароды.

На базе педагагічнага вучылішча пазней было заснавана прафесійна-тэхнічнае вучылішча ПТВ-165, якое рыхтавала спецыялістаў сельскай гаспадаркі.

У Паставах у 50-я гады актыўна дзейнічаў тэатр, які ў 1959 годзе атрымаў званне народнага. Спектаклі і прадстаўленні ладзіліся ім да 1985 года.

**Пытанні і заданні:**

1. Якія першачарговыя праблемы паўсталі перад насельніцтвам і кіраўніцтвам Пастаўскага раёна ў пасляваенны час?
2. Якія прадпрыемствы былі адноўлены ў першую чаргу? Чаму?
3. Як адбывалася калектывізацыя ў нашым раёне?
4. Чаму значная група жыхароў раёна запісалася на выезд у Польшчу?
5. У якіх формах існаваў антысавецкі супраціў на тэрыторыі раёна?
6. Якія буйнейшыя прадпрыемствы пачалі дзейнічаць ў 50–60-я гады?
7. Якія дасягненні меў раён у сферы культуры ў 50–90-я гады XX стагоддзя?

# § 21. Сённяшні дзень краю (1991–2008)

**1. Эканамічны крызіс у пачатку 90-х гадоў XX ст.** У пачатку 90-х гадоў Пастаўшчыну, як і ўсю Беларусь, ахапіў эканамічны крызіс. Палітыка перабудовы і галоснасці, якая праводзілася ў СССР, падштурхнула былыя саюзныя рэспублікі да незалежнасці і самастойнасці.

8 снежня 1991 года ў Белавежскай пушчы быў дэнансаваны дагавор аб утварэнні СССР і замест яго стварылася Садружнасць Незалежных Дзяржаў (СНД). Эканамічныя і гандлёвыя сувязі паміж рэспублікамі, якія існавалі дзесяцігоддзямі, абарваліся. Гэта вельмі балюча ўдарыла па прадпрыемствах, якія згубілі ранейшыя рынкі збыту сваёй прадукцыі. Ва ўмовах рыначных рэформ, якія атрымалі назву «шокавай тэрапіі», прадукцыя многіх прадпрыемстваў, у тым ліку і нашага раёна, стала неканкурэнтаздольнай. З гэтай



Картка спажыўца

прычыны адбыўся рэзкі спад вытворчасці, зменшылася зарплата працоўных. Так, завод «Школьнік» у Паставах, які выпускаў мэблю для навучальных устаноў, пасля страты эканамічных сувязей, змен у сацыяльна-эканамічным развіцці апынуўся на раздарожжы. Пачынаючы з 1990-х гадоў тут амаль цалкам адбылося абнаўленне вытворчасці, якая была зарыентавана на выраб мэблі: тумбаў, сталоў, шафаў, канап, дачных набораў, набораў для кухні і іншых тавараў шырокага ўжытку.

Амаль спыніўся завод «Беліт». У пачатку 1993 года ён быў прыняты ў склад Мінскага вытворчага аб'яднання «Гарызонт». Пачалося яго другое ўзыходжанне. Цяпер у цэхах выпускаецца звыш 40 назваў прадукцыі. Асноўная з іх — трансфарматары для тэлевізараў новага пакалення, мікрахвалевыя печы. Частка вытворчых плошчаў пераабсталявана пад крыты рынак «Гарызонт».

Сітуацыя абвастрылася імклівым ростам інфляцыі, калі курс беларускага рубля рэзка ўпаў, грошы абясцэніліся, цэны на тавары пастаянна павышаліся. Рост зарплаты не паспяваў за ростам цэн. У выніку гэтага рэзка пагоршыліся матэрыяльнае становішча і жыццёвы ўзровень насельніцтва. Крызіс, які ахапіў усе сферы народнагаспадарчай дзейнасці, прывёў да вострага дэфіцыту тавараў народнага спажывання, што стала прычынай увядзення картачнай і талоннай сістэмы, чэргаў і незадаволенасці насельніцтва.

Вельмі вострa крызісныя з'явы закранулі сельскую гаспадарку. Значна знізіліся аб'ёмы вытворчасці многіх відаў сельгаспрадукцыі, ураджайнасць збожжавых, бульбы, ільну. Зношанасць тэхнічных сродкаў склала больш за 50 працэнтаў. Большасць гаспадарак не мела ўласных грашовых сродкаў, бо закупачныя цэны не кампенсавалі вялікія затраты на вытворчасць прадукцыі раслінаводства і жывёлагадоўлі. Працаўнікі месяцамі не атрымлівалі зарплаты.



👁 Беларускія грошы 1992 г. выпуску

Многія жыхары раёна звальняліся з прадпрыемстваў і займаліся пошукам спосабаў зарабіць грошы («чаўночны» бізнес, гандаль, індывідуальная прадпрымальная дзейнасць, паездкі на заробкі ў іншыя краіны).

Асаблівасцю Пастаўшчыны было тое, што на яе тэрыторыі размяшчаліся вялікія ваенныя базы. Беларусь адмовілася ад ядзернай зброі — і стратэгічныя ракеты з нашага раёна былі вывезены ў Расію. Таксама быў закрыты аэрадром, а вайсковыя часці расфарміраваны або пераведзены ў іншыя месцы дыслакацыі. Шмат мясцовых жыхароў засталіся без работы. У выніку ўсіх складаных працэсаў Паставы па ўзроўні беспрацоўя сярод гарадоў Віцебскай вобласці займалі першае месца.

**2. Развіццё гаспадаркі раёна на мяжы стагоддзяў.** Складаная сітуацыя ў эканоміцы вымушала прыняць рашучыя і непапулярныя меры па выхаду з крызісу, жорсткай эканоміі ўсіх рэсурсаў, тэхнічнай мадэрнізацыі і рэканструкцыі прадпрыемстваў, пошуку найбольш эфектыўных метадаў гаспадарання ў новых і нязвыклых сацыяльна-эканамічных умовах. І гэта дало станоўчыя вынікі. У апошнія гады XX стагоддзя эканамічная сітуацыя стабілізавалася, а ў пачатку новага тысячагоддзя Пастаўшчына пачала даволі дынамічна развівацца.

За апошнія 3–5 гадоў змены ў вобліку раёна адбываюцца настолькі імкліва, што нават самі жыхары не паспяваюць здзіўляцца з'яўленню новых магазінаў, новых тавараў, паслуг, правядзенню

розных культурных імпрэз. У наш край зачасцілі турыстычныя аўтобусы і дэлегацыі прадстаўнікоў розных устаноў, міністэрстваў і ведамстваў, каб пераняць тутэйшы вопыт.

На сённяшні дзень прадпрыемствы і арганізацыі ўяўляюць сабой зладжаны гаспадарчы комплекс. Прамысловасць раёна прадстаўлена 13 прадпрыемствамі. Асноўнымі галінамі спецыялізацыі з'яўляюцца харчовая і дрэваапрацоўчая. Перапрацоўку сельскагаспадарчай прадукцыі вядуць 6 прадпрыемстваў. Самае вялікае па аб'ёме таварнай прадукцыі — ААТ «Пастаўскі малочны завод». КУП «Пастаўскі мясакамбінат» праводзіць забой жывёлы і першасную апрацоўку сыравіны. РУП «Лынтупскі спіртзавод» выпускае спірт-сырэц і спірт-рэктыфікат. Перапрацоўку садавіны і гародніны ажыццяўляе УДП «Пастаўскі кансервавы завод», які выкарыстоўвае як мясцовую, так і прывазную сыравіну. На мясцовыя і ўласныя рэсурсы зарыентавана работа ААТ «Пастаўскі ільнозавод», які выпускае ільноваласно і развівае сетку падсобнай гаспадаркі.




Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнка запальвае газ у Паставах




Завод «Беліт»

Лясная і дрэваапрацоўчая прамысловасць прадстаўлена ГЛХУ «Пастаўскі лясгас», ААТ «Варапаеўскі дрэваапрацоўчы камбінат», ААТ «Паставымэбля», ПУП «Пастаўскі



Шпіталь пагранічных войск

мэблевы цэнтр». Яны выпускаюць мэблю, дзвярныя і аконныя блокі, піламатэрыялы.

Радыёэлектронная прамысловасць прадстаўлена ПТЧУП «Завод Беліт», якое ўваходзіць у мінскае аб'яднанне «Гарызонт».

КПУП «Пастаўская друкарня» друкуе газеты і бланачную прадукцыю.

У г. п. Варапаева дзейнічае завод жалезабетонных вырабаў, які забяспечвае сваёй прадукцыяй будаўнічыя арганізацыі.

У аграпрамысловым комплексе раёна дзейнічае 21 сельскагаспадарчае прадпрыемства. У 2003 годзе калгасы былі пераўтвораны ў сельскагаспадарчыя вытворчыя кааператывы (СВК). Найбольш буйным прадпрыемствам з'яўляецца СВК «Камайскі», дзе выпускаецца да 27% валавай прадукцыі АПК раёна. Стабільна працуюць СВК «Хацілы», СВК «Навасёлкі-Лучай» (спецыялізуецца на вытворчасці і перапрацоўцы рапсу), СВК «Яновіца», СВК «Свіранскі», СВК «Ярэва», СВК



Завод вучэбнага абсталявання «Школьнік»




Памятны знак пачатку газіфікацыі Пастаўскга раёна



Пастаўскі малочны завод

«Блакітныя азёры», СВК «Сцяг Перамогі».

У адпаведнасці з Дзяржаўнай праграмай адраджэння і развіцця сяла ў Пастаўскім раёне да 2010 года 10 населеных пунктаў павінны стаць аграгарадкамі. Першымі такі статус набылі Камаі, Лынтупы, Дунілавічы.

Галоўнай гандлюючай арганізацыяй раёна з'яўляецца Пастаўскае раённае спажывецкае таварыства. Яно займаецца гандлем, вытворча-нарыхтоўчай і будаўнічай дзейнасцю, абслугоўваннем насельніцтва, грамадскім харчаваннем, забеспячэннем паслуг. РайСТ займае перадавыя пазіцыі ў вобласці і ў рэспубліцы. У 2003 годзе калектыў занесены на рэспубліканскую Дошку гонару.

Удзельная вага тавараў уласнай вытворчасці ў рознічным таваразвароце складае 22%. Кааператыўная прамысловасць спажывецкага таварыства ўяўляе сабой хлебапякарную, кандытарскую, каўбасную і рыбную вытворчасць, швейны, трыкатажны і ткацкі цэхі, цэх па перапрацоўцы воўны, цэх сталярных вырабаў.

Гандаль прадстаўлены 95 магазінамі, у тым ліку 54 у сельскай мясцовасці. Жыхароў малых населеных пунктаў абслугоўваюць 10 аўтамагазінаў. У сферы гандлю працуюць фірменныя магазіны малаказавода, мясакамбіната, «Віцебскія дываны», пункты продажу індывідуальных прадпрымальнікаў.

Транспартныя паслугі аказвае ААТ «Аўтатранспартнае прадпры-



Мітынг на плошчы ў Паставах у Дзень Перамогі. 2008 г.

емства № 17», якое абслугоўвае 22 маршруты, з якіх 6 — у г. Паставы, міжнародных — 1, міжгародных — 3. Аўтобусным транспартам злучаны ўсе цэнтры сельскагаспадарчых прадпрыемстваў і сельсаветаў. Працуюць маршрутныя таксоўкі індывідуальных прадпрымальнікаў. У Паставах, Варапаеве, Лынтупах маюцца чыгуначныя станцыі.

Спецыялізаваным прадпрыемствам па аказанні бытавых паслуг з'яўляецца КУП «Пастаўскі райбыткамбінат». Бытавыя паслугі аказваюць у раёне 50 індывідуальных прадпрымальнікаў.

У раёне працуе будаўнічая арганізацыя ДКУ АСП «Рассвет Пастаўскі». Дорожнае будаўніцтва і абслугоўванне дарог ажыццяўляе КУП «Пастаўскае ДРБУП-132», ДЭУ-33, прадпрыемства меліярацыйных сістэм ПКУП «Пастаўскае ПМС».

У кастрычніку 2004 года на Пастаўшчыне адбылася важная падзея: у наш край прыйшоў газ, што некалькі зменшыла праблему з палівам, палепшыла экалогію.

У сістэме адукацыі раёна 57 устаноў: гімназія, 12 сярэдніх школ, 20 базавых, 8 пачатковых і 15 дзіцячых дашкольных устаноў, Варапаеўская дапаможная школа-інтэрнат. Дзейнічае аб'яднанне пазашкольных устаноў і цэнтр карэкцыйнага развіваючага навучання і рэабілітацыі.

Установа «Пастаўскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж сельскагаспадарчай вытворчасці» рыхтуе спецыялістаў сярэдняга звяна і кадры масавых рабочых прафесій, навучаецца там 600 вучняў.

Раённае тэрытарыяльнае медыцынскае аб'яднанне ўключае 6 бальніц, у тым ліку Пастаўскую раённую бальніцу на 195 ложкаў з паліклінікай на 375 наведванняў у змену. Працуе 87 дактароў, 364 медыцынскія работнікі сярэдняга звяна. Установа аховы здароўя «Пастаўскае РТМА» з'яўляецца базавай арганізацыяй у рэфармаванні сістэмы аховы здароўя у Беларусі. У раёне адкрыты 2 офісы ўрачоў агульнай практыкі. Упершыню ў рэспубліцы праведзены сеансы тэлемедыцыны.

У Паставах заходзіцца 1-ы шпіталь Памежных войск Рэспублікі Беларусь.

Аздараўленне дзяцей ажыццяўляецца ў дзіцячым рэспубліканскім аздараўленчым цэнтры «Ветразь» ля вёскі Касцяні.

**3. Культурныя здабыткі.** Сетка ўстаноў культуры ўключае ў сябе раённы Дом культуры ў Паставах, 2 гарпасялковыя, 6 сельскіх Дамоў культуры, 15 сельскіх клубаў, 12 клубаў-бібліятэк, 34 бібліятэкі, школу мастацтваў, мастацкую школу, краязнаўчы музей, Дом рамёстваў.

10 самадзейным калектывам нададзена званне народных, ансамбль народнай музыкі «Паазер'е» мае званне заслужанага аматарскага калектыву. У другой палове і асабліва ў канцы стагоддзя на Пастаўшчыне назіраецца павышаны інтарэс да народнай музыкі. Звязана гэта ў першую чаргу з дзейнасцю выкладчыкаў Пастаўскай музычнай школы, уплывам і традыцыямі Груздаўскага цымбальнага аркестра і асабліва з выдатнымі творчымі і арганізацыйнымі здольнасцямі дырэктара музычнай школы Анатоля Собаля, якому ўдалося стварыць цікавы і адметны ансамбль народнай музыкі «Паазер'е». Ансамбль, аснову якога складаюць дыятанічныя цымбалы, а таксама мелодыі і песні Пастаўскага краю, карыстаецца шырокай папулярнасцю як на радзіме, так і за яе межамі. «Паазер'е» — неаднаразовы ўдзельнік шматлікіх канцэртаў, конкурсаў, фестываляў. Менавіта дзякуючы самабытнасці і высокаму выканальніцкаму майстэрству пастаўскіх музыкаў, а таксама арганізацыйным здольнасцям кіраўніцтва раёна ў горадзе на сталае жыхарства «прапісаўся» міжнародны фестываль народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік».

Упершыню ў Паставах фестываль праходзіў у 1992 годзе і з таго часу стаў традыцыйным. З 1996 года набыў статус міжнароднага. На свята народнай музыкі прыязджаюць фальклорныя калектывы з розных краін: Літвы, Латвіі, Эстоніі, Польшчы, Малдовы, Украіны, Расіі, Італіі, Венесуэлы і іншых. У праграме фестываляў звычайна праводзяцца конкурсы, ладзяцца канцэрты, арганізуюцца творчыя майстэрні. Шмат слухачоў збіраецца на паказ гіторыка-музычных кампазіцый і феерверкаў, якія праводзяцца звычайна ўвечары пра святле ліхтароў і пражэктараў.

Акрамя «Паазер'я» вялікім поспехам у слухачоў карыстаюцца выступленні ансамбля народнай песні «Вітанне», хор ветэранаў «Памяць», эстрадны калектыў «25±».

На сённяшні дзень у Паставах дзейнічае дзіцячая мастацкая школа, якой нададзена імя А. Ромэра. Мастацкія традыцыі на Пастаўшчыне паспяхова развіваюць І. Атрахімовіч, А. Гарошка,

С. Дацэнка, Я. Забароўскі, Н. Кірылава, С. Сіповіч, А. Стахоўскі і інш.

Міжваенны і пасляваенны час не прынеслі вялікіх здабыткаў на ніве літаратуры, а вось апошнія дзесяцігоддзі XX стагоддзя і пачатак новага сталі парой найбольшага літаратурнага ўздыму. Ён супаў з новай хваляй беларускага адраджэння, абуджэннем нацыянальнай самасвядомасці, цікавасці да роднай гісторыі і культуры. Актыўна пачалі працаваць у жанрах паэзіі і прозы пісьменнікі старэйшага пакалення: А. Нафрановіч, Н. Захарэвіч, Я. Абрамовіч, З. Шыман; і маладзейшыя: А. Касцень, І. Пракаповіч, П. Літвіновіч, А. Гарбуль, Л. Трубач, В. Лісіцкая, Г. Жук, С. Ліпень. Зараз у раёне жыве і працуе каля 30 аўтараў, творы якіх перыядычна друкуюцца як у мясцовай прэсе, так і ў рэспубліканскіх выданнях. За апошнія 15 гадоў колькасць аўтараў, якія маюць свае кніжкі, вырасла да 14, а колькасць выдадзеных кніг — да 45. Гэта значыць, што ў сярэднім у год пісьменнікамі Пастаўшчыны выдаецца 2–3 кнігі.



Абраз Маці Божай Жыровіцкай у Паставах

Важным аб'ектам культуры з'яўляецца краязнаўчы музей. Ён налічвае каля 7000 экспанатаў. Мае аддзелы прыроды, гісторыі Пастаўскага раёна, Вялікай Айчыннай вайны, этнаграфічны. Сярод экспанатаў — археалагічныя калекцыі кафлі XV – пачатку XX стагоддзя, скарб талераў і ортаў XVII стагоддзя, планы панскіх маёнткаў, матэрыялы пра падпольны і партызанскі рух, развіццё гаспадаркі ў пасляваен-



Ансамбль народнай музыкі «Паазер’е»



Ветэраны вайны. 2008 г.



Дзіцячы аздараўленчы лагер «Ветразь»



Дом для заезду, XVIII ст. (сёння — краязнаўчы музей)

ны час. У этнаграфічнай экспазіцыі куток інтэр'ера сялянскай хаты, тканыя дываны, вышываныя сеткі, керамічныя вырабы і іншае.

Акрамя раённага краязнаўчага музея ў Паставах дзейнічае музей Вялікай Айчыннай вайны ў СШ № 2, краязнаўчы куток у СШ № 5; экалагічны музей у СШ № 1. У адным з пакояў раённай бальніцы (былы палац Тызенгаўзаў) створана невялікая музейная экспазіцыя, якая адлюстроўвае гісторыю маёнтка і захапленні ягоных гаспадароў. Калекцыйныя зборы сучаснага мясцовага жывапісу, дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва, народнай музыкі і фальклору знаходзяцца ў будынку раённага арганізацыйна-метадычнага цэнтра аддзела культуры «Стары млын», які знаходзіцца ў гістарычным будынку XIX стагоддзя ў цэнтры горада каля моста цераз р. Мядзелка.

У ім работа па захаванню і перадачы спадчыны вядзецца ў гуртках па народнай вышыўцы, вязанні, аплікацыі з са-

ломкі, саломапляценні, кераміцы, ганчарстве, народным ткацтве, габелене, пляценні паясоў.

Пры Доме рамёстваў дзейнічае клуб нацыянальнай кухні, гульні, абрадаў «Традыцыя», удзельнікі якога аднаўляюць і дэманструюць багатую мясцовую кухню і забавы жыхароў гэтай зямлі.

У цесным супрацоўніцтве з Домам рамёстваў арганізуе сваю дзейнасць клуб народных умельцаў «Майстры». Вядомымі майстрамі з'яўляюцца Т. Петух (выцінанка, саломапляценне, ткацтва), М. Аўгусціновіч (пляценнем з лазы), Ю. Фурс (кавальства), С. Шчэрба (ганчарства), М. Ананьева (вышыўка), В. Шашура (разьба па дрэве), Ж. Глабенка (вышыўка, габелен), А. Анкудовіч (саломапляценне), П. Турла (выраб пудзіл птушак і звяроў).

Апошнім часам актывізавалася праца за здаровы лад жыцця. Для заняткаў фізічнай культурай і спортам у раёне ў 2004 годзе ўведзены ў эксплуатацыю гарадскі



Пастаўская раённая бібліятэка



Старшыня Пастаўскага райвыканкама Э. П. Казура выступае на фестывалі «Звіняць цымбалы і гармонік»



Стары млын

стадыён, маюцца 3 фізкультурна-аздараўленчыя комплексы, 33 спартыўныя залы, 2 водныя басейны.

Найбольшай папулярнасцю карыстаецца валейбольная каманда «Атлант-Д» г. Паставы, якая ўдала выступае ў 1-й лізе чэмпіяната Рэспублікі Беларусь па валейболе. Таксама шмат прыхільнікаў мае футбольная каманда «ПМЦ-Паставы», якая здолела прабіцца ў першую лігу чэмпіяната Беларусі.

Пастаўшчыне пашанцавала. У гарадскім і раённым органах кіравання склаліся творчыя калектывы, якія не толькі здольны бачыць перспектывы развіцця горада і раёна, але і знаходзіць сродкі для рэалізацыі планаў, рацыянальна выкарыстоўваць працоўныя рэсурсы, «чалавечы фактар». У значнай ступені гэта адбываецца дзякуючы энергічнай дзейнасці старшыні Пастаўскага райвыканкама Эдуарда Пятровіча Казуры. Менавіта з яго асобай большасць пастаўчан звязвае тыя станоўчыя зрухі, якія адбыліся ў гарадскім жыцці апошніх гадоў.

**Пытанні і заданні:**

1. Якія прычыны выклікалі эканамічны крызіс у Беларусі ў 90-я гады XX стагоддзя?
2. Якія праблемы на Пастаўшчыне з'явіліся ў час эканамічнага крызісу?
3. Якія буйнейшыя прадпрыемствы працуюць зараз у нашым краі? Што яны выпускаюць?
4. Чаму стварэнне аграгарадкоў з'яўляецца важным накірункам дзяржаўнай палітыкі ў сельскай гаспадарцы?
5. Якімі дасягненнямі ў сферы культуры можа ганарыцца Пастаўшчына?

Тэма III

# Матэрыяльная і духоўная спадчына











# § 22. Легенды і паданні

**1. Вусная народная творчасць.** Найкаштоўнейшы скарб народа — гэта яго мова. Менавіта праз яе людзі могуць размаўляць між сабой, выказваць свае думкі і пачуцці. Спрадвечная мова жыхароў Пастаўшчыны — беларуская, бо ва ўсе часы беларусы складалі большую частку насельніцтва. Аднак людзі размаўляюць на дыялекце — мясцовай гаворцы, якая з'яўляецца разнавіднасцю агульнанароднай мовы. Дыялектная мова адрозніваецца ад літаратурнай сваёй абмежаванасцю пашырэння, звычайна вуснай формай бытавання, вузкай грамадскай ужывальнасцю. Напрыклад, у нашай мясцовасці шырока ўжываюцца канчаткі -ець, -аць, -эць, -ыць у дзеясловах 3-й асобы адзіночнага ліку I спражэння (нясець, бярэць, ідзець, кажыць). Таксама часта можна пачуць рэдкія словы: «пявун» — певень, «бусел» — бацян, а ў некаторых мясцовасцях нашага раёна кажуць: не столь, а «сталяванне», тут — «тутака», там — «тамака», вунь там — «вуньдзіка», жэрдка — «жэрдзіна», зусім — «саўсім».

На Варапаеўшчыне слова «стройна» ўжываецца ў значэнні «прыгожа», на Лынтупшчыне «прыгожы» — гэта «пекны». На Лынтупшчыне і Мягуншчыне «гілі» — гэта авадні. Вось яшчэ некалькі прыкладаў дыялектных слоў: вышчарка — рагатун; вырва — праныра; вадзіцца — сварыцца; вандзэлак — клунак; вея — мяцеліца; грэмзаць — неакуратна пісаць; драбіна — лесвіца; дакляраваць — абяцаць; дзялка — участак сенакосу, пасеваў; дранка — страва з дранай бульбы; ешчы — непераборлівы ў ядзе; жыргаць — пераступаць праз нешта; зімна — холадна; камы — таўчоная бульбяная каша; касмыль — пасма валасоў; лахудра — неахайная жанчына; любовы — нятлусты; матуз — шнурок; пагурак — узгорак; пісклюк — кураня; рулі — малако з накрышаным хлебам; скаба — рабрына; хэнць — жаданне, імкненне; шчыток — печка; швэдар — світэр.

Трэба адзначыць, што на гаворкі краю зрабілі пэўны ўплыў літоўская, польская і руская мовы.

На роднай мове ствараліся і перадаваліся з пакалення ў пакаленне вусныя народныя творы: сказы, прымаўкі і прыказкі, загадкі, вершы, песні, казкі, легенды, паданні.



👁 Возера — скарбонка легенд і паданняў

Прыказкі і прымаўкі — гэта адшліфаваная стагоддзямі народная мудрасць, народны вопыт, які перадаваўся ад дзядоў унукам. Вось некалькі з тых, якія ўжываюцца на Пастаўшчыне:

- *Замужам быць, не кашульку шыць.*
- *Краса прыглядзіцца, розум прыгадзіцца.*
- *Мужу праўду не кажы, толькі лытку пакажы.*
- *Хто рана ўстаець, таму Бог даець.*
- *Ціхая свіння глыбока рые.*
- *Абяцанка цацачка — дурному — радасць.*
- *Вялікія сабакі, вялікі брэх.*
- *І Бога хвалі, і чорта не гняві.*
- *Каб я знала, што замужам ліха, сядзела бы ў матулі ціха.*
- *Маўчу, дык пэўна замуж хачу.*
- *Мужык, як варона, а хіцёр, як чорт.*
- *Сею, бараную, увідзеў дзеўку маладую, кінуў-рынуў баранаваць, пайшоў дзеўку абдымаць.*

Багата Пастаўшчына народнымі песнямі, абрадавымі замовамі, казкамі, загадкамі.

**2. Легенды.** Сярод шматлікіх жанраў вусна-паэтычнай творчасці беларускага народа легенда займае даволі значнае месца і вызначаецца сваім адметным характарам. Гэты жанр не такі папулярны,

як казкі, песні, загадкі, прыказкі і прымаўкі, але заўсёды выклікае цікавасць, бо праўда жыцця там мудрагеліста пераплятаецца з нястрымнай фантазіяй і выдумкай народа.

Легенда — гэта фальклорнае або літаратурнае фантастычнае, як правіла, празаічнае апавяданне, якое падаецца і ўспрымаецца як верагоднае.

Народная легенда належыць да найбольш старажытных жанраў фальклору. Чалавеку далёкага мінулага былі незразумелыя многія з'явы ў навакольным жыцці, якія ён спрабаваў растлумачыць уздзеяннем таемных незвычайных сіл. Невыпадкова ў шэрагу беларускіх народных легенд разам з рэалістычным, часта бытавым адлюстраваннем жыцця дзейнічаюць нячыстая сіла, чарадзеі і г. д. Вось якая легенда існуе пра Чортаў (Здань) камень Саболкаўскі: *Аднойчы пайшоў мужык у начное каня пасвіць, стрэльбу з сабой узяў, каб, часам, ад ваўкоў адбівацца. І каля каменя ўбачыў ён нейкага незнаёмага старога чалавека, які таксама быў са стрэльбаю. Стары прапанаваў абмяняцца стрэльбамі, кажучы, што ягоная лепшая за мужыцкую, бо і страляе лепей, і аздоблена align рознымі ўпрыгожаннямі. Спакусіўся мужык на такі абмен, хоць і ягоная стрэльба была не благая і амаль што новая. Стары пайшоў, а мужык, задаволены, застаўся пасвіць каня, раз пораз кідаючы позіркі на прыгожую новенькую зброю.*

*Калі мужыка змарыў сон, то ён уладкаваўся на камні, прыціснуўшы да сябе стрэльбу, і заснуў. Раніцою, прачнуўшыся, ён са здзіўленнем убачыў у сваіх руках замест стрэльбы нейкі доўгі сук. А ягоная ляжала пасярод паляны побач з канём, што працягваў пасвіцца.*

Ведучы цяжкую і ўпартую барацьбу з прыроднымі стыхіямі, старажытны чалавек у сваім уяўленні атаясамліваў іх з нейкімі цёмнымі, варожымі людзям сіламі. Так з'яўляліся легенды пра нячыстую сілу, якая быццам жыла ў непраходных балотах, дрымучых лясах, азёрах... Шэраг легенд звязаны з штодзённым бытам селяніна, у якіх таксама ўздзеяннем незвычайных сіл тлумачыцца паморак хатняй жывёлы, неўраджай. Часта, дзякуючы фантазіі расказчыка, сюжэт легенды знарок ахінаўся покрывам асаблівай таямнічасці і жудасці (напрыклад, легенды аб скарбах). Вось як, напрыклад, у гэтай: «*Мы з мужам ішлі на начны цягнік. Раптам бачым, што збоку ад нас воўк бяжыць. Шэрсць у яго стаіць дыбам, хвост*



Камень з выбітым крыжам у Саранчанах



Вялікі камень Чашкоўшчынскі



Камень-воўк

*трубой, язык высунуты, вочы блішчаць. Мы ідзём, і ён бяжыць побач, ні на крок не адстае. Але потым рушыў хутчэй, апярэдзіў нас.*

*Нечакана адчынілася неба, вялікае святло разышлося навокал, а воўк раптоўна знік. Мы вельмі спужаліся, стаялі знямелыя і не маглі нават варухнуцца. Праз нейкі час усё сталася, як і раней. Ачунялі мы, здзіўлена паглядзелі адно на аднаго, не разумеючы ці то сон, ці то праўда. Цікаўнасць не дала нам спакою. Падышлі мы з маім чалавекам да таго месца, дзе дзіўны воўк прапаў, і ўбачылі, што там ляжыць вялікі шэры камень. Відаць, гэта звер знік, ператварыўшыся ў камень .*

*Кажуць, што пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі праходзіў праз нашу вёску стары салдат, які быў апрануты ў «царскую форму». Ён расказаў што тут вельмі шмат золата схавана. Але шкада, што я ў той час была малая і салдат не мог паказаць месца, дзе быў закапаны скарб. Можа, той скарб і пад гэтым каменем. А шэры воўк, якога бачылі неаднаразова каля камня, сцеражэ зямное багацце».*

Аднак часцей за ўсё ў беларускіх народных легендах над цёмнымі чараўнічымі сіламі перамогу атрымлівае чалавек, яго смеласць, стойкасць, кемлівасць.

Глыбокай пяшчотнай любоўю да роднага краю і роднай прыроды прасякнуты паэтычныя легенды аб утварэнні найбольш вядомых азёраў і рэчак. Вось як апавядае легенда пра Дзявочую затоку Камайскага возера: *«Гэта гісторыя адбылася яшчэ пры цары. Працавалі ў мясцовага пана парабкамі адны маладыя хлопец з дзяўчынай. І такое каханне ў іх паміж сабой было, што людзі нават прымаўкі жартаўлівыя аб гэтай неразлучнай пары складалі. Кажуць, і дня не маглі адно без другога пражыць.*

*І ўсё б было добра, справа ішла да вяселля, каб не мясцовы пан, іх гаспадар. Маладосць і прыгажосць той дзяўчыны спакусіла пана на злачынства.*

*У той час па нашаму краю бадзялася нямала збеглых з катаргі непрытульных «маскалёў». Яны, як цыганы, доўга не сядзелі на адным месцы, бо для такіх узяць што чужое, абрабаваць ці забіць чалавека, што раз плюнуць. Вось, з двума такімі бандытамі і згаварыўся пан, як разлучыць закаханых.*

*Па агульнай змове з бандытамі, адправіў пан тога парабка аж у Лынтупы прадаць цяля. Усё было прадугледжана, каб нішто і ніхто не перашкодзіла бандытам. Пакуль хлопец дабраўся ў далёкае мястэчка, пакуль змог прадаць па больш-менш падыходзячаму кошту гэта самае худое цяля з панскага статку, дык і нядоўгі кастрычніцкі дзень падышоў да свайго скanчэння. Ужо пасля Радуты хлопца ахінула цёмная восеньская ноч. Імжыў дождж, у цемры і цішыні гэтай непрагляднай ночы ўсё жывое пахавалася ў свае сховішчы ад невыноснай вільгаці і зімна, толькі чаўканне па набраклай ад вады дарозе лапцяў адзінокага падарожніка гулка адгукалася ў цягучым густым паветры. Напэўна лепшага часу да злачынцаў і не прыдумаеш. Так і адбылося, як задумалі пан і бандыты. На другі дзень знайшлі таго парабка недалёка ад Лодасяў на дарозе забітым і абрабаваным.*

*Немагчыма перадаць, як гаравала аб сваім каханым яго дзяўчына. Людзі самі, гледзячы на яе, лілі горкія слёзы.*

*А крывадушны пан не пасаромеўся сам прыйсці ў хату бацькоў той дзяўчыны. Бацькам сказаў, што вельмі ўзрушаны горам дзяўчыны, што шкадуе яе і, каб паменшыць яе гора, забірае іх дачку да сябе ў палац.*

*Зашчымелі ў нядобрым прадчуванні сэрцы бацькоў, ды што з панам зробіш. Пры цары кожны пан у сваіх уладаннях быў і царом і богам, не тое што ў старажытныя вольныя часы.*

*Калі ж дзяўчына апынулася ў поўнай яго ўладзе, пан пачаў дамагацца яе. У панскім палацы не было каму заступіцца за бедную парабчанку. Не дабром, дык сілай узяў бы яе пан. Таму і сказала дзяўчына свайму кату, што, як усе заснуць, сама прыйдзе да яго.*

*Але дарэмна чакаў яе пан усю ноч. Дзяўчына, як усе ляглі спаць, патаемна вылезла ў акно і пабегла да берага Камайскага возера, дзе раней сустракалася са сваім каханым.*

*Доўга плакала яна там аб сваім каханым, аб сваёй гаротнай долі. Апасля ўстала і са словамі: «Калі не ты, мой любы, дык ніхто мяне не возьме!» — кінулася ў чорную сцюдзёную ваду возера.*

*З той пары і завецца гэта месца Дзявочай затокай. Людзі кажуць, што да цяперашняга часу ў паўнамесячныя ночы даносяцца з вады стогны той парабчанкі. І калі хто пачуе гэты стогн, хутка развітаецца са сваім каханым ці каханай».*

Нарэшце, у шэрагу беларускіх легенд апяваецца сам чалавек, яго выключнае ўмельства ў працы, сіла і хараство яго пачуццяў.

**3. Паданні.** Па форме і зместу блізка да легенд стаяць народныя паданні. Паданне — гэта вусна-паэтычнае празаічнае апавяданне, у якім ад імя сведкі або ўдзельніка падзей паведамляецца пра сапраўдныя ці магчымыя ў жыцці падзеі, пра рэальных асоб. Паданне адрозніваецца ад легенды адсутнасцю чарадзейнага, незвычайнага. Існуе шмат паданняў пра паходжанне паасобных гарадоў, вёсак, урочышчаў, геаграфічных назваў, адлюстраваны пэўныя гістарычныя падзеі або расказваецца аб справах выдатных гістарычных дзеячаў ці аб подзвігах асобных народных герояў. Часам вусныя сказы пра герояў набываюць характэрныя рысы легенды.

Шмат розных паданняў бытуе ў нашым народзе аб помніках даўніны, аб камянях і дрэвах, аб крыніцах. Людзі заўжды памяталі старажытныя паселішчы і пахаванні, культавыя аб'екты і прысвойвалі гэтым мясцінам спецыфічныя назвы. Узнікалі паданні аб іх. Назвы і паданні служаць адлюстраваннем розных гістарычных падзей і светаўспрымання нашых продкаў. Так, на Пастаўшчыне да нашага часу заставаліся такія назвы курганных могільнікаў,



Курган Магіла рыцара



Інтэр’ер Пакроўскай царквы ў Асінагарадку



Святы (дзіравы) камень Каптарунскі. Схема

як Магілы, Капцы і назвы гарадзішчаў — Гара, Гарадзішча, Гарадок. Несумненна, аб кожным з іх існуе шмат паданняў. Напрыклад, у вёсцы Сарокі расказваюць, што ў Гарадзішчы ёсць патайныя дзверы, якія вядуць у склеп, у якім шмат зброі і залатых манет. З гэтага склепа, нібыта, падземны ход вядзе ў такі ж склеп пад гарадзішчам Гарадок (Асінагарадок).

На жаль, не ўсе паданні запісаны, і яны знікаюць з народнай памяці. А кожнае з іх — гэта старонка нашай гісторыі.

Асабліва авеяны паданнямі былыя язычніцкія культавыя месцы. Па-першае, гэта узгоркі, дзе і сёння, як і стагоддзі назад, спраўляюцца Купаллі. На Пастаўшчыне яны маюць як славянскія назвы (Лысая гара каля возера Швакшты, Лысая гара каля в. Ширкі, Чорная гара (гарадзішча) каля в. Данеўцы), так і балцкія (літоўскія) назвы, накшталт Піляканя. Адзін з пагуркаў каля в. Каптаруны мясцовыя жыхары называюць Лігаліна. Пра адзін з пагуркаў каля в. Саранчаны існуе паданне, быццам гэта магіла рыцара часоў ВКЛ.

Мала вывучанымі да апошняга часу застаюцца культавыя валуны і каменныя крыжы. Да многіх валуноў яшчэ і сёння ходзяць веруючыя. Да культавых валуноў адносяцца такія, якія маюць назвы і аб якіх існуюць паданні. Яны звычайна маюць выемкі, знакі, надпісы і малюнкі. Сярод такіх камянёў на Пастаўшчыне можна назваць Святы камень, які знаходзіцца ў лесе каля в. Каптаруны. Як сведчаць мясцовыя жыхары, вада з выемкі лічыцца святой. Да нядаўняга часу людзі пакланяліся гэтаму валуну. Культавым аб'ектам мог быць і вялікі камень у балоце каля в. Высокае.

У беларусаў быў распаўсюджаны і культ дрэў. Па-першае, культ дубу. На пачатку нашага стагоддзя этнографамі зафіксавана, што дубам насілі ахвяры і на іх галінкі вешалі ручнікі. У Паставах цікавасць уяўляў дуб над рэчкай за касцёлам. Яго спілавалі ў 2007 годзе. Магчыма, на тым месцы было паганскае капішча.

Павагай у беларусаў карысталіся таксама сасна, ліпа, асіна. У вёсцы Асінагарадок ёсць старажытнае гарадзішча. У паданні пра яго гаворыцца, што ў час шведскай навалы там стаяў рускі полк. Разведка данесла, што ад вёскі Сарокі ідуць шведы. Тады пачалі служыць малебен, а ікону павесілі на асіне. Але не паспелі малебен закончыць, як шведы прыйшлі. Людзі кінуліся ў бой, адбілі ворагаў і пагналіся за імі. Ікона ж так і засталася на асіне. Потым на гэтым месцы пабудавалі Пакроўскую царкву. У яе змясцілі цудатворную ікону, якая і стала называцца асінагародскай іконай.



Капліца Снарскіх у Шынаўшчыне



Ля святой крыніцы ў Вярхоўі (в. Жданы)

Часта пакланяліся крыніцам. У часы хрысціянства каля такіх крыніц сталі ставіць крыжы, у тым ліку і каменныя, і будавалі капліцы. Капліца каля Святой крыніцы знаходзілася да 1963 года каля вёскі Жданы на Варапаеўшчыне.

Усе легенды і паданні ўтрымліваюць звесткі надзвычай важныя і цікавыя, бо гэта і ёсць адгалоскі міфаў нашых далёкіх продкаў. Таму вельмі важна іх запісваць, збіраць, захоўваючы мову апавяданняў, бо фальклорныя крыніцы не толькі пашыраюць нашы веды па гісторыі, але і робяць яе больш цікавай, разнастайнай, захапляючай…

**Пытанні і заданні:**

1. Чаму мова — найкаштоўнейшы скарб народа?
2. У чым асаблівасці дыялектаў Пастаўшчыны?
3. У якіх формах прадстаўлена ў нашым краі вусная народная творчасць?
4. Чым адрозніваюцца легенды ад паданняў?
5. З якімі прыроднымі аб'ектамі звязана большасць легенд і паданняў нашага краю?
6. Па якіх прыкметах можна вызначыць, што легенда, казка або паданне «нарадзіліся» на Пастаўшчыне, а не дзесьці ў іншым куточку Беларусі?
7. Якія мясцовыя казкі ты ведаеш?

# § 23. Матэрыяльная культура

**1. Асаблівасці матэрыяльнай культуры.** За доўгую гісторыю жыхары Пастаўскага раёна стварылі розныя матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці, якія сталі традыцыйнымі.

Матэрыяльная культура народа ўключае ў сябе асаблівасці размяшчэння паселішчаў, арганізацыю і будаўніцтва жылля і гаспадарчых будынкаў, выраб і аздабленне прылад працы, прадметаў паўсядзённага ўжытку, адзення, абутку, развіццё іншых рамёстваў і промыслаў. Яна развіваецца пад уплывам пэўных геаграфічна-кліматычных умоў мясцовасці, гісторыі народа, яго духоўнай культуры.

Рассяленне людзей заўсёды звязана з краявідамі мясцовасці, яе прыроднымі ўмовамі. Здаўна жыхары імкнуліся размяшчаць сваё жытло каля вады. Азёрны край ствараў для гэтага найлепшыя магчымасці. Яшчэ паляўнічыя і рыбаловы ў старажытнасці наладжвалі стаянкі там, дзе маглі знайсці ежу і ваду. Пазней людзі зразумелі каштоўнасць узбярэжжаў вадаёмаў для мэт земляробства і жывёлагадоўлі. Водная сістэма з'яўлялася і старажытнейшым транспартным шляхам.

Уздоўж рэк, на берагах азёр знаходзіцца пераважная колькасць значных населеных пунктаў Пастаўшчыны, такіх, як Паставы, Варапаева, Лынтупы, Дунілавічы, Казлоўшчына, Камаі, Ласіца, Ляхаўшчына, Юнькі і іншыя. Шэраг паселішчаў узнікла на месцах ляднага земляробства, калі ў выніку працоўнай дзейнасці чалавека адступаў лес, аддаючы прастору пасевам. Людзі імкнуліся таксама сяліцца і каля радовішчаў карысных выкапняў (Гута, Рудка, Жалязоўшчына).

**2. Асаблівасці жылля.** Сядзіба — гэта ўчастак зямлі з дваром, садам і агародам. Раней двор падзяляўся на чысты: хата, сені, істопка (варыўня), клець і гаспадарчы: пабудовы для жывёлы, птушкі, гаспадарчага начыння (хлявы, вазоўні, паветкі), абгароджаны дзяннік (загон для жывёлы). Воддаль знаходзілася гумно і прыгуменне (гумнішча).

У Беларусі выдзяляюцца тры тыпы забудовы двара. Першы з іх, самы старажытны, нагадваў невялікую ўмацаваную крэпасць

і называўся «*вяночнай забудовай*», бо хата, клеці і хлявы ўтваралі замкнёны 4-кутнік, прамежкі паміж пабудовамі закрываліся глухім бярвенчатым плотам, а патрапіць у двор можна было толькі праз веснічкі ў браме. Другі тып, *пагонная забудова*, найбольш пашыраная на Пастаўшчыне ў вёсках, уяўляе сабой пабудовы, злучаныя між сабой у адзін рад пад агульным дахам. Трэці тып, *сучасны*, — гэта калі пабудовы не звязаны між сабой, а хлеў аднесены на некаторую адлегласць ад хаты.



Пагонная забудова вёскі

Сярод важнейшых пабудоў, якія існавалі на сядзібах Беларусі са старажытнасці, можна назваць: клець (свіран), варыўня (істопка), пограб (склеп), лазня, хлявы (абора, або кароўнік, цялятнік, аўчарня, стайня, куратнік), павець (паветка), гумно, ёўня (асець), пуня (адрына), азярод (друкі).

Асноўным будынкам на сядзібе з'яўляецца хата. У старажытнасці людзі жылі ў зямлянках і будах, пазней навучыліся ладзіць сабе наземныя жытлы з дрэва. Спачатку хаты былі курныя, без комінаў — дым выходзіў праз адтуліну ў сцяне, і толькі ў XIX стагоддзі яны былі заменены белымі (з печамі і комінамі). Галоўным матэрыялам для будаўніцтва была драўніна. Будавалі хаты найчасцей з хвоі і елкі, у ніжні вянец клаўся дуб. Спачатку ставілі пабудову проста на зямлі, пазней — на штандарах (драўляных слупах), потым — на каменным падмурку. Стрэхі рабіліся двух, трох і чатырохсхільныя і пакрываліся саломай, чаротам, дрэвам (дранкай, шчапой, гонтай, дошкамі). Падлога ў хаце ў старажытнасці была земляная і глінабітная, пазней — драўляная. Каля ўваходных дзвярэй майстраваўся ганак, пазней — веранда.

Здаўна людзі стараліся нейкім чынам упрыгожыць свае хаты. Найчасцей гэта праяўлялася ў формах вільчакоў (скрыжаваныя ўверсе страхі канцы ветраніц), якія мелі выгляд бычыных рагоў, конскіх галоў і глядзелі ў розныя бакі, аберагаючы хату ад злых духаў; у аздабленні франтонаў (найчасцей — сонца з промнямі);

упрыгожаннях ліштваў над вокнамі.

Галоўным месцам у хаце была покуць — кут наўскось ад печы. Там віселі абразы з ручнікамі, стаяў стол, а на скрыжаванні лаў — хлебная дзяжа. Уздоўж сцяны знаходзіўся спальны памост (палок), прымацаваная да бэлькі, вісела калыска. З другой паловы XIX стагоддзя распаўсюдзіліся ложкі, канапы. Жылая частка хаты з аднакамернай паступова ператварылася ў шматкамерную.

У старых вёсках яшчэ можна сустрэць будынкі канца XIX – пачатку XX стагоддзя але сучасныя хаты шмат у чым адрозніваюцца ад традыцыйных беларускіх. Побач з драўлянымі цяпер будуюць цагляныя, блочныя, панэльныя, шлакабетонныя дамы. Стрэхі звычайна перакрываюцца шыферам або металачарапіцай. Некаторыя хаты звонку абіваюцца шалёўкай або сайдзінгам. Павялічыліся памеры і колькасць вокнаў, замест драўляных рам устаўляюцца шклопакеты. Унутранае убранне



Старая хата ў в. Ліцвінкі



Свіран у в. Каралінова



Гаспадарчая пабудова ў маёнтку Казлоўск



👁 Лазня з саламянай страхой у в. Дзяўгуны

хат значна наблізілася да інтэр'ераў гарадскіх кватэр: 4–6 пакояў, кухня, фабрычная мэбля і дываны, фарбаваная падлога, электрычнасць, газ, швейныя і пральныя машыны, тэлевізары, камп'ютары, спадарожнікавыя антэны і іншыя рэчы сучаснай цывілізацыі.

Пры будаўніцтве хаты прытрымліваліся народных звычаяў. Месца для яе выбіралася вельмі грунтоўна: глядзелі, каб дзялянка была вольная, не спрэчная, каб на ёй не знаходзілася чалавечых костак, каб на ёй ніхто не парэзаўся, не пабіўся. Дрэва на пабудову нарыхтоўвалі ў снежні-студзені, бо ў гэты час яно смалістае, або ў сакавіку-красавіку, калі пачынаў рухацца сок — лічылася, што ён робіць драўніну мацнейшай. Ніколі не бралі дрэва, якое вывернула бура, бо казалі, што гэта «чорт сабе выбраў»; таксама не секлі і дрэва, якое навісала над другім — «хата згарыць», і рыплівае — «будзе мучыць кашаль».



👁 Шатровы (галандскі) млын-вятрак у Пастаўскім р-не

Пры закладцы хаты за вугал хавалі манеты, кавалак хлеба ці сыру, а часам і галаву пеўня, які прыносіўся ў ахвяру дамавіку. Каб засцерагчы дом ад перуноў, пад усе чатыры вуглы клалі кавалачкі ладану, пасвянцоныя зёлкі ці хвойныя галіны. Паміж бярвёнамі маглі закладваць разнастайныя травы, сабраныя перад Купаллем, срэбныя манеты. Пры завяршэнні будаўніцтва гаспадар перакідваў праз апошні вянец асвечанае яйка, якое адразу закопвалася на месцы падзення з замовай, каб «вецер не здзіраў страху».



Млыны



Покуць

Напярэдадні ўваходзінаў у новы дом праз акно запускалі пеўня, калі ён спяваў, то гэта быў добры знак. Засяляліся на поўню, каб «жыццё ў новай хаце было поўным». Першым заходзіў гаспадар, які нёс гаршчок з вуглямі, потым — гаспадыня з абразам, астатнія неслі маёмасць, у першую чаргу — стол. Гаспадар абносіў гаршчок уздоўж сцен, спыняючыся ў кожным куце, ставіў гаршчок на прыпечак і адразу запальваў у печы.

У дзень засялення запрошвалі гасцей і святара, каб асвяціў новае жытло. Госці, увайшоўшы ў хату, кідалі грошы на печ, клалі на стол хлеб-соль, дарылі гаспадарам посцілкі, абрусы і іншае, часам прыносілі і пускалі ў хату жывых курэй, гусей, парсючкоў і іншую хатнюю жывёлу.

**3. Традыцыйнае адзенне і ежа.** Традыцыйнае адзенне жыхароў Пастаўшчыны XIX стагоддзя значна адрознівалася ад сучаснага. Мужчыны ўлетку насілі саламяныя капелюшы, кашулі навыпуск, вышытыя ўверсе і знізу, падперазаўшы іх чырвоным поясам. Штаны былі аднатонныя ці паласатыя з сукна. Запраўлялі іх у скураныя боты. Часта адзенне дапаўняла цёмная камізэлька. У халодную пару надзявалі армякі, буркі, кажухі, валёнкі. З часам з'явіліся фрэнчы, якія бераглі для ўрачыстых падзей.

Жаночае адзенне было больш разнастайнае. Дзяўчаты і жанчыны насілі спадніцы ў зборку і ў кліны, паркалёвыя блузкі з



Традыцыйнае жаночае і мужчынскае адзенне на Пастаўшчыне ў старажытнасці

фальбонкамі. Пад іх часта надзявалі безрукаўку-шнуроўку. На ногі вязалі «тэпцікі», «чабаты». Лапці, плеценыя з лазы, абувалі ў лес ці на паству.

Спадніцы былі доўгія да шчыкалаткі ў «паскі» (палоскі) ці «шклянкі» (клеткі). Абавязковымі для жанчын былі фартухі — будзённы і святочны. З ваўнянай тканіны натуральных колераў шыліся жакеты. Папулярнымі галаўнымі ўборамі ў нашай мясцовасці былі каптуры і хусткі. У дрэннае надвор'е адзявалася вялікая тканая хустка з «фрэндзелямі» (махрамі). Па словах старажылаў, калі ў дзеўкі не было хусткі з «фрэндзелямі», то і замуж яе ніхто не браў.

Галоўным прадуктам харчавання заўсёды быў хлеб. Яго пяклі вялікімі буханкамі (па 4–6 кг) на кляновым або аеравым лісці. Калі хлеба не было, то пяклі з прэснай мукі праснакі або каржы. З XVIII стагоддзя вялікае месца ў харчаванні пачала займаць бульба. Яе елі і ядуць цэлую і рэзаную, вараную і смажаную; з дранай пякуць дранікі і бабку, з тоўчанай робяць камы, з пакрышанай — булён. Бульба ідзе на прыгатаванне клёцак, калдуноў.

Традыцыйную ежу — крупяную кашу — варылі галоўным чынам з проса і аўсу, ячных і грэцкіх



Лапці


Дранікі

круп, гатавалі з малаком, мясам, салам, каўбасой. У час посту шырока ўжывалі квашаную капусту, зацірку, бліны. Летам гатавалі халаднік. Закалоўшы кабана, рабілі розныя мясныя прадукты: каўбасы, вантрабянку, крывянку, халадзец. Малако елі халоднае, гатаванае, але часцей — кіслае.

На традыцыйныя святы гатавалі абрадавыя стравы. На масленіцу, акрамя бліноў, абавязковымі былі сыр і масла; на Вяліканне — фарбаваныя яйкі, сыр, масла, сала, кумпяк, парася; на Купалле варылі кулагу — кісла-салодкую мучную кашу з жытняй або грэцкай мукі.

**4. Традыцыйныя промыслы і рамёствы.** Жыхары Пастаўшчыны здаўна займаліся рознымі промысламі і рамёствамі, якія былі звязаны з апрацоўкай металу, драўніны, вырабамі з гліны, саломы, скуры, нітак, тканін. Да сярэдзіны XIX стагоддзя шырокае развіццё кавальскага рамяства звязвалася са здабычай жалеза з балотных руд. Амаль у кожнай вялікай вёсцы быў свой каваль, які вырабляў і рамантаваў металічныя часткі плугоў, сярпоў, кос, павозак, сячкарань, прылады хатняга ўжытку (нажы, сякеры, вілы) і г. д. Вядомыя кавалі жывуць і цяпер у вёсках Вярэнькі, Казлоўшчына, Кураполле, Навадруцк, Хацілы, г. п. Лынтупы.


Кавальства

Шмат сялян займалася ганчарствам. Яны выраблялі міскі, гладышы, жбаны, латкі, гарнушкі. Шырока была распаўсюджана задымленая кераміка, але сустракалася і абвараная (гатаваная). Была традыцыя аплятаць гліняны посуд бяростай («берасцянікі») або дротам. У XIX стагоддзі вядомымі цэнтрамі



Народны майстар ганчар Сяргей Шчэрба

Адным з найбольш развітых рамёстваў на Пастаўшчыне было ткацтва. У якасці сыравіны выкарыстоўвалася воўна, кудзеля, каноплі. Ткалі палатно, ручнікі, абрусы, паясы. Для работы выкарыстоўваліся ткацкія станкі, якія былі амаль у кожнай хаце. Гэтай працай у вёсках займаліся жанчыны.

Апрацоўка скур — гарбарства — была цесна звязана з хатняй жывёлагадоўляй і забяспечвала насельніцтва абуткам, адзеннем, конскай вупражжу. Выраблялі скуры і саматужнікі сяляне, і ганчарства на Пастаўшчыне былі вёскі Буцавічы, Мышкі, Філіпаўцы.

Вельмі пашыраны быў дрэваапрацоўчы промысел. Майстры забяспечвалі выраб прылад працы, сродкаў руху, прадметаў побыту — маслабоек, дзежак, бочак, цэбраў, кроснаў, калаўротаў, куфраў, начовак, каромыслаў, лодак, музычных інструментаў. Сталярскімі ўменнямі славіліся жыхары вёсак Юнькі, Грэйцева, Манеўшчына, Лапачонкі, Андроны, Балаі, Дунілавічы.



Драўляныя начоўкі



Ткачыха за кроснамі



Маляваны дыванок з Пастаўшчыны

гараджане для сваіх уласных патрэб.

Аўчыны служылі матэрыялам для пашыву кажухоў, шуб, шапак. Апрацаваныя скуры свойскай жывёлы выкарыстоўваліся для вырабу скураных лапцяў, ботаў, чаравікаў, «румынак», дзяг (мужчынскія паясы) і г. д.

Самадзейныя мастакі распісвалі мэблю, шкло, тканіну. У 1930–1950-я гады назіраўся росквіт умельства маляваных дываноў. На палатне, байкавых коўдрах народныя мастакі малявалі букеты кветак, экзатычныя і рамантычныя віды — лебедзі і русалкі на возеры, алені ў лесе, тыгры на востраве. Цікавай культурнай з'явай на Пастаўшчыне быў і роспіс шкла. Папулярнымі ў нашых мясцінах былі і выцінанкі («выразанкі»), якія прыйшлі да нас з Усходу разам з паперай і маюць доўгую гісторыю існавання. Пераважна з белай паперы, часам з газеты, вырабляліся фіранкі, сурвэткі, з каляровай — кветкі, птушкі, калядныя зоркі. Гэты від народнага дэкаратыўнага мастацтва бытаваў у нас амаль да сярэдзіны XX стагоддзя. Самымі ўлюбёнымі кампазіцыямі выцінанак на Пастаўшчыне былі ромбікі, зоркі, кветкі.

Некаторыя нашы сучаснікі прадаўжаюць старадаўнія традыцыі рамяства. Народнымі майстрамі з'яўляюцца В. Мелец (разьба па дрэве), М. Аўгусціновіч (пляценне з лазы), С. Шчэрба (ганчарства), Т. Петух (ткацтва, выцінанка), М. Ананьева (вышыўка), Ю. Фурс (кавальства).




Выцінанка

**Пытанні і заданні:**

1. Што такое сядзіба?
2. Якія тыпы забудовы двара ёсць на Пастаўшчыне?
3. Як выглядае традыцыйна беларуская хата?
4. Якія звычаі звязаны з пабудовай хаты?
5. Апішы (вусна) асноўныя асаблівасці традыцыйнага мужчынскага і жаночага адзення на Пастаўшчыне. Якія іх элементы сустракаюцца ў сучасным адзенні?
6. З чаго гатавалі традыцыйную ежу жыхары Пастаўшчыны?
7. Дай характарыстыку асноўных промыслаў і рамёстваў нашага краю.

# § 24. Традыцыі роднага краю

**1. Народныя святы і абрады.** Пастаўшчына славіцца сваёй багатай народнай культурай, якая бярэ пачатак у глыбокай старажытнасці. Паколькі асноўнымі заняткамі жыхароў былі раней земляробства і жывёлагадоўля, то абрады і звычаі людзей вельмі цесна звязаны з гадавым цыклам. Вылучаюць зімовыя, веснавыя, летнія і восеньскія святы і прысвяткі.

Абрады зімовага цыкла (Каляды, Куцця, Запусты) былі скіраваны на тое, каб загадзя паўплываць на будучы ўраджай і звязаны з ім дабрабыт сям'і. Галоўнае месца належала каледаванню, калі вясёлы гурт пераапранутай моладзі хадзіў па хатах з пажаданнямі шчасця і дабра гаспадарам. У католікаў быў пашыраны падобны абрад «Тры каралі». На зімовыя святкі ладзілася старадаўняя гульня «Жаніцьба Цярэшкі». Канец зімы («Запусты») моладзь адзначала катаннем на конях, на санках, зімовымі гульнямі.







Велікодны стол

Калядоўшчыкі



Купальскі карагод



Дзяды. Памінальны стол

Вясной на Пастаўшчыне святкавалі Вялікдзень (Вяліканне, Велькванец), Юр'е, Радаўніцу, калі людзі, памінаючы памерлых, прасілі благаслаўлення для працы на зямлі.

Летнія традыцыйныя святы ўслаўлялі велічнасць прыроды, божы дар жыцця. Галоўнае свята лета — Купалле. Ноччу палілася вялікае вогнішча, вакол якога моладзь вадзіла карагоды, гуляла, скакала праз агонь, танцавала. Дзяўчаты варажылі: плялі вянкі і пускалі іх па рацэ. Адчайныя хлопцы хадзілі ў лес шукаць папараць-кветку. У гэты ж дзень збіралі лекавыя травы.

Сярод восеньскіх народных свят добра вядомы Пакровы і Асяніны — Змітраўскія дзяды. На Асяніны збіраліся родзічы і ішлі на могілкі, каб памянуць памерлых. Вечарам рабілі жалобны стол з багатай куццёй.

**2. Традыцыі выяўленчага мастацтва.** Традыцыі выяўленчага мастацтва бяруць пачатак ад Тызенгаўзаў. Вядома, што Антоній Тызенгаўз быў не толькі буйным магнатам-рэфарматарам, але і мецэнатам. Менавіта пры ім пачаўся культурны росквіт былога занядбанага мястэчка. А. Тызенгаўз захапляўся мастацтвам і збіраў калекцыі твораў жывапісу, графікі, скульптуры, прадметаў ужытковага мастацтва. Паводле гістарычных звестак, «нястомны ў ідэях падскарбій за пару тыдняў да сваёй смерці жадае адкрыць новую «рысавальную школу» і па яго просьбе ў сядзібе пачалі рыхтаваць памяшканне, рыштунак і начынне.



ZASADY
ORNITOLOGII
ALBO
NAUKI O PTAKACH.
OBEJMUJĄCE:
RYS POSTĘPU JEJ LITERATURY, TAXONOMIJĄ,
GLOSSOLOGIĄ I TERMINOLOGIĄ
PRZEZ
HRABIEGO KONSTANTEGO TYZENHAUZA
CZŁ. W. TOW. UCZ.
z przydaniem 3 tablic litografowanych części
ptaków objaśniających i jednej tablicy kolorów.

Nakładem Autora.

WILNO.
DRUKIEM JÓZEFA ZAWADZKIEGO.
1841.

Вокладка кнігі Канстанціна Тызенгаўза



Карціна А. Ромэра «Хрыстос і сірата» ў Камайскім касцёле

Вялікім знаўцам жывапісу і графікі быў Канстанцін Тызенгаўз. Маючы ў сваім маёнтку ў Паставах багацейшую карцінную галерэю твораў сусветнавядомых мастакоў, а там былі Леанарда да Вінчы, Веранезе, Тынтарэта, Рубенс, Дзюрэр, Тыцыян, вядомы навуковец-арнітолаг выдатна маляваў сам. Прыгожымі графічнымі малюнкамі ён аздобіў выданні сваіх кніг, у тым ліку і такой фундаментальнай працы, як «Апісанне птушак усіх частак свету» ў трох тамах.

Дачка Канстанціна Марыя Тызенгаўз-Пшаздзецкая вельмі захаплялася жывапісам, брала ўрокі малявання ў самаго Дэлакруа, заснавальніка французскага рамантызму. Альбом з уласнымі малюнкамі кляштараў і касцёлаў яна падаравала Папу Рымскаму Лявону XIII на яго залаты юбілей. Удасканальвацца ў жывапісе Марыя не змагла з прычыны хваробы — пальцы правай рукі сталі нерухомымі, і таму яе вялікі мастацкі твор, які ўяўляў серыю малюнкаў-мініяцюр з постацямі каралёў, гетманаў, вучоных і святых не быў закончаны.

Да пытанняў уплываў выяўленчага мастацтва на выхаванне чалавека у сваіх філасофска-педагагічных працах звяртаўся брат Марыі Райнольд Тызенгаўз.

Пэўны ўнёсак у развіццё жывапісу на Пастаўшчыне зрабіў вядомы мастак Альфрэд Ромэр,

маёнтак якога знаходзіўся ў Каралінове ў другой палове XIX стагоддзя. Нядаўна выяўленую ў Камайскім касцёле карціну А. Ромэра «Хрыстос і сірата» мастацтвазнаўцы адносяць да шэдэўраў выяўленчага мастацтва на Беларусі.



Сінтэз мастацтваў. Сумесная работа мастака І. Атрахімовіча і каваля Ю. Фурса

На сённяшні дзень у Паставах дзейнічае дзіцячая мастацкая школа, якой нададзена імя А. Ромэра. У ёй працуе шэраг таленавітых мастакоў. Будынак мастацкай школы знаходзіцца амаль у цэнтры горада на Камсамольскай плошчы (былы Рынак Задзеўскі).

У Паставах працуе шэраг мастакоў, творы якіх вядомыя не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Гэта І. Атрахімовіч, А. Гарошка, С. Дацэнка, Я. Забароўскі, Н. Кірылава, С. Сіповіч, А. Стахоўскі, Д. Шаруеў і некаторыя іншыя.

**3. Музычныя традыцыі.** Музычная культура мэтанакіравана пачала развівацца на Пастаўшчыне ў XVII–XVIII стагоддзях. На тыя часы пры многіх шляхецкіх сядзібах існавалі прыгонныя аркестры, якія былі сведчаннем узроўню культуры ўладароў маёнткаў і прэтэнзіяй на арыстакратычны лад жыцця. На развіццё музычнай культуры трацілiся вялікія сродкі.

У 1782 годзе вядомая ў Еўропе балетная школа з часткай інструментальнай капэлы А. Тызенгаўза была перавезена з Гародні ў Паставы. У гэтай школе вялікая ўвага аддавалася ўрокам музыкі. Выхаванцамі школы былі дзеці прыгонных сялян толькі з маёнткаў магната. Дзяўчынкі вучыліся іграць на клавіцымбалах, а хлапчукі — на басэтлі (кантрабасе).У малодшых класах займаліся па 5 гадзін. Музычная адукацыя пераймала лепшыя еўрапейскія ўзоры.

Музыкай захапляўся сын Канстанціна Тызенгаўза Райнольд. У 70-я гады XIX стагоддзя ён стварыў ў Паставах аркестрава-харавую школу, у якой вучыліся дзеці з мястэчка. Кіраваў школай Пётр Шчука — таленавіты музыкант і педагог. У школе дзейнічаў аркестр,



Хлеб-соль удзельнікам фестывалю «Звіняць цымбалы і гармонік»



Дыятанічныя цымбалы



Амфітэатр

які набліжаўся па складу да малога сімфанічнага аркестра, і хор з 24 чалавек. У рэпертуары пастаўскага аркестра і хору было каля 30 опусаў: уверцюры, месы, маршы. Аркестр і хор бралі ўдзел у рэлігійных і свецкіх святах. Дзейнасць школы падтрымлівала Марыя Тызенгаўз-Пшаздзецкая.

Райнольдам Тызенгаўзам напісана аб'ёмная праца «Спевы і музычнае суправаджэнне», якая ўключала 11 раздзелаў. У ёй аўтар разважаў пра тое, што такое спевы, як выявіць музычную адоранасць дзяцей, як трэба пачынаць навучанне спевам, якія бываюць музычныя інструменты, што трэба рабіць, каб музычная культура пашыралася сярад простага люду.

Далёка за межамі краіны вядома пра музычныя традыцыі краю, бо Паставы з 1992 года з'яўляюцца сталіцай міжнароднага фестывалю народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік». На свята народнай музыкі прыязджаюць фальклорныя калектывы з розных краін. У праграме фестываляў звычайна праводзяцца конкурсы, ладзяцца канцэрты, арганізуюцца творчыя майстэрні. Фестывальныя традыцыі ўзніклі дзякуючы музыкам і спевакам, якія з

пакалення ў пакаленне зберагалі, узбагачалі і перадавалі нашчадкам лепшыя ўзоры народных мелодый, песень, танцаў. У 60-я гады XX стагоддзя набыў шырокую вядомасць Груздаўскі цымбальны аркестр, пазней яго традыцыі пераняў фальклорны ансамбль «Паазер'е», які створаны пры Пастаўскай музычнай школе. Нязменным кіраўніком калектыву з'яўляецца А. А. Собаль. У 2006 годзе ансамблю споўнілася 15 гадоў. За гэты час музыкі далі шмат канцэртаў у розных краінах, сталі лаўрэатамі рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў.

**4. Традыцыі і тэатральнае мастацтва.** У маёнтку А. Тызенгаўза ў 1781–85 гадах дзейнічала прыватная балетная школа, адзіная ў Рэчы Паспалітай. У ёй рыхтаваліся да выступу на сцэне 16 дзяўчат і 18 хлопцаў. Выкладалі ў ёй Ле Ду і прыгонны танцоўшчык Рымінскі. Ставіліся пераважна школьныя балетныя спектаклі. У 1785 годзе ў Варшаве быў паказаны балет «Гілас і Сільвія». Выхаванцамі пастаўскай балетнай школы з'яўляліся вядомыя танцоўшчыкі таго часу Апалонія Дарэўская, Адам Бжазінскі і Андрэй Кухальскі. Пасля смерці А. Тызенгаўза балетная школа перастала існаваць.

Тэатр у Паставах адрадзіўся ў 1920-х гадах у фармаце драматычнага гуртка. У 1927 годзе ён меў статус беларускага народнага тэатра. Варта адзначыць мужнасць і патрыятызм актораў, якія ставілі беларускія спектаклі ва ўмовах паланізатарскай антыбеларускай палітыкі ўладаў. У газеце «Беларуская крыніца» № 44 ад 1927 г. паведамлялася: «Беларускі народны тэатр у Паставах ставіў "Паўлінку". У ролі Пранцыся ёсць словы: "Хай пан схавае сваю панскую мову свінням на снеданне". Прысутныя шпікі думалі, што было сказана не "панскую", а "польскую". Ну і давай чапіцца… Цягалі, дапытвалі… Сарвалі наступнае прадстаўленне».



На сядзібе Зюзі Паазёрскага

У 1959 годзе пастаўскі тэатр атрымаў званне народнага. Актыўна дзейнічаў да 1985 года.

**5. Літаратурныя традыцыі.** Паставы маюць трывалыя літаратурныя традыцыі, якія зарадзіліся ў канцы XVIII стагоддзя. Іх пачынальнікам можна лічыць гаспадара горада Францыска Ксаверыя Хамінскага (1750–1809). Гэты чалавек меў актыўную грамадзянскую пазіцыю, удзельнічаў у палітычным жыцці; за ўдзел у антыцарскай змове быў арыштаваны, сядзеў у турме. З гэтай прычыны ягоная творчасць насіла публіцыстычны характар. Ф. К. Хамінскі з'яўляецца аўтарам класічных вершаў, вядомага ў той час артыкула «Адказ». Пераклаў на польскую мову творы Гарацыя, Ж. Расіні, П. Карнэля і іншых; напісаў некалькі од. Даследчыкі лічаць, што частку паэтычных твораў, якія прыпісваюцца Агінскаму, стварыў менавіта Хамінскі і апублікаваў пад псеўданімам «Слонімскі грамадзянін» у зборніках «Гістарычныя і маральныя аповесці» (1782) і «Байкі і нябайкі» (1788).

Канстанцін Тызенгаўз (1786–1853) вядомы як аўтар навуковых прац па арніталогіі. Яго пяру належаць кнігі «Асновы арніталогіі, або Навукі пра птушак» (1841) і «Усеагульная арніталогія, або Апісанне птушак усіх частак свету»(1843–46).

Даволі вядомай літаратаркай сярэдзіны XIX стагоддзя была пляменніца Канстанціна Габрыэля Пузыніна (1815–1869). Яна з'яўлялася дачкой Адама Гюнтара і Аляксандры Тызенгаўз, сястры Канстанціна Тызенгаўза. Праявіла сябе як паэт, празаік, драматург. Выдала зборнікі: «У імя Божае» (1843), «Далей у свет» (1845), «Прозай і вершам» (1856), «Малыя, але праўдзівыя апавяданні» (1857), «Ці ладна, ці багата?» (камедыя, 1859), «Ядвіга» (гістарычная драма, 1886). Ёй належаць і цікавыя ўспаміны пра пастаўскі маёнтак, якія апублікаваны ў кнізе «W Wilne i w dworach Litewskich 1815–1843».

Сын Канстанціна, Райнольд Тызенгаўз (1830–1880) праявіў сябе як аўтар літаратурна-педагагічных прац: «Што спрыяе сапраўднаму духоўнаму стану», «Адказ дзецям на ўласнае пытанне, чым заняцца пасля вывучэння навук», «Адказ дзецям на пытанне, для чаго і як трэба вучыцца музыцы», «Адказы бацькам на ўласныя пытанні, як выхоўваць дзяцей» і іншых.

З Пастаўшчынай звязаны дзіцячыя гады аднаго з класікаў беларускай літаратуры Уладзіміра Дубоўкі (1900–1976). Ён нарадзіўся ў

в. Агароднікі, што за дзесяць кіламетраў ад Паставаў, але асноўную частку жыцця правёў за межамі Беларусі, з якіх 28 гадоў, рэпрэсаваны, — у лагерах і на пасяленні ў Сібіры і на Далёкім Усходзе. У сваёй творчасці неаднаразова звяртаўся да родных мясцін; напісаў верш «Паставы».



Паэт Уладзімір Дубоўка

Сярод сучасных літаратараў, якія жывуць на Пастаўшчыне, плённа працуюць на ніве прыгожага пісьменства члены пісьменніцкіх саюзаў Аркадзь Нафрановіч і Ігар Пракаповіч, а таксама ўдзельнікі літаратурнага аб'яднання «Світанак» Алесь Касцень, Алесь Гарбуль, Наталля Карнілава, Аліна Латыш, Пётр Літвіновіч, Леанід Трубач, Зінаіда Шыман, Вольга Лісіцкая, Мар'ян Бумбліс, Вадзім Ліпніцкі, Слава Ліпень, Люцыян Шчасны, Люцыян Каранеўскі, Святлана Аліхвер. Значны след у літаратурнай спадчыне Пастаўшчыны пакінулі пасля сябе Ніна Захарэвіч і Яўстафій Абрамовіч. Некаторых ураджэнцаў Пастаўшчыны жыццёвыя шляхі завялі ў іншыя гарады і краіны. У Мінску жывуць і працуюць: Янусь Малец, Міхась Кенька, Аліна Легастаева, Таццяна Дубоўская; у Віцебску — Люда Сіманёнак і Алена Гінько, у Польшчы — Юрась Гарбінскі і Іосіф Зямчонак; у Італіі — Наталля Каравацкая. Аднак і там, далёка ад родных прастораў, у іх творах прысутнічаюць знаёмыя з дзяцінства краявіды, кветкі і водар роднай зямлі.

**Пытанні і заданні:**

1. Якія народныя святы, абрады і традыцыі ты ведаеш?
2. Якімі культурнымі традыцыямі багаты наш край?
3. Чаму Пастаўшчына славіцца сваімі музычнымі традыцыямі?
4. Якіх мастакоў роднага краю ты можаш назваць?
5. Якія творы мясцовых пісьменнікаў табе даводзілася чытаць?
6. Падрыхтуй паведамленне пра творчасць аднаго з дзеячаў культуры Пастаўшчыны.

# § 25. Славутыя людзі Пастаўшчыны

**1. Героі паўстанняў XIX стагоддзя.** Пастаўская зямля ўзгадавала многіх выдатных людзей, якіх любоў да волі і да радзімы падштурхнула на гераічныя ўчынкі. У паўстанні 1830–1831 годоў сваёй мужнасцю і самаахвярнасцю вызначыліся браты *Адольф і Станіслаў Кубліцкія* з Палесся, якія арганізавалі паўстанцкі атрад і пачалі ўзброеную барацьбу супраць расійскіх войск. Таксама з Палесся паходзіў і кіраўнік паўстанцкіх узброеных сіл Свянцянскага павета *Вікенцій Барткевіч*, які яшчэ ў 1794 годзе быў паручнікам артылерыі ў паўстанцкай арміі Тадэвуша Касцюшкі. Актыўнымі ўдзельнікамі антырасійскіх выступленняў былі браты *Аўгуст, Адольф і Густаў Хомскія* з маёнтка Кубаркі, *Юзаф Лапацінскі* з маёнтка Норыца, *Міхал Сямашка* з маёнтка Ляхаўшчына.

У паўстанні К. Каліноўскага 1863–1864 гадоў самаахвярна змагаліся «за нашу і вашу волю» ўладальнік маёнтка Камаі *Апалінарый Таньскі*, які быў паўстанцкім грамадзянскім начальнікам Свянцянскага павета, і ўладальнік маёнтка Сурвілішкі *Густаў Чаховіч*, які быў ваенным начальнікам гэтага ж павета. Усе актыўныя ўдзельнікі выступленняў былі сурова пакараныя расійскімі ўладамі.



Паўстанец Фларыян Даноўскі

За актыўную паўстанцкую дзейнасць двойчы высылаўся на катаргу ў Сібір *Фларыян Даноўскі*, помнік якому знаходзіцца на могілках у Каралінове.

**2. Героі сусветных і грамадзянскіх войнаў XX стагоддзя.** У гады Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў, у якія патрапіла Расійская

імперыя ў пачатку XX стагоддзя, праявілі звае здольнасці і ўменні ўраджэнцы Пастаўшчыны І. Ф. Шубін, А. У. Станкевіч, А. М. Ціхан.

*Іван Філарэтавіч Шубін* нарадзіўся ў в. Саранчаны, працаваў на заводах у Пецярбургу, дзе ўступіў у партыю бальшавікоў. Ваяваў, камандаваў кавалерыйскім палком. Быў 4 разы паранены, узнагароджаны трыма ордэнамі Чырвонага Сцяга. У 1937 годзе быў рэпрэсаваны і трагічна загінуў.



Генерал А. Станкевіч

*Антон Уладзіміравіч Станкевіч* родам з маёнтка Губіна на Пастаўшчыне. Служыў у Віленскім пяхотным вучылішчы. У час Першай сусветнай вайны камандаваў брыгадай, дывізіяй. У 1918 годзе ўступіў у Чырвоную Армію, быў намеснікам камандуючага 13-й арміі. Загінуў, патрапіўшы ў палон да белагвардзейцаў. Пахаваны на Краснай плошчы ў Маскве. У гонар Станкевіча названа вуліца ў Паставах.

*Антон Міхайлавіч Ціхан* нарадзіўся ў 1887 годзе ў в. Альшэўскія. Працаваў у Пецярбургу на заводзе. З 1905 года ўдзельнічаў у рэвалюцыйным руху, быў членам партыі бальшавікоў. Займаў высокія пасады ў партыйных і прафсаюзных органах краіны. З 1930 года быў наркамам працы. Арыштаваны і расстраляны 7.3.1939 г.

У гады Другой сусветнай вайны мужнасцю і гераізмам праславіліся Н. Асяненка, Ф. Маркаў, Г. Маслоўская, М. А. Васільеў, В. А. Сідарэнка, Б. А. Хлуд, А. В. Шагалаў, А. К. Галубкоў, В. П. Кірычук, М. П. Красільнікаў, У. М. Піўнюк, П. П. Бароўка, С. Я. Зубкоў, А. І. Чувалаў і многія іншыя жыхары раёна. (*Успомні, чым вядомыя гэтыя героі?)*

*Васіль Аляксандравіч Юшкевіч.* Генерал-палкоўнік (1945). Нарадзіўся 28 лютага 1897 года ў г. Паставы. Закончыў курсы ўдасканалення вышэйшага начсаставу пры Ваеннай акадэміі імя Фрунзе (1926 і 1928). З 1915 года ў арміі. Удзельнік Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў, вайны ў Іспаніі ў 1936–1939 гадах. У Вялікую Айчынную вайну ваяваў на Заходнім, Калінінскім, Паўночна-Заходнім і 2-м Прыбалтыйскім франтах. Камандаваў

44-м корпусам, які ў чэрвені 1941 года абараняў Мінск. У бітве пад Масквой камандаваў 31-й арміяй, якая ў снежні 1941 года вызваліла г. Калінін ад фашыстаў. У перыяд Беларускай аперацыі 1944 года камандаваў 3-й ударнай арміяй 2-га Прыбалтыйскага фронту. З 1944 года камандуючы войскамі Адэскай, у 1946–1950 гадах. Прыволжскай ваенных акруг. Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР. Узнагароджаны ордэнамі Леніна (двума), Чырвонага Сцяга (чатырма), Суворава, Кутузава. Памёр 15.3.1951 г. у г. Ленінград. Яго імем названа вуліца ў Паставах.



Генерал В. Юшкевіч

**3. Героі мірнай працы.** У пасляваенны час за самаахвярную і сумленную працу па аднаўленні і развіцці гаспадаркі раёна вялікая група жыхароў краю ўзнагароджана ордэнамі і медалямі. Дваім — В. М. Асяненку і А. А. Валодзьку — нададзена высокае званне Герояў Сацыялістычнай працы. *Васіль Мікалаевіч Асяненка* нарадзіўся 31.1.1916 г. у в. Ліпнікі. У час вайны быў камандзірам партызанскага атрада «Слава», сакратаром Пастаўскага падпольнага райкама камсамола. Ганаровае званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена яму ў 1966 годзе за поспехі ў развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці, калі працаваў першым сакратаром Глыбоцкага РК КПБ. Памёр 13.6.1977 г.

*Адольф Адольфавіч Валодзька* нарадзіўся 17.7.1946 г. у в. Старчуны. Закончыў Гарадоцкі тэхнікум механізацыі сельскай гаспадаркі. З 1968 года працуе старшынёй сельгаскааператыва «Навасёлкі-Лучай» (раней — калгас імя Суворава). Ганаровае званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена ў 1988 годзе. Узнагароджаны таксама двума ордэнамі Леніна, ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Дружбы народаў. Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР.

28 чалавек адзначана найвышэйшай узнагародай СССР — ордэнам Леніна. Гэта першы сакратар Пастаўскага райкама КП Беларусі В. Клачкова, старшыня выканкама Курапольскага сельсавета



Васіль Асяненка

В. Гедроец, старшыні калгасаў Н. Андрон («Запаветы Ільіча»), А. Бульбяноў («Светлы шлях»), А. Валодзька (імя Суворава), М. Кляпец («Ленінскі шлях»), В. Лапушынскі («Прагрэс»), Г. Пачопка («Чырвоны сцяг»), М. Шчучка («Перамога»); калгасныя брыгадзіры Л. Дук, Л. Жыткевіч, В. Якімовіч; механізатары Ф. Амбразевіч, М. Варашкевіч, А. Есьман, С. Жук, Я. Касцень, Г. Сікора, В. Стэльмах, Б. Турон, У. Чатовіч; свінаркі Я. Марцінкевіч, П. Федаронак; даяркі С. Пракоп, Я. Тараскевіч; рабочыя А. Дзевятоўскі, С. Жмуркевіч; настаўніца СШ № 1 М. Мілава.

Шэраг сумленных працаўнікоў Пастаўшчыны атрымалі высокае званне «Заслужаны работнік Беларусі». Яны праявілі сябе ў розных галінах гаспадаркі. Званне «Заслужаны лесавод» атрымаў Ц. Качаткоў, дырэктар Пастаўскага лясгаса; «Заслужаны меліяратар» — Л. Калеснік, машыніст экскаватара Навадруцкага ўпраўлення меліярацыі; «Заслужаны настаўнік» — Г. Бароўка, настаўніца пачатковых класаў СШ № 1; Б. Белкіна, настаўніца Лынтупскай сярэдняй школы; А. Брэская, настаўніца гісторыі Варапаеўскай школы; В. Бульбяноў, настаўнік фізікі, дырэктар Дунілавіцкай школы; Л. Васільева, настаўніца хіміі СШ № 2 г. Паставы; З. Вярбіцкая, настаўніца Жуперскай васьмігадовай школы; Г. Дунец, настаўніца Манькавіцкай васьмігадовай школы; К. Дунец; Л. Кайровіч, настаўніца пачатковых класаў СШ № 2; Н. Капіч, настаўніца пачатковых класаў Камайскай сярэдняй школы; Р. Куляшова, настаўніца СШ № 1



Старшыня СВК Навасёлкі-Лучай, Герой Сацыялістычнай працы А. Валодзька

г. Паставы; Н. Лукічова, настаўніца беларускай мовы і літаратуры СШ № 1 г. Паставы; М. Мілава — настаўніца СШ № 1 г. Паставы; Ф. Пішчыкава, настаўніца рускай мовы і літаратуры СШ № 3 г. Паставы; Я. Разумоўская, настаўніца СШ № 1 г. Паставы; У. Соўка, загадчык Пастаўскага раённага аддзела адукацыі; Т. Стахоўская, настаўніца Юнькаўскай васьмігадовай школы; А. Чарэнка — арганізатар пазакласнай і пазашкольнай работы СШ № 2; «Заслужаны работнік гандлю і грамадскага харчавання» — Л. Барвінок, загадчыца магазіна «Дары прыроды» ў г. Паставы; «Заслужаны работнік народнай адукацыі» — Я. Антаневіч, завуч СШ № 1 г. Паставы; «Заслужаны работнік прамысловасці» — В. Івашка, майстар хлебабулачнага цэха хлебазавода № 2 у г. Паставы; «Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі» — А. Валодзька, старшыня калгаса імя Суворава; Б. Шылько, старшыня калгаса «Дружба»; «Заслужаны ўрач» — В. Малы, галоўны ўрач Пастаўскай бальніцы і Пастаўскага раёна.



Пісьменнік і навуковец Міхась Кенька

**4. Дзяржаўныя дзеячы, навукоўцы, творцы.** У розных сферах жыцця праявілі сябе выхадцы з Пастаўшчыны. Сярод іх шэраг вядомых дзяржаўных дзеячаў краіны. Гэта дэпутаты Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь і Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу краіны Б. П. Шылько, В. В. Чэпік, П. М. Розынка, В. Ф. Януковіч; былы міністр замежных спраў Рэспублікі Беларусь М. М. Хвастоў; былы міністр сельскай гаспадаркі і харчавання І. П. Шакола.



Архімандрыт Мадэст

Пастаўская зямля дала дарогу ў свет навукі многім таленавітым хлопцам і дзяўчатам. Яны сталі дактарамі і кандыдатамі навук, дацэнтамі і

выкладчыкамі вышэйшых навучальных устаноў. Вучоную ступень доктара навук атрымалі А. І. Быхавец (біялогія), Ю. Л. Вайцяхоўскі (геалогія), І. В. Залуцкі (медыцына), Г. А. Каралёнак (эканоміка). Кандыдацкія дысертацыі абаранілі У. М. Глазкоў (фізіка), Р. Б. Грыгаранец (матэматыка), Н. А. Дзісько (біялогія), А. Я. Зуйкоў (сельская гаспадарка), І. І. Маліноўскі (медыцына), У. С. Масцяніца (матэматыка), А. Я. Міхасёнак (тэхніка), Э. І. Рудкоўскі (філасофія), В. Е. Собаль (гісторыя), А. С. Юркевіч (медыцына), пісьменнік М. П. Кенька (літаратура).

Сярод творцаў самай адметнай асобай Пастаўшчыны з'яўляецца пісьменнік, паэт Уладзімір Дубоўка. У розных жанрах творчасці праявілі сябе мастакі Г. Анішчык (Гутар), А. Улыбін, С. Катовіч, П. Козіч, музыкант В. В. Баранаў, кампазітары С. Казура і Б. Рудкоўскі, дырыжоры і заслужаныя работнікі культуры Беларусі І. Ф. Сушко і І. Цітовіч, спявачка Абрамава, пісьменнікі Я. Малец, І. М. Пракаповіч, А. І. Нафрановіч, А. Легастаева, М. Вайцяшонак, дзеяч культуры Т. І. Стружэцкі, энцыклапедыст Я. Якубоўскі, пісьменнік-святар К. Сваяк, архімандрыт Мадэст.



Народная артыстка Расіі Л. Абрамава (у цэнтры) сярод членаў журы конкурсу маладых выканаўцаў

**Пытанні і заданні:**

1. Якіх герояў паўстанняў XIX стагоддзя ты можаш назваць? За што яны змагаліся?
2. Назаві герояў сусветных і грамадзянскіх войнаў XX стагоддзя.
3. Хто з ураджэнцаў Пастаўшчыны атрымаў званне Героя Сацыялістычнай Працы?
4. Хто з ураджэнцаў нашага краю сталі вядомымі дзяржаўнымі дзеячамі?
5. Якія навукоўцы і творчыя асобы нарадзіліся на Пастаўшчыне?

# Тэма IV

# «Я спадчыну ад продкаў атрымаў...»





# § 26. Тваё ўласнае «Я»

**1. Твае адметныя прыкметы і ролі.** Кожны чалавек — адзіны і непаўторны на планеце Зямля. Ён мае шэраг вонкавых і ўнутраных прыкмет, якімі адрозніваецца ад іншых людзей. Гэта рост, вага, пульс, крывяны ціск, колер валасоў, колер і форма вачэй, форма вушэй, радзімыя плямкі, памер адзення і абутку, характар, тэмперамент, а таксама імя і прозвішча.

Некаторыя прыкметы чалавек мае з часу нараджэння, іншыя набывае на працягу жыцця. (Прывядзі прыклады прыкмет, якія чалавек набывае ад нараджэння, а якія — на працягу жыцця.)

Акрамя гэтага кожны жыхар планеты Зямля выконвае шмат розных абавязкаў, або роляў, якія ўплываюць і на яго знешні воблік, і на паводзіны. Напрыклад, вучань можа быць географам (калі добра вывучае прадмет геаграфія), турыстам (калі ўдзельнічае ў паходах), музыкантам (калі добра іграе на музычным інструменце), спеваком (калі спявае у школьным хоры) і да т. п.

З усіх гэтых прыкмет і асаблівасцяў складаецца ўласнае «Я».

На працягу жыцця ролі чалавека не застаюцца пастаяннымі, бо ён расце, сталее, атрымлівае адукацыю, прафесію. Таму паступова ў кожнага чалавека мяняюцца яго ролі ў сям'і і ў грамадстве. *(Прывядзі прыклады змены роляў чалавека на працягу жыцця ў сям'і і ў грамадстве).*

**2. Таямніцы твайго імя.** Адным з самых дарагіх і любімых слоў для чалавека з'яўляецца ўласнае імя. Яго выбіраюць бацькі пасля нараджэння дзіцяці, і яно ідзе з чалавекам па жыцці да скону. Па імёнах мы запамінаем людзей, па імёнах мы звяртаемся да іх. А які сэнс маюць нашы імёны і як яны ўтварыліся? У даўнія дахрысціянскія часы імёны не толькі служылі для абазначэння асобы і вылучэння яе з ліку іншых, але і павінны былі абараняць чалавека ад злых сіл. Старажытныя людзі верылі ў магічную сілу слова і былі ўпэўнены, што жывёлы, дрэвы, розныя з'явы прыроды, назвы якіх узяты ў

якасці імён, становяцца апекунамі, абаронцамі іх носьбітаў. У тыя часы ўжываліся такія імёны, як Воўк, Ліс, Заяц, Гром, Лебедзь, Бабёр, Трацццяк, Рабы, Крывы і ім падобныя. Многія з тых старажытных імёнаў сталі асновай сучасных прозвішчаў (*Прывядзі прыклады*). Некаторыя імёны адлюстроўвалі пачуцці і жаданні людзей: Надзея, Любоў, Уладзімір, Уладзіслаў, Яраслаў, Любамір, Багалеп, Радаслаў, Багдан, Яраполк, Барыслаў, Святаполк. (*Паспрабуй растлумачыць сэнс гэтых імёнаў*). Такія славянскія імёны былі распаўсюджаны ў XI–XVIII стагоддзях, але зараз яны сустракаюцца рэдка.

З хрысціянствам на Беларусь прыйшлі каталіцкія і праваслаўныя імёны, як уласна грэчаскія, так і старажытнарымскія, старажытнаяўрэйскія, сірыйскія, егіпецкія. У дзень хрышчэння дзіця звычайна атрымлівала імя, якое запісана ў святцах — царкоўных кнігах, дзе пералічваліся ўсе святыя і царкоўныя святы ў каляндарным парадку. Прычым па форме імя можна было даведацца, да якой хрысціянскай канфесіі належыць чалавек. Калі ў католікаў сустракаліся імёны Базыль, Ян, Барбара, Тодар, Юзаф, Стэфан, Гелена, то ў праваслаўных адпаведна Васіль, Іван, Варвара, Фёдар, Іосіф, Сцяпан, Алена. У вёсках, калі некалькі чалавек мела адно імя, то ўжываліся розныя яго формы, напрыклад, Ян-Янка-Янук-Івась; або Пётра-Пятрусь-Пятрук.

Кожнае імя нясе ў сабе нейкі сэнс, які можна вызначыць, калі перакласці яго на беларускую мову. Напрыклад, Васіль — «царскі», Андрэй — «мужны», Генадзь — «радавіты, высакародны», Марына — «марская», Алег — «святы», Мікіта — «пераможца», Алена — «сонечная, светлая». *(Пра сэнс некаторых найбольш распаўсюджаных імён можна даведацца ў дадатку).*

**Цікавыя факты.** 1. Адно і тое ж імя ў розных народаў гучыць па-рознаму. Рускае Іван прыйшло з грэцкага Іаан, якое ў сваю чаргу патрапіла са стараяўрэйскай мовы, дзе мела форму Іоханан, што значыць, «той, каго мілуе Бог». Цёзкамі Івана з'яўляюцца імёны Джон (англійскае), Ёханес, Ёган (нямецкае), Жан (французскае), Джавані (італьянскае), Юхан (шведскае), Енс (дацкае), Хуан (іспанскае), Юханна (арабскае).

2. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў 20–30-я гады XX стагоддзя некаторыя бацькі давалі сваім дзецям штучна утвораныя імёны: Рэм — ад «рэвалюцыя міравая (сусветная)», Кім — ад «камуністычны інтэрнацыянал», Акцябрына — народжаная Акцябром (Кастрычнікам), Гіпатэнуза, Гімалай, Турбіна, Трактар, Дызель, Рэўдзіт (рэвалюцыйнае дзіця).

**3. Таямніцы твайго прозвішча.** Каб адрозніць людзей з аднолькавымі імёнамі або ахарактарызаваць асобу ў старажытныя часы ўзнікла патрэба ў дадатковых сродках для абазначэння таго ці іншага чалавека. Такімі сродкамі і сталі другое імя, імя па бацьку, мянушка, назва мясцовасці, якія далі пачатак прозвішчам.

Прозвішчы ўтвараліся рознымі шляхамі і прыйшлі на нашу тэрыторыю з розных моў. Найбольш пашыранымі былі наступныя спосабы: а) ад дахрысціянскіх імён і мянушак (Рысь, Воўк, Зайцаў, Бабровіч, Собаль); б) ад прафесіі чалавека (Каваль, Лавец, Шапавал, Кравец, Бондар); в) ад паселішча, дзе чалавек нарадзіўся (Палачанін, Віцьбіч, Свірскі, Тураўскі); г) ад мясціны, дзе знаходзіўся фальварак, маёнтак, зямельны надзел (Падгайскі, Залескі, Падліпскі, Падлужны, Лесавік); д) ад характэрнай прыкметы знешнасці, характару, звычкі (Маўчан, Піскуновіч, Бяспалы, Таўкач, Крывенькі, Весялоўскі); е) ад назваў старажытных багоў, міфалагічных істот (Гром, Бажок, Лель, Марозаў, Пярун); ё) ад хрысціянскіх імён (Іваноўскі, Александровіч, Барысюк, Амбразевіч, Паўлоўскі); ж) ад назваў народаў або этнічных груп (Кацапаў, Палячок, Лях, Мазуркевіч, Прус, Чаховіч, Швед, Шваб, Маскалёў, Жамойдзь, Турак, Татарэнка).

Многія беларусы маюць тыпова рускія, польскія, нямецкія, татарскія, літоўскія прозвішчы: Іваноў, Пятроў, Дзянісаў, Трафімаў, Дзёмін, Козыраў; Альшэўскі, Зелянкоўскі, Стахоўскі, Янкоўскі, Станкевіч, Шпілеўскі, Панятоўскі; Фурман, Цандзер, Шанц, Фунт, Хільман, Кошман; Кардаш, Бесан, Бут-Гусаім, Баслык, Султан, Кучук; Каўрус, Мальдзіс, Тумас, Мажэйка, Кудрыс, Пунтус.

**4. Твой тэмперамент.** Характэрнай рысай кожнага чалавека з'яўляецца яго тэмперамент. Гэта асаблівасць унутранай яго сутнасці, якая перадаецца пры нараджэнні ад бацькоў і ад якой залежыць характар.

Існуюць чатыры тыпы тэмпераменту. Прачытай пра кожны з іх і паспрабуй вызначыць, да якога тыпу належыш ты.

*Халерык*. Гэта чалавек успыльчывы, рухавы, але задужа самаўпэўнены. Ён часта прыдумляе штосці новае і цікавае, але звычайна не даводзіць задуманае да канца. Ён нецярплівы і калі захопіцца, яго цяжка спыніць. Такі чалавек не любіць чакаць. Рухаецца ён хутка, мае добрую памяць, лёгка і хутка запамінае.



Такі тэмперамент быў у А. С. Пушкіна, цара Пятра I, у героя вядомага мультфільма Карлсана.

*Сангвінік*. Чалавек гэтага тыпу ўраўнаважаны і рухомы, добра валодае сабой, упэўнены ў сваіх сілах. Ён часта прыдумляе нешта новае і робіць так, як задумаў. Лёгка прыстасоўваецца да новых абставін, лёгка ўваходзіць у новыя кампаніі. Гаворка ў яго хуткая, гучная, з жывой інтанацыяй і мімікай. Але густы і інтарэсы ў такога чалавека непастаянныя. Калі яму нецікава, то ён адкрыта сумуе, але калі захоплены чымсьці, то абавязкова давядзе справу да канца. Ён валодае добрымі арганізатарскімі здольнасцямі.



Такі тэмперамент мелі Напалеон, Сувораў, герой казкі Бураціна.

*Флегматык.* Гэта спакойны ўраўнаважаны чалавек. Гаворыць у асноўным па справе, не любіць пустых слоў і абяцанняў. Ён прапануе новыя ідэі толькі пасля таго, як усё добра вывучыць і разлічыць. Можа доўга і спакойна працаваць, умее чакаць. Гаворка яго спакойная, без эмоцый. Да новых абставін прыстасоўваецца марудна. У залежнасці ад выхавання з яго можа вырасці або вялікі лянотнік, або напорысты баец.



Флегматыкамі былі: Кутузаў, Крылоў, кот Матроскін.

*Меланхолік.* Для такога чалавека характэрны нерашучасць, няўпэўненасць, яму цяжка зрабіць выбар. Ён не любіць ісці на кантакты з незнаёмымі людзьмі. Часта крыўдзіцца. Голас у яго ціхі, гаворка замаруджаная. Вельмі хвалюецца перад важнымі падзеямі. Калі сутыкаецца з цяжкасцямі, то яго агортвае адчай. Але меланхолік — выдатны працаўнік, калі трэба ўсё выконваць па правілах і яго будуць падтрымліваць.



Меланхолікамі былі Гогаль, Чайкоўскі, П'еро, аслік Іа.

Вельмі часта ў чалавеку спалучаюцца рысы ўсіх тэмпераментаў. Нельга лічыць адзін тэмперамент добрым, а другі — дрэнным, бо каштоўнасць

чалавека вызначаюць яго паводзіны і справы.

Вызначыўшы свой тэмперамент, ты зможаш паглядзець на сябе як бы збоку, падумаць, што можна паправіць у сваім характары, якія яго рысы змяніць да лепшага.



Тыпы тэмпераменту. Малюнак Х. Біструпа

**5. Твой гараскоп.** Кожны чалавек любіць свой дзень нараджэння. Гэта канкрэтная дата, месяц, год. Акрамя гэтага, амаль кожны ведае свой знак Задыяка. Што ж такое задыякальны гараскоп?

У глыбокай старажытнасці ўзнікла навука астралогія, прыхільнікі якой лічаць, што жыццё і лёс людзей залежаць ад размяшчэння планет і зорак на небе. Чалавек нараджаецца пад адным з дванаццаці знакаў Задыяка, у якім у момант нараджэння знаходзілася Сонца. Астролагі ўпэўнены, што поўная карта зорнага неба ў імгненне з'яўлення чалавека на свет можа даць поўнае апісанне яго характару. Знак Задыяка, пад якім нарадзіўся чалавек, з'яўляецца для яго самым моцным з усіх зорных цел. Трэба разумець, што аналіз знака Задыяка дае не зусім дакладную характарыстыку, бо акрамя даты трэба ведаць яшчэ і дакладны час нараджэння, а таксама геаграфічную шырату і даўгату. Калі ты будзеш вывучаць знакі Задыяка, то зможаш ведаць адметныя ўласцівасці характару сваіх сяброў і сябровак, і гэтыя веды дапамогуць табе адносіцца да іх з большым разуменнем і цярпеннем.



Кітайскі каляндар

| | Знак задыяка | Даты нараджэння | Знак задыяка | Даты нараджэння | Знак задыяка | Даты нараджэння |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Агонь | АВЕН | 21 сакавіка – 20 красавіка | ЛЕЎ | 23 ліпеня – 22 жніўня | СТРАЛЕЦ | 22 лістапада – 21 снежня |
| Зямля | ЦЯЛЕЦ | 21 красавіка – 20 мая | ДЗЕВА | 23 жніўня – 22 верасня | КАЗЯРОГ | 22 снежня – 19 студзеня |
| Вада | БЛІЗНЯТЫ | 21 мая – 21 чэрвеня | ШАЛІ | 23 верасня – 22 кастрычніка | ВАДАЛЕЙ | 20 студзеня – 18 лютага |
| Паветра | РАК | 22 чэрвеня – 22 ліпеня | СКАРПІЁН | 23 кастрычніка – 21 лістапада | РЫБЫ | 19 лютага – 20 сакавіка |

Па ўяўленнях астролагаў, кожны знак задыяка знаходзіцца пад уздзеяннем адной з чатырох стыхій — Агню, Вады, Зямлі і Паветра, якія таксама ўплываюць на характар і паводзіны чалавека.

Акрамя задыякальнага гараскопу апошнім часам карыстаецца папулярнасцю ўсходні гараскоп. Ён будуецца на аснове календара, якім карыстаюцца ў краінах Усходняй Азіі. Паводле яго, кожны год у межах 12-гадовага цыкла праходзіць пад знакам якой-небудзь жывёлы. Людзі, якія народжаны пад адным знакам, маюць шмат агульнага ў сваіх характарах.




Задыяк




Знакі задыяка

| Жывёла | Год | Жывёла | Год | Жывёла | Год |
|---|---|---|---|---|---|
| ПАЦУК (МЫШ) | 1984 (± 12) | ДРАКОН | 1988 (± 12) | МАЛПА | 1992 (± 12) |
| БУЙВАЛ (ВОЛ) | 1985 (± 12) | ЗМЯЯ | 1989 (± 12) | ПЕВЕНЬ | 1993 (± 12) |
| ТЫГР | 1986 (± 12) | КОНЬ | 1990 (± 12) | САБАКА | 1994 (± 12) |
| КОТ (ТРУС) | 1987 (± 12) | КАЗА (АВЕЧКА) | 1991 (± 12) | СВІННЯ (КАБАН) | 1995 (± 12) |

**Пытанні і заданні:**

1. Па якіх прыкметах адрозніваюцца людзі паміж сабой?
2. Як утварыліся імёны і прозвішчы?
3. Як падзяляюць людзей па тыпах тэмпераменту?

# § 27. Твая сям'я

**1. Сямейны побыт.** Амаль да сярэдзіны XX стагоддзя на Пастаўшчыне шырока былі распаўсюджаны вялікія сем'і, якія аб'ядноўвалі некалькі шлюбных пар, звычайна бацькоў і жанатых сыноў. Такая сям'я вяла адну гаспадарку, у якой праца дэтальна размяжоўвалася на жаночую



Ворыва



Сенакос. Сярэднявечная гравюра

і мужчынскую. Галавой вялікай сям'і быў бацька, а калі ён паміраў, то яго месца займаў старэйшы сын.



👁 Прадзенне воўны

У сем'ях існаваў строгі падзел працы па полу і ўзросту. Кожны член сям'і добра ведаў свае абавязкі. Дзеці дапамагалі маці чысціць бульбу, няньчыць дзяцей; пасвілі гусей, курэй. Падлеткам давяралі пасвіць не толькі птушак, але і буйную жывёлу: кароў, коней, валоў, авечак. У сялянскіх сем'ях дзеці пачыналі працаваць вельмі рана. З 7–8 гадоў яны пасвілі жывёлу, зграбалі сена, баранавалі. Падлеткаў, якім было каля 15 гадоў, прывучалі касіць, араць, малаціць. У 5 гадоў дзяўчынкі няньчылі дзяцей, а ў 16 умелі шыць, ткаць, жаць.

Старыя часцей за ўсё вялі хатнюю гаспадарку: кармілі хатнюю птушку, даглядалі скаціну, а таксама выхоўвалі дзяцей і дапамагалі маладзейшым у полі.

Мужчыны і юнакі апрацоўвалі зямлю, аралі, засявалі, касілі сенажаці, раскарчоўвалі лес, рубілі хаты, нарыхтоўвалі дровы на зіму, рабілі драўляны посуд, плялі корабы і кошыкі.

Дзяўчаты, як і жанчыны, мылі бялізну, посуд, варылі ежу, даглядалі агарод, палолі грады, жалі, сушылі сена, ірвалі і адбівалі пранікам лён, мялі льнотрасту, трапалі і часалі кудзелю, пралі, ткалі і шылі вопратку.

**Цікавы факт:** У XVI–XVIII стагоддзях шляхта аддавала сваіх дзяцей у сялянскую сям'ю для выхавання якасцей простых людзей: працавітасці, вынослівасці, непераборлівасці ў ежы і адзенні, любові да зямлі. Гэты звычай называлі дзядзькаваннем.

Дзяцей даглядала і выхоўвала маці, якой дапамагалі дзед і баба. Яны перадавалі малым свой жыццёвы вопыт, свае навыкі, уменні майстраваць тыя ці іншыя рэчы і вусна-паэтычную спадчыну (казкі, песні, загадкі, байкі, прыказкі і прымаўкі).



👁 Радзінны абрад

**2. Сямейныя святы і абрады.** Кожная сям'я — гэта вялікі свет са сваімі ўнутранымі законамі і ўзаемаадносінамі, сваімі святамі і традыцыямі, захапленнямі і ладам жыцця. Але ёсць шэраг святаў і абрадаў, якія ўласцівы амаль кожнай сям'і, бо адпавядаюць галоўным этапам чалавечага жыцця. Гэта радзіны, вяселле і хаўтуры.

*Радзіны* — гэта свята нараджэння дзіцяці. У даўнія часы роды звычайна прымала бабка — пажылая спрактыкаваная жанчына. Таму на радзінах ёй адводзілася самая ганаровая роля: яе ўшаноўвалі, абдорвалі, славілі словам, урачыста праводзілі дадому. Асноўнай старадаўняй абрадавай стравай была бабіна каша, якую яна гатавала з круп на малацэ, дадаючы масла, цукар, упрыгожвала галінкамі, кветкамі, цукеркамі.

Пасля нараджэння дзіцяці жанчыны з радні парадзіхі, выбраўшы вольную часіну, пяклі аладкі або яешню, і кожная самастойна ішла ў адведкі.

Царква з радзінамі звязала абрад хрышчэння дзіцяці, таму яны і атрымалі яшчэ адну назву — «хрэсьбіны». Калі хрысцілі дзіця, то давалі яму імя, якое было ў святцах у дзень хрышчэння малога.


ARCHIDIEC
PROBOSZCZ R. K. PARAFJI
ŚWIADECTWO METRYCZNE
URODZENIA I CHRZTU
z ksiąg metrycznych
rzymsko-katolickiego parafjalnego kościoła
Roku 1902 dnia 8
ochrzczono niemowlę imieniem
urodzone roku tysiąc
dnia
małżonków ślubnych
WIAROGODNOŚĆ POWYŻSZEGO AKTU NINIEJSZEM STWIERDZAM.
PROBOSZCZ PARAFJI

👁 Пасведчанне аб нараджэнні і хрышчэнні. 1902 г.

*Вяселле* — свята ўступлення ў шлюб жаніха і нявесты. Сярод усіх свят, якія адзначалі нашы продкі, яно было найбольш маляўнічым і прыгожым, насычаным абрадамі і песнямі. Само вяселле



Вянчанне



Вяселле

уключала некалькі абавязковых этапаў. Спачатку было сватанне, калі ў хату да дзеўкі ішлі 2–3 мужчыны, звычайна хросны бацька або дзядзька жаніха, яго бацька, іншы раз старэйшы брат. Яны вялі перамовы з бацькамі нявесты наконт вяселля, дамаўляліся аб пасагу. Пасля бацькі засватанай дзяўчыны або і сама маладая ішлі да жаніха паглядзець на гаспадарку жаніха.

Праз адзін-два тыдні былі заручыны, калі да дзеўкі на конях з шархунамі



Каплічка на Груздаўскіх могілках

прыязджалі сват, жаніх і яго бацька. Мэта заручын — публічнае заяўленне аб сватанні і аб згодзе нявесты і бацькоў на шлюб.

Напярэдадні вяселля была зборная субота. Заручаная хадзіла да сваіх сяброўак і клікала іх да сябе дамоў віць вянок. Пашыўшы і звіўшы вянок, яго прымяралі на маладую, а тая ў вянку кланялася бацькам, сяброўкам і ўсім прысутным. У той жа дзень спраўляўся кавалерскі вечар у доме жаніха, куды ён запрашаў сваіх сяброў і вясковых дзяўчат. Звычайна перад вяселлем, у суботу, пяклі каравай — цэнтральную страву на

вяселлі. Караваем і песняй, як правіла, пачыналі і заканчвалі вяселле.

Шлюбавіны — дзень, у які заключаўся шлюб. Раней вянчаліся ў царкве, але ў народзе прызнаваўся толькі шлюб, які афармляўся вяселлем. На шлюбавінах выконвалі такія абрады: пасад, расплятанне касы, благаславенне, выкуп маладой, абмен караваяў або вяночкаў, злучэнне караваяў, абход вакол стала. Само вяселле магло доўжыцца амаль тыдзень з суботы да чацвярга. У нядзелю маладыя вянчаліся, а пасля гэтага яны раз'язджаліся па сваіх хатах. У панядзелак малады са сваёй дружынай на конях ехаў да маладой, «выкупляў» яе, забіраў пасаг і вёз у сваю хату. І там 2–3 дні гуло вяселле. Абавязковымі ўдзельнікамі яго былі музыкі: скрыпач і дудар, а пазней — гарманіст, цымбаліст і бубніст.

У наступную нядзелю пасля вяселля маладыя з блізкай раднёй ездзілі ў госці да бацькоў нявесты.

*Хаўтуры* — абрад пахавання памерлых. Паводле традыцыі, славяне ў дахрысціянскі перыяд спальвалі нябожчыкаў, радзей хавалі ў зямлю, насыпаючы курган. Хаваць памёршых у дашчанай труне на могільніку ў сельскай мясцовасці пачалі ў XIII–XIV стагоддзях. На магіле насыпалі невялічкі ўзгорак і ля галавы ставілі крыж. Вярнуўшыся з могільніку, ўсе старанна мылі рукі і садзіліся за жалобны стол. На памінках выконвалі пэўныя рытуалы, успаміналі памёршага, елі канун — кашу з вадою, падсалоджаную мёдам або цукрам, клёцкі, бліны, пакідалі яду нябожчыку.

**Цікавы факт:** Памінкі паўтараліся ў памінальныя дні: трэці, шосты, дзевяты, саракавы, паўгодкі, гадавіна пасля смерці, а таксама абавязкова на радаўніцу і на дзяды.

**Пытанні і заданні:**

1. Якую работу ў сямейнай гаспадарцы выконвалі раней дзеці твайго ўзросту?
2. Назаві галоўныя сямейныя святы і абрады.
3. Чым адрозніваюцца сучасныя святы і абрады ад даўнейшых?

# § 28. Твой радавод

**1. Што такое род?** Род — гэта калектыў кроўных родзічаў, якія вялі сваё паходжанне па адной лініі (мацярынскай або бацькоўскай), усведамлялі сябе патомкамі агульнага продка і мелі агульнае родавае імя. Узніклі роды ў Беларусі ў глыбокай старажытнасці і ўяўлялі сабой некалькі вялікіх сем'яў, якія былі звязаны роднаснымі сувязямі. У кожнага роду быў свой татэм — жывёла ці птушка, імем якой ён называўся і якой пакланяўся. Членам роду забаранялася паляваць на татэмную жывёлу. У кожнага роду было родавае свята, якое спраўлялася ў гонар татэма, і родавы татэмістычны цэнтр — месца, дзе захоўваліся свяшчэнныя родавыя рэчы. На Пастаўшчыне жылі роды, у якіх татэмнымі жывёламі былі воўк, змяя (вуж) і птушка бусел. Муж і жонка павінны былі быць з розных родаў.



Буслы. Татэмныя птушкі



Воўк. Татэмны звер



Вуж. Татэмны знак

Старажытная родавая арганізацыя знікла на позняй стадыі першабытнаабшчыннага ладу, але яна зрабіла вялікі ўплыў на побыт і духоўную культуру людзей, што адлюстравалася ў рэлігійных вераваннях, міфалогіі, фальклоры. Сляды родавай арганізацыі ў беларусаў захаваліся пераважна ў вясельных абрадах.

У цяперашні час родам называюць рад пакаленняў блізкіх па крыві людзей, якія паходзяць ад аднаго продка.

**2. Родзічы і сваякі.** У сучасных сямейных адносінах выдзяляюць роднасць па прамой лініі (бацькі і дзеці, продкі і нашчадкі) і па

бакавой (браты і сёстры, дзядзькі, цёткі і пляменнікі). Для абазначэння ступені роднасці ўжываюцца розныя словы-тэрміны: тата, мама, дачка, сын, дзед, баба, прадзед, прабабка, унук, унучка. Выдзяляюць некалькі ступеняў роднасці і сваяцтва. Да першай ступені кроўнай роднасці ў беларусаў адносяць бацьку (тату), маці (матку, маму), сына, дачку. Да другой ступені — дзеда, бабу, унука і ўнучку; да трэцяй — прадзеда, прабабку, праўнука, праўнучку. Значна радзей ужываецца чацвёртая ступень роднасці: прапрадзед, прапрабабка, прапраўнук, прапраўнучка. Далейшыя ступені кроўнай роднасці называюцца агульна: продкі, дзяды, дзяды-прадзеды, нашчадкі.




Каляровае дрэва свайго радаводу, вышытае Л. Зарэцкай з в. Навасёлкі

Назвы роднасці першай ступені бакавой лініі: брат, сястра, пляменнік, пляменніца; другой ступені — дзядзька, цётка, дваюрадны (стрыечны) брат, дваюрадная (стрыечная) сястра. Назвы трэцяй і наступных ступеняў бакавой лініі ўжываюцца рэдка і падаюцца звычайна апісальна.

Асобную групу сваякоў складаюць хросныя бацькі, хросная маці, хросныя дзеці — хроснік (хрэснік), хросніца (хрэсніца), а таксама назвы кум і кума. Усе яны звязаны з царкоўным абрадам хрышчэння.

У гаворках паміж людзьмі часта ўжываюцца розныя агульныя назвы роднасці: радня, родзічы, радзіна, сваякі, свае, адроддзе, род.

**Цікавы факт:** У старажытнай Беларусі існаваў такі звычай. Калі хлопчык вырастаў, то мусіў даказаць, што меў права называцца мужчынам. Для гэтага ён павінен быў пераплысці хуткую і глыбокую раку, здабыць на паляванні тура, мядзведзя або зубра, распаліць пад дажджом вогнішча, а яшчэ — абавязкова ведаць, кім былі ягоныя дзяды, прадзеды і прапрадзе-

ды. Таго, хто не ведаў, часам нават выганялі з сялібы, бо лічылася, што такі бяспамятны чалавек лёгка можа зрабіцца здраднікам.

**3. Радавод.** Радавод — гэта гісторыя роду, якая гаворыць аб ягоным паходжанні, аб пераемнасці пакаленняў і крэўнай повязі паміж сямейнікамі. Для яго складання карыстаюцца як пісьмовымі, так і вуснымі сведчаннямі. Збіраючы матэрыял для радавода, у першую чаргу распытваюць бліжэйшую радню, выяўляюць ступень роднасці або сваяцтва. Каб даведацца пра родзічаў, якія жылі ў XIX стагоддзі і раней, трэба карыстацца пісьмовымі крыніцамі. Гэта могуць быць метрычныя кнігі храмаў, перапісы насельніцтва, інвентары маёнткаў і іншыя гістарычныя дакументы. Радаводы дваранскіх і шляхецкіх сем'яў можна адшукаць у радаслоўных разрадных кнігах, баярскіх спісах, польскіх гербоўніках, якія вяліся з сярэдзіны XVI стагоддзя.



Герб Бішэўскіх і Даўгялаў Абданк



Герб Хамінскіх Парай



Герб Чаховічаў Сыракомля

Спецыялісты складаюць радаводныя дрэвы — графічныя выявы радаводаў. Яны дазваляюць прасачыць развіццё пэўнай галіны роду, вызначыць ступень роднасці з іншымі родзічамі. Гэта вельмі старая традыцыя, бо шляхта здаўна і ва ўсіх краінах цаніла веды аб сваіх продках, ганарылася старажытнасцю і славутасцю сваіх родаў. Але, каб мець радавод, неабавязкова быць шляхціцам — памятаць пра сваіх продкаў варта кожнаму.

**4. Як скласці радавод?** Радаводы складаюцца па мужчынскай і жаночай лініях, ці, як раней казалі, «па мячу» і «па кудзелі». Каб скласці радавод, трэба ісці наступным шляхам:

1. Намаляваць радаводнае дрэва (генеалагічную схему). Уверсе мусіць быць ваш прадзед (а калі ведаеш, і прапрадзед) са сваёю жонкаю (пазнач даты жыцця), ад іх павінныісці лініі да дзяцей (пазнач і іх даты жыцця), адзнач шлюбныя сувязі. Гэтаксама зафіксуй звесткі пра вашых бацькоў, іхніх братоў і сясцёр. А потым — пра сябе, больш далёкіх братоў і сясцёр. Такая схема дапаможа табе лепш арыентавацца ў сваяцкіх сувязях.

2. Паспрабуй запісаць, што ты ведаеш пра сваіх продкаў. Кароткую біяграфію пра кожнага асобна.

3. Пагавары з бацькам і маці, запішы тыя звесткі, якія яны табе паведамяць.

4. Пагавары з бабуляй і дзядулем, запішы іх расказы.

5. Збяры фотаздымкі, пісьмы, успаміны і іншую інфармацыю пра бліжэйшую радню.

6. Выпішы назвы вёсак і гарадоў, дзе жылі і зараз жывуць блізкія родзічы.

7. Зрабі картасхему населеных пунктаў сваёй радні.

**Пытанні і заданні:**

1. Што такое род?
2. Як ты разумееш словаспалучэнне «татэмная жывёла»?
3. Што такое радавод?
4. Чаму шляхта вяла радаводы?
5. Якія крыніцы інфармацыі трэба выкарыстоўваць, каб збіраць звесткі для радавода?
6. Складзі свой радавод.

## § 29. Твая родная мясціна

**1. «Мой родны кут, як ты мне мілы...»** Гэтыя радкі з паэмы Я. Коласа «Новая зямля» напэўна ведае кожны жыхар Беларусі, бо ў кожнага з нас ёсць свая маленькая радзіма — вёска, вуліца, горад, — месца, дзе пачалося жыццё, праходзілі гады маленства і юнацтва. Менавіта там, у невялікім родным куточку, чалавек пачынае шлях у вялікае жыццё, крок за крокам вывучае і спазнае

багацце навакольнага свету, знаёміцца з прыродай, гісторыяй, культурай і тым самым далучаецца паступова да агульначалавечай цывілізацыі. З усяго гэтага вырастае шчымлівае і пяшчотнае пачуццё да роднага краю, да родных і блізкіх людзей, да ўсяго, што ёсць на планеце Зямля.

Аднак, бывае, даводзіцца чуць, што нейкая вёска нецікавая, бо там няма ні рэчкі, ні возера, ні помнікаў гісторыі... Але не бывае нецікавых мясцін: усюды, дзе жылі і жывуць людзі, была і ёсць свая гісторыя, бо жыхары гэтых мясцін апрацоўвалі зямлю, даглядалі жывёлу, займаліся гаспадаркай, гулялі вяселлі, праўлялі хаўтуры, кагосьці любілі, з кагосьці смяяліся. Нецікавасць існуе ад няведання, вывучэнне ж геаграфіі і гісторыі родных мясцін нараджае ў душы пачуццё любові і жаданне працаваць на карысць сваёй радзімы.

Яшчэ ўсяго каля дзесяці гадоў таму матэрыялаў пра Пастаўскі раён было вельмі мала, і здавалася, што ў нашым краі нічога вартага ўвагі няма. Аднак выйшла ў свет кніга «Памяць. Пастаўскі раён», з'явіліся кнігі і публікацыі па прыродзе, гісторыі, культуры Пастаўшчыны, пра населеныя пункты Манькавічы, Задзеўе, Груздава, Лучай, Лынтупы, Дунілавічы, Варапаева, Міхнічы, Паставы — і стала бачна, што жывём мы ў шчодрай мясцовасці, дзе кожная вёсачка, кожны хутар з'яўляюцца скарбонкамі матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей. Але вядома і іншае, што вялікія багацці нашай спадчыны далёка не ўсе вывучаны, апісаны, сфатаграфаваны. На Пастаўшчыне існавала каля 800 населеных пунктаў, а ўласныя летапісы маюць усяго адзінкі. Навукоўцы не ў стане вывучыць усе вёсачкі і хутары Беларусі, таму ёсць спадзяванне на тое, што гэтым зоймуцца школьнікі.

**Сведчаць дакументы:** Аўтар знакамітай кнігі «Географія Беларусі» ў 1919 годзе пісаў: *«Але з паняцьцем Бацькаўшчыны ў нас зьвязуецца яшчэ і нейкае цёплае, а іншы раз і вельмі гарачае пачуцьцё да нашае роднае стараны. Кожын чалавек л ю б і ц ь сваю Бацькаўшчыну, незалежна ад велічу і хараства яе прыроды, ад яе багацьця і славы, ад таго дабрабыту, які́м яна дарыць сваіх сыноў. Брадзячы жыхар паўночнае тундры любіць сваю суровую Бацькаўшчыну ня менш, чым жыхар яскравага, поўнага жыцьця і фарбаў, багатага паўдня. А гэткае замілаваньне змушае нас цікавіцца роднаю стараною, яе рэкамі, гарамі, лясамі, местамі, як цікавяцца кожным прадметам, якога любяць».*



Андрэй Майсяёнак

**2. Твая родная вёска.** Кожная вёска ў любой цывілізаванай краіне павінна мець свой летапіс. Напрыклад, у Чэхіі ў сельскіх паселішчах есць людзі, якія вядуць запісы аб падзеях і здарэннях, якія там адбываюцца. У Беларусі такога пакуль што няма, а з кожным годам невялікія населеныя пункты змяншаюцца ў памерах, а некаторыя і зусім знікаюць. Паспрабуй стаць летапісцам сваёй вёскі або вёскі, у якой жывуць твае бабуля і дзядуля ці проста родзічы. Як гэта зрабіць?

Наш зямляк, прафесар, доктар біялагічных навук і вядомы краязнаўца А. Майсяёнак падрыхтаваў для школьнікаў памятку па вывучэнні родных мясцін. Вось яе галоўныя палажэнні:

- назва вёскі (сучасная і ранейшая), ад чаго паходзіць, даты змен і г. д. Назвы зніклых вёсак, іх геаграфічныя каардынаты, абставіны і даты знікнення. Назвы і месцы маёнткаў, якія былі ў вашым наваколлі, хто і калі быў іх гаспадаром, архітэктарам будаўніцтва;
- якія цікавыя забудовы з мінулых часоў захаваліся ў вашым рэгіёне? Ці ведаеце вы руіны старых замкаў, палацаў, гаспадарчых забудоў (млыны і г. д.), якія не ўзяты на ўлік і не ахоўваюцца як помнікі? Вельмі важна запісаць успаміны старажылаў, адшукаць звесткі пра гісторыю аб'ектаў, зрабіць фотаздымкі;
- якія пейзажныя паркі засталіся ў вашым наваколлі з мінулых часоў? Ці добраўпарадкаваны яны? Якія незвычайныя пароды дрэў і хмызнякоў можна адшукаць у старых парках?;
- звярніце асаблівую ўвагу на могілкі. Прыміце ўдзел у добраўпарадкаванні магіл удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, барацьбітоў за нацыянальнае вызваленне. Якое пахаванне на могілках лічыцца самым старым? Ці ёсць забытыя пахаванні і помнікі? Хто з выдатных людзей Беларусі пахаваны на бліжэйшых могілках, вывучыце яго лёс і дзейнасць, яго жыццё? Якія могілкі зруйнаваны ці закінуты? Дзе знаходзяцца яўрэйскія, татарскія могілкі, старыя пахавальныя курганы? Ці вядомы вам археалагічныя помнікі ў вашым рэгіёне, як яны пазначаны і захоўваюцца;

- якія маюцца помнікі культавага дойлідства? Ці існуе ў вашым наваколлі разбураны касцёл ці царква, сінагога ці мячэць, якія не ўзяты пад улік ці пад ахову дзяржавы? Зрабіце іх здымкі, малюнкі, даведайцеся ў старэйшых людзей іх гісторыю;
- пазнаёмцеся ўважліва з рэлігійным жыццём вашага наваколля. Даведайцеся пра гісторыю прыхода і дзеючага храма. Уважліва вывучыце і занатуйце (пажадана і фота) пахаванні і надпісы на помніках каля прыходскіх храмаў, а таксама памятныя шыльды і надпісы ў інтэр'ерах, якія зроблены ў памяць ці гонар фундатараў, ахвярадаўцаў, памерлых ці загінуўшых. Ці маюцца ў вашым наваколлі месцы, звязаныя з рэлігійным культам, капліцы, крыжы, крыніцы? Якія існуюць апавяданні пра гэта старэйшых людзей?
- настойліва шукайце старыя газеты, часопісы, на любых мовах, старыя кнігі і падручнікі, старыя фотаздымкі, альбомы. Не дапускайце, каб гэтыя каштоўнасці былі выкінуты на смецце. Шукайце іх у старэйшых людзей, вядзіце з імі гаворку аб гісторыі іх жыцця і працы, занатуйце;
- якія былі цікавыя падзеі ў вашай акрузе ў час Першай і Другой сусветных войнаў, савецка-польскай вайны, аб'яднання Беларусі ў 1939 годзе? Як праходзіла калектывізацыя? Запішыце ўважліва ўспаміны сведкаў і ўдзельнікаў гэтых падзей;
- як вучыліся вашы дзяды і бацькі? На якой мове і што гэта каштавала? Занатуйце назвы школ, дзе яны існавалі, хто быў з выкладчыкаў і які пра іх успамін? Каго з выдатных лекараў сустрэлі вашы родныя на сваім жыццёвым шляху?
- хто быў пацярпелы, арыштаваны з вашых мясцін да 1939 г.? Іх далейшы лёс?
- хто быў у вашым раёне рэпрэсаваны органамі НКУС, МДБ, які іх лёс, запішыце ўважліва ўспаміны гэтых людзей. Ці маеце вы звесткі пра невядомыя пахаванні рэпрэсаваных у вашым раёне?
- запішыце ўспаміны ўдзельнікаў Вялікая Айчыннай вайны, пра іх баявую дзейнасць, месцы стаянак, адносіны да мясцовага насельніцтва. Што вы ведаеце пра дзейнасць партызанскіх атрадаў і атрадаў Арміі Краёвай? Які іх агульны ўдзел у вызваленні Беларусі ад нямецкафашысцкіх захопнікаў?
- што вядома вам пра гісторыю прадпрыемстваў, калгасаў (саўгасаў) у вашым рэгіёне? Якіх выдатных дзеячаў прамысловасці і вясковай гаспадаркі вы ведаеце? Запішыце іх ўспаміны. Які ўклад робіць гаспадарка ў развіццё вашага горада і вёскі, асабліва ў развіццё народнай адукацыі і культуры?

- якія помнікі прыроды ёсць у вашым раёне? Што вам вядома пра іх з легендаў, успамінаў? Якія вы ведаеце валуны, крыніцы, рэчышчы, балоты? Што гавораць пра іх старажылы? Ці маюць валуны асабістыя назвы, надпісы ці малюнкі?;
- ці ведаеце вы старыя дрэвы, паркі, азёры, з якімі звязана жыццё і творчасць славутых людзей? Запішыце ўспаміны старэйшых людзей і інфармацыю краязнаўцаў;
- што вядома вам пра жыццё нацыянальных меншасцей на Беларусі? Якія асабістасці ўкладу жыцця і працы, рэлігіі былі і засталіся ў літоўцаў, яўрэяў, палякаў, татар? Даведайцеся пра асноўныя рэлігійныя і культурныя каштоўнасці іх жыцця;
- магчыма ў вашым регіёне захаваліся старыя гаспадарчыя пабудовы, меліярацыйныя прыстасаванні, каналы з мінулых часоў. Якая іх гісторыя? Вазьміце іх на ўлік, вывучыце дакладна, складзіце тапаграфічную карту;
- звярніце асаблівую ўвагу на свой радавод. Хто вашы бацькі і дзяды, прадзеды. Адкуль паходзяць, які быў іх жыццёвы лёс, дзе пахаваны старэйшыя пакаленні, чым займаліся і дзе працавалі. Якія іх былі мова і веравызнанне? Якія сямейныя рэліквіі захаваліся ў вашай сям'і, старыя альбомы? Зрабіце іх здымак, апісанне і занатуйце ў краязнаўчым дзённіку. Зарысуйце свой асабісты радавод, у якім пазначце месцы, даты нараджэння (смерці) вашых продкаў.

**3. Твая вуліца.** Для школьнікаў, якія нарадзіліся і жывуць у гарадах, аб'ектам вывучэння можа быць вуліца або гарадскі мікрараён.

З'яўленне вуліц звязана з разрастаннем вёсак, пераўтварэнні іх у мястэчкі і гарады. Першыя беларускія гарады ўзніклі як апорныя пункты абароны (назва «горад» паходзіць ад слова «гарадзіць, умацоўваць паселішча») па берагах буйных рэк ці ў сутоках дзвюх рэк, на высокім мысе або пагорку. Цэнтрам горада быў звычайна ўмацаваны дзядзінец, які пасля XIV стагоддзя называўся замкам. Вакол месціўся пасад. Вуліцы звычайна разыходзіліся ад цэнтра ў напрамку бліжэйшых населеных пунктаў. У цэнтры горада яны масціліся бярвеннем, плашкамі ці дошкамі.

З XVII стагоддзя ў гарадской забудове і планіроўцы адбываліся змены, бо з'явіўся яшчэ адзін цэнтр — ратушная плошча з гандлёвымі радамі. Ратушы пачалі будаваць у гарадах, якія мелі магдэбургскае права (права на самакіраванне). Ад гандлёвай плошчы вуліцы разыходзіліся ў напрамку на бліжэйшыя




Кнігі пра Пастаўшчыну

буйныя гарады і вёскі (радыяльная або веерная планіроўка). У далейшым з'явіліся вуліцы паўколавага напрамку. Прыватнаўласніцкія гарады развіваліся ў асноўным па загадзя распрацаваных праектах і мелі ўпарадкаваную планіроўку.

У канцы XVIII – першай палове XIX стагоддзя беларускія гарады былі ўключаны ў агульны план перабудовы гарадоў Расійскай Імперыі. Перапланіроўка раздзяліла гарады на цэнтральную частку і прадмесці, на раёны і кварталы, у якіх усталёўваліся абавязковыя правілы забудовы. Зараз у большасці старых гарадоў спалучаецца радыяльная забудова цэнтра з квартальнай забудовай новых гарадскіх ускраін.

Паводле характару забудовы вуліцы падзяляюцца на аднарадныя і двухрадныя. На аднарадных вуліцах хаты стаяць толькі на адным баку дарогі, а з другога боку можа знаходзіцца лес, возера, рака ці які іншы прыродны аб'ект. На вуліцах могуць знаходзіцца толькі жылыя дамы, а на некаторых, асабліва на цэнтральных, размяшчаюцца грамадскія будынкі — магазіны, установы,

арганізацыі і інш. У вялікіх гарадах пераважаюць шматпавярховыя дамы, у невялікіх — адна- і двухпавярховыя.

**Пытанні і заданні:**

1. Чаму важна ствараць летапісы населеных пунктаў?
2. Якія крыніцы трэба выкарыстоўваць пры складанні летапісаў вёсак?
3. Як з'явіліся вуліцы?
4. Якія віды планіроўкі характэрны для беларускіх гарадоў?
5. Якія бываюць вуліцы паводле характару забудовы?
6. Як змянялася колькасць вуліц у Паставах за апошнія 300 год?

# Паселішчы роднага краю






# § 30. **Лынтупы**

**1. Асаблівасці прыроды.** Лынтупы — буйнейшы населены пункт у заходняй частцы Пастаўскага раёна. Размешчаны ён абапал невялікай рачулкі Лынтупка, якая ў межах паселішча ўтварае некалькі штучных ставоў. У даўнейшыя часы рэчка была значна больш паўнаводная, што і прывабіла сюды людзей.

Крышталічны падмурак з гранітаў і гнейсаў мае найбольшую глыбіню залягання ў межах Пастаўскага раёна — больш 600 метраў. У тоўшчы асадкавых парод, якія ляжаць над ім, разам з адкладаннямі кембрыйскага, ардавікскага і дэвонскага перыядаў палеазойскай эры выяўлены адклады сілурыйскага перыяду, чаго няма ў іншых частках раёна. Гэта сведчыць пра тое, што старажытныя моры тут трывалі даўжэй. Наогул, Лынтупшчына знаходзіцца на мяжы прыўзнятай Беларускай антэклізы і ўвагнутай Балтыйскай сінеклізы.

Лінтупы і самы вышэйшы з буйнейшых населеных пунктаў Пастаўшчыны. Свянцянскія грады тут узвышаюцца на 210–220 метраў над узроўнем мора, а ў ваколіцах ёсць і вышэйшыя ўзгоркі.

У кліматычных адносінах тутэйшая мясцовасць — самая вільготная частка раёна. Па колькасці ападкаў (больш 700 м) Лынтупшчына разам з Наваградчынай займае першае месца ў Беларусі. Гэта тлумачыцца тым, што заходнія вятры з Атлантычнага акіяна затрымліваюцца высокімі Свянцянскімі градамі.



Рака Лынтупка

У адрозненне ад іншых паселішчаў Пастаўшчыны ў ваколіцах Лынтупаў азёр няма, толькі на захад ад

паселішча ляжыць амаль зарослае Раманішскае возера. Рака Лынтупка, што працякае праз паселішча з поўначы на поўдзень нясе свае воды ў самую чыстую раку Беларусі Страчу (прыток Віліі). Мае даўжыню 23 кіламетры і плошчу вадазбору 57 км$^2$. Сярод лынтупскага парку на рацэ створаны 4 сажалкі, злучаныя каналамі.

З паўночнага і ўсходняга боку пасёлка знаходзяцца палеткі, дзе зямля апрацоўваецца, а з іншых бакоў да Лынтупаў падступаюць лясы, прычым з поўдня яны цягнуцца аж да Блакітных азёр, утвараючы знакамітую Дамуцёўскую пушчу. У лясах водзіцца шмат звяроў, яны багатыя на грыбы і ягады.

**2. Гісторыя Лынтупаў.** Час узнікнення паселішча невядомы, але, верагодна, першыя жыхары стала пасяліліся тут яшчэ ў першай палове I тысячагоддзя нашай эры. Пра даўняе засяленне тутэйшых мясцін людзьмі сведчыць вялікі курганны магільнік балтаў, які месціцца на адлегласці 2,5 км на паўднёвы захад ад Лынтупаў. Там выяўлена 74 насыпы дыяметрам 5–17 метраў з пахавальным абрадамтрупаспаленне. У курганах, якія вывучаліся археолагамі, знойдзены бронзавыя шыйныя грыўні, бранзалеты, пярсцёнкі, падвескі-ракавіны, бронзавыя спіралькі, жалезныя шылы і іншыя рэчы балцкай культуры.



Археалагічныя знаходкі з курганоў каля Лынтупаў: 1, 13 — наканечнікі дзід; 2, 4, 5, 7 — нажы; 3 — шыла; 6, 9 — фрагменты бранзалетаў; 8, 19 — сякеры; 10–12, 14–16 — прасніцы; 18 — спражкі

У гістарычных крыніцах Лынтупы згадваюцца ўпершыню пад 1385 годам, раней чым Паставы і Дунілавічы.




Лынтупы, чыгуначная станцыя. 1919 г.

З сярэдзіны XVI стагоддзя мястэчка ў Ашмянскім павеце Віленскага ваяводства Вялікага Княства Літоўскага. Па інвентарызацыі 1591 года ў Лынтупах была плошча і 2 вуліцы — «Да млына» і «Да сяла Судоўскага», 28 дымоў, каля 150 жыхароў. Сядзіба ўладара маёнтка складалася са старога дома з 6 памяшканнямі і гаспадарчых пабудоў.

У розныя часы мястэчкам валодалі Астроўская, Гільзены, Бучынскія, Бішэўскія. А першы храм у Лынтупах быў пабудаваны ў 1459 годзе віленскім ваяводам Андрэем Даўгірдовічам, пры касцёле быў шпіталь. З таго часу касцёл завуць Андрэеўскім.

З часу трэцяга падзелу Рэчы Пасталітай у 1795 годзе Лынтупы ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі. У 1812 годзе мястэчка занялі войскі Напалеона. Жыхары мястэчка прымалі ўдзел у паўстанні 1830–1831 гадоў. 5 мая 1831 года атрады паўстанцаў былі ў Лынтупах, адкуль накіраваліся ў Ашмянскі павет.

З 1843 года Лынтупы сталі цэнтрам воласці ў Свянцянскім павеце Віленскай губерні, а з 1854 года маёнтак перайшоў ва ўладанне Юрыя Бішэўскага, нашчадкі якога валодалі ім да 1939 года.

У 1885 года ў Лынтупах налічвалася 13 двароў, пражывала 214 жыхароў. Дзейнічала валаснное праўленне, касцёл, яўрэйскі малітоўны дом, школа (пабудавана ў 1866), багадзельня, 3 крамы, карчма, праводзіліся кірмашы.

Галоўныя рысы сучаснага мястэчка акрэсліліся на мяжы XIX–XX стагоддзяў, калі праз паселішча прайшла чыгунка Новасвянцяны –

Беразвечча, узведзены бровар, закладзены парк і пабудаваны двухпавярховы палац. Тады ж на месцы драўлянага храма, які згарэў, вырас у мястэчку і мураваны касцёл. Адбылося ўсё гэта дзякуючы ў значнай ступені гаспадару Лынтупаў Юзафу Бішэўскаму.

У Першую сусветную вайну мястэчка было акупавана (1915–1918) кайзераўскімі войскамі. У 1918 – сярэдзіне 1920 года на кароткі час тут усталёвалася савецкая ўлада. Па Рыжскай дамове Лынтупы ўвайшлі ў склад Польшчы, сталі цэнтрам гміны ў Свянцянскім павеце Віленскага ваяводства. У 1937 годзе ў мястэчку мелася 194 двары, пражывала 1355 жыхароў.

19 верасня 1939 года Лынтупы сталі часткай БССР. З 1941 па 1944 год мястэчка знаходзілася пад нямецка-фашысцкай акупацыяй, было моцна разбурана. 19–20 мая 1942 года ў Лынтупах акупанты правялі масавыя расстрэлы мірных жыхароў. У пачатку вайны ў ваколіцах Лынтупаў дзейнічала партызанская група на чале з Ф. Маркавым, якая ў канцы 1942 года стала часткай брыгады імя К. Я. Варашылава. Мястэчка было вызвалена 6 ліпеня 1944 года часцямі 357-й стралковай дывізіі.

З 20.9.1944 г. Лынтупы ў Пастаўскім раёне Маладзечанскай вобласці. Пасля вайны ў мястэчку былі аптэка, бальніца, пачатковая школа, маслабойня, лесапільня і сталярны цэх.

З 22.8.1967 г. Лынтупы набылі статус гарадскога пасёлка. У пачатку 1990-х гадоў тут адкрылі пашывачны цэх Віцебскай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», пры саўгасе — цэх па намотцы электраматораў і трансфарматараў, у 1992 годзе — дапаможны цэх па пашыве дзіцячых куртак. У пачатку XXI стагоддзя ў Лынтупах былі аптэка, бальніца, ветэрынарны ўчастак, 2 дзіцячыя сады, спіртзавод, дом быту, лясніцтва, міліцэйскі ўчастак, 5 магазінаў, лазня, метэастанцыя, АТС, філіял ашчаднага банка, філіял ПМК-21, пажарная каманда, пошта, нафтабаза, электрастанцыя, цэх дрэваапрацоўкі, сталовая, хлебанарыхтоўчае прадпрыемства, сярэдняя школа, бібліятэка.

**3. Адметныя мясціны Лынтупаў.** У Лынтупах ёсць шэраг цікавых аб'ектаў, якія маюць гістарычную і культурную каштоўнасць.

*Сядзібна-паркавы ансамбль Бішэўскага.* Знаходзіцца ён у цэнтры мястэчка. Сфарміраваўся ў другой палове XIX – пачатку XX стагоддзя. Агульная плошча каля 20 га. Створаны ўладальнікам



Палац Ю. Бішэўскага



Палац. Пачатак XX ст.



Стаў і масток у сядзібна-паркавым комплексе Ю. Бішэўскага

маёнтка Юзафам Бішэўскім па адзіным плане. На адной восі паслядоўна размешчаны прамавугольны парадны партэр пейзажна-рэгулярнага парку (плошча 6 га), аднапралётны бутавы мост, палац, гаспадарчыя пабудовы. Водная сістэма была спланавана так, што палац апынуўся на штучным астраўку, абкружаны трыма ставамі з масткамі, гротам, альтанкай. Тэрыторыя падзелена на дзве зоны: парадную (перад палацам), якая ўключае флігель, капліцу, ставы, і гаспадарчую — некалькі аднапавярховых прамавугольных у плане мураваных будынкаў, гарэлачны бровар, піваварня, аляярня, крухмальня і іншыя. Дэндрасклад парку фарміруюць пасадкі ліпы, клёна серабрыстага і вастралістага Шведлера, дуба, елкі блакітнай, арэха шэрага (маньчжурскага), піхты сібірскай, лістоўніцы еўрапейскай, чорнай вольхі, вязу, ясакара і дэкаратыўных кустоў.

*Палац.* Пабудаваны па праекце вядомага польскага архітэктара Тадэвуша Растваро ўскага ў 1907 годзе і быў вырашаны ў стылі позняга італьянскага рэнесансу. Мураваны палац мае складаную асіметрычную аб'ёмна-

прасторавую кампазіцыю, быў багата аздоблены ляпным дэкорам. Меў пакінутую яшчэ з сярэднявечча ад ранейшых пабудоў разгалінаваную сістэму падземных хадоў. Існуе рамантычнае паданне пра гісторыю яго будаўніцтва. У час вучобы ў Парыжы малады пан Юзаф закахаўся ў сімпатычную француженку-акторку і ў запале пачуццяў прапанаваў ёй руку і сэрца. Прыгажуня паабяцала выйсці замуж, але пры ўмове, што малады чалавек пабудуе ёй шыкоўны палац. Вярнуўшыся ў Лынтупы, Бішэўскі (а ён сам быў архітэктарам) затраціў



Вежа-лядоўня



Андрэеўскі касцёл

шмат сіл і энергіі, каб у невялікім драўляным мястэчку ў атачэнні трох ставоў, якія былі выкапаны ўручную, вырас цудоўны мураваны палац з комплексам неабходных гаспадарчых пабудоў. Вакол палаца быў заложаны парк з рэдкіх кустоў і дрэў. Аднак француженкаакторка, наведаўшы Лынтупы, толькі пакруціла носікам, скептыч-



Капліца ў Раманішках

на прамовіла: «У майго бацькі лепшыя стайні!» — і з'ехала назад у Парыж. А закаханы Бішэўскі так і застаўся халасцяком.

*«Замкавая» вежа.* Пабудавана ў 1897 годзе. Ніжняя, падземная частка вежы выкарыстоўвалася ў гаспадарчых патрэбах у якасці лядоўні. Верхняя частка, да якой па ўнутранай сцяне вежы вяла вінтавая дубовая лесвіца, — у якасці альтанкі-бельведэра.

*Афіцыня.* Лічыцца самай старажытнай пабудовай ансамбля. Пабудавана ў стылі класічнага старапольскага маёнтка. Аднапавярховая пабудова з чатырохкалонным портыкам, увенчаным трохкутным шчытом.

*Павільён.* Пабудаваны ў стылі старажытнагрэцкага свяцілішча. Рад з дванаццаці калон, пастаўленых уздоўж двух бакоў, падтрымліваў антаблемент і плоскі аднасхільны дах.

*Гарэлачны бровар.* Упершыню ўспамінаецца ў матэрыялах інвентарызацыі 1591 года. У 1904 годзе з устаноўкай новага спіртаачышчальнага абсталявання перапрафіляваны ў спіртзавод. Дзейнічае па сённяшні дзень.

*Піваварня.* Час заснавання невядомы.Маюцца звесткі пра выпуск гатовай піваваранай прадукцыі ў XVI стагоддзі і матэрыяльныя знаходкі 1904 года. Засталося некалькі будынкаў канца XIX – пачатку XX стагоддзя.

*Касцёл святога Андрэя Баболі (Андрэеўскі касцёл).* Знаходзіцца на цэнтральнай плошчы мястэчка. Заснаваны на месцы старажытнага (1459) драўлянага касцёла ў 1899 годзе. Асвечаны 11 лістапада 1911 г. Беламураваны касцёл — помнік архітэктуры неабарока.

Лынтупы — адзіны населены пункт на Пастаўшчыне, дзе ёсць аж пяць брацкіх магіл часоў Другой сусветнай вайны. У дзвюх з іх пахаваныя мясцовыя жыхары, якія былі захоплены фашыстамі ў якасці закладнікаў за забойства шэфа жандармерыі Віленскай акругі Крыля і гебітскамісара Бэка партызанскай групай Ф. Маркава. Яшчэ ў дзвюх брацкіх магілах спачываюць яўрэі: у снежні 1942 фашысты знішчылі насельнікаў гета (перад вайной у Лынтупах яўрэі складалі каля траціны жыхароў). Брацкія магілы знаходзяцца на вуліцах Галубкова, Новай Будаўнічай, а таксама на паўднёвай, паўночнай і паўднёва-ўсходняй ускраінах пасёлка.

У 2007 годзе на чыгуначнай станцыі Лынтупы ўсталяваны бюст Б. Ялавецкага, арганізатара і праекціроўшчыка будаўніцтва чыгункі Новасвянцяны – Беразвечча.

У лынтупскай школе дзейнічаюць музей баявой славы 357-й стралковай ордэна Суворава дывізіі і «Беларуская хатка».

**4. Вядомыя людзі Лынтупшчыны.** У розныя гады ў Лынтупах бывалі беларускія пісьменнікі Янка Брыль, Васіль Быкаў, Іван Шамякін, Алесь Петрашкевіч. У ваколіцах Лынтупаў праходзілі здымкі фільма паводле сцэнарыя В. Быкава «Воўчая зграя».

З Лынтупамі звязана дзейнасць Баляслава Ялавецкага, землеўласніка, былога вайсковага інжынера, аднаго з ініцыятараў стварэння канстытуцыйна-каталіцкай партыі, заснавальніка «Першага таварыства пад'язных чыгуначных шляхоў» і «Руска-Бельгійскага металургічнага таварыства», дэпутата Дзяржаўнай Думы Расіі. Ён быў ініцыятарам, праекціроўшчыкам і фундатарам будаўніцтва чыгункі Новасвянцяны – Беразвечча.

Лынтупы — радзіма вядомага навукоўца, доктара геолага-мінералагічных навук Юрыя Вайцяхоўскага. Ён нарадзіўся ў 1960 годзе, закончыў Ленінградскі геалагічны інстытут, працуе ў геалагічным інстытуце Кольскага навуковага цэнтра Расійскай акадэміі навук.

За баявыя заслугі ў час Другой сусветнай вайны былая піянерважатая Лынтупскай школы Г. І. Маслоўская, разведчыца партызанскай брыгады імя Варашылава, удастоена звання Героя Савецкага Саюза. Сярод выхаванцаў Лынтупскай сярэдняй школы — доктар навук А. І. Быхавец, кандыдаты навук Н. У. Дубоўская, У. С. Масцяніца і іншыя. Доўгі час у Лынтупах жыў і працаваў Іосіф Быхавец, краязнаўца, аўтар кнігі «Лынтупы» (1993). Яго справу актыўна працягвае Алесь Гарбуль — даследчык мясцовай гісторыі, аўтар кнігі «Скарбы сівых валуноў» (2002).



Магіла Уладыслава Ігнацыя Даўгялы на могільніку ў Лынтупах

**Пытанні і заданні:**

1. Якія прыродныя асаблівасці адрозніваюць Лынтупшчыну ад іншых частак Пастаўшчыны?
2. Калі Лынтупы ўпершыню ўпамінаюцца ў пісьмовых крыніцах?
3. На які час прыпадае найбольш актыўнае развіццё мястэчка? З чым яно звязана?
4. Якія галоўныя падзеі можна выдзеліць у гісторыі Лынтупаў?
5. Якія адметныя мясціны мястэчка прываблiваюць турыстаў?
6. Жыццё якія вядомых людзей звязана з Лынтупамі?

# § 31. **Варапаева**

**1. Асаблівасці прыроды.** Варапаева — другі па велічыні населены пункт на Пастаўшчыне, мае статус аграгарадка. Гэта ж і самы вялікі чыгуначны вузел у раёне: ад яго адыходзяць у розныя бакі тры лініі — на Лынтупы, Друю і Крулеўшчызну.

Знаходзіцца ва ўсходняй частцы раёна на левым беразе ракі Заражанка. У тэктанічных адносінах займае старажытны ўстойлівы комплекс Беларускай антэклізы, які паслы ўтварэння не зведаў на сабе ніякіх значных працэсаў. У прабуранай каля Варапаева свідравіне глыбіня залягання падмурка аказалася 541 м. Падмурак складзены гранітамі і гнейсамі. Над ім пластамі залягаюць марскія адклады палеазойскай эры (кембрыйскага, ардовікскага і дэвонскага перыядаў) і водна-ледавіковыя адклады кайназойскай эры.

Менавіта ледавік аказаў найбольшы ўплыў на ўтварэнне сучаснага разнастайнага рэльефу. Лічыцца, што адна з яго магутных лопасцей рухалася на поўдзень праз мясцовасць, дзе знаходзіцца сучаснае Варапаева ў напрамку на Дунілавічы. Пасля таго, як ледавік растаў, на яго месцы ўтварылася даліна ракі і катлавіны азёр.

Варапаева знаходзіцца на мяжы паміж Свянцянскімі градамі і Дзісненскай нізінай. На захад ад Заражанкі тэрыторыя адносна выраўнена і мае вышыні 140–150 м над узроўнем мора, на ўсход характар паверхні вельмі складаны: даволі высокія ўзгоркі чаргуюцца з глыбокімі катлавінамі, якія запоўнены вадой. Таму ў ваколіцах Варапаева так многа азёр: Глыбокае, Ясюкі, Амшанае, Маскалёва, Белае, Чорнае, Зароўшына. Яны параўнальна невялікія па плошчы, але даволі глыбокія.

Рака Заражанка з'яўляецца самай доўгай ракой у Пастаўскім раёне. Каля Варапаева яна мае шырыню 10–12 метраў з глыбінямі каля 1 метра. На поўдзень ад пасёлка каля в. Алешына Заражанка запруджана і там утварылася вадасховішча, дзейнічае гідраэлектрастанцыя.



Маляўнічыя краявіды Варапеўскіх ваколіц

По даліне ракі глебы пераважна пясчаныя і супясчаныя, сустракаюцца паклады жвіру. На міжрэччах пераважаюць цяжкія глiністыя і суглінкавыя глебы, якія сфарміраваліся на ледавіковай марэне.



Рака Заражанка ў Варапаеве

На захад і ўсход ад пасёлка мясцовасць адкрытая, пераважаюць апрацаваныя палеткі з невялікімі купінамі кустоўя. У паўночна-заходнім напрамку на вялікую адлегласць цягнецца адзін з буйнейшых лясных масіваў на Пастаўшчыне — Варапаеўская Дача, які мае плошчу больш 80 км². У цэнтральнай частцы Дачы (урочышча Шурыца) пераважаюць змешаныя ялова-бярозавыя насаджэнні. На сушэйшых месцах у паўночнай і заходняй частцы месца елкі займае сасна. Ва ўрочышчы Зайцова, што ля Варапаева, сустракаюцца асіннікі. У асноўным лясы Варапаеўскай Дачы спелыя, сярэдняя вышыня дрэў 22–24 м, таўшчыня — 25–30 см. Большая часткаляснога масіву раней выкарыстоўвалася як ваенны палігон.

Вузкая паласа лесу працягнулася на поўдзень уздоўж ракі Заражанка ад Варапаева да Дунілавіч. Лясы ў ваколіцах Варапаева багатыя на дзічыну, грыбы, ягады, лекавыя травы.

**2. Гісторыя Варапаева.** Варапаева — даволі малады населены пункт: у гістарычных крыніцах упершыню сустракаецца пад 1800 годам на карце Дзісенскага (у склад якога ўваходзіла) і Вілейскага паветаў Мінскай губерні. З 1843 года — у Віленскай губерні. У 1860-я гады ў фальварку Варапаева, які здаваўся ў арэнду і ўваходзіў у маёнтак Паставы, працавалі цагельны завод, вадзяны млын з сукнавальняй і карчма (шынок). У 1896–1897 гады праз паселішча прайшла чыгунка Новасвянцяны – Беразвечча, якая дала значны штуршок для яго развіцця. У 1897 годзе ў Варапаеве былі фальварак (6 двароў, 69 жыхароў, штучны вадаём, млын, сукнавальня, крама, карчма, смалярны завод), станцыя (18 жыхароў, 2 двары), хутар (2 двары, 11 жыхароў), штучны вадаём, вузкакалейка 1-га Таварыства пад'язных пуцей, млын. Маёнтак уваходзіў у пастаўскія ўладанні Тызенгаўзаў-Пшаздзецкіх і здаваўся ў арэнду. Найбольшага росквіту зазнаў у канцы XIX – пачатку XX стагоддзя калі Канстанцінам Пшаздзецкім быў закладзены парк і пабудаваны палац.

Рупнасцю ўладальніка ў канцы XIX стагоддзя пабудаваны шкіпінарны завод, дзейнічаў цагельны завод, працаваў вадзяны млын.

З 1921 года мястэчка ўвайшло ў Пастаўскі павет Віленскага ваяводства Польшчы. Меліся лесапільны і цагельны заводы, працавалі вадзяны, паравы і электрычны млыны, лесаэксплуатацыя. Быў адбудаваны (знішчаны ў Першую сусветную вайну) графскі палац, дзе налічвалася звыш 20 пакояў, у тым ліку зала для танцаў, сабрана багатая бібліятэка, калекцыя зброі і музычных інструментаў (пасля 1939 года яна трапіла ў Мінск).

У 1923 годзе адкрыты пачатковая школа імя Ю. Пілсудскага, клуб моладзі. У 1934 годзе пабудаваны касцёл Святога Міхаіла, пры якім дзейнічаў Саюз каталіцкай моладзі (займаўся культурна-рэлігійнай дзейнасцю). У фальварку Варапаева была зімовая цяпліца, меўся плодагадавальнік (у 1931–1937 гадах тут працаваў вядомы сялекцыянер І. П. Сікора). У 1933 годзе ўладанні Пшаздзецкага наведаў прэзідэнт Польшчы Ігнацы Масціцкі, які прысутнічаў на адкрыцці вузкакалейкі Варапаева – Друя.

З 1939 года мястэчка ўвайшло ў склад БССР, знаходзілася ў Дунілавіцкім раёне Вілейскай вобласці. У 1944 годзе з Дунілавіч, якія былі моцна разбураны, у Варапаева перанесены органы

раённага кіравання: райкам КП(б)Б, райвыканкам, райаддзелы МУС і МДБ, банк, пракуратура, нарсуд, ваенкамат, рэдакцыя раённай газеты «Сцяг Сталіна». Працавалі радыёвузел, ашчадная каса, няпоўная сярэдняя школа, бальніца на 50 ложкаў, амбулаторыя, аптэка, санстанцыя, гасцініца на 20 месцаў, 5 магазінаў, дзіцячыя яслі на 20 месцаў, лазня, базар, Дом культуры з глядзельнай залай на 40 месцаў, чыгуначны вакзал. У 1950 годзе Варапаева атрымала статус пасёлка гарадскога тыпу. У ім працавалі цагельны завод (77 рабочых), мэблевая фабрыка (60), лесапільны завод (25), кавальска-слясарны цэх (6), кравецкая і шавецкая майстэрні (адпаведна 10 і 8), паравозавагонарамонтнае дэпо (100), дыстанцыя сувязі (60), лесапільны і шпалерны заводы (4 і 200), майстэрня (40 і 120 рабочых на дыстанцыі асобна), маслазавод (15), друкарня (8), хлебапякарня (12) цырульня (5), арцель «Новае жыццё» (вытворчасць пладова-агароднінных вырабаў, слабаалкагольных напіткаў, 15), меліся чайныя «Блакітны Дунай» і «Чайка». Пры МТС (працавала 10 чалавек) выдавалася газета «Бальшавіцкая праўда» (са снежня 1952 года «Ленінская праўда»). У 1956 годзе адкрыты рэстаран. У 1959 годзе на базе міжкалгаснай будаўнічай арганізацыі заснаваны завод жалезабетонных вырабаў.



Сядзіба Пшаздзецкіх Варапаева



ГЭС у в. Алешына каля Варапаева

У 1954 годзе Варапаева знаходзілася ў Маладзечанскай, а з 20.1.1960 г. у Віцебскай абласцях, спачатку ў Глыбоцкім, з 1962 г. у Пастаўскім раёнах. У 1969 годзе пражывала 4,2 тыс. жыхароў,

у 2001 — налічвалася 1024 двары, 3372 жыхары. Працуюць дрэваапрацоўчы камбінат, завод жалезабетонных вырабаў, дыстанцыя пуці Беларускай чыгункі, хлебакамбінат, участак энергасетак, аддзяленне сувязі, лясніцтва, камбінат бытавога абслугоўвання, гасцініца, тэлемайстэрня, пажарная служба, дзіцячая і дарослая бібліятэкі, музычная школа, гарадскі і заводскія дамы культуры, Варапаеўская раённая бальніца, паліклініка, дзіцячая кансультацыя, аддзяленне хуткай дапамогі, ветлячэбніца, камбінат грамадскага харчавання, у якім знаходзіцца кафэ «Вясна», кандытарскі цэх, магазін «Кулінарыя» і іншыя.

**3. Адметныя мясціны Варапаева.** З прычыны сваёй адноснай маладосці пасёлак не мае старажытных помнікаў гісторыі і культуры, аднак некаторыя яго будынкі і куточкі вартыя ўвагі. Найбольшую цікавасць выклікае сядзібна-паркавы ансамбль узвышанай левабярэжнай часткі ракі Заражанка. Ён сфарміраваны на



Касцёл святога Міхаіла Архангела



Свята-Уваскрашэнская царква



Іканастас Свята-Уваскрашэнскай царквы



Брама ў Варапаеўскі парк



Брацкая магіла ў парку



Дом упраўляючага Куркузовіча

аснове натуральнага хваёвага бору і падзяляецца на дзве часткі — паўднёвую і паўночную. Яны злучаюцца між сабой мураваным арачным мостам, які перакінуты цераз лагчыну.

У найбольш узвышанай паўднёвай частцы парку раней знаходзіўся палац Пшаздзецкага — двухпавярховы мураваны будынак, які не захаваўся. Уезды ў сядзібу размяшчаліся з двух бакоў і былі аформлены арыгінальнымі брамамі. З паўднёвага боку знаходзіліся гаспадарчыя пабудовы. Парк у Варапаеве захаваў свае асноўныя рысы і з'яўляецца самам ацалелым з усіх паркаў Пастаўшчыны.

З іншых помнікаў культуры і архітэктуры выдзяляецца дом упраўляючага Куркузовіча, касцёл святога Міхаіла Архангела і Свята-Уваскрашэнская царква. Калі дом упраўляючага пабудаваны яшчэ за «польскім часам», то храмы ўзведзены зусім нядаўна, у канцы XX стагоддзя. Касцёл святога Міхаіла Архангела будаваўся з 1993 па 1996 год. Ён размешчаны ў паўночна-заходняй частцы па-

сёлка. Узведзены на сродкі парафіян, з удзелам фундатараў і дзяржавы. Уяўляе сабой аднавежавую пабудову з цэнтральнай апсідай і дзвюма сакрысціямі. Сучасны храм нагадвае па сваіх формах ранейшы драўляны, які існаваў з 1932 па 1959 год.

Варапаеўская Свята-Уваскрашэнская царква ўзведзена ў 1992–1994 гадах. Галоўная частка царквы — васьміграннная шатровая вежа. Яна ўзвышаецца над портыкам галоўнага ўвахода. Увенчана цыбульчатападобнай галоўкай. Над будынкам узвышаюцца яшчэ тры невялікія купалы.

**4. Вядомыя людзі Варапаеўшчыны.** З Варапаевам звязана жыццё і дзейнасць шэрагу знакамітых людзей, якія ўнеслі важкі ўклад у розных галінах чалавечай дзейнасці.

У 1954 годзе ў пасёлку нарадзіўся Андрэй Зуйкоў, кандыдат сельскагаспадарчых навук, навуковы супрацоўнік Беларускага навукова-даследчага інстытута бульбаводства. Варапаева — радзіма мастака Сцяпана Катовіча. Ён нарадзіўся ў 1952 годзе, закончыў Мінскае мастацкае вучылішча, Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. Член Беларускага саюза мастакоў. Адной з яго вядомых работ з'яўляюцца вітражы на станцыі метро «Інстытут культуры» ў Мінску.

У Варапаеве вучыўся і пазней працаваў мастацкім кіраўніком раённага Дома культуры Іосіф Сушко, заслужаны работнік культуры Беларусі. Вядомасць набыў як кіраўнік Маладзечанскага народнага ансамбля песні і танца «Спадчына», з якім падрыхтаваў больш за 20 праграм.

Варапаеўская школа дала шлях у вялікую навуку Андрэю Майсяёнку, члену-карэспандэнту Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, загадчыку лабараторыі вітамінаў і каферментаў інстытута фармакалогіі і біяхіміі НАНБ, прафесару, доктару біялагічных навук.

Скончыла Варапаеўскую школу ўраджэнка в. Тузбіца паэтэса Алена Гінько, аўтарка кніг паэзіі «Самотная птушка», «Пяшчота пры журбе». У пасёлку нарадзіўся і працаваў выкладчык Варшаўскага універсітэта, даследчык Пастаўшчыны, аўтар шэрагу кніг Іосіф Зямчонак.

Званне «заслужаны настаўнік» нададзена Алене Брэскай, выкладчыцы гісторыі і грамадазнаўства Варапаеўскай сярэдняй школы, выдатніку народнай асветы.

**Пытанні і заданні:**

1. Якія асаблівасці прыроды надаюць Варапаеўшчыне своеасаблівую непаўторнасць і прывабнасць?
2. Чаму ў Варапаеве няма старажытных помнікаў?
3. Якія падзеі далі штуршок для развіцця мястэчка?
4. Якую ролю ў жыцці Варапаева адыграў род Тызенгаўзаў-Пшаздзецкіх?
5. Калі Варапаева мела статус раённага цэнтра?
6. Якія гістарычныя і культурныя аб'екты ў пасёлку выклікаюць цікавасць у турыстаў?
7. Падрыхтуй паведамленні пра вядомых людзей Варапаева.

# § 32. Дунілавічы

**1. Асаблівасці прыроды.** Дунілавічы знаходзяцца ва ўсходняй частцы Пастаўскага раёна на ўзгорках і лагчынах Свянцянскіх град каля азёр Свідна, Бледнае і па даліне ракі Заражанка. Нетры маюць двух'ярусную пабудову: на глыбіні каля 500 метраў знаходзіцца крышталічны падмурак з гранітаў і гнейсаў Беларускай антэклізы; зверху пластамі рознай таўшчыні залягаюць асадкавыя пароды рознага ўзросту. Найбольшую магутнасць маюць адклады дэвонскага перыяду палеазойскай эры. Паверхневы пласт складзены марэнай паазёрскага ледавіка. Лічыцца, што адна з яго магутных лопасцей рухалася на поўдзень праз мясцовасць, дзе знаходзяцца сучасныя Дунілавічы. Пасля таго, як ледавік растаў, на яго месцы ўтварылася даліна ракі і катлавіны азёр. Абапал Заражанкі рэльеф вельмі складаны з вялікай колькасцю камавых узгоркаў і глыбокімі рэчышчамі ручаёў. Тэрыторыя на захад ад мястэчка абвешчана ландшафтным геамарфалагічным заказнікам «Карагач». Сярэднія вышыні мясцовасці вагаюцца ад 145–147 метраў над узроўнем мора на ўрэзе вады каля азёр, да 170–190 м на вышэйшых узгорках.

Кліматам Дунілавічы мала чым адрозніваюцца ад іншых паселішчаў Пастаўшчыны. Тут менш выпадае ападкаў (600–650 мм) і цяплей летам, чым на Лынтупшчыне.

Праз Дунілавічы працякае рака Заражанка, якая ў ніжнім цячэнні называецца Галбяіца. Яна — самая доўгая ў Пастаўскім

раёне. У вярхоўях рэчка мае звілістае рэчышча, прымае шмат прытокаў: ручаёў, каналаў, рэчку Смычыцу. Ніжэй Дунілавічаў шырыня Заражанкі павялічваецца да 12 м пры сярэдняй глыбіні 0,7 м. Пашырэнне і нязначнае спрамленне рэчышча адбылося дзякуючы шэрагу запруд у в. Алешына, г. п. Варапаева, в. Кейзікі. Шырыня даліны 50–150 м.

На ўсходняй ускраіне паселішча знаходзіцца возера Свідна. Гэта даволі вялікі вадаём плошчай 0,97 км$^2$ і найбольшай глыбінёй 11,6 м. Дно да глыбіні 3–5 м пясчанае, ніжэй выслана ілам. Шырыня паласы раслiннасці 50–75 м. На паўднёвым захадзе з возера выцякае ручай у р. Заражанка.

Амаль у 5 разоў меншае па плошчы возера Бледнае, што ляжыць з паўднёвага боку мястэчка. Яно мае глыбіню да 11 метраў і моцна зарастае з берагоў.

Вакол Дунілавічаў лясоў няма, толькі на поўдзень ад мястэчка за вёскай Пятровічы шырокай паласой цягнецца вялікі лясны масіў, на ўскрайку якога ляжыць прыгожае возера Баравое. У лясах, пераважна саснова-яловых, многа ягад, грыбоў; водзіцца шмат птушак і звяроў.

**2. Гісторыя Дунілавічаў.** Сучасныя Дунілавічы першапачаткова мелі назву Данілавічы, Дунілаўскае. Да першага Усерасійскага перапісу насельніцтва 1897 года некаторыя геаграфічныя назвы не мелі цвёрда ўсталяваных правапісаў. У ходзе той кампаніі перавага была аддадзена «Дунілавічам».

Паселішча належыць да самых старых рэзідэнцый колішняга Вялікага Княства Літоўскага. Упершыню ўпамінаецца ў 1473 годзе як уладанне князя Аляксандра Юр'евіча Гальшанскага. Тады Данілавічы насялялі сяляне-даннікі, якія плацілі даніну мёдам. Пасля смерці А. Ю. Гальшанскага ў 1511 годзе Данілавічы перайшлі да яго сына Паўла. У 1551 годзе пасля смерці Паўла Гальшанскага, біскупа віленскага, Данілавічы перайшлі па завяшчанні ва ўладанне польскага караля Сігізмунда Аўгуста. Пад 1556 годам Данілавічы ўпамінаюцца як мястэчка; уваходзілі ў Ашмянскі павет Віленскага ваяводства. Вялікі князь ВКЛ Жыгімонт II Аўгуст падараваў іх Мікалаю Крыштофу Радзівілу, які валодаў Данілавічамі ў 1567–1577 гадах. У 1617 годзе Альбрэхт Радзівіл прадаў Яну Ісайкоўскаму-Далмату «местечко Дуниловичи, волок оседлых 28,



Амбар у Дунілавічах. XIX ст.



Палац Тышкевічаў у Крыкалах. Пасля рэканструкцыі 1914 г.



Пахаванні польскіх жаўнераў



Стары касцёл у Дунілавічах

плацов и огородов 139, в том местечке костёл католический, ещё не имевший фундуша, и церковь русская». У 1624 годзе гаспадар заснаваў у Данілавічах драўляны касцёл у гонар Св. Пятра і Паўла. Потым мястэчка перайшло ў спадчыну да сына Караля, а пасля яго смерці ў 1640 годзе — дачцэ апошняга — Альжбеце, жонцы спачатку Крыштофа Рудаміны-Дусяцкага, потым Крыштофа Белазора. Апошні разам з жонкай заснаваў у Данілавічах мураваны касцёл (1624) і дамініканскі кляштар (1683); на іх месцы ў 1769–1773 гадах пабудаваны велічны Траецкі касцёл. Потым

Дунілавічамі валодалі Бжастоўскія, Янішэўскія, Тышкевічы. У час 2-га падзелу Рэчы Паспалітай у 1793 годзе мястэчка было далучана да Расійскай імперыі, увайшло ў Вілейскі павет Мінскай губерні, з 1843 года — у Віленскай губерні.

Пасля рэформы 1861 года Дунілавічы — цэнтр воласці. У гэтым жа годзе касцёл Святой Тройцы перароблены ў царкву.

У 1866 г. у Дунілавічах налічвалася 106 двароў, 691 жыхар. З 1886 года мястэчка стала цэнтрам Дунілавіцкай воласці Вілейскага павета, у якім мелася праваслаўная царква, касцёл, 2 малітоўныя яўрэйскія дамы, народнае вучылішча, 8 крам, 4 карчмы, вадзяны млын з сукнавальняй, кірмашы 6 студзеня і 1 кастрычніка, базары ў нядзелю.

У 1905 годзе Дунілавічы складаліся з маёнтка (74 жыхары), мястэчка (1400 жыхароў), касцельнай сядзібы (10 жыхароў). Мелася камера судовага следчага, урачэбны ўчастак, з 1892 года працаваў прыёмны пакой на 2 ложкі. Таксама тут знаходзіўся старшы ўраднік, валаснае і мяшчанскае праўленні, крама. У 1909 годзе 29 двароў, 57 сямей, 230 жыхароў.

З 1921 года знаходзілася ў складзе Польшчы, было цэнтрам Дунілавіцкага павета ў Навагрудскім, а з 1922 года ў Віленскім ваяводствах. У 1920-я гады ў мястэчку працавалі лесапільны і цагельны заводы, млын, кузня, піларама. Былі наладжаны вытворчасць дываноў, пашыў жаночага адзення, шапак, выраб скур, дзейнічалі ткацкі цэх, фарбавальня, гадзіннікавая майстэрня. Меліся вышэйшая яўрэйская і агульнаадукацыйная школы, касцёл, 3 сінагогі, кнігарня, пераплётная, банкі, амбулаторыя, аптэка, ламбард, гасцініца і іншыя ўстановы. Практыкаваў адвакат, натарыус, судовы выканаўца, дантыст, ветэрынар. Былі рэстаран, кулінарыя, чарачная, піўная, кааператыўны гандаль коньмі, спажывецкімі таварамі, абутковая і швейная майстэрні. Працавалі землямеры, шаўцы, сталяры, слесары, муляры. Буйнейшым зямельным уладальнікам быў граф Юзаф Тышкевіч (1064 дзесяціны зямлі).

Увайшоўшы ў склад БССР (1939), Дунілавічы сталі цэнтрам раёна Вілейскай вобласці. У час Другой сусветнай вайны з 1941 па 1944 год мястэчка знаходзілася пад нямецка-фашысцкай акупацыяй. 21 лістапада 1942 года пачаўся масавы расстрэл яўрэяў. За тры дні фашыстамі было расстраляна 828 чалавек яўрэяў з тых 903, што знаходзіліся ў гета.

Пасля пераносу ў 1950 годзе цэнтра Дунілавіцкага раёна ў Варапаева Дунілавічы сталі цэнтрам сельсавета. З 1962 года ўваходзіць у склад Пастаўскага раёна.

У 1971 годзе было 246 двароў, 781 жыхар, цэнтр калгаса «XXV партз'езд», сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, паліклініка, аптэка, ветэрынарны пункт, аддзяленне сувязі, лясніцтва, сталовая, 3 магазіны, камбінат бытавога абслугоўвання.

У 2001 годзе 322 двары, 785 жыхароў, праўленне калгаса «XXV партз'езд», сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, участковая бальніца, лясніцтва, пошта, магазіны, дзіцячы сад.

**3. Адметныя мясціны Дунілавічаў.** У сучасным вобліку вёскі дамінуе велічны Траецкі касцёл. Гэта агромісты храм, які размешчаны ў цэнтры паселішча, уяўляе сабой трохнефавую двухвежавую базіліку з трансептам і хорамі над прытворам. Пабудаваны ён у 1769–1773 гадах з цэглы каля двухпавярховага мураванага кляштара дамінікан, які не збярогся. Да яго тут стаяў драўляны касцёл, заснаваны ў 1683 годзе па фундацыі Лізаветы Белазор. Насупраць быў пастаўлены драўляны касцёл, які згарэў у 1890 годзе і не быў адноўлены.



Троіцкі касцёл

Траецкі касцёл шмат пацярпеў. Пасля Другой сусветнай вайны быў зачынены і фактычна разрабаваны — да канца 80-х гадоў, калі яго вярнулі вернікам, заставаліся трываць толькі сцены. Зараз касцёл адноўлены.



Касцельная брама



Інтэр’ер Троіцкага касцёла



Грабніца Длужнеўскіх

Насупраць храма, на ўзгорку, знаходзіцца могільнік, дзе пахаваны вайскоўцы польскай арміі 36-га палка Легіі Акадэміцкай, якія загінулі ў баях з Чырвонай Арміяй Тухачэўскага ў 1920 годзе ў ваколіцах вёскі.

Наогул у Дунілавічах маецца 7 некропаляў і помнік 34 землякам, якія загінулі ў Другую сусветную вайну. На вясковых могілках можна сустрэць старыя пахаванні з арыгінальнымі мастацкімі надмагіллямі; знаходзіцца там і адзіная на Пастаўшчыне грабніца-усыпальніца ўладальнікаў Рудкі — Длужнеўскіх.

Да Другой сусветнай вайны ў мястэчку пражывала шмат яўрэяў, таму на заходнім ускрайку Дунілавічаў знаходзіцца вялікі могільнік, дзе пахаваны прадстаўнікі гэтага народа. У апошнюю вайну ў мястэчку было ўтворана гета. У лістападзе 1942 года пачаўся масавы расстрэл яўрэяў. За тры дні фашысты расстралялі 828 чалавек. Магіла вязняў гета знаходзіцца на адлегласці 1 км на захад ад вёскі.

Побач з Дунілавічамі, на левым беразе ракі Заражанка, раскінуўся Крыкалаўскі парк. Ён быў спланаваны ў пейзажным стылі на схілах сямі ўзгоркаў, якія раздзяляюцца глыбокімі лагчынамі. Кампазіцыя грунтуецца на эфекце паслядоўнай змены шэрагу маляўнічых курцін (участкаў зямлі, на якіх расце адна парода дрэў) і перспектывамі краявідаў. Каляровую палітру на мясцовасці ствараюць папуляцыі клёну, ясеню, вяза, вольхі, лістоўніцы, асіны. Парк быў моцна пашкоджаны ў час Першай

сусветнай вайны, не даглядаўся і моцна здзічэў.

Да 1914 года ў Крыкалах знаходзіўся прыгожы каменны аднапавярховы палац, пабудаваны ў класічным стылі. Перад вайной графам Тышкевічам праводзілася яго карэнная рэканструкцыя. Аднак справа не была закончана. У час вайны работнікі фальварка ў запале барацьбы з эксплуататарамі спалілі сядзібны комплекс разам з паненкамі, якія ў ім знаходзіліся. Зараз на месцы маёнтка засталіся толькі некаторыя фрагменты гаспадарчых пабудоў.




Вокладка кнігі І. Зямчонка «Данілавічы»

У парку ёсць і яшчэ адна прываблівая рэліквія: гэта Чортаў камень — вялізны валун у рост чалавека формай падобны на сэрца. З аднаго боку ён быў пляскаты і меў нейкія таямнічыя знакі. Паводле легенды, на гэтым камені граф-чараўнік, які ўмеў замаўляць змей, гуляў у карты з Чортам.

На поўнач ад Дунілавічаў у вёсачцы Ясеневічы знаходзілася яшчэ адна шляхецкая сядзіба. Належала яна доўгі час Янішэўскім, пасля была выкуплена Неліповічам. Гэта быў вялікі аднапавярховы дом з ганкам на дзве пары калон. З боку Дунілавіч у двор вяла вялікая каштанавая алея, у пачатку якой знаходзілася драўляная капліца. Сядзібны дом захаваўся да нашых часоў.

**4. Вядомыя людзі Дунілавічаў.** Мястэчка з'яўляецца радзімай вядомых удзельніц рэвалюцыйных падзей пачатку XX стагоддзя сясцёр Любові і Іды Аксельрод.

Аксельрод Любоў (Эмтэр) (літ. псеўданім Артадокс) (1868–05.02.1946) атрымала вышэйшую адукацыю ў Бернскім універсітэце, там жа абараніла дысертацыю. Працавала над пытаннямі філасофіі і літаратуразнаўства, прымала актыўны ўдзел у рэвалюцыйным руху ў меншавіцкай фракцыі РСДРП. Аўтар кніг «Філасофскія нарысы» (1906), «У абарону дыялектычнага ма-

тэрыялізму. Супраць схаластыкі» (1928), «Ідэалістычная дыялектыка Гегеля і матэрыялістычная дыялектыка Маркса» (1934).

Аксельрод Іда атрымала вышэйшую адукацыю таксама ў Бернскім універсітэце, абараніла дысертацыю. Працавала над пытаннямі філасофіі і літаратуразнаўства, прымала актыўны ўдзел у рэвалюцыйным руху. Была загадчыцай літаратурнай часткі бернскага выдання «Бернер Тагвах». Аўтар кнігі «Готфрыд Келлер: Літаратурна-крытычныя артыкулы» (1923).

Ураджэнцам Дунілавічаў з'яўляўся каталіцкі святар, удзельнік беларускага хрысціянскага руху Дзяніс Малец (1909–?). Служыў вікарыем у горадзе Бельск-Падляскі на Беласточчыне, у Пінскім кафедральным саборы. У гады Другой сусветнай вайны прымаў удзел у беларускім нацыянальна-рэлігійным жыцці. У якасці ганаровага госця прысутнічаў на канферэнцыі школьных інспектараў у Мінску (15.12.1941), дзе быў арыштаваны нямецкай тайнай паліцыяй. Дата, месца і акалічнасці смерці застаюцца невядомымі.

Знакамітымі людзьмі ў Дунілавічах з'яўляюцца Бульбяновы. Аляксандр Васільевіч Бульбяноў, старшыня калгаса «Светлы шлях», адным з першых на Пастаўшчыне быў узнагароджаны за сваю працу ордэнам Леніна. Васілю Аляксандравічу Бульбянову, дырэктару Дунілавіцкай сярэдняй школы, у 2001 годзе прысвоена ганаровае званне «заслужаны настаўнік».

**Сведчаць дакументы**:

З дзённіка імператара Мікалая II:

*«7-го февраля. Воскресенье. 1916 г.*

*К 10 час. поезд подошел к станции Селавино, где встретили Эверт и Литвинов при поч. карауле от 7-го Сибирского каз. полка. Поехал с Фредерикс[ом] в закрытом моторе по занесенной снегом тяжелой дороге к месту смотра в 37 верстах. Участвовал весь 1-й Сибирский корпус и по полку представителей от 1-го и 34-го арм. корпусов. Все части прошли церем. марш. отлично; сибирцы только три недели в резерве на отдыхе. Радовался ужасно увидеть своих сибирских стрелков и свою роту в поч. карауле у штаба 1-й Сиб. стр. дивизии в м. Дуниловичи. Там в доме гр. Тышкевичей угостили хорошим завтраком. Около четырех час. собрался в обратный путь. Бросало неимоверно в моторе, радовался попасть в поезд. Уехал в 6 1/2 ч. через Полоцк на Двинск и т. д. Вечером поиграл в домино».*

**Пытанні і заданні:**

1. Вызнач важнейшыя асаблівасці прыроды ваколіц Дунілавічаў.
2. Якім знакамітым шляхецкім родам належалі Дунілавічы?
3. Храмы якіх канфесій існавалі ў мінулыя часы ў мястэчку?
4. Якая трагедыя напаткала жыхароў мястэчка ў час Другой сусветнай вайны?
5. Якія падзеі прымусілі расійскага імператара Мікалая II наведаць Дунілавічы?
6. Параўнай колькасць двароў і жыхароў у 1971 і 2001 годзе? Якія высновы можна зрабіць?
7. Якія помнікі гісторыі і культуры могуць прывабіць турыстаў у Дунілавічах і яе ваколіцах?
8. Жыццё якіх вядомых людзей звязана з Дунілавічамі?

# § 33. **Камаі**

**1. Асаблівасці прыроды.** Камаі знаходзяцца ў маляўнічай мясцовасці на берагах Вялікага і Малога Камайскіх азёр. Цэнтральная частка займае высокае ўзвышша на адным з узгоркаў Свянцянскіх град. Будова зямной кары ў ваколіцах паселішча даволі простая: на глыбіні каля 570 метраў залягае крышталічны падмурак з гранітаў і гнейсаў, а вышэй — асадкавыя пароды рознага ўзросту, пераважна палеазойскай эры (кембрыйскага, ардовікскага, дэвонскага перыядаў). Зверху яны перакрыты марэннымі адкладамі апошняга паазёрскага ледавіка, дзейнасць якога і ўтварыла высокія ўзгоркі і глыбокія катлавіны, у якіх ляжаць Камайскія азёры. Сярэдняя вышыня паверхні над узроўнем Балтыйскага мора мае адзнакі каля 200 метраў, што на 40 м вышэй, чым Паставы. Па гэтай прычыне ў Камаях некалькі халадней і больш выпадае ападкаў, чым у райцэнтры.

Камайскія азёры ўтварыліся ў месцы, дзе ў целе ледавіка былі прамыіны і вада, падаючы з вышыні, выбівала ў мёрзлым грунце паглыбленні. У Вялікім Камайскім возеры выяўлена 4 замкнёныя катлавіны з глыбінямі ад 8 да 22 метраў. Дно вадаёма пясчанае, глыбей 2 метраў выслана ілам. Чацвёртая частка воднай паверхні

занята раслiннасцю, шырыня паласы — 5–30 метраў. Катлавiна возера ляжыць нiжэй навакольнай мясцовасцi на 9–14 метраў.

Малое Камайскае возера, маючы зусiм невялiкую плошчу (0,05 км$^2$), таксама выдзяляецца сваёй глыбiнёй, якая дасягае 12,2 м. Схiлы катлавiны маюць вышыню да 15 метраў. На мелкаводдзях возера моцна зарастае.

Глебы ў ваколiцах Камай у асноўным цяжкiя глiнiстыя i суглiнкавыя, хоць месцамi сустракаюцца глебы пясчаныя i супясчаныя. Дзейнасць чалавека прывяла да таго, што вакол азёр землi разараны i ператвораны ў палеткi. З поўначы i з поўдня ад паселiшча раскiнуўся даволi вялiкi лясны масiў «лес Камаi», у якiм асноўныя пароды дрэў — елка, асiна, бяроза. Некаторыя ўчасткi лесу забалочаны.

**2. Паходжанне назвы.** Iснуе некалькi версiй паходжання назвы Камаi. Адна з iх выводзiць найменне ад лiтоўскага «kamanas», што азначае «аброць», i пацвярджае гэта легендай: у старажытныя часы якiсьцi вершнiк, ратуючыся на канi праз возера так моцна нацягнуў лейцы, што яны парвалiся. З гэтай прычыны ў возеры i затанулi вершнiк, конь i аброць.




Пячатка Пятра Рудамiны Дусяцкага

Другая версiя звязвае паходжанне назвы з фiнскiм словам «kamai», што азначае «хлам», «буралом». Вельмi верагодна, што рака Камайка, якая мае i зараз даволi хуткае цячэнне, пракладаючы шлях памiж стромкiх узгоркаў Свянцянскiх град, у часы паводак магла моцна падмываць берагi i абрушваць грунты з дрэвамi ў рэчышча. Мясцовыя жыхары прыгадваюць, што ў даваенны



На плошчы ў Камаях. 1950–60-я гг.




Вокладка рукапіснага летапісу Камайскага касцёла

час у рацэ знаходзіліся 12-ціметровыя ствалы моранага дуба-тапельца.

Аднак найбольш верагоднай падаецца іншая версія. Калі зрабіць дапушчэнне, што назва мае старажытную гісторыю і засяленне гэтай мясцовасці ішло па рэках з нізоўяў у вярхоўі, то трэба прызнаць, што аснова ўсіх прыведзеных назваў «кам» першапачаткова адносілася да ракі. У гэтым выпадку фіна-вугорскія мовы даюць зразумелае тлумачэнне: «кам» — «рака», «плынь» (удм.). Можна прыгадаць назву ракі Кама, прытока Волгі. Такім чынам, атрымліваецца лагічная схема назваў : рака Кама — возера Камай — азёры Камаі (мн. лік) — вёска Камаі — азёры Камайскія — рэчка Камайка.

**3. Гісторыя вёскі.** Гісторыя вёскі сваімі каранямі заходзіць у далёкае мінулае. Узнікла яна на высокім узгорку на беразе Малога Камайскага возера у першым тысячагоддзі нашай эры. Першымі насельнікамі паселішча былі прадстаўнікі фіна-угорскіх плямёнаў, якія і пакінулі пасля сябе назву вёскі. Упершыню Камаі ўпамінаюцца ў пачатку



Касцёл Яна Хрысціцеля



Інтэр’ер касцёла Яна Хрысціцеля

XVI стагоддзя як уладанне Глеба Юр'евіча Пронскага. Пасля яго гібелі ў 1513 годзе ў бітве з татарамі пад Менскам вёскай валодала яго ўдава, а з 1533 года яго сыны Андрэй і Фрыдрых (Сямён), якія прыняў каталіцтва, займаў відныя дзяржаўныя пасады. Магчыма, па яго распараджэнні і быў пабудаваны драўляны касцёл. Пасля смерці Фрыдрыха (1555), кіеўскага ваяводы, уладальнікам Камаяў з 1572 года стаў яго сын Аляксандр. Ён распрадаў большасць сваіх маёнткаў, у тым ліку і Камаі, якія дасталіся Тамашу Рудаміну-Дусяцкаму, а з 1592 года браслаўскаму войскаму Яну Рудаміну-Дусяцкаму. Тады яны ўжо ўпамінаюцца як мястэчка, тут працуюць саматужныя майстэрні, ладзяцца кірмашы.

Вясной 1602 года ўспыхнула эпідэмія, шмат людзей вымерла. У гэты час здарыўся неўраджай, пачаўся вялікі голад. Магчыма, гэта і паслужыла прычынай звароту людзей да Бога. У 1603 годзе Ян Рудаміна-Дусяцкі распачаў будаўніцтва чатырохвежавага касцёла-крэпасці. Ён ахвяраваў многа багацця, выдзеліў 30 коп грошаў з двара Камаі і па 3 грошы з падуладных вёсак, падарыў дом з «пляцоўкай» для спеваў, доступ да камайскага возера. Рудаміны-Дусяцкія валодалі вёскай да 1721 года. Пазней паселішча належала Сулістроўскім і Чаховічам.



Касцёл у Камаях. Схема



Камайскі крыж



Капліца Чаховічаў у Мягунах

У 1690 годзе Камаі ўваходзілі ў Ашмянскі павет; было 130 дымоў. З 1795 года вёска ў час 3-га падзелу Рэчы Паспалітай увайшла ў склад Расійскай імперыі. У 1847 годзе тут існавала яўрэйская абшчына (199 душ). У 1873 годзе мястэчка Камаі стала цэнтрам воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні, у якім налічвалася 134 рэвізскія душы.

У 1861 годзе маёнтак належаў Танскаму. Жыхары Камаяў прымалі актыўны ўдзел у паўстанні 1863–1864 гадоў. Паўстанцкі грамадскі начальнік Свянцянскага павета Апалінарый Танскі забяспечваў паўстанцаў грашыма, а ў яго маёнтках Камаі і Бежаны нарыхтоўвалася харчаванне. Танскі быў арыштаваны царскімі ўладамі і высланы на пасяленне ў Пензенскую губерню.

У сярэдзіне 1880-х гадоў Камаі — маёнтак і мястэчка, дзе пражывала 366 жыхароў у 50 дварах. Быў касцёл, яўрэйская малітоўная школа, шпіталь, 4 крамы, карчма, вінны бровар, млын, праводзілася 8 кірмашоў у год. У 1897 годзе. існавала вучылішча.

З 1921 года Камаі сталі цэнтрам гміны Свянцянскага павета Віленскага ваяводства. У 1937 годзе ў маёнтку было 4 двары, 93 жыхары, а ў мястэчку — 79 двароў, 485 жыхароў. Пасля ўключэння ў 1939 годзе ў склад БССР вёска была цэнтрам сельсавета ў Гадуцішскім, а потым у Пастаўскім раёнах.

У 1971 годзе ў Камаях пражывала 432 жыхары, было 164 дамы, сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, бальніца, аптэка, дзіцячы сад, 2 магазіны, сепаратарны пункт, млын, швейная майстэрня, ветэрынарны пункт, аддзяленне сувязі, сталовая. У пачатку XXI стагоддзя ужо было 294 двары, 779 жыхароў. У Камаях размяшчалася праўленне калгаса «Дружба», сярэдняя школа, дзіцячы сад, Дом культуры, бібліятэка, пошта, 2 магазіны, лясніцтва, участковая бальніца.

**4. Адметныя мясціны Камаяў.** Самымі адметнымі аб'ектамі ў Камаях з'яўляюцца мураваны касцёл і вялікі каменны крыж. Абарончы касцёл Яна Хрысціцеля быў пабудаваны ў 1603–1606 гадах з фундацыі Яна Рудаміны-Дусяцкага, які ахвяраваў на будоўлю шмат сваіх багаццяў. Храм размяшчаецца ў цэнтры вёскі на колішняй гандлёвай плошчы на высокім узгорку. Ён уяўляе сабой помнік архітэктуры абарончa-культавага дойлідства з рысамі стыляў готыкі, рэнесансу, барока. Знешні выгляд касцёла даволі суровы, пазбаўлены дэкаратыўных элементаў. З захаду храм мае дзве вялікія магутныя цыліндрычныя вежы з ярусамі разнастайных байніц, якія абаранялі ўваход у касцёл. Яны арганічна звязаны з галоўным корпусам будынка і маюць дыяметр каля 6 метраў і вышыню 16 метраў. Шарападобныя праёмы байніц дазвалялі мець вельмі шырокі спектр абстрэлу. Сляды яшчэ дзвюх вежаў з боку алтара сведчаць пра тое, што касцёл першапачаткова быў чатырохвежавы. Сцены маюць таўшчыню каля 2 метраў. У некаторых месцах у сценах знаходзяцца каменныя ядры. Яны спецыяльна былі ўмураваны ў 1661 годзе па загаду фундатара касцёла Пятра Рудаміны, як напамін пра абстрэл вежаў храма шведскімі гарматамі ў 1655 годзе: тады, у час Лівонскай вайны, аблогу ў касцёле трымалі рускія войскі.

Унутраная прастора храма падзяляецца на асноўную залу і капліцу, якія злучаны мураванымі лесвіцамі. Да сённяшняга дня зберагліся арганы XVII–XVIII стагоддзяў, аздобленыя разьбой і скульптурай, а таксама чатыры драўляныя алтары. У цэнтры знаходзіцца алтарны абраз «Маці Боская з Дзіцём» XVII стагоддзя у сярэбраным чаканным абкладзе. Яго яшчэ называюць «Мадонна смутку» і «Смутная мадонна». Абраз лічыцца цудадзейным.

Размалёўку касцёла выконваў вядомы мастак з маёнтка Каралінова Альфрэд Ромэр. Тут жа, у храме, знаходзіцца і ягоны выдатны жывапісны твор «Хрыстос і сірата» (1896). Палатно, на якім намаляваны Ісус Хрыстос, да сэрца якога з адданасцю і часова набытым супакоем туліцца бедны вясковы хлопчык, узрушвае сваёй узвышанай суровасцю, простым і ў той жа час глыбокім філасофскім зместам. Твор стаў апошняй працай А. Ромэра, бо праз тры месяцы пасля яго напісання ён памёр.

У падзямеллі знаходзяцца шматлікія пахаванні з надпісамі на каменных плітах.

Мясцовае паданне гаворыць пра тое, што з касцёла ў розныя бакі адыходзіла некалькі падземных хадоў. Адзін з іх вёў да плябаніі і далей уніз да зарастаючага азярца і да палаца Чаховіча. Другі падземны ход быццам бы выходзіў на старых могілках каля возера Малое Камайскае.

Другой адметнай асаблівасцю вёскі з'яўляецца вялікі каменны крыж. Месціцца ён у самым цэнтры паселішча за 30 метраў на захад ад касцёла Яна Хрысціцеля ля былой мястэчковай плошчы. Крыж мае ўнушальныя памеры: вышыня — 2,5 м, шырыня ўнізе — 0,7 м, таўшчыня — 0,6 м, шырыня па гарызантальнай папярэчыне — 1,88 м. Вертыкальная частка крыжа мае чатырохгранную форму. У сярэдкрыжжы — трохкутная ніша для распяцця памерамі 36×56×10 см. Пад ёй знаходзяцца чатыры рады ледзь прыкметных знакаў. Ніжэй іх высечана кола дыяметрам каля 9 см, пад якім маецца знак у выглядзе парасона. Над нішай захаваліся літары і лічбы «R 1803». На паўночным баку крыжа ніжэй папярэчыны захавалася літара «B».

Высечаны крыж з вялікага валуна ружовага граніту рапаківі, які, верагодна, быў прынесены сюды ў час апошняга зледзянення (20–17 тыс. гадоў таму) са Скандынавіі.

Дакладная дата ўстаноўкі крыжа невядома. Ёсць тры версіі: XV–XVI стагоддзі, 1603–1606 гады, 1803 год. Верагодна, крыж усё ж такі створаны значна раней XIX стагоддзя, бо дужа архаічна выглядае ён побач з касцёлам і ў параўнанні з падобнымі помнікамі таго часу. У адным з паданняў гаворыцца пра тое, што даўным-даўно паляўнічыя натрапілі на беразе возера сярод дрымучага лесу на закінутую крэпасць, на дзядзінцы якой стаяла вялікая, на два чалавечыя росты, каменная баба. Вельмі можа быць, што ў час хрысціянізацыі краю паганскі ідал-«баба» быў перароблены ў крыж.

Існуе і яшчэ адно паданне. *Калісьці даўно на месцы каменнага крыжа стаяў касцёл. У час аднаго з чарговых нашэсцяў ворагаў на гэту зямлю мясцовыя людзі схаваліся ў храме. Заваёўнікі ўзялі касцёл у аблогу і пачалі штурм. Мужна бараніліся жыхары, але сілы былі няроўныя. І калі ворагі ўжо былі гатовыя ўварвацца пад сутарэнні храма, абаронцы палі на калені і пачалі разам маліцца — прасіць у Бога паратунку. Раптам нетры разышліся і касцёл праваліўся пад зямлю. На паверхні застаўся толькі купальны крыж, які акамянеў і захаваўся да цяперашняга часу.*

**5. Вядомыя людзі Камайшчыны.** З Камаямі звязана жыццё і дзейнасць некаторых знакамітых людзей. У пачатку XX стагоддзя (1915) у мясцовым касцёле пачынаў як вікарый сваю душпастырскую дзейнасць Казімір Сваяк (Канстанцін Стаповіч) — рэлігійны і культурна-асветны дзеяч, адзін з ідэолагаў і пачынальнікаў беларускага хрысціянскага руху, паэт і публіцыст, які падрыхтаваў і выдаў зборнік вершаў «Мая ліра» і малітоўнік для беларусаў-католікаў. У 1893 годзе ў Камаях нарадзіўся і жыў да 14 гадоў вядомы музыкант і прапагандыст музыкі, арганіст-віртуоз, педагог і рэктар, пачынальнік і арганізатар сусветных фестываляў арганнай музыкі Браніслаў Рудкоўскі. Тут жа ў 1932 годзе нарадзіўся і вырас гісторык, географ, філолаг, лаўрэат дзяржаўнай прэміі БССР (1976), сааўтар шматлікіх энцыклапедый, ініцыятар стварэння і галоўны рэдактар часопіса татар-мусульман «Байрам», аўтар гімна беларускіх татар Якуб Якубоўскі. Камайская зямля з'яўляецца радзімай доктара філалогіі, даследчыка творчасці Алеся Гаруна, аўтара грунтоўных кніг-даследванняў «Беларуская філасофская думка XX стагоддзя» і «Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя» Юрася Гарбінскага. У Камайскай школе вучыўся адзін з вядомейшых краязнаўцаў, нястомны шукальнік даўніны на абсягах Пастаўскага і Мядзельскага раёнаў, аўтар шматлікіх публікацый пра мінулае тутэйшых мясцін Іван Драўніцкі. Зараз у Камаях жыве вядомы беларускі літаратар, паэт і празаік, аўтар тэкстаў шэрагу папулярных песень Аркадзь Нафрановіч.

**Пытанні і заданні:**

1. Якія асаблівасці прыроды надаюць Камайшчыне своеасаблівую адметнасць?
2. Якія існуюць версіі паходжання назвы паселішча?
3. Якія гістарычныя падзеі звязаны з Камаямі?
4. Прадстаўнікі якіх шляхецкіх родаў валодалі Камаямі?
5. Якія камайскія легенды ты ведаеш?
6. Якія гістарычныя і культурныя аб'екты ў пасёлку выклікаюць цікавасць у турыстаў?
7. Падрыхтуй паведамленні пра вядомых людзей Камаяў.

# § 34. **Парыж-Асінагарадок**

**1. Асаблівасці прыроды.** Ва ўсходняй частцы Пастаўскага раёна знаходзяцца тры населеныя пункты, якія зараз фактычна зліліся ў адзін. Гэта Асінагарадок, Парыж і Навадруцк. Размясціліся яны паўколам каля даліны ракі Дубаўка, займаючы вышэйшыя і больш прыдатныя для жыцця месцы.

Геалагічная будова мясцовасці мала адрозніваецца ад іншых частак Пастаўшчыны: на гранітна-гнейсавым крышталічным падмурку пластамі залягаюць марскія асадкавыя пароды палеазойскай эры, пераважна дэвонскага перыяду. Толькі тоўшча іх тут найменшая ў раёне — каля 520–540 метраў. Геалагічная структура — Беларуская антэкліза.



Асінагарадок на карце XIX ст.

У мезазойскую і кайназойскую эры ўсходняя частка Пастаўшчыны была сушай, таму асадкавыя пароды не назапашваліся. Ледавіковыя нашэсці, асабліва апошні паазёрскі ледавік, перакрылі ранейшыя адклады марэннымі тоўшчамі, у якіх пераважаюць глiністыя часціцы. Пазней водныя патокі размылі частку марэны, утварыўшы водна-ледавіковыя пясчана-жвіровыя наносы.

Мясцовасць знаходзіцца на паўночным ускрайку Свянцянскіх град. Сярэдняя вышыня тут каля 140 метраў над узроўнем Балтыйскага мора. Гарадзішча ў Асінагарадку, на якім знаходзіцца царква, мае адзнаку 153,2 м, узровень вады ў рацэ Ласіца — каля 137 метраў. Складаны рэльеф у ваколіцах паселішчаў стварыла ў асноўным рака Дубаўка, якая за доўгі час урэзалася ў горныя пароды, выпрацаваўшы даволі глыбокую і месцамі шырокую даліну.

Вялікіх азёр паблізу паселішчаў няма. Толькі за 2 км на паўночны захад ад Асінагарадка ляжыць возера Ласіца. Яно мелкаводнае. Пры плошчы 0,46 км$^2$ вадаём мае максімальную глыбіню ўсяго 3,8 м. Асабліваю пекнату яму надае невялічкі (0,2 га) астравок у цэнтральнай частцы. Праз возера цячэ рака Ласіца, правы прыток Галбяіцы. Яна мае даўжыню 30 км і працякае таксама праз возера Крывое. Правым прытокам Ласіцы з'яўляецца Дубаўка, вакол якой і размяшчаюцца Асінагарадок, Парыж і Навадруцк.

Назва Ласіца мае фіна-угорскае паходжанне: «лаас» — «лес» (эст.). Значыць і возера, і рака знаходзіліся раней у лясістай мясцовасці. Аднак зараз вакол паселішчаў вялікіх лясных масіваў няма: за шматгадовую гісторыю асваення гэтай тэрыторыі дрэвы былі раскарчаваны і навакольныя прасторы ператварыліся ў раллю і пашу.

**2. Гісторыя Асінагарадка і ваколіц.** Тры вёскі, размешчаныя адна каля другой, перапляліся нітачкамі гісторыі і сталі адным цэлым. Але да 1973 года яны развіваліся асобна і Навадруцкам называлася толькі чыгуначная станцыя, якая ўзнікла ў 1897 годзе ў час будаўніцтва чыгункі Новасвянцяны – Беразвечча. Потым назву Парыж скасавалі і вёска пачала называцца Навадруцк. У пачатку XXI стагоддзя па просьбе мясцовых жыхароў паселішчу вярнулі былую назву. Так зараз існуюць вёскі Парыж, Асінагарадок і чыгуначная станцыя Навадруцк.

Гісторыя гэтых мясцін пачынаецца ў глыбокай даўніне. Калі сюды ўпершыню прыйшлі людзі — дакладна ўстанавіць складана. Але пра тое, што гэта адбылося вельмі даўно, сведчыць гарадзішча ў вёсцы Асінагарадок. Яно знаходзіцца на паўднёва-заходняй ускраіне вёскі, на ўзгорку.

Паводле падання, сама вёска ўзнікла на месцы, дзе на дрэве з'явіўся абраз Божай Маці, які стаў знакам да спынення бою, што адбываўся ў гэтай мясцовасці.

Асінагарадок упамінаецца ў дакументах пад 1567 годам у складзе Ашмянскага павета Віленскага ваяводства ВКЛ, потым Рэчы Паспалітай. Спачатку маёнтак Асінагарадок належаў Жабам (ваявода полацкі Жаба пачаў будаваць тут касцёл і кляштар, але не закончыў), потым князю В. І. Друцкаму-Любецкаму.

З 1795 года вёска ўвайшла ў склад Расійскай імперыі. У час вайны з Напалеонам у 1812 годзе тут адбыліся ваенныя дзеянні,



Экспазіцыя музея Навадруцкай школы

аб чым сведчыць брацкая магіла рускіх воінаў. Існуе паданне, што Напалеону, які спыняўся тут падчас паходу на Маскву, так спадабаліся мясцовыя краявіды, што ён пажадаў заснаваць тут другі Парыж, адкуль быццам і пайшла назва паселішча. У 1862 годзе ў вёсцы заснавана народнае вучылішча.

У 1905 годзе Асінагарадок — сяло ў Луцкай воласці Дзісенскага павета, у якім пражывала 90 жыхароў, мелася 185 дзесяцін зямлі, дзейнічала крама. У пачатку XX ст. пабудавана Пакроўская царква і званіца — помнік драўлянага дойлідства з выкарыстаннем элементаў стылю «мадэрн». З 1921 па 1939 год знаходзілася ў Луцкай гміне Дунілавіцкага павета Віленскага ваяводства Польшчы. У 20-я гады ў вёсцы мелася 33 будынкі, пражывала 143 жыхары. З 1939 па 1941 год уваходзіла ў БССР, была вёскай у Казлоўшчынскім сельсавеце Дунілавіцкага раёна. У час Другой сусветнай вайны знаходзілася ў зоне нямецка-фашысцкай акупацыі, але, у адрозненне ад некаторых населеных пунктаў нашага раёна, моцна не пацярпела. Пасля вайны ў вёсцы налічвалася 32 гаспадаркі. З 1962 года Асінагарадок увайшоў у Пастаўскі раён. На той час у вёсцы было 27 двароў і 77 жыхароў, пачатковая школа. У канцы XX стагоддзя паселішча паступова павялічвалася ў памерах, разбудоўвалася, у выніку чаго ў 2001 годзе ужо налічвалася 87 двароў і пражывала 213 жыхароў.

Вёска Навадруцк узнікла пасля 1897 года як станцыя на першай у Расійскай імперыі прыватнай чыгуначнай лініі Новасвянцяны — Беразвечча (Глыбокое). Назву атрымала ад прозвішча землеўладальнікаў князёў Друцкіх-Любецкіх. У 2001 годзе, калі Навадруцк быў аб'яднаны з Парыжам, у паселішчы было 195 двароў, пражывала 449 жыхароў. З устаноў і арганізацый меліся: Навадруцкае ДБЭП, базавая школа, клуб, бібліятэка, пошта, участковая бальніца, магазін.

**3. Адметныя мясціны Асінагарадка і ваколіц.** Адметнасцямі Асінагарадка з'яўляюцца: гарадзішча, Пакроўская царква са званіцай, помнік вайне 1812 года і помнік-капліца рускім воінам, якія загінулі ў сутычцы са шведамі ў 1706 годзе.

Гарадзішча (мясцовая назва Гарадок) ляжыць на паўднёва-заходняй ускраіне вёскі на высокім узгорку. Мае плошчу 130×70 метраў. Гарадзішча было абследавана Ф. В. Пакроўскім (1890–1892) і Я. Г. Звяругам у 1972 годзе. Археалагічныя раскопкі не праводзіліся. Плошча гарадзішча каля 200 м$^2$. У народзе бытуе легенда, што Асінагарадоцкае гарадзішча звязваецца падземным патаемным ходам з Сароцкім гарадзішчам.

На гарадзішчы ў 1782 годзе пабудавана Свята-Пакроўская уніяцкая царква, а ў 1856 годзе па



Царква ў Асінагарадку



Помнік вайне 1812 г.



Званіца ў Асінагарадку



Помнік руска-шведскай вайне 1706 г.

распараджэнні мясцовага князя Ігнація Друцкага-Любецкага быў зроблены рамонт. У 1856 годзе вакол храма пабудавана каменная агароджа. У 1897 годзе князь Уладзімір Друцкі-Любецкі за свае грошы зрабіў капітальны рамонт царквы і званіцы. Кіраваў рэстаўрацыйнымі работамі архітэктар Нікаля.

Храм мае традыцыйную кампазіцыю: прамавугольны асноўны зруб, роўны з ім па шырыні бабінец, пяцігранная апсіда і складаны шмат'ярусны дах з высокай шатровай вежачкай у цэнтры. Побач з царквой знаходзіцца званіца. Ніжні яе ярус змураваны ў выглядзе пілона, верхні — драўляны, складанай формы. Царква і званіца з'яўляюцца помнікамі драўлянага дойлідства з выкарыстаннем элементаў стылю «мадэрн».

Побач з царкоўнай каменнай агароджай знаходзіцца мураваны помнік-капліца, узведзены ў першай чвэрці XIX



Капліца Друцкіх-Любецкіх у в. Казлоўшчына



Магілы народных лекараў Даламанавых у Верацеі



👁 Далманава студня ў Верацеі, дзе людзі набіралі гаючую ваду



👁 Эйфелева вежа ў в. Парыж

стагоддзя ў памяць аб вайне 1812 года. У 2005 годзе была зроблена яго рэканструкцыя.

Побач з помнікам у 2006 годзе па ініцыятыве настаяцеля храма айца Анатолія на грашовыя сродкі прыхаджан Свята-Пакроўскай царквы ўзведзены помнік Паўночнай вайны паміж Расіяй і Швецыяй. Паводле гістарычных звестак у 1706 годзе ў Асінагарадку спыніўся полк рускіх салдат.Быў адслужаны малебен, воіны прычасціліся і адразу пайшлі у бой, які адбыўся на рацэ Ласіца. Рускі полк быў разбіты шведамі. У гонар гэтых падзей і пастаўлены помнік.

На поўдзень ад Гарадзішча ўздоўж ракі Ласіца цягнецца паласа гістарычных помнікаў. Тут захавалася некалькі старажытных курганоў. Мясцовыя жыхары расказваюць, што гэта шведскія магілы, у якіх закапана разам з людзьмі шмат каштоўных рэчаў. У 1889 годзе некалькі курганоў раскапалі сяляне, аднак нічога, апрача чалавечых касцей не знайшлі. Некаторыя старажылы сцвярджаюць, што ў курганах былі пахаваны волаты: пры будаўніцтве дарогі некаторыя насыпы аказаліся пашкоджанымі і сведкі бачылі вельмі вялікія чалавечыя косткі.

Каля вясковых могілкаў на ўсход ад в. Маштаркі выяўлены ладны каменны крыж. Ён намнога меншы за камайскі: вышыня ўсяго 77 см, шырыня ў папярэчыне 42 см, таўшчыня 36 см. На адным з бакоў праглядаецца складаная сістэма насечак, ліній і крыжоў,

на другім баку ў сярэдняй частцы ёсць невялікая адтуліна. Верагоднай можа быць версія, што гэты каменны крыж — перарobленая выява даўнейшага паганскага ідала.

Цікавая і багатая калекцыя гістарычных экспанатаў захоўваецца ў Навадруцкай школе. Сярод іх ёсць рэдкія рукапісы, даўнейшыя рэчы, прылады працы.

У апошнія гады пад кіраўніцтвам вядомага ксяндза Булькі з Мосара ў Парыжы ствараецца вялікі каталіцкі комплекс. Ужо дзейнічае капліца, уладкоўваюцца ставы, пабудавана копія Эйфелевай вежы.

Вясной 1967 года у вёсцы Асінагарадок быў заложаны парк, у якім пазней, у 1971 годзе пастаўлены помнік у гонар землякоў, якія загінулі ў час Другой сусветнай вайны.

**4. Вядомыя людзі Асінагарадка і ваколіц.** У Асінагарадку нарадзіўся і пражыў 8 гадоў выдатны артыст Васіль Качалаў (Шверубовіч), якому за вялікія заслугі ў тэатральным мастацтве прысвоена званне народнага артыста СССР. В. Качалаў лаўрэат Дзяржаўнай прэміі, узнагароджаны дзвюма ордэнамі Леніна, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

У напрамку на ўсход ад Асінагарадка па-суседску ляжаць тры невялічкія вёскі Губіна, Верацеі і Рудакова, кожная з каторых з'яўляецца радзімай вядомых людзей не толькі Беларусі, але і замежжа. У маёнтку Губіна ў 1862 годзе нарадзіўся Антон Станкевіч — былы царскі афіцэр, які ў Першую сусветную вайну камандаваў спачатку палком, потым брыгадай і дывізіяй. За ўдалыя дзеянні на фронце атрымаў чын генерал-маёра. У 1918 годзе перайшоў служыць у Чырвоную Армію, камандаваў дывізіяй на Арлоўскім фронце. Трапіў у палон да дзянікінцаў і быў павешаны. Пахаваны на Чырвонай плошчы каля Крамлёўскай сцяны ў Маскве.

Вёска Верацеі да нядаўняга часу была месцам, куды з'язджаліся людзі з розных куткоў былога Савецкага Саюза, бо тут жыў Далман — вядомы народны лекар. Далман — гэта народная мянушка-сімвал цэлага роду Даламанавых, дар якіх — лячыць людзей — перадаваўся з пакалення ў пакаленне. Народнымі лекарамі былі: Уладзімір Васільевіч, яго сын Міхаіл Уладзіміравіч і потым унук Сяргей Міхайлавіч. Легенда апавядае, што калі паміраў стары Далман, то некалькі дзён шалела бура, бліскалі маланкі, грымеў пя-

рун. Шмат дрэў было павалена і паламана; у велічэзны дуб, які быў пасаджаны продкамі Далмана, патрапіла маланка і амаль з каранем яго вывернула.

Акрамя дынастыі народных лекараў Верацеі — адзіная вёска на Пастаўшчыне, два ўраджэнцы якой з'яўляюцца вядомымі беларускімі літаратарамі, членамі Саюза беларускіх пісьменнікаў. Гэта кандыдат філалагічных навук, дацэнт БДУ, празаік і перакладчык Міхась Кенька і паэтэса Аліна Легастаева.

З Верацеі пайшоў у навуку Яўген Карабёнак — матэматык, кандыдат матэматычных навук, загадчык кафедры геаметрыі і матэматычнага аналізу Віцебскага дзяржаўнага універсітэта.

У суседняй вёсцы Рудакова нарадзіўся жыхар ЗША айцец Аляксандр Ясюковіч. Ён скончыў духоўныя семінарыі ў Варшаве і Джонстаўне, Багаслоўскі інстытут у Парыжы. Займаецца іканаграфіяй. Пісаў абразы для 30 храмаў у ЗША, распісваў сабор Аляксандра Неўскага ў Пітсбургу. З'яўляецца прэзідэнтам асацыяцыі літургічных мастацтваў.

**Сведчаць дакументы:** З летапісу Свята-Пакроўскай царквы: *«1897 г. По просьбе... старосты Осиногород. князь Владимир Игнатьевич Друцкий-Любецкий на свой счёт в 1897 году произвёл капитальный ремонт Осиногор. церкви.*

*Во время ремонта устроен под церковь новый фундамент, церковь обита новыми досками, устроен новый резной клирос... На средства князя Друцкого-Любецкого приобретены иконы».*

**Пытанні і заданні:**

1. Як растлумачыць паходжанне назваў Асінагарадок, Парыж, Навадруцк?
2. У чым асаблівасці прыроды ваколіц Парыжа-Асінагарадка?
3. Якія гістарычныя падзеі звязаны з Асінагарадком, Парыжам, Навадруцкам?
4. Прадстаўнікі якога шляхецкага роду пакінулі адметны след у тутэйшай мясцовасці?
5. Якія мясцовыя легенды і паданні ты ведаеш?
6. Якія гістарычныя і культурныя аб'екты ў ваколіцах Парыжа-Асінагарадка выклікаюць цікавасць у турыстаў?
7. Падрыхтуй паведамленні пра вядомых людзей Асінагарадка і ваколіц.

# Дадаткі





Дадатак 1

## Буйнейшыя рэкі Пастаўскага раёна

| № | Назва | Выток | Вусце |
|---|---|---|---|
| 1 | Аржоўка | в. Вохабні (Мядз. р-н) | р. Мядзелка |
| 2 | Бірвета | воз. Эрзветас (Летува) | р. Дзісна |
| 3 | Вінгра | в. Оцкавічы | р. Мядзелка |
| 4 | Вараноўка | в. Воранава | воз. Споры |
| 5 | Глодаўка | воз. Глодава | р. Спарыца |
| 6 | Галбяіца | в. Дзягілі (Мядз. р-н) | р. Дзісна |
| 7 | Дзісна | воз. Дзіснай (Летува) | р. Зах. Дзвіна |
| 8 | Камайка | воз. Вял. Камайскае | р. Бірвета |
| 9 | Ласіца | в. Турчына | р. Галбяіца |
| 10 | Лучайка | воз. Лучай | р. Мядзелка |
| 11 | Лынтупка | в. Вялічкі | р. Страча |
| 12 | Мядзелка | воз. Мядзел (Мядз. р-н) | р. Бірвета |
| 13 | Палавіца | в. Кролікі | р. Галбяіца |
| 14 | Пеляка | в. Пялякіс (Летува) | р. Струна |
| 15 | Плісаўка | воз. Пліса (Глыб. р-н) | р. Галбяіца |
| 16 | Снарыхоўка | в. Слабада | р. Палавіца |
| 17 | Спарыца | воз. Світка | р. Мядзелка |
| 18 | Страча | воз. Мал. Швакшты | р. Вілія |
| 19 | Шурыца | в. Карпавічы | р. Галбяіца |
| 20 | Янавіца | в. Янанішкі | воз. Вял. Сурвілішкі |

Дадатак 2

## Характарыстыкі буйнейшых азёр Пастаўскага раёна

| Назва | Плошча, км$^2$ | Найбольшая глыбіня, м |
|---|---|---|
| Баравое-1 (Барова) | 0,49 | 16 |
| Белае-2 | 0,31 | 5 |
| Белькі | 0,26 | 4,2 |
| Волься | 0,25 | 2,5 |
| Вял. Камайскае | 0,25 | 22 |

| Даўжыня агульная, км | Даўжыня ў межах Пастаўскага раёна, км | Плошча вадазбору км² | Расход вады ў вусці, м³/с |
|---|---|---|---|
| 14 | 13 | - | - |
| 34 | 3 | 1600 | 10,4 |
| 15 | 15 | 88 | - |
| 11 | 11 | 19 | |
| 7,8 | 7,8 | - | - |
| 63 | 51 | 1050 | 6,6 |
| 178 | 29 | 8180 | 52,4 |
| 50 | 21 | 306 | - |
| 30 | 27 | 160 | - |
| 46 | 46 | 258 | - |
| 23 | 14 | 57 | - |
| 50 | 40 | 7765 | 6 |
| 38 | 38 | 21 | - |
| 25 | 9 | 82 | - |
| 14 | 11 | 49 | - |
| 8,4 | 8,4 | - | - |
| 11 | 11 | 109 | - |
| 59 | 9 | 1140 | 9,1 |
| 20 | 20 | 70 | - |
| 18 | 18 | 96 | - |

| Найбольшая даўжыня, км | Найбольшая шырыня, км | Празрыстасць, м |
|---|---|---|
| 0,92 | 0,54 | - |
| 1,02 | 0,93 | - |
| 0,94 | 0,37 | 0,5 |
| 0,84 | 0,39 | 1,4 |
| 1,05 | 0,36 | 1,4 |

| Назва | Плошча, км² | Найбольшая глыбіня, м |
|---|---|---|
| Вял. Сурвілішкі | 1,03 | 9,1 |
| Вял. Швакшты | 9,56 | 5,3 |
| Галбея | 0,35 | - |
| Глодава | 0,35 | 6 |
| Гуцкое (Задняе) | 0,36 | - |
| Доўжа | 1,04 | 13,7 |
| Загачча | 0,3 | 7,8 |
| Задзеўскае | 0,92 | 21,8 |
| Ласіца-1 | 0,46 | 3,8 |
| Лісіцкае | 0,85 | 5,1 |
| Лодасі | 1,03 | 7,5 |
| Лучай | 2,51 | 3,2 |
| Мажэйкі | 0,66 | 3,9 |
| Мал. Камайскае | 0,05 | 12,2 |
| Мал. Сурвілішкі | 0,29 | 2,6 |
| Мал. Швакшты | 1,91 | 3,2 |
| Саранчаны | 0,68 | 3,5 |
| Свідна | 0,97 | 11,6 |
| Світа | 0,83 | 31 |
| Споры | 0,7 | 20,8 |
| Трумпічы | 0,44 | 4 |
| Халасенскае | 0,26 | - |
| Чарты | 0,29 | - |
| Чорнае-1 | 0,36 | 31,5 |
| Чэцверць | 0,46 | 7,7 |

Дадатак 3

## Вялікія камяні — геалагічныя помнікі прыроды

| Назва | Даўжыня, м | Шырыня, м | Вышыня, м |
|---|---|---|---|
| Заўлечанскі | 4,50 | 3,80 | 1,70 |
| Зыбалішскі | 3,80 | 1,90 | 1,50 |
| Казнадзеішскі | 2,60 | 1,70 | 1,70 |
| Камайскі | 3,10 | 2,70 | 1,40 |

| Найбольшая даўжыня, км | Найбольшая шырыня, км | Празрыстасць, м |
|---|---|---|
| 2,36 | 0,53 | 1,0 |
| 4,2 | 3,4 | 2,5 |
| 1,0 | 0,48 | - |
| 1,6 | 0,45 | 1,7 |
| 1,65 | 0,42 | - |
| 4,89 | 0,42 | 2,0 |
| 1,2 | 0,33 | 1,5 |
| 2,46 | 0,64 | 1,6 |
| 1,44 | 0,51 | 1,0 |
| 1,65 | 0,75 | 0,9 |
| 1,83 | 0,94 | 2,5 |
| 3,9 | 1,45 | 1,2 |
| 1,42 | 0,66 | 2,0 |
| 0,32 | 0,22 | - |
| 1,02 | 0,46 | 2,0 |
| 2,3 | 1,3 | 2,0 |
| 1,6 | 0,6 | 0,9 |
| 1,45 | 0,98 | 3,5 |
| 1,5 | 1,06 | 3,2 |
| 1,45 | 0,84 | 4,0 |
| 1,37 | 0,57 | 0,8 |
| 0,8 | 0,4 | - |
| 1,18 | 0,38 | - |
| 1,5 | 0,5 | - |
| 0,95 | 0,8 | 0,9 |

| Абвод, м | Аб'ём, $м^3$ | Вага, т | Склад | Асаблівасці |
|---|---|---|---|---|
| 12,80 | 15,40 | 40-80 | Граніта-гнейс | |
| 8,90 | 5,7 | 15,2 | Граніт рапаківі | |
| 70 | 4,0 | 10,6 | Граніта-парфір | |
| 9,80 | 6,3 | 16,5 | Граніт рапаківі | Культавы |

| Назва | Даўжыня, м | Шырыня, м | Вышыня, м |
|---|---|---|---|
| Каптарунскі (Святы, Дзіравы) | 2,45 | 1,85 | 1,0 |
| Кулакоўскі 1 | 4,80 | 2,80 | 2,21 |
| Кулакоўскі 2 | 3,46 | 2,00 | 1,65 |
| Ладоскі | 3, 30 | 3,10 | 1,65 |
| Ласёўскі | 3,08 | 2,5 | 1,73 |
| Логавінскі | 3,75 | 2,27 | 1,66 |
| Мініковіцкі | 3,03 | 1,9 | 1,4 |
| Мягунскі | 3,20 | 2,70 | 1,50 |
| Пятруцкі 1 | 3,03 | 1,9 | 0,8 |
| Пятруцкі 2 | 3,05 | 2,8 | 1,1 |
| Саболкаўскі (Чортаў, Здань) | 4,0 | 3,3 | 1,22 |
| Скарпаўскі | 3,03 | 2,4 | 1,2 |
| Трапшавіцкі | 3,60 | 2,30 | 1,90 |
| Чашкоўшчынскі | 3,50 | 3,0 | 2,10 |

Дадатак 4

## Ландшафтныя геамарфалагічныя заказнікі прыроды Пастаўскага раёна

| Назва |
|---|
| Спорыцкая ледавіковая лагчына |
| Карагач |
| Саранчанскія ўзгоркі |
| Палескія ўзгоркі |
| Сяргеевіцкія ўзгоркі |

| Абвод, м | Аб'ём, м³ | Вага, т | Склад | Асаблівасці |
|---|---|---|---|---|
| 7,10 | 2,4 | 6,4 | Граніт | Культавы |
| 15,10 | 15,5 | 40,3 | Граніт | |
| 9,06 | 6,0 | 15,6 | Граніт | |
| 9,70 | 8,9 | 23,6 | Граніт | Культавы |
| - | 6,9 | 18,1 | Граніт | |
| 10,08 | 7,56 | 19,5 | Граніт | |
| - | 4,2 | 10,9 | Граніта-дыярыт | |
| 9,40 | 6,9 | 18,3 | Граніт | |
| - | 2,4 | 6,3 | Граніт | |
| - | 4,9 | 12,8 | Граніт | |
| 11,70 | 8,5 | 22,6 | Палявы шпат | Культавы |
| - | 4,56 | 11,9 | Граніт | |
| 9,20 | 8,4 | 22,2 | Граніт рапаківі | |
| 10,20 | 11,70 | 31,0 | Граніт рапаківі | |

| Асноўныя ахоўваемыя аб'екты |
|---|
| Ледавіковая лагчына;<br>горы: Гарадзішча, Гаёк, Споркі;<br>азёры: Споры, Світа, Свідна, Асцюцьева |
| Марэнны масіў;<br>горы: Лембаўка, Маяк, Карагач, Шаламок;<br>возера Выгарка;<br>даліна ракі Смычыца |
| Градава-ўзгорысты канцовамарэнны рэльеф;<br>гара Вёшка |
| Канцовамарэнны рэльеф;<br>горы: Ануўкава, Бярнатава; тэрмакарставая катлавіна Амшар;<br>скразная даліна р. Янавіца;<br>расліна – званочак рапунцель |
| Озавыя грады;<br>горы: Лысая, Цыганская, Дальняя |

Дадатак 5

## Хроніка падзей

**III–II тыс. да н. э.** — існаванне першага вядомага неалітычнага паселішча на беразе возера Задзеўскае.

**VII ст. да н. э. – IV ст. н. э.** — існавалі гарадзішчы культуры штрыхаванай керамікі ў Дзяўгунах, Сароках, Сіманьках, Колаўцах, Саранчанах, Данеўцах.

**I тыс. н. э.** — існаванне гарадзішча ў цэнтры г. Паставы (на месцы сучаснага касцёла).

**996 г.** — згадванне ў літаратурных крыніцах вёскі Пасаднік, з якой пазней выраслі Паставы.

**X–XIII стст.** — Пастаўшчына ў складзе Полацкага і Нальшчанскага княстваў.

**1252 г.** — нашэсце мангола-татарскай конніцы Бурундая

**1264 г.** — пасля заваявання Войшалкам Нальшчан і Дзяволтвы Пастаўшчына ўваходзіць у склад Вялікага Княства Літоўскага.

**1324, 1378 гг.** — паходы крыжакоў Лівонскага ордэна на Пастаўшчыну, Мядзельшчыну.

**1385 г.** — у гістарычных крыніцах згадваюцца Лынтупы.

**1409 г.** — вёска Пасаднік паводле прывілею караля Уладзіслава Ягайлы пераведзена ў разрад мястэчак з наданнем ёй назвы Паставы; у мястэчку 26 двароў, 13 корчмаў.

**1414 г.** — Вялікі князь Вітаўт у сваім прывілеі пацвердзіў Паставам статус мястэчка.

**1443 г.** — будаўніцтва касцёла ў Груздаве.

**1459 г.** — будаўніцтва касцёла ў Лынтупах.

**1473 г.** — у гістарычных крыніцах згадваюцца Дунілавічы

**1522 г.** — Паставы ўваходзяць у склад Ашмянскага павета Віленскага ваяводства.

**1569 г.** — у выніку Уніі Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага Пастаўшчына становяцца часткай адзінай федэратыўнай дзяржавы — Рэчы Паспалітай.

**1579 г.** — падчас Лівонскай вайны Расіі з Рэччу Паспалітай (1558–1583) з Паставаў на плытах па рэчцы Мядзелка да Полацка сплаўлялася артылерыя войска караля Стэфана Баторыя.

**1602 г.** — эпідэмія і голад на Пастаўшчыне.

**1603–1606 гг.** — пабудаваны касцёл Яна Хрысціцеля ў в. Камаі.

**1610 г.** — будаўніцтва касцёла ў Паставах.

**1613 г.** — на карце ВКЛ Мікалая Радзівіла пазначаны населеныя пункты Пастаўшчыны — Паставы, Асінагарадок, Дунілавічы, Камаі, Лынтупы, Полава, Лучай, Ожунічы (Ажуны), Олбій (Голбія), Гадуцішкі.

**1615 г.** — у в. Мягуны мясцовая жыхарка Зофія Шупене абвінавачана ў зносінах з д'яблам і чараўніцтве; спалена на вогнішчы разам з сынам-падлеткам.

**1616 г.** — у Паставах на Востраве (Гарадзішча) з фундацыі Станіслава Бяган-

скага пабудаваны касцёл Бязгрэшнага зачацця Найсвяцейшай Панны і кляштар францысканцаў.

**1624 г.** — будаўніцтва касцёла ў Дунілавічах.

**1628 г.** — мястэчка Паставы, якое належала А. Радзівілу, складалася з цэнтральнай часткі, прадмесця Зарэчча і 2 пасадаў; было 66 двароў.

**1654 г.** — у час вайны паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй (1654–1667) Пастаўшына разрабавана і спалены рускімі войскамі графа Шарамецьева.

**1655 г.** — у час вайна паміж Швецыяй і Расіяй шведамі абстраляны камайскі касцёл.

**Пач XVIII ст.** — вялікая засуха і эпідэміі.

**1709 г.** — праз Паставы ў час руска-шведскай вайны прайшоў 16-тысячны корпус шведскага генерала Левенгаўпта.

**1713 г.** — кароль Рэчы Паспалітай Аўгуст II зацвердзіў прывілей аб заснаванні ў Паставах кірмашоў і базараў з прычыны спусташэнняў, якія прынеслі краю вайна, мор і засухі.

**1713 г.** — будаўніцтва царквы ў Паставах.

**1722 г.** — Паставы пераходзяць ва ўладанне роду Тызенгаўзаў.

**1755 г.** — у мястэчку адкрыта свецкая школа з сярэдняй ступенню навучання, з Мядзела пераведзены гродскі суд.

**1756 г.** — будаўніцтва уніяцкай царквы ў Груздаве.

**1760 г.** — пачатак карэннай перабудовы мястэчка, якую распачаў падскарбій ВКЛ Антоній Тызенгаўз; у Паставах пабудавана 8 прамысловых прадпрыемстваў, узведзены архітэктурны ансамбль Рынкавай плошчы, пачата будаўніцтва палаца.

**1769–1773 гг.** — будаўніцтва касцёла ў Дунілавічах.

**1766–1776 гг.** — будаўніцтва касцёла езуітаў у в. Лучай.

**1782 г.** — будаўніцтва царквы ў Асінагарадку.

**1783 г.** — у Паставах 198 дымоў, 1386 душ.

**1791 г.** — Паставы — цэнтр Завілейскага павета Віленскага ваяводства.

**1793 г.** — у выніку другога падзелу Рэчы Паспалітай Паставы і ўсходняя частка Пастаўшчыны ўваходзяць у склад Расійскай імперыі і становяцца цэнтрам Дзісненскага павета Менскай губерні.

**1794 г., чэрвень** — паўстанцкія атрады Т. Касцюшкі праходзілі праз Паставы на Кабыльнік.

**1795 г.** — паводле трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай і заходняя частка Пастаўшчыны ўваходзіць у Расійскую імперыю.

**1796 г.** — гораду нададзены герб: на блакітным полі шчыта рыбацкая сетка і тры залатыя рыбіны.

**1798 г.** — Паставы страцілі статус горада, сталі мястэчкам — цэнтрам Пастаўскай воласці Дзісненскага павета Менскай губерні.

**1812 г., ліпень** — праз Пастаўшчыну прайшлі французскія войскі пад кіраўніцтвам Жэрома Банапарта.

**1812 г., кастрычнік** — Пастаўшчына захоплена рускімі войскамі.

**1815 г.** — вялікі пажар у Паставах, у выніку якога згарэла большая частка мястэчка, у тым ліку і Свята-Мікалаеўская царква.

**1817 г.** — будаўніцтва царквы ў Рымках.

**1-я палова XIX ст.** — росквіт Паставаў у час кіравання Канстанціна Тызенгаўза; пабудаваны палац, створаны арніталагічны музей (звыш 3000 экспанатаў), карцінная галерэя і пейзажны парк.

**1830 г.** — будаўніцтва царквы ў Ласіцы.

**1831 г., 11 красавіка** — Адольф і Станіслаў Кубліцкія з Палесся з узброеным атрадам напалі на Свянцяны, паклаўшы пачатак паўстанню (1830–1831) супраць расійскай акупацыі; у маі паўстанцкія атрады знаходзіліся ў Паставах.

**1842 г.** — па новым адміністрацыйным падзеле мястэчка пераходзіць з Менскай губерні ў Віленскую.

**1853 г.** — памёр Канстанцін Тызенгаўз, прыродазнаўца і асветнік, які стварыў у Паставах карцінную галерэю і арніталагічны музей.

**1861–1863 гг.** — Пастаўшына знаходзіліся на тэрыторыі, дзе актыўна разгортвалася паўстанне пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага; сяляне і шляхта змагалася за зброяй супраць расійскіх войск; І. Карнацэвіч са Станелевічаў асуджаны на 4 гады катаржных работ.

**1870 г.** — у мястэчку 111 двароў, школа, 2 млыны, валюшня, 13 крам, 7 кірмашоў у год; пражывала 1586 жыхароў, з якіх 829 жанчын і 757 мужчын; католікаў — 377, праваслаўных — 263, яўрэяў — 925, татараў — 21.

**1880 г.** — Паставы пераходзяць ва ўладанне роду Пшаздзецкіх.

**1886 г.** — у Паставах налічвалася 66 двароў, 726 жыхароў; мелася валасная ўправа, касцёл, сінагога, яўрэйскі малітоўны дом, царква, школа, паравы і вадзяны млыны, 17 крам, 4 піцейныя дамы, сукнавальня; праводзілася 7 кірмашоў у год і базар па нядзелях.

**1887 г.** — у мястэчку на Гарадзішчы пабудаваны касцёл святога Антонія Падуанскага.

**1894 г.** — на Рынкавай плошчы ўзведзены праваслаўны Свята-Мікалаеўскі храм.

**1895–1897 гг.** — праз Пастаўшчыну прайшла чыгунка Новасвянцяны — Беразвечча (суч. Швянчэнеляй — Глыбокае).

**Пач. XX ст.** — у Паставах размяшчалася практычная кавалерыйская школа, у якой бываў расійскі імператар Мікалай II.

**1915 г., 20 верасня** — мястэчка захоплена германскімі войскамі у час Першай сусветнай вайны.

**1915–1918 гг.** — Паставы знаходзіліся на лініі фронту Першай сусветнай вайны паміж нямецкімі (в. Задзеўе) і рускімі (5-ы гарадок) войскамі.

**1916 г., 18–28 сакавіка** — мястэчка моцна разбурана падчас актыўных баявых дзеянняў на лініі фронту (Нарацкая аперацыя).

**1917 г.** — у Паставах створаны Савет салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў, органы ўлады Часовага ўрада, ваенна-рэвалюцыйны камітэт.

**1918 г., 18 лютага** — мястэчка захоплена германскімі войскамі.

**1918 г., лістапад** — мястэчка захоплена войскамі Чырвонай Арміі.

**1919 г., красавік** — Паставы захоплены войскамі Польшчы.

**1920 г., 4–6 ліпеня** — крывавыя баі паміж польскімі і рускімі войскамі ва ўсходняй частцы раёна (Асінагарадок-Дунілавічы);

**1920 г., ліпень** — Паставы заняты войскамі Чырвонай Арміі.

**1921 г, 18 сакавіка** — па Рыжскай дамове паміж Савецкай Расіяй і Польшчай Паставы перайшлі ў склад «крэсаў усходніх» Польшчы.

**1921 г.** — у в. Лучай пачала дзейнічаць агранамічная школа.

**1925 г.** — горад — цэнтр Пастаўскага павета Віленскага ваяводства.

**1933 г.** — адкрыты рух па чыгунцы Варапаева – Друя; з гэтай нагоды Варапаева і Гуту наведаў прэзідэнт Польшчы І. Масціцкі.

**1939 г., верасень** — Паставы заняты войскамі Чырвонай Арміі.

**1939 г., 2 лістапада** — горад увайшоў у склад БССР.

**1940 г., 15 студзеня** — у складзе Вілейскай вобласці БССР утвораны Пастаўскі і Дунілавіцкі раёны.

**1941 г., ліпень** — Пастаўшчына захоплена войскамі фашысцкай Германіі.

**1942 г., 21 лістапада** — фашысты расстралялі жыхароў Пастаўскага і Дунілавіцкага гета (каля 5 тыс. чалавек).

**1942 г., май** — створаны партызанскі атрад імя Суворава пад камандаваннем Ф. Маркава.

**1942, лістапад** — створана партызанская брыгада імя К. Варашылава пад камандаваннем Ф. Маркава.

**1942 г., 22 снежня** — фашысты расстралялі яўрэяў у Лынтупах (93 чалавекі).

**1943 г., верасень–кастрычнік** — фашысты правялі карную аперацыю супраць партызан «Фрыц».

**1943 г.** — створаны Пастаўскі і Дунілавіцкі раённыя камсамольскія цэнтры.

**1943 г., 19 студзеня** — фашыстамі спалена вёска Альцы разам з жыхарамі.

**1944 г., 5 ліпеня** — Паставы заняты падраздзяленнямі 145-й Віцебскай стралковай дывізіі 1-га Прыбалтыйскага фронту.

**1944 г., 20 верасня** — Пастаўскі і Дунілавіцкі раёны ўвайшлі ў склад Маладзечанскай вобласці БССР.

**1944 г.** — утворана Пастаўскае педагагічнае вучылішча (дзейнічала да 1955 г.)

**1947 г.** — уведзены ў дзеянне Пастаўскі ільнозавод.

**1947 г.** — жорстка пакараны ўдзельнікі моладзевай патрыятычнай арганізацыі Пастаўскага педвучылішча «Саюз беларускіх патрыётаў».

**1950 г.** — масавая калектывізацыя сялянскіх гаспадарак на Пастаўшчыне.

**1950 г, 8 чэрвеня** — вёсцы Варапаева нададзены статус гарадскога пасёлка, які становіцца цэнтрам Дунілавіцкага раёна.

**1953 г.** — пабудаваны кансервавы завод.

**1957 г.** — створана дарожнае эксплуатацыйнае упраўленне № 132.

**1958 г.** — у в. Груздава створаны цымбальны аркестр (з 1973 г. — народны)

**1958 г.** — створана міжкалгасная будаўнічая арганізацыя.

**1959 г.** — у горадзе пражывала 10 566 жыхароў.

**1960 г., 20 студзеня** — горад Паставы стаў раённым цэнтрам Віцебскай вобласці, Дунілавіцкі раён скасаваны.

**1962 г.** — распрацаваны генеральны план забудовы горада.

**1962 г., 25 снежня** — у Пастаўскі раён з Глыбоцкага перададзены г. п. Варапаева, Белькаўскі, Ваўкалацкі, Дунілавіцкі, Казлоўшчынскі, Ласіцкі сельсаветы.

**1963 г.** — пабудаваны малаказавод.

**1964 г.** — пабудаваны хлебазавод.

**1970 г.** — у Паставах пражывала 15 139 жыхароў.

**1976 г.** — адкрыты для наведвальнікаў Пастаўскі раённы краязнаўчы музей

**1976 г.** — пачаў працаваць завод «Беліт».

**1980 г.** — узведзены новы корпус бальніцы.

**1981 г.** — пабудавана прадпрыемства па вытворчасці камплектаў вучэбнага абсталявання па чарчэнні і маляванні (зараз — прадпрыемства «Паставымэбля»).

**1991 г.** — раён у складзе незалежнай Рэспублікі Беларусь.

**1991 г.** — прайшоў першы фестываль народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік», які стаў традыцыйным.

**1995 г.** — узведзены будынак новай паліклінікі.

**2001 г.** — у Пастаўскім раёне 48,3 тыс. жыхароў, 516 сельскіх населеных пунктаў.

**2002 г.** — у горадзе пражывала 20 955 чалавек.

**2004 г.** — у Паставы падведзены прыродны газ.

**2006, 3 верасня** — у Паставах прайшло рэспубліканскае Свята беларускага пісьменства

**2008, чэрвень** — у Паставах прайшоў I Міжнародны конкурс юных вакалістаў «Bella voce».

**2008 г.** — у Пастаўскім раёне пражывала 44 800 чалавек.

Дадатак 6

## Паходжанне і сэнс некаторых імёнаў

### Мужчынскія імёны

**Адам** — чалавек *(старажытнаяўр.)*

**Алег** — святы *(сканд.)*

**Алесь** — абаронца *(грэч.)*

**Аляксандр** — мужны, абаронца *(грэч.)*

**Аляксей** — той, хто аберагае *(грэч.)*

**Анатоль** — усход, усход сонца *(грэч.)*
**Андрэй** — мужны, адважны *(грэч.)*
**Антон** — той, хто ўступае ў бой *(лац.)*
**Аркадзь** — пастух *(грэч.)*
**Арцём** — здаровы, або прысвечаны Артэмідзе *(грэч.)*
**Барыс** — барэц *(грэч.)*
**Браніслаў** — той, што аберагае славу *(слав.)*
**Вадзім** — абвінаваўца, бунтаўшчык *(слав.)*
**Валерый** — моцны, здаровы *(лац.)*
**Васіль** — царскі *(грэч.)*
**Віталь** — жыццёвы (лат.)
**Вячаслаў** — той, хто марыць праславіцца *(слав.)*
**Генадзь** — высакародны *(грэч.)*
**Георгій (Жора, Юра, Ягор)** — земляроб *(грэч.)*
**Давыд** — любімы *(старажытнаяўр.)*
**Даніла** — бог – мой суддзя *(старажытнаяўр.)*
**Дзмітрый** — той, хто належыць багіні земляробства Дзяметры *(грэч.)*
**Дзяніс** — натхнёны *(грэч.)*
**Іван (Ян, Янка, Ясь)** — той, каго мілуе Бог *(старажытнаяўр.)*
**Ігар** — бог-абаронца *(старажытнагерм.)*
**Ілля** — крэпасць; Бог ёсць мой Бог *(старажытнаяўр.)*
**Іосіф (Юзік, Язэп)** — прымножаны *(старажытнаяўр.)*
**Казімір** — дакладнага тлумачэння няма *(слав.)*
**Канстанцін** — пастаянны, стойкі *(грэч.)*
**Кірыла** — уладар; той, хто кіруе, правіць *(грэч.)*
**Леанід** — падобны да льва *(грэч.)*
**Лявон** — падобны да льва *(грэч.)*
**Максім** — самы вялікі, найбольшы *(лац.)*
**Мікалай** — той, што перамагае народы *(грэч.)*
**Мікіта** — пераможца *(грэч.)*
**Міхась** — падобны да Бога *(старажытнаяўр.)*
**Павел** — малы, невялікі *(лац.)*
**Піліп** — той, хто любіць коней *(грэч.)*
**Пётр** — камень, цвёрды *(грэч.)*
**Раман** — рымлянін *(лац.)*
**Рыгор (Грыгорый)** — які не спіць *(грэч.)*
**Сідар** — дар, падарунак багіні Ісідоры *(грэч.)*
**Сцяпан** — вянок, якім узнагароджвалі лепшых воінаў *(грэч.)*
**Сымон** — пачуты Богам *(старажытнаяўр.)*
**Сяргей** — вельмі паважаны, стражнік *(лац.)*

**Тодар (Фёдар)** — божы дар *(грэч.)*
**Трахім** — кармілец *(грэч.)*
**Уладзімір** — валодаць сусветам *(слав.)*
**Цімох (Цімафей)** — той, які шануе Бога *(грэч.)*
**Эдуард** — той, які ахоўвае *(лац.)*
**Юзік** — гл. Іосіф
**Юлій** — кучаравы; з роду Юліяў *(лац.)*
**Юрый** — гл. Георгій
**Янка** — гл. Іван

## Жаночыя імёны

**Агата** — харошая, добрая *(грэч.)*
**Аксіння (Аксеня)** — госця, чужаземка *(грэч.)*
**Ала** — другая, наступная *(грэч.)*
**Алена (Алёна, Лена)** — сонечная, светлая *(грэч.)*
**Барбара** — язычніца, чужаземка *(лац.)*
**Браніслава** — ахоўваючая славу *(слав.)*
**Валянціна (Валя)** — моцная, здаровая *(лац.)*
**Вера** — спадзяванне *(слав.)*
**Вераніка** — тая, што нясе перамогу *(грэч.)*
**Вікторыя** — перамога *(лац.)*
**Вольга** — святая *(сканд.)*
**Галіна (Галя)** — спакойная, лагодная *(грэч.)*
**Ганна (Аня, Анюта)** — сімпатычная, мілавідная *(старажытнаяўр.)*
**Дар'я (Даша)** — уладарная, уладная *(старажытнаперс.)*
**Дзіана (Дзіна)** — боская, божая *(лац.)* (у гонар старажытна рымскай багіні Месяца і палявання)
**Жанна** — тая, якую мілуе Бог (запазычана *з франц.* у гонар Жанны д'Арк)
**Жэня (Яўгенія)** — высакародная *(грэч.)*
**Зіна (Зінаіда)** — нашчадак Зеўса *(грэч.)*
**Зося (Соф'я, Соня)** — мудрая *(грэч.)*
**Зоя** — жыццё *(грэч.)*
**Ірына (Іра)** — мір, спакой *(грэч.)*
**Кацярына (Каця)** — чыстая *(грэч.)*
**Клава (Клаўдзія)** — кульгавая *(лац.)*
**Ксенія** — гасціннасць *(грэч.)*
**Ларыса** — чайка *(грэч.)*
**Ліда (Лідзія)** — тая, што з Лідзіі (вобласць у Малой Азіі) *(грэч.)*
**Ліза (Лізавета, Елізавета)** — вядомая, знакамітая; тая, што шануе Бога *(лац.)*

**Люба (Любоў)** — прыхільнасць, адданасць *(слав.)*
**Люда (Людміла)** — мілая людзям *(слав.)*
**Мая** — ад назвы месяца май
**Маргарыта** — жамчужына *(грэч.)*
**Марына** — марская *(лац.)*
**Марыя (Мар'я, Маня)** — любімая Богам, жаданая *(старажытнаяўр.)*
**Надзя (Надзея, Надзежда)** — спадзяванне, чаканне чаго-небудзь *(слав.)*
**Насця (Настасся, Анастасія)** — уваскрасенне, ажыванне *(грэч.)*
**Наталля (Наташа)** — родная, нараджэнне *(лац.)*
**Ніна** — ласкавая (паходжанне не высветлена)
**Паўліна (Паўлінка)** — малая *(лац.)*
**Рая (Раіса)** — легкадумная, бяспечная *(грэч.)*
**Света (Святлана)** — светлая *(слав.)*
**Софія** — мудрая *(грэч.)*
**Тамара (Тома)** — фінікавая пальма *(старажытнаяўр.)*
**Таня (Таццяна)** — арганізатарка, наладжвальніца *(грэч.)*
**Фаіна** —ззяючая, светлая *(грэч.)*
**Хрысціна (Хрысця)** — тая, што належыць Хрысту *(грэч.)*
**Эльвіра (Эля)** — значэнне не высветлена *(ісп.)*
**Юля (Юлія, Юльяна)** — кучаравая; з рымскага роду Юліяў *(лац.)*
**Яўгенія (Жэня)** — высакародная *(грэч.)*

Дадатак 7

## Назвы ступеняў сваяцтва

**Айчым** — няродны бацька
**Мачаха** — няродная маці
**Пасынак** — няродны сын
**Падчарыца** — няродная дачка
**Зводныя браты (сёстры)** — дзеці мачахі і айчыма
**Пляменнік (пляменніца)** — дзеці брата або сястры
**Дзядзька (цётка)** — брат (сястра) бацькі або маці
**Дваюрадны (стрыечны) брат** — сын бацькавага або матчынага брата (сястры)
**Дваюрадная (стрыечная) сястра** — дачка бацькавага або матчынага брата (сястры)
**Зяць** — муж дачкі
**Нявестка** — сынава жонка
**Свёкар, свякроў** — мужавы бацькі

**Цесць, цешча** — жончыны бацькі
**Дзевер** — мужаў брат
**Залоўка** — мужава сястра
**Швагер (швагра)** — муж сястры, або жончын брат, або муж жончынай сястры
**Швагерка** — жончына сястра
**Братавая** — братава жонка
**Ятроўкі** — братавыя між сабой
**Сваты** — усе родныя мужа ў адносінах да ўсіх родных жонкі і наадварот.

Дадатак 8

## Змяненне колькасці жыхароў у Паставах з 1628 па 2008 год

**1628 г.** — 1044 жыхароў
**1667 г.** — 45 жыхароў
**1783 г.** — 1386 жыхароў
**1864 г.** — 1586 жыхароў
**1866 г.** — 797 жыхароў
**1870 г.** — 1000 жыхароў
**1881 г.** — 936 жыхароў
**1886 г.** — 726 жыхароў
**1897 г.** — 2397 жыхароў
**1939 г.** — 3400 жыхароў
**1959 г.** — 10 566 жыхароў
**1970 г.** — 15 139 жыхароў
**1979 г.** — 17 860 жыхароў
**1989 г.** — 18 807 жыхароў
**1999 г.** — 21 109 жыхароў
**2001 г.** — 21 100 жыхароў
**2002 г.** — 20 955 жыхароў
**2008 г.** — 19 800 жыхароў

**Тэма I. Мой родны край – Пастаўшчына**

§ 1. Пастаўскі раён на карце Рэспублікі Беларусь . . . . . . . . . . . . 6
§ 2. Горад Паставы — цэнтр Пастаўскага раёна . . . . . . . . . . . . 9
§ 3. Геаграфія Пастаўскага краю. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .21
§ 4. Край блакітных рэк і азёр . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .27
§ 5. Раслінны і жывёльны свет. Ахова прыроды . . . . . . . . . . . .33
§ 6. Насельніцтва Пастаўшчыны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .39
§ 7. Адкуль пайшлі назвы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .48

**Тэма II. Мінулае і сучаснасць**

§ 8. Гісторыя Пастаўшчыны на стужцы часу . . . . . . . . . . . . . . .54
§ 9. Маўклівыя сведкі мінуўшчыны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .58
§ 10. З глыбіні вякоў. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .70
§ 11. У Рэчы Паспалітай . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .77
§ 12. У складзе Расійскай імперыі. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .89
§ 13. Роля Тызенгаўзаў-Пшаздзецкіх у гісторыі краю . . . . . . .104
§ 14. Грознай вайны навала: Першая сусветная . . . . . . . . . . .117
§ 15. На крутым павароце гісторыі (1917–1921). . . . . . . . . . .125
§ 16. За польскім часам (1921–1939). . . . . . . . . . . . . . . . . . . .131
§ 17. Пад уладай першых Саветаў (1939–1941). . . . . . . . . . . .141
§ 18. Ішла вайна народная (1941–1944) . . . . . . . . . . . . . . . . .148
§ 19. Пастаўшчына партызанская . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .161
§ 20. У мірнай працы (1944–1991) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .170
§ 21. Сённяшні дзень краю (1991–2008) . . . . . . . . . . . . . . . . .177

**Тэма III. Матэрыяльная і духоўная спадчына**

§ 22. Легенды і паданні. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .190
§ 23. Матэрыяльная культура . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .199

§ 24. Традыцыі роднага краю . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 209
§ 25. Славутыя людзі Пастаўшчыны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 217

**Тэма IV. «Я спадчыну ад продкаў атрымаў...»**

§ 26. Тваё ўласнае «Я» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 224
§ 27. Твая сям'я . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 230
§ 28. Твой радавод . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 235
§ 29. Твая родная мясціна . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 238

**Тэма V. Паселішчы роднага краю**

§ 30. Лынтупы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 246
§ 31. Варапаева . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 254
§ 32. Дунілавічы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 261
§ 33. Камаі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 269
§ 34. Парыж-Асінагарадок . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 277

**Дадаткі**

1. Буйнейшыя рэкі Пастаўскага раёна . . . . . . . . . . . . . . . . . . 286
2. Характарыстыкі буйнейшых азёр Пастаўскага раёна . . . . . . 286
3. Вялікія камяні — геалагічныя помнікі прыроды . . . . . . . . . 288
4. Ландшафтныя геамарфалагічныя заказнікі прыроды Пастаўскага раёна . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 290
5. Хроніка падзей . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 292
6. Паходжанне і сэнс некаторых імёнаў . . . . . . . . . . . . . . . . 296
7. Назвы ступеняў сваяцтва . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 299
8. Змяненне колькасці жыхароў у Паставах з 1628 па 2008 год . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 300

П

**Пракаповіч, І. М.**

Чароўны край — Пастаўшчына: Краязнаўчыя артыкулы / І. М. Пракаповіч. — Мінск : _______, 2009. — 304 с.

ISBN 978-985-

Анатацыя ...........

**УДК**
**ББК**

Тэхнічныя звесткі